ВЫБАРЧЫ КОДЭКС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
11 лютага 2000 г. № 370-З

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 студзеня 2000 года*
*Адобраны Саветам Рэспублікі 31 студзеня 2000 года*

Змяненні і дапаўненні:

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 ліпеня 2000 г. № 406-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2000 г., № 64, 2/181) <H10000406>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2003 г. № 183-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 8, 2/932) <H10300183>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 6 кастрычніка 2006 г. № 166-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 166, 2/1263) <H10600166>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2010 г. № 99-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 5, 2/1649) <H11000099>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 8 лістапада 2011 г. № 309-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 127, 2/1861) <H11100309>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 25 лістапада 2013 г. № 72-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 27.11.2013, 2/2070) <H11300072>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 чэрвеня 2015 г. № 268-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 06.06.2015, 2/2266) <H11500268>

ЗМЕСТ

АГУЛЬНАЯ ЧАСТКА
РАЗДЗЕЛ I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ. АСНОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ ВЫБАРЧАЙ СІСТЭМЫ, ПРАВЯДЗЕННЯ РЭФЕРЭНДУМУ (НАРОДНАГА ГАЛАСАВАННЯ)
ГЛАВА 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
Артыкул 1. Адносіны, якія рэгулююцца гэтым Кодэксам
Артыкул 2. Прававая аснова выбарчай сістэмы, рэферэндуму
ГЛАВА 2. АСНОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ ВЫБАРЧАЙ СІСТЭМЫ, ПРАВЯДЗЕННЯ РЭФЕРЭНДУМУ
Артыкул 3. Асноўныя прынцыпы правядзення выбараў і рэферэндуму
Артыкул 4. Усеагульнае выбарчае права і права на ўдзел у рэферэндуме
Артыкул 5. Свабодныя выбары і ўдзел у рэферэндуме
Артыкул 6. Роўнае выбарчае права і права на ўдзел у рэферэндуме
Артыкул 7. Прамое выбарчае права, права на прамое волевыяўленне на рэферэндуме

Артыкул 8. Ускоснае выбарчае права
Артыкул 9. Тайнае галасаванне
Артыкул 10. Асноўныя прынцыпы правядзення адклікання дэпутата, члена Савета Рэспублікі
Артыкул 11. Забеспячэнне камісіямі правядзення выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, рэферэндуму, адклікання дэпутатаў
Артыкул 12. Забеспячэнне правядзення выбараў і адклікання членаў Савета Рэспублікі
Артыкул 13. Галоснасць пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі, дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў
РАЗДЗЕЛ II. ВЫБАРЧЫЯ АКРУГІ, УЧАСТКІ ДЛЯ ГАЛАСАВАННЯ. СПІСЫ ГРАМАДЗЯН, ЯКІЯ МАЮЦЬ ПРАВА ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ВЫБАРАХ, РЭФЕРЭНДУМЕ, ГАЛАСАВАННІ АБ АДКЛІКАННІ ДЭПУТАТА
ГЛАВА 3. ВЫБАРЧЫЯ АКРУГІ
Артыкул 14. Выбарчая акруга па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
Артыкул 15. Выбарчыя акругі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў
Артыкул 16. Парадак утварэння выбарчых акруг па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў
ГЛАВА 4. УЧАСТКІ ДЛЯ ГАЛАСАВАННЯ
Артыкул 17. Участкі для галасавання
Артыкул 18. Парадак утварэння ўчасткаў для галасавання
ГЛАВА 5. СПІСЫ ГРАМАДЗЯН, ЯКІЯ МАЮЦЬ ПРАВА ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ВЫБАРАХ, РЭФЕРЭНДУМЕ, ГАЛАСАВАННІ АБ АДКЛІКАННІ ДЭПУТАТА
Артыкул 19. Спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутата, і парадак іх складання
Артыкул 20. Парадак уключэння ў спіс грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутата
Артыкул 21. Азнаямленне са спісамі грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутата. Права на абскарджанне няправільнасцей у спісе
РАЗДЗЕЛ III. ПАЎНАМОЦТВЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, ДЗЯРЖАЎНЫХ ОРГАНАЎ У АРГАНІЗАЦЫІ ПАДРЫХТОЎКІ ВЫБАРАЎ, РЭФЕРЭНДУМУ, АДКЛІКАННЯ ДЭПУТАТА, ЧЛЕНА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ. СІСТЭМА І ПАЎНАМОЦТВЫ КАМІСІЙ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ВЫБАРАЎ, РЭФЕРЭНДУМУ, ГАЛАСАВАННЯ АБ АДКЛІКАННІ ДЭПУТАТА
ГЛАВА 6. ПАЎНАМОЦТВЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, ДЗЯРЖАЎНЫХ ОРГАНАЎ У АРГАНІЗАЦЫІ ПАДРЫХТОЎКІ

ВЫБАРАЎ, РЭФЕРЭНДУМУ, АДКЛІКАННЯ ДЭПУТАТА, ЧЛЕНА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ
Артыкул 22. Паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у арганізацыі падрыхтоўкі выбараў, рэспубліканскага рэферэндуму
Артыкул 23. Паўнамоцтвы Палаты прадстаўнікоў у арганізацыі падрыхтоўкі выбараў, рэспубліканскага рэферэндуму
Артыкул 24. Паўнамоцтвы мясцовых выканаўчых і распарадчых, а таксама прадстаўнічых органаў у арганізацыі падрыхтоўкі выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата, члена Савета Рэспублікі
ГЛАВА 7. СІСТЭМА КАМІСІЙ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ І ПРАВЯДЗЕННІ ВЫБАРАЎ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ, ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ, РЭФЕРЭНДУМУ, ГАЛАСАВАННЯ АБ АДКЛІКАННІ ДЭПУТАТА
Артыкул 25. Сістэма камісій па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутатаў
Артыкул 26. Цэнтральная камісія
Артыкул 27. Камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
Артыкул 28. Камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў
Артыкул 29. Камісіі па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў
Артыкул 30. Камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата
Артыкул 31. Камісіі па рэферэндуме
ГЛАВА 8. УТВАРЭННЕ, АРГАНІЗАЦЫЯ РАБОТЫ І ПАЎНАМОЦТВЫ ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІІ
Артыкул 32. Парадак утварэння Цэнтральнай камісіі
Артыкул $32^{1}$. Арганізацыя работы Цэнтральнай камісіі і забеспячэнне яе дзейнасці
Артыкул 33. Паўнамоцтвы Цэнтральнай камісіі
Артыкул $33^{1}$. Члены Цэнтральнай камісіі з правам дарадчага голасу
ГЛАВА 9. УТВАРЭННЕ КАМІСІЙ ПА ВЫБАРАХ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ, ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ, ПА РЭФЕРЭНДУМЕ, ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГАЛАСАВАННЯ АБ АДКЛІКАННІ ДЭПУТАТА. ПАРАДАК ЗМЯНЕННЯ СКЛАДУ КАМІСІЙ, АРГАНІЗАЦЫЯ ІХ РАБОТЫ І ПАЎНАМОЦТВЫ
Артыкул 34. Утварэнне камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, па рэферэндуме, па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата
Артыкул 35. Парадак вылучэння прадстаўнікоў у склад тэрытарыяльных, акруговых і ўчастковых камісій
Артыкул 36. Парадак змянення складу камісій
Артыкул 37. Арганізацыя работы тэрытарыяльных, акруговых і ўчастковых камісій
Артыкул 38. Садзейнічанне камісіям у ажыццяўленні іх паўнамоцтваў

Артыкул 39. Паўнамоцтвы абласных, Мінскай гарадской камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, па рэферэндуме, па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата
Артыкул 39[1]. Паўнамоцтвы абласных, Мінскай гарадской тэрытарыяльных выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў
Артыкул 40. Паўнамоцтвы раённых, гарадскіх камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, па рэферэндуме, па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата
Артыкул 41. Паўнамоцтвы гарадскіх (у гарадах раённага падпарадкавання), пасялковых, сельскіх тэрытарыяльных выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў гарадскіх, пасялковых, сельскіх Саветаў дэпутатаў, па рэферэндуме, па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата
Артыкул 42. Паўнамоцтвы акруговых выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, па выбарах у абласныя Саветы дэпутатаў і тэрытарыяльных выбарчых камісій, якія ажыццяўляюць у раёнах горада Мінска паўнамоцтвы акруговых выбарчых камісій па выбарах у Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў
Артыкул 42[1]. Члены акруговых выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў з правам дарадчага голасу
Артыкул 43. Паўнамоцтвы акруговай камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў, дэпутата абласнога Савета дэпутатаў
Артыкул 44. Паўнамоцтвы ўчастковай камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутата Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, па рэферэндуме, па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата
РАЗДЗЕЛ IV. ПЕРАДВЫБАРНАЯ АГІТАЦЫЯ, АГІТАЦЫЯ ПА РЭФЕРЭНДУМЕ, АДКЛІКАННІ ДЭПУТАТА, ЧЛЕНА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ. ФІНАНСАВАННЕ ВЫБАРАЎ, РЭФЕРЭНДУМУ, АДКЛІКАННЯ ДЭПУТАТА, ЧЛЕНА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ. АДКАЗНАСЦЬ ЗА ПАРУШЭННЕ ЗАКАНАДАЎСТВА АБ ВЫБАРАХ, РЭФЕРЭНДУМЕ, АДКЛІКАННІ ДЭПУТАТА, ЧЛЕНА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ
ГЛАВА 10. ПЕРАДВЫБАРНАЯ АГІТАЦЫЯ, АГІТАЦЫЯ ПА РЭФЕРЭНДУМЕ, АДКЛІКАННІ ДЭПУТАТА, ЧЛЕНА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ
Артыкул 45. Перадвыбарная агітацыя, агітацыя па рэферэндуме, адкліканні дэпутата, члена Савета Рэспублікі
Артыкул 45[1]. Правядзенне масавых мерапрыемстваў, якія арганізуюцца кандыдатамі ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, іх даверанымі асобамі
Артыкул 46. Выкарыстанне сродкаў масавай інфармацыі ў перадвыбарнай кампаніі, пры правядзенні рэферэндуму
Артыкул 47. Абмежаванні пры правядзенні перадвыбарнай агітацыі, агітацыі па рэферэндуме

ГЛАВА 11. ФІНАНСАВАННЕ ВЫБАРАЎ, РЭФЕРЭНДУМУ, АДКЛІКАННЯ ДЭПУТАТА, ЧЛЕНА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ
Артыкул 48. Расходы на падрыхтоўку і правядзенне выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата, члена Савета Рэспублікі
Артыкул 48[1]. Выбарчыя фонды кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты
ГЛАВА 12. АДКАЗНАСЦЬ ЗА ПАРУШЭННЕ ПАТРАБАВАННЯЎ ГЭТАГА КОДЭКСА. РАЗГЛЯД ЗВАРОТАЎ
Артыкул 49. Адказнасць за парушэнне патрабаванняў гэтага Кодэкса
Артыкул 49[1]. Парадак і тэрміны разгляду зваротаў аб парушэнні заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата, члена Савета Рэспублікі
ГЛАВА 13. ПАРАДАК ГАЛАСАВАННЯ ПРЫ ПРАВЯДЗЕННІ ВЫБАРАЎ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ, ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ, РЭФЕРЭНДУМУ, АДКЛІКАННЯ ДЭПУТАТАЎ
Артыкул 50. Час і месца галасавання
Артыкул 51. Арганізацыя галасавання на ўчастку для галасавання
Артыкул 52. Правядзенне галасавання на ўчастку для галасавання
Артыкул 53. Датэрміновае галасаванне на выбарах, рэферэндуме
Артыкул 54. Галасаванне ў месцы знаходжання выбаршчыка, удзельніка рэферэндуму на выбарах, рэферэндуме
ГЛАВА 14. ПАДЛІК ГАЛАСОЎ НА ЎЧАСТКУ ДЛЯ ГАЛАСАВАННЯ ПРЫ ПРАВЯДЗЕННІ ВЫБАРАЎ, РЭФЕРЭНДУМУ
Артыкул 55. Падлік галасоў на ўчастку для галасавання пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, рэферэндуму
АСАБЛІВАЯ ЧАСТКА
РАЗДЗЕЛ V. ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ, ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ
ГЛАВА 15. АРГАНІЗАЦЫЯ І ПРАВЯДЗЕННЕ ВЫБАРАЎ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, ДЭПУТАТАЎ
Артыкул 56. Прызначэнне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў
Артыкул 57. Патрабаванні, якія прад'яўляюцца да кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты
Артыкул 58. Права грамадзян Расійскай Федэрацыі, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, удзельнічаць у выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў
Артыкул 59. Несумяшчальнасць статусу дэпутата са службовым становішчам, а таксама з адпаведнымі паўнамоцтвамі
Артыкул 60. Права і тэрміны вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты
Артыкул 61. Парадак вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь
Артыкул 62. Парадак вылучэння кандыдатаў у дэпутаты палітычнымі партыямі

Артыкул 63. Парадак вылучэння кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў працоўнымі калектывамі
Артыкул 64. Парадак вылучэння кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўнымі калектывамі
Артыкул 65. Парадак вылучэння кандыдатаў у дэпутаты шляхам збору подпісаў выбаршчыкаў
Артыкул 66. Дакументы аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты, якія падаюцца ў акруговую, тэрытарыяльную выбарчую камісію
Артыкул 67. Праверка дакладнасці подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах па выбарах дэпутатаў
Артыкул 68. Рэгістрацыя кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты
Артыкул 68[1]. Адмова ў рэгістрацыі кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты
Артыкул 69. Зняцце кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты сваёй кандыдатуры
Артыкул 70. Адмена рашэння палітычнай партыі, працоўнага калектыву аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты
Артыкул 70[1]. Адмена рашэння аб рэгістрацыі кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты за парушэнне патрабаванняў гэтага Кодэкса
Артыкул 71. Парадак вылучэння кандыдатаў у дэпутаты замест выбылых
Артыкул 72. Бюлетэнь па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, бюлетэнь па выбарах дэпутатаў
ГЛАВА 16. ГАРАНТЫІ ДЗЕЙНАСЦІ І ПРАВЫ КАНДЫДАТА Ў ПРЭЗІДЭНТЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, У ДЭПУТАТЫ
Артыкул 73. Роўнасць праў і абавязкаў кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты
Артыкул 74. Права кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты выступаць на сходах, карыстацца сродкамі масавай інфармацыі, атрымліваць інфармацыю
Артыкул 75. Перадвыбарная праграма кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты
Артыкул 76. Даверaныя асобы кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты
Артыкул 77. Вызваленне кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты ад працоўных (службовых) абавязкаў для ўдзелу ў перадвыбарных мерапрыемствах і гарантыі іх дзейнасці
ГЛАВА 17. ПАРАДАК УСТАНАЎЛЕННЯ ВЫНІКАЎ ГАЛАСАВАННЯ І ПАДВЯДЗЕННЯ ВЫНІКАЎ ВЫБАРАЎ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Артыкул 78. Вызначэнне вынікаў галасавання ў тэрытарыяльных камісіях па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
Артыкул 79. Вызначэнне і апублікаванне вынікаў выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
Артыкул 80. Другі тур галасавання
Артыкул 81. Паўторныя выбары

ГЛАВА 18. ПАРАДАК УСТАНАЎЛЕННЯ ВЫНІКАЎ І ПАДВЯДЗЕННЯ ВЫНІКАЎ ВЫБАРАЎ ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ
Артыкул 82. Вызначэнне вынікаў выбараў у выбарчай акрузе па выбарах дэпутата Палаты прадстаўнікоў
Артыкул 83. Вызначэнне вынікаў выбараў абласнымі, Мінскай гарадской тэрытарыяльнымі выбарчымі камісіямі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў
Артыкул 84. Вызначэнне вынікаў выбараў Цэнтральнай камісіяй
Артыкул 85. Апублікаванне вынікаў выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў
Артыкул 86. Выключаны
Артыкул 87. Паўторныя выбары
Артыкул 88. Правядзенне выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў замест выбылых
ГЛАВА 19. ПАРАДАК ВЫЗНАЧЭННЯ ВЫНІКАЎ І ПАДВЯДЗЕННЯ ВЫНІКАЎ ВЫБАРАЎ ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ
Артыкул 89. Вызначэнне вынікаў выбараў у выбарчай акрузе па выбарах дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў
Артыкул 90. Выключаны
Артыкул 91. Вызначэнне вынікаў выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў тэрытарыяльнымі выбарчымі камісіямі
Артыкул 92. Апублікаванне вынікаў выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў
Артыкул 93. Выключаны
Артыкул 94. Паўторныя выбары
Артыкул 95. Правядзенне выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў замест выбылых
Артыкул 96. Правядзенне выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў у новаўтвораных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках **і пры змяненні меж адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі**
РАЗДЗЕЛ VI. ВЫБАРЫ ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ
ГЛАВА 20. ПАРАДАК ПРЫЗНАЧЭННЯ ВЫБАРАЎ ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ. ВЫЛУЧЭННЕ КАНДЫДАТАЎ У ЧЛЕНЫ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ
Артыкул 97. Прызначэнне выбараў членаў Савета Рэспублікі
Артыкул 98. Патрабаванні, якія прад'яўляюцца да кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі
Артыкул 99. Несумяшчальнасць статусу члена Савета Рэспублікі са службовым становішчам, паўнамоцтвамі дэпутата Палаты прадстаўнікоў
Артыкул 100. Вылучэнне кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі
Артыкул 101. Рэгістрацыя кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі
ГЛАВА 21. ПРАВЯДЗЕННЕ ПАСЯДЖЭННЯ ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ БАЗАВАГА ЎЗРОЎНЮ ВОБЛАСЦІ, ДЭПУТАТАЎ МІНСКАГА ГАРАДСКОГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПА ВЫБАРАХ ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ

Артыкул 102. Парадак склікання і правядзення пасяджэння дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў па выбарах членаў Савета Рэспублікі
Артыкул 103. Абмеркаванне кандыдатур, якія прапануюцца для выбрання членамі Савета Рэспублікі
Артыкул 104. Арганізацыя галасавання па выбарах членаў Савета Рэспублікі
Артыкул 105. Правядзенне галасавання па выбарах членаў Савета Рэспублікі
Артыкул 106. Вызначэнне вынікаў галасавання па выбарах членаў Савета Рэспублікі
Артыкул 107. Вызначэнне вынікаў выбараў членаў Савета Рэспублікі Цэнтральнай камісіяй
Артыкул 108. Апублікаванне вынікаў выбараў членаў Савета Рэспублікі
Артыкул 109. Пасведчанне аб выбранні членам Савета Рэспублікі
Артыкул 110. Правядзенне выбараў члена Савета Рэспублікі замест выбылага
РАЗДЗЕЛ VII. РЭФЕРЭНДУМ
ГЛАВА 22. ПАНЯЦЦЕ, ВІДЫ І МЭТА РЭФЕРЭНДУМУ. ПЫТАННІ, ЯКІЯ ВЫНОСЯЦЦА НА РЭФЕРЭНДУМ
Артыкул 111. Паняцце, віды і мэта рэферэндуму
Артыкул 112. Пытанні, якія выносяцца на рэферэндум
ГЛАВА 23. ІНІЦЫІРАВАННЕ І ПРЫЗНАЧЭННЕ РЭСПУБЛІКАНСКАГА РЭФЕРЭНДУМУ
Артыкул 113. Права ініцыятывы на правядзенне рэспубліканскага рэферэндуму
Артыкул 114. Ініцыятыўная група па правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму
Артыкул $114^1$. Фонд ініцыятыўнай групы па правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму
Артыкул 115. Збор подпісаў грамадзян
Артыкул 116. Разгляд ініцыятывы грамадзян аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму
Артыкул 117. Рашэнне аб прызначэнні рэспубліканскага рэферэндуму
Артыкул 118. Бюлетэнь для галасавання
ГЛАВА 24. ВЫЗНАЧЭННЕ ВЫНІКАЎ І ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ РЭСПУБЛІКАНСКАГА РЭФЕРЭНДУМУ
Артыкул 119. Вызначэнне вынікаў рэферэндуму па раёне, горадзе, раёне ў горадзе
Артыкул 120. Вызначэнне вынікаў рэферэндуму па абласцях і горадзе Мінску
Артыкул 121. Падвядзенне вынікаў рэферэндуму
Артыкул 122. Правядзенне паўторнага галасавання
Артыкул 123. Апублікаванне і ўступленне ў сілу рашэння, прынятага рэферэндумам
Артыкул 124. Юрыдычная сіла рашэння, прынятага рэферэндумам
ГЛАВА 25. ПАРАДАК ПРЫЗНАЧЭННЯ І ПРАВЯДЗЕННЯ МЯСЦОВАГА РЭФЕРЭНДУМУ
Артыкул 125. Парадак падрыхтоўкі і правядзення мясцовага рэферэндуму
Артыкул 126. Права ініцыятывы на правядзенне мясцовага рэферэндуму
Артыкул 127. Рашэнне аб прызначэнні мясцовага рэферэндуму
Артыкул 128. Правядзенне мясцовага рэферэндуму

Артыкул 128[1]. Фонд ініцыятыўнай групы па правядзенні мясцовага рэферэндуму
РАЗДЗЕЛ VIII. ПАРАДАК АДКЛІКАННЯ ДЭПУТАТА ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ, ДЭПУТАТА МЯСЦОВАГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ
ГЛАВА 26. ПАДСТАВЫ І ПАРАДАК УЗНІМАННЯ ПЫТАННЯ АБ АДКЛІКАННІ ДЭПУТАТА
Артыкул 129. Падставы адклікання дэпутата
Артыкул 130. Права ўзнімання пытання аб адкліканні дэпутата
Артыкул 131. Ініцыіраванне пытання аб адкліканні дэпутата
Артыкул 132. Правамоцнасць сходу выбаршчыкаў пры ўзніманні пытання аб адкліканні дэпутата і парадак яго правядзення
Артыкул 133. Гарантыі праў дэпутата пры ўзніманні пытання аб яго адкліканні
Артыкул 134. Рэгістрацыя ініцыятыўнай групы
Артыкул 135. Збор подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку прапановы аб узніманні пытання аб адкліканні дэпутата
Артыкул 136. Парадак збору подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку прапановы аб узніманні пытання аб адкліканні дэпутата
Артыкул 137. Парадак і тэрміны падачы падпісных лістоў у мясцовыя Саветы дэпутатаў. Вызначэнне вынікаў збору подпісаў выбаршчыкаў
ГЛАВА 27. ПАРАДАК ПРЫЗНАЧЭННЯ ГАЛАСАВАННЯ АБ АДКЛІКАННІ ДЭПУТАТА. ГАЛАСАВАННЕ І ПАДВЯДЗЕННЕ ЯГО ВЫНІКАЎ
Артыкул 138. Прыняцце рашэння аб прызначэнні галасавання аб адкліканні дэпутата
Артыкул 139. Бюлетэнь для галасавання аб адкліканні дэпутата
Артыкул 140. Даверaныя асобы дэпутата
Артыкул 141. Парадак правядзення галасавання аб адкліканні дэпутата і падвядзення яго вынікаў
Артыкул 142. Недапушчальнасць паўторнага ўзнімання пытання аб адкліканні дэпутата на працягу года
РАЗДЗЕЛ IX. ПАРАДАК АДКЛІКАННЯ ЧЛЕНА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ
ГЛАВА 28. ПАДСТАВЫ І ПАРАДАК ІНІЦЫІРАВАННЯ АДКЛІКАННЯ ЧЛЕНА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ
Артыкул 143. Падставы і парадак адклікання члена Савета Рэспублікі
Артыкул 144. Ініцыіраванне ўзнімання пытання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі
Артыкул 145. Парадак разгляду ініцыятывы аб узніманні пытання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі прэзідыумам абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і абласным, Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам
Артыкул 146. Праверка Цэнтральнай камісіяй захавання патрабаванняў гэтага Кодэкса пры ініцыіраванні ўзнімання пытання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі
Артыкул 147. Узніманне пытання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі
Артыкул 148. Парадак прызначэння галасавання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі

Артыкул 149. Агітацыя за адкліканне або супраць адклікання члена Савета Рэспублікі
ГЛАВА 29. ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ ПАСЯДЖЭННЯ ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ БАЗАВАГА ЎЗРОЎНЮ ВОБЛАСЦІ, ДЭПУТАТАЎ МІНСКАГА ГАРАДСКОГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПА ПЫТАННІ АБ АДКЛІКАННІ ЧЛЕНА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ
Артыкул 150. Правядзенне пасяджэння дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў па пытанні аб адкліканні члена Савета Рэспублікі
Артыкул 151. Арганізацыя галасавання па адкліканні члена Савета Рэспублікі
Артыкул 152. Разгляд Цэнтральнай камісіяй вынікаў галасавання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі
РАЗДЗЕЛ X. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
Артыкул 153. Уступленне ў сілу гэтага Кодэкса
Артыкул 154. Прывядзенне актаў заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым Кодэксам
Артыкул 155. Асноўныя тэрміны, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым Кодэксе
Артыкул 155[1]. Парадак захоўвання дакументаў па выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата, члена Савета Рэспублікі
Артыкул 156. Прызнанне, што некаторыя заканадаўчыя акты страцілі сілу

## АГУЛЬНАЯ ЧАСТКА

## РАЗДЗЕЛ I
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ. АСНОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ ВЫБАРЧАЙ СІСТЭМЫ, ПРАВЯДЗЕННЯ РЭФЕРЭНДУМУ (НАРОДНАГА ГАЛАСАВАННЯ)

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### Артыкул 1. Адносіны, якія рэгулююцца гэтым Кодэксам

Гэты Кодэкс рэгулюе адносіны, якія ўзнікаюць пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, выбараў і адклікання дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (далей – Палата прадстаўнікоў), членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (далей – Савет Рэспублікі), дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў Рэспублікі Беларусь (далей – мясцовыя Саветы дэпутатаў), а таксама пры падрыхтоўцы і правядзенні рэферэндуму (народнага галасавання) (далей – рэферэндум), і ўстанаўлівае гарантыі, якія забяспечваюць свабоднае волевыяўленне грамадзян Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 2. Прававая аснова выбарчай сістэмы, рэферэндуму

Прававую аснову выбарчай сістэмы, рэферэндуму складаюць Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, гэты Кодэкс і іншыя акты заканадаўства Рэспублікі Беларусь,

пастановы Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў (далей – Цэнтральная камісія).

## ГЛАВА 2
## АСНОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ ВЫБАРЧАЙ СІСТЭМЫ, ПРАВЯДЗЕННЯ РЭФЕРЭНДУМУ

### Артыкул 3. Асноўныя прынцыпы правядзення выбараў і рэферэндуму

Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў з'яўляюцца свабоднымі і праводзяцца на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні.

Выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў праводзяцца па аднамандатных выбарчых акругах.

Выбары членаў Савета Рэспублікі праводзяцца на аснове роўнага і ўскоснага выбарчага права пры тайным галасаванні.

Рэферэндум праводзіцца шляхам усеагульнага, свабоднага, роўнага і тайнага галасавання.

### Артыкул 4. Усеагульнае выбарчае права і права на ўдзел у рэферэндуме

Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў і рэферэндум з'яўляюцца ўсеагульнымі: права выбіраць, удзельнічаць у рэферэндуме маюць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія дасягнулі 18 гадоў.

У выбарах, рэферэндуме не ўдзельнічаюць грамадзяне, прызнаныя судом недзеяздольнымі, асобы, якія ўтрымліваюцца па прыгаворы суда ў месцах пазбаўлення свабоды. У галасаванні не ўдзельнічаюць асобы, у дачыненні да якіх у парадку, устаноўленым крымінальна-працэсуальным заканадаўствам, выбрана мера стрымання – утрыманне пад вартай.

### Артыкул 5. Свабодныя выбары і ўдзел у рэферэндуме

Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, удзел у рэферэндуме з'яўляюцца свабоднымі: выбаршчык, удзельнік рэферэндуму асабіста вырашае, ці ўдзельнічаць яму ў выбарах, рэферэндуме, за каго галасаваць на выбарах, за што галасаваць на рэферэндуме.

### Артыкул 6. Роўнае выбарчае права і права на ўдзел у рэферэндуме

Выбаршчыкі, удзельнікі рэферэндуму ўдзельнічаюць адпаведна ў выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў і рэферэндуме на роўных падставах: кожны выбаршчык, удзельнік рэферэндуму мае адзін голас.

Выбары членаў Савета Рэспублікі з'яўляюцца роўнымі: кожны дэпутат мясцовага Савета дэпутатаў базавага ўзроўню мае адзін голас.

Кандыдаты, якія выбіраюцца на дзяржаўныя пасады, удзельнічаюць у выбарах на роўных падставах.

### Артыкул 7. Прамое выбарчае права, права на прамое волевыяўленне на рэферэндуме

Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў з'яўляюцца прамымі. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь выбіраецца непасрэдна народам Рэспублікі Беларусь. Дэпутаты выбіраюцца грамадзянамі непасрэдна.

Грамадзяне ўдзельнічаюць у рэферэндуме на аснове прамога волевыяўлення.

**Артыкул 8. Ускоснае выбарчае права**

Выбары членаў Савета Рэспублікі з'яўляюцца ўскоснымі: члены Савета Рэспублікі выбіраюцца на пасяджэннях дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню кожнай вобласці і дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў.

**Артыкул 9. Тайнае галасаванне**

Галасаванне на выбарах і рэферэндуме з'яўляецца тайным: кантроль за волевыяўленнем выбаршчыкаў, удзельнікаў рэферэндуму ў ходзе галасавання забараняецца.

**Артыкул 10. Асноўныя прынцыпы правядзення адклікання дэпутата, члена Савета Рэспублікі**

Адкліканне дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі, дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў ажыццяўляецца з захаваннем асноўных прынцыпаў выбарчай сістэмы.

**Артыкул 11. Забеспячэнне камісіямі правядзення выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, рэферэндуму, адклікання дэпутатаў**

Правядзенне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, рэферэндуму, адклікання дэпутатаў забяспечваюць камісіі.

Камісіі ў сваёй дзейнасці кіруюцца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Кодэксам, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Камісіі пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутатаў у межах сваіх паўнамоцтваў незалежныя ад дзяржаўных органаў і не звязаныя рашэннямі палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў.

Рашэнні камісій, прынятыя ў межах іх паўнамоцтваў, абавязковыя для выканання ўсімі дзяржаўнымі органамі, палітычнымі партыямі, іншымі грамадскімі аб'яднаннямі, іншымі арганізацыямі, а таксама грамадзянамі.

Рашэнні вышэйстаячай камісіі, прынятыя ў межах яе паўнамоцтваў, абавязковыя для ніжэйстаячых камісій.

**Артыкул 12. Забеспячэнне правядзення выбараў і адклікання членаў Савета Рэспублікі**

Правядзенне выбараў членаў Савета Рэспублікі і адкліканне выбраных членаў Савета Рэспублікі забяспечваюць прэзідыумы абласных, Мінскага гарадскога, раённых, гарадскіх (гарадоў абласнога падпарадкавання) Саветаў дэпутатаў і

адпаведныя абласныя, Мінскі гарадскі, раённыя, гарадскія выканаўчыя камітэты, а таксама Цэнтральная камісія.

### Артыкул 13. Галоснасць пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі, дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў

Падрыхтоўка і правядзенне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, членаў Савета Рэспублікі, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, рэферэндуму, адклікання дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі, дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў ажыццяўляюцца адкрыта і галосна.

Адпаведныя камісіі, мясцовыя прадстаўнічыя, выканаўчыя і распарадчыя органы інфармуюць грамадзян аб сваёй рабоце па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі, дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў, аб утварэнні выбарчых акруг, аб складзе, месцы знаходжання і часе работы камісій, спісе грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутата, кандыдатах, выніках галасавання, выбараў, рэферэндуму, адклікання.

Цэнтральная камісія, адпаведная тэрытарыяльная, акруговая выбарчая камісія пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў выpабляе агульныя плакаты з біяграфічнымі данымі кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, а таксама кандыдатаў у дэпутаты, якія балаціруюцца ў адной выбарчай акрузе, для размяшчэння на ўчастках для галасавання і ў іншых устаноўленых для гэтага месцах. Адпаведная выбарчая камісія выpабляе інфармацыйныя матэрыялы аб кандыдатах у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты для накіравання іх выбаршчыкам. Аб'ём звестак, якія размяшчаюцца ва ўказаных матэрыялах, у дачыненні да кожнага кандыдата павінны быць прыкладна аднолькавым. Расходы на выраб агульных плакатаў з біяграфічнымі данымі кандыдатаў і інфармацыйных матэрыялаў аб кандыдатах ажыццяўляюцца за кошт сродкаў, выдзеленых з рэспубліканскага бюджэту на падрыхтоўку і правядзенне выбараў.

Пры правядзенні выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата, члена Савета Рэспублікі маюць права прысутнічаць назіральнікі – дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, члены Савета Рэспублікі, дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў, давераныя асобы кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, прадстаўнікі палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, грамадзян, замежныя (міжнародныя) назіральнікі, а таксама прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі ў парадку, які ўстанаўліваецца Цэнтральнай камісіяй.

Назіральнік мае права:

прысутнічаць на пасяджэннях адпаведных камісій;

прысутнічаць на пасяджэннях дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў па выбарах членаў Савета Рэспублікі, а таксама па адкліканні члена Савета Рэспублікі;

прысутнічаць пры пламбіраванні або апячатванні скрынак для галасавання;

знаходзіцца ў дзень галасавання ў памяшканнях для галасавання з моманту пламбіравання або апячатвання скрынак для галасавання да заканчэння падвядзення вынікаў галасавання;

прысутнічаць пры датэрміновым галасаванні, галасаванні па месцы знаходжання грамадзян, правядзенні паўторнага падліку галасоў грамадзян;

назіраць за выдачай бюлетэняў, ходам галасавання, прытрымліваннем устаноўленага гэтым Кодэксам парадку галасавання;

звяртацца з прапановамі і заўвагамі па пытаннях арганізацыі галасавання да старшыні ўчастковай, падліковай камісіі або яго намесніка;

атрымліваць інфармацыю аб выніках падліку галасоў і складанні пратаколаў адпаведных камісій аб выніках выбараў, рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата;

знаёміцца з пратаколамі ўчастковых камісій аб выніках галасавання і пратаколамі адпаведных камісій аб выніках выбараў, рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата, падпісанымі і накіраванымі ў вышэйстаячую камісію ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам;

зрабіць копію пратакола ўчастковай камісіі аб выніках галасавання сваімі сіламі і сродкамі;

накіроўваць звароты ў адпаведную ці вышэйстаячую камісію або пракурору аб устараненні парушэння гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата і члена Савета Рэспублікі не пазней чым на трэці дзень пасля выбараў, рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата, члена Савета Рэспублікі;

знаёміцца з рашэннямі пасяджэнняў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў па выбарах членаў Савета Рэспублікі, а таксама па адкліканні члена Савета Рэспублікі.

Назіральнік не мае права:

займацца агітацыяй у любой яе форме;

аказваць кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, у члены Савета Рэспублікі, у дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў якую-небудзь інфармацыйную, метадычную, фінансавую або іншую дапамогу;

ствараць перашкоды ў правядзенні галасавання;

праводзіць дзеянні, якія парушаюць тайну галасавання;

весці апытанні грамадзян, якія прыбылі для галасавання і якія прагаласавалі;

запаўняць за грамадзяніна па яго просьбе бюлетэнь;

ствараць перашкоды для нармальнай работы камісій, пасяджэнняў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і правядзення галасавання;

знаходзіцца каля сталоў выдачы бюлетэняў, каля кабін і скрынак для галасавання;

умешвацца ў работу камісій, пасяджэнняў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў.

Пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, рэферэндуму, адклікання дэпутата назіральнікі акрэдытуюцца пры адпаведных выбарчых камісіях, камісіях па рэферэндуме, па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата, а пры правядзенні выбараў і адклікання членаў Савета Рэспублікі – пры прэзідыумах

адпаведных абласных, Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў. Назіральнікі акрэдытуюцца пры прад'яўленні дакумента аб накіраванні назіральнікам, які вызначаецца Цэнтральнай камісіяй, і пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Папярэдняга паведамлення аб накіраванні назіральніка не патрабуецца.

Тэрмін паўнамоцтваў назіральніка пачынаецца з дня яго акрэдытацыі і заканчваецца ў дзень устанаўлення адпаведнай камісіяй вынікаў падліку галасоў, вынікаў выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата, члена Савета Рэспублікі.

Камісія, пры якой акрэдытаваны назіральнік, мае права пазбавіць яго акрэдытацыі ў выпадку парушэння ім заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата.

Камісіі інфармуюць назіральнікаў, замежных (міжнародных) назіральнікаў аб даце, часе і месцы правядзення сваіх пасяджэнняў.

Замежныя (міжнародныя) назіральнікі ад замежных дзяржаў і міжнародных арганізацый запрашаюцца ў Рэспубліку Беларусь Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, Палатай прадстаўнікоў, Саветам Рэспублікі, Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь, Цэнтральнай камісіяй.

Замежныя (міжнародныя) назіральнікі акрэдытуюцца Цэнтральнай камісіяй. Тэрмін паўнамоцтваў замежнага (міжнароднага) назіральніка пачынаецца з дня яго акрэдытацыі і заканчваецца ў дзень устанаўлення вынікаў выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата, члена Савета Рэспублікі.

Замежныя (міжнародныя) назіральнікі ажыццяўляюць назіранне у парадку, прадугледжаным часткай пятай гэтага артыкула. Замежныя (міжнародныя) назіральнікі маюць права таксама сустракацца з кандыдатамі, даверанымі асобамі кандыдатаў, а пасля дня галасавання выкладаць сваё меркаванне аб заканадаўстве Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата, члена Савета Рэспублікі, праводзіць прэс-канферэнцыі і звяртацца ў сродкі масавай інфармацыі.

Замежныя (міжнародныя) назіральнікі не маюць права выкарыстоўваць свой статус для ажыццяўлення дзейнасці, не звязанай з назіраннем за падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата, члена Савета Рэспублікі.

Цэнтральная камісія мае права пазбавіць акрэдытацыі замежнага (міжнароднага) назіральніка ў выпадку парушэння ім заканадаўства Рэспублікі Беларусь або агульнапрызнаных прынцыпаў і норм міжнароднага права.

Сродкі масавай інфармацыі асвятляюць падрыхтоўку і правядзенне выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата, члена Савета Рэспублікі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі маюць права прысутнічаць на пасяджэннях камісій, у памяшканнях для галасавання, на пасяджэннях дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў па выбарах членаў Савета Рэспублікі, а таксама па адкліканні члена Савета Рэспублікі.

Кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты маюць права прысутнічаць на ўчастках для галасавання пры падліку галасоў выбаршчыкаў.

Асобы, якія перашкаджаюць у дзень выбараў, рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата, члена Савета Рэспублікі рабоце камісій, правядзенню пасяджэнняў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, па распараджэнні старшынь адпаведных камісій, якія старшынствуюць на пасяджэннях дэпутатаў мясцовых

Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, выдаляюцца з памяшканняў для галасавання, з пасяджэнняў.

## РАЗДЗЕЛ II
## ВЫБАРЧЫЯ АКРУГІ, УЧАСТКІ ДЛЯ ГАЛАСАВАННЯ. СПІСЫ ГРАМАДЗЯН, ЯКІЯ МАЮЦЬ ПРАВА ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ВЫБАРАХ, РЭФЕРЭНДУМЕ, ГАЛАСАВАННІ АБ АДКЛІКАННІ ДЭПУТАТА

### ГЛАВА 3
### ВЫБАРЧЫЯ АКРУГІ

**Артыкул 14. Выбарчая акруга па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**

Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь праводзяцца па адзінай выбарчай акрузе, якая складае ўсю тэрыторыю Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 15. Выбарчыя акругі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў**

Для правядзення выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь утвараецца 110 выбарчых акруг.

Для правядзення выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў утвараюцца выбарчыя акругі:

па выбарах у абласны Савет дэпутатаў – ад 40 да 60 выбарчых акруг;

па выбарах у Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў – ад 40 да 60 выбарчых акруг;

па выбарах у раённы Савет дэпутатаў – ад 25 да 40 выбарчых акруг;

па выбарах у гарадскі Савет дэпутатаў (горада абласнога падпарадкавання) – ад 25 да 40 выбарчых акруг;

па выбарах у гарадскі Савет дэпутатаў (горада раённага падпарадкавання) – ад 15 да 25 выбарчых акруг;

па выбарах у пасялковы, сельскі Савет дэпутатаў – ад 11 да 15 выбарчых акруг.

Сярэднюю колькасць выбаршчыкаў на выбарчую акругу па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў па Рэспубліцы Беларусь устанаўлівае Цэнтральная камісіяя не пазней чым за пяць месяцаў да заканчэння тэрміну паўнамоцтваў Палаты прадстаўнікоў дзеючага склікання.

У межах норм, указаных у частцы другой гэтага артыкула, колькасць выбарчых акруг, якія падлягаюць утварэнню па выбарах у мясцовы Савет дэпутатаў, і сярэдняя колькасць выбаршчыкаў на выбарчую акругу ўстанаўліваюцца адпаведным мясцовым Саветам дэпутатаў не пазней чым за пяць месяцаў да заканчэння тэрміну паўнамоцтваў мясцовага Савета дэпутатаў дзеючага склікання.

Колькасць выбаршчыкаў у выбарчай акрузе вызначаецца зыходзячы з колькасці грамадзян, якія валодаюць выбарчым правам, якія пражывалі на тэрыторыі, што ўваходзіць у выбарчую акругу, пры правядзенні апошніх выбараў або рэферэндуму.

Выбарчыя акругі ўтвараюцца з прыкладна роўнай колькасцю выбаршчыкаў: адхіленне колькасці выбаршчыкаў у выбарчай акрузе па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў ад сярэдняй колькасці выбаршчыкаў, якія адносяцца да выбарчай акругі па Рэспубліцы Беларусь, а ў выбарчай акрузе па выбарах дэпутатаў адпаведнага мясцовага Савета дэпутатаў – ад сярэдняй колькасці выбаршчыкаў, якія

адносяцца да выбарчай акругі па выбарах у дадзены мясцовы Савет дэпутатаў, як правіла, не можа перавышаць 10 працэнтаў. Выбарчая акруга складае адзіную тэрыторыю: не дапускаецца ўтварэнне выбарчай акругі з тэрыторый, якія не мяжуюць паміж сабой.

Спісы выбарчых акруг з указаннем іх назваў, нумароў, меж, колькасці выбаршчыкаў і месцаў знаходжання выбарчых камісій публікуюцца: па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў – Цэнтральнай камісіяй не пазней чым на пяты дзень пасля прызначэння выбараў у Палату прадстаўнікоў, па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў – тэрытарыяльнымі выбарчымі камісіямі не пазней чым за 80 дзён да выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў.

У выпадку роспуску Палаты прадстаўнікоў выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў праводзяцца па выбарчых акругах, утвораных пры правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў папярэдняга склікання.

Ад кожнай выбарчай акругі выбіраецца адзін дэпутат.

### Артыкул 16. Парадак утварэння выбарчых акруг па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў

Выбарчыя акругі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў утвараюцца Цэнтральнай камісіяй па прадстаўленні абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў.

Выбарчыя акругі па выбарах у абласныя, Мінскі гарадскі, раённыя, гарадскія (гарадоў абласнога і раённага падпарадкавання), пасялковыя і сельскія Саветы дэпутатаў утвараюцца тэрытарыяльнымі выбарчымі камісіямі па выбарах у адпаведныя мясцовыя Саветы дэпутатаў па прадстаўленні адпаведна абласных, Мінскага гарадскога, раённых, гарадскіх, пасялковых і сельскіх выканаўчых камітэтаў.

## ГЛАВА 4
## УЧАСТКІ ДЛЯ ГАЛАСАВАННЯ

### Артыкул 17. Участкі для галасавання

Для правядзення галасавання і падліку галасоў па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, па рэферэндуме, адкліканні дэпутата тэрыторыя раёнаў, гарадоў, раёнаў у гарадах дзеліцца на ўчасткі для галасавання.

Участкі для галасавання ўтвараюцца з колькасцю не меншай за 20 і не большай за 3000 выбаршчыкаў, удзельнікаў рэферэндуму.

Участкі для галасавання могуць быць утвораны ў санаторыях, прафілакторыях, дамах адпачынку, бальніцах і іншых арганізацыях аховы здароўя, якія аказваюць медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах. Участкі для галасавання ўтвараюцца таксама ў воінскіх часцях.

### Артыкул 18. Парадак утварэння ўчасткаў для галасавання

Участкі для галасавання па правядзенні выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата ўтвараюцца ў раёнах і гарадах раённымі, гарадскімі (у гарадах абласнога

падпарадкавання) выканаўчымі камітэтамі, а ў гарадах з раённым дзяленнем – мясцовымі адміністрацыямі раёнаў у гарадах (далей – мясцовая адміністрацыя). У воінскіх часцях участкі для галасавання ўтвараюцца ў такім жа парадку па прадстаўленні камандзіраў воінскіх часцей.

За межамі Рэспублікі Беларусь участкі для галасавання па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, рэспубліканскім рэферэндуме для грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія знаходзяцца на тэрыторыі замежных дзяржаў, утвараюцца кіраўнікамі дыпламатычных прадстаўнікоў (консульскіх устаноў) Рэспублікі Беларусь, што дзейнічаюць на тэрыторыі адпаведных замежных дзяржаў, у парадку, які ўстанаўлівае Цэнтральная камісія

Участкі для галасавання ўтвараюцца не пазней чым за два месяцы да выбараў і не пазней чым за 25 дзён да рэферэндуму, за 25 дзён да дня галасавання аб адкліканні дэпутата.

Участкі для галасавання ўтвараюцца пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў і рэферэндуму па ўзгадненні з адпаведнымі раённымі, гарадскімі, раённымі ў гарадах тэрытарыяльнымі камісіямі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, раённымі, гарадскімі выбарчымі камісіямі па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, раённымі, гарадскімі, раённымі ў гарадах камісіямі па рэферэндуме, а пры правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў – па ўзгадненні з акруговымі выбарчымі камісіямі.

Пры адначасовым правядзенні выбараў рознага ўзроўню, выбараў і рэферэндуму ўчасткі для галасавання з'яўляюцца агульнымі па выбарах рознага ўзроўню, выбарах і рэферэндуме.

Органы, якія ўтварылі ўчасткі для галасавання, абавязаны не пазней чым у дзесяцідзённы тэрмін апавясціць выбаршчыкаў, удзельнікаў рэферэндуму аб межах кожнага ўчастка для галасавання з указаннем месца знаходжання ўчастковай камісіі і памяшкання для галасавання.

## ГЛАВА 5
## СПІСЫ ГРАМАДЗЯН, ЯКІЯ МАЮЦЬ ПРАВА ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ВЫБАРАХ, РЭФЕРЭНДУМЕ, ГАЛАСАВАННІ АБ АДКЛІКАННІ ДЭПУТАТА

### Артыкул 19. Спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутата, і парадак іх складання

Спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў, дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў, складаюцца па кожным участку для галасавання і падпісваюцца старшынёй і сакратаром участковай камісіі.

Гарадскія, пасялковыя, сельскія выканаўчыя камітэты, а ў гарадах з раённым дзяленнем – мясцовыя адміністрацыі, раённыя выканаўчыя камітэты ў гарадах і пасёлках гарадскога тыпу, дзе не ўтвораны гарадскія і пасялковыя выканаўчыя камітэты, забяспечваюць улік выбаршчыкаў, удзельнікаў рэферэндуму і перадаюць участковым камісіям спісы грамадзян Рэспублікі Беларусь, зарэгістраваных на тэрыторыі адпаведных участкаў для галасавання, якія маюць права ўдзельнічаць у

выбарах, рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутата, падпісаныя старшынямі адпаведных выканаўчых камітэтаў, а ў гарадах з раённым дзяленнем – кіраўнікамі мясцовых адміністрацый.

Спісы грамадзян – ваеннаслужачых, якія знаходзяцца ў воінскіх часцях, а таксама членаў сямей ваеннаслужачых і іншых выбаршчыкаў, удзельнікаў рэферэндуму, якія пражываюць у раёнах размяшчэння воінскіх часцей, складаюцца на аснове даных, якія падаюцца камандзірамі воінскіх часцей. Ваеннаслужачыя, якія пражываюць па-за воінскімі часцямі, уключаюцца ў спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутата, па месцы жыхарства на агульных падставах.

Спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутата, па ўчастках для галасавання, утвораных у санаторыях, прафілакторыях, дамах адпачынку, бальніцах і іншых арганізацыях аховы здароўя, якія аказваюць медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах, складаюцца ўчастковымі камісіямі на аснове даных, якія падаюцца ва ўчастковыя камісіі кіраўнікамі ўказаных устаноў.

Спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, рэспубліканскім рэферэндуме, па ўчастках для галасавання, утвораных за межамі Рэспублікі Беларусь, складаюцца на аснове даных, якія падаюцца кіраўнікамі дыпламатычных прадстаўніцтваў (консульскіх устаноў) Рэспублікі Беларусь, што дзейнічаюць на тэрыторыі адпаведных замежных дзяржаў.

Прозвішчы грамадзян у спісе ўказваюцца ў парадку, зручным для правядзення галасавання.

### Артыкул 20. Парадак уключэння ў спіс грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутата

У спіс грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутата, уключаюцца грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія валодаюць выбарчым правам, дасягнулі да дня або ў дзень выбараў, рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата 18 гадоў, зарэгістраваныя да моманту складання спіса па месцы жыхарства або па месцы знаходжання на тэрыторыі дадзенага ўчастка для галасавання. Грамадзяне, зарэгістраваныя па месцы знаходжання, уключаюцца ў спіс толькі на ўчастку для галасавання па месцы знаходжання.

Грамадзянін, які мае права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутата, можа быць уключаны ў спіс толькі на адным участку для галасавання.

У спіс грамадзян, што маюць права ўдзельнічаць у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, рэспубліканскім рэферэндуме, на ўчастку для галасавання, утвораным за межамі Рэспублікі Беларусь, уключаюцца грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія пражываюць на тэрыторыі замежнай дзяржавы або якія знаходзяцца ў працяглай замежнай камандзіроўцы. У гэты спіс пры звароце ва ўчастковую камісію ўключаюцца таксама грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія прыбылі ў замежную дзяржаву ў сувязі з прыватнай, службовай, дзелавой або турыстычнай паездкай.

### Артыкул 21. Азнаямленне са спісамі грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутата. Права на абскарджанне няправільнасцей у спісе

Спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутата, прадстаўляюцца выбаршчыкам, удзельнікам рэферэндуму для азнаямлення за 15 дзён да выбараў, рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата, а на ўчастках для галасавання, утвораных у санаторыях, прафілакторыях, дамах адпачынку, бальніцах і іншых арганізацыях аховы здароўя, якія аказваюць медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах, – за два дні да выбараў, рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата.

Грамадзяне, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутата, але не ўключаныя ў спіс па якой-небудзь прычыне, дадаткова ўключаюцца ўчастковай камісіяй у спіс на падставе пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь пры наяўнасці ў ім штампа аб рэгістрацыі па месцы жыхарства на тэрыторыі ўчастка для галасавання, а грамадзяне, зарэгістраваныя па месцы знаходжання, – на падставе пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь і дакумента, які пацвярджае рэгістрацыю па месцы знаходжання на тэрыторыі ўчастка для галасавання. Пры адсутнасці ў грамадзяніна рэгістрацыі на тэрыторыі дадзенага ўчастка для галасавання ён уключаецца ў спіс на падставе пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь і дакумента, які пацвярджае пражыванне на тэрыторыі ўчастка для галасавання. У гэтым выпадку ўчастковая камісія перадае паведамленне аб уключэнні грамадзяніна ў спіс ва ўчастковую камісію ўчастка для галасавання, на тэрыторыі якога грамадзянін зарэгістраваны па месцы жыхарства або па месцы знаходжання.

Кожнаму грамадзяніну забяспечваецца магчымасць праверыць, ці ўключаны ён у спіс і ці правільна ў спісе ўказаны звесткі аб ім.

Кожнаму грамадзяніну даецца права абскардзіць неўключэнне, няправільнае ўключэнне ў спіс або выключэнне са спіса, а таксама дапушчаныя ў спісе недакладнасці ва ўказанні даных аб грамадзяніне. Заява аб няправільнасцях у спісе разглядаецца ўчастковай камісіяй, якая абавязана не пазней чым у двухдзённы тэрмін, а напярэдадні і ў дзень выбараў, рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата неадкладна разгледзець заяву, унесці неабходныя выпраўленні ў спіс або выдаць заяўніку копію матываванага рашэння аб адхіленні яго заявы. Гэта рашэнне можа быць абскарджана ў вышэйстаячую камісію, якая абавязана разгледзець скаргу не пазней чым у трохдзённы тэрмін, а ў дзень галасавання – неадкладна. Рашэнне ўчастковай камісіі можа быць таксама абскарджана не пазней чым за пяць дзён да выбараў, рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата ў раённы, гарадскі суд, які абавязаны разгледзець скаргу ў трохдзённы тэрмін. Рашэнне раённага, гарадскога суда канчатковае. Выпраўленне ў спісе ў адпаведнасці з рашэннем вышэйстаячай камісіі або суда праводзіцца ўчастковай камісіяй неадкладна.

## РАЗДЗЕЛ III
## ПАЎНАМОЦТВЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, ДЗЯРЖАЎНЫХ ОРГАНАЎ У АРГАНІЗАЦЫІ ПАДРЫХТОЎКІ ВЫБАРАЎ, РЭФЕРЭНДУМУ, АДКЛІКАННЯ ДЭПУТАТА, ЧЛЕНА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ.

# СІСТЭМА І ПАЎНАМОЦТВЫ КАМІСІЙ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ВЫБАРАЎ, РЭФЕРЭНДУМУ, ГАЛАСАВАННЯ АБ АДКЛІКАННІ ДЭПУТАТА

## ГЛАВА 6
## ПАЎНАМОЦТВЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, ДЗЯРЖАЎНЫХ ОРГАНАЎ У АРГАНІЗАЦЫІ ПАДРЫХТОЎКІ ВЫБАРАЎ, РЭФЕРЭНДУМУ, АДКЛІКАННЯ ДЭПУТАТА, ЧЛЕНА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ

### Артыкул 22. Паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у арганізацыі падрыхтоўкі выбараў, рэспубліканскага рэферэндуму

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь:

1) прызначае чарговыя і пазачарговыя выбары ў Палату прадстаўнікоў і вызначае арганізацыйныя мерапрыемствы па забеспячэнні іх правядзення;

2) прызначае чарговыя і пазачарговыя выбары ў Савет Рэспублікі і вызначае арганізацыйныя мерапрыемствы па забеспячэнні іх правядзення;

3) прызначае чарговыя і пазачарговыя выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў і вызначае арганізацыйныя мерапрыемствы па забеспячэнні іх правядзення;

4) прызначае выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў у новаўтвораных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках;

5) пры роспуску Саветам Рэспублікі мясцовага Савета дэпутатаў прызначае выбары ў гэты мясцовы Савет дэпутатаў;

6) прызначае рэспубліканскі рэферэндум і вызначае арганізацыйныя мерапрыемствы па забеспячэнні яго правядзення.

### Артыкул 23. Паўнамоцтвы Палаты прадстаўнікоў у арганізацыі падрыхтоўкі выбараў, рэспубліканскага рэферэндуму

Палата прадстаўнікоў:

1) прызначае выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і вызначае арганізацыйныя мерапрыемствы па забеспячэнні іх правядзення;

2) пры разглядзе рэспубліканскага бюджэту прадугледжвае сродкі на правядзенне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, членаў Савета Рэспублікі, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, рэспубліканскага рэферэндуму.

### Артыкул 24. Паўнамоцтвы мясцовых выканаўчых і распарадчых, а таксама прадстаўнічых органаў у арганізацыі падрыхтоўкі выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата, члена Савета Рэспублікі

Абласныя, Мінскі гарадскі выканаўчыя камітэты падрыхтоўваюць прапановы аб утварэнні выбарчых акруг па выбарах у Палату прадстаўнікоў, абласныя, Мінскі гарадскі Саветы дэпутатаў.

Раённыя, гарадскія (у гарадах абласнога і раённага падпарадкавання), пасялковыя, сельскія выканаўчыя камітэты падрыхтоўваюць прапановы аб утварэнні выбарчых акруг па выбарах у раённыя, гарадскія, пасялковыя, сельскія Саветы дэпутатаў.

Раённыя, гарадскія (у гарадах абласнога падпарадкавання) выканаўчыя камітэты, мясцовыя адміністрацыі ўтвараюць участкі для галасавання і ўчастковыя камісіі па правядзенні выбараў, рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата.

Гарадскія (у гарадах раённага падпарадкавання), пасялковыя, сельскія выканаўчыя камітэты ўтвараюць гарадскія, пасялковыя, сельскія тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў гарадскіх, пасялковых, сельскіх Саветаў дэпутатаў, гарадскія, пасялковыя, сельскія камісіі па рэферэндуме.

Гарадскія, пасялковыя, сельскія выканаўчыя камітэты, мясцовыя адміністрацыі, раённыя выканаўчыя камітэты ў гарадах і пасёлках гарадскога тыпу, дзе не ўтвораны гарадскія і пасялковыя выканаўчыя камітэты, забяспечваюць улік грамадзян і перадаюць участковым камісіям спісы грамадзян, зарэгістраваных на тэрыторыі адпаведных участкаў для галасавання, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутата.

Раённыя, гарадскія, пасялковыя, сельскія выканаўчыя камітэты, мясцовыя адміністрацыі:

1) арганізуюць даванне камісіям па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, выбарчым камісіям, камісіям па рэферэндуме, камісіям па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата памяшканняў для размяшчэння камісій і правядзення галасавання, а таксама неабходнага абсталявання, сродкаў сувязі, транспартных сродкаў;

2) ствараюць умовы для правядзення сустрэч кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты з выбаршчыкамі; забяспечваюць бясплатнае даванне ім памяшканняў для гэтых мэт, а таксама неабходных даведачных і інфармацыйных матэрыялаў; вырашаюць пытанні давання памяшканняў для публічнага абмеркавання пытанняў (праектаў рашэнняў), вынесеных на рэферэндум;

3) выдзяляюць на тэрыторыі ўчасткаў для галасавання месцы для размяшчэння агітацыйных друкаваных матэрыялаў;

4) вызначаюць месцы для правядзення кандыдатамі ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, іх даверанымі асобамі масавых мерапрыемстваў (сходаў па-за памяшканнямі, мітынгаў, пікетавання) з мэтай ажыццяўлення перадвыбарнай агітацыі.

Раённыя, гарадскія выканаўчыя камітэты, мясцовыя адміністрацыі, а таксама абласныя і Мінскі гарадскі выканаўчыя камітэты пры ініцыіраванні правядзення рэферэндуму грамадзянамі Рэспублікі Беларусь правяраюць дакладнасць подпісаў грамадзян у падпісных лістах рэферэндуму і прымаюць рашэнні аб выніках збору подпісаў грамадзян.

Прэзідыумы абласных, Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў і абласныя, Мінскі гарадскі выканаўчыя камітэты:

1) утвараюць акруговыя выбарчыя камісіі па выбарах у Палату прадстаўнікоў, а таксама адпаведна ў абласцях – акруговыя выбарчыя камісіі па выбарах у абласны Савет дэпутатаў і ў горадзе Мінску – тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, якія ажыццяўляюць у раёнах горада Мінска паўнамоцтвы акруговых выбарчых камісій па выбарах у Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў;

2) утвараюць абласныя, Мінскую гарадскую тэрытарыяльныя камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, па выбарах у Палату прадстаўнікоў, па выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў, абласныя, Мінскую гарадскую камісіі па

рэферэндуме, а таксама акруговыя камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў, дэпутата абласнога Савета дэпутатаў;

3) склікаюць пасяджэнні дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў па выбарах і адкліканні членаў Савета Рэспублікі.

Прэзідыумы раённых, гарадскіх Саветаў дэпутатаў і раённыя, гарадскія (у гарадах абласнога падпарадкавання) выканаўчыя камітэты ўтвараюць раённыя, гарадскія тэрытарыяльныя камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, па выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў, а таксама раённыя, гарадскія камісіі па рэферэндуме.

Прэзідыумы гарадскіх Саветаў дэпутатаў і гарадскія выканаўчыя камітэты ў гарадах з раённым дзяленнем утвараюць раённыя ў гарадах камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, па рэферэндуме.

Прэзідыумы Мінскага гарадскога, раённых, гарадскіх (у гарадах абласнога падпарадкавання) Саветаў дэпутатаў і адпаведныя выканаўчыя камітэты вылучаюць кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі, а таксама ініцыіруюць (акрамя прэзідыума Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта) узнiманне пытання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі.

Мясцовыя Саветы дэпутатаў устанаўліваюць колькасць выбарчых акруг, якія падлягаюць утварэнню, і сярэднюю колькасць выбаршчыкаў на выбарчую акругу па выбарах у адпаведны мясцовы Савет дэпутатаў, прызначаюць адпаведна абласныя, раённыя, гарадскія, раённыя ў гарадах, пасялковыя, сельскія рэферэндумы, а таксама выбары дэпутатаў замест выбылых.

Старшыня або прэзідыум мясцовага Савета дэпутатаў:

1) склікаюць сходы выбаршчыкаў па ініцыіраванні і ўзніманні пытання аб адкліканні дэпутата;

2) арганізуюць праверку дакладнасці подпісаў выбаршчыкаў на падпісных лістах у падтрымку прапановы аб узніманні пытання аб адкліканні дэпутата і складаюць пратакол аб выніках збору подпісаў.

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя, а таксама прадстаўнічыя органы ажыццяўляюць і іншыя паўнамоцтвы, прадугледжаныя гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата.

## ГЛАВА 7
## СІСТЭМА КАМІСІЙ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ І ПРАВЯДЗЕННІ ВЫБАРАЎ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ, ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ, РЭФЕРЭНДУМУ, ГАЛАСАВАННЯ АБ АДКЛІКАННІ ДЭПУТАТА

### Артыкул 25. Сістэма камісій па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутатаў

Падрыхтоўку і правядзенне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, рэферэндуму забяспечваюць Цэнтральная камісія, а таксама адпаведна выбарчыя камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, камісіі па рэферэндуме.

Падрыхтоўку і правядзенне адклікання дэпутата Палаты прадстаўнікоў, дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў забяспечваюць Цэнтральная камісія і камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата.

**Артыкул 26. Цэнтральная камісія**

Цэнтральная камісія з'яўляецца дзяржаўным органам, які арганізуе ў межах сваіх паўнамоцтваў падрыхтоўку і правядзенне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, членаў Савета Рэспублікі, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, рэспубліканскіх рэферэндумаў. Цэнтральная камісія вырашае пытанні, звязаныя з арганізацыяй адклікання дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі.

Цэнтральная камісія ўзначальвае сістэму выбарчых камісій і камісій па рэферэндуме, якія дзейнічаюць у перыяд падрыхтоўкі і правядзення выбараў і рэспубліканскіх рэферэндумаў.

Цэнтральная камісія – пастаянна дзеючы орган, з'яўляецца юрыдычнай асобай, мае пячатку з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і са сваёй назвай, рахунак у банку.

**Артыкул 27. Камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**

Падрыхтоўку і правядзенне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь забяспечваюць наступныя выбарчыя камісіі:

тэрытарыяльныя камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – абласныя, Мінская гарадская, раённыя, гарадскія (у гарадах абласнога падпарадкавання, акрамя гарадоў з раённым дзяленнем), раённыя ў гарадах камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

участковыя камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Пры прызначэнні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Палата прадстаўнікоў можа прыняць рашэнне не ўтвараць абласныя, Мінскую гарадскую, раённыя, гарадскія (у гарадах абласнога падпарадкавання) камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а ўскласці ажыццяўленне іх паўнамоцтваў на дзеючыя абласныя, Мінскую гарадскую, раённыя, гарадскія (у гарадах абласнога падпарадкавання) тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі.

**Артыкул 28. Камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў**

Падрыхтоўку і правядзенне выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў забяспечваюць наступныя выбарчыя камісіі:

абласныя, Мінская гарадская тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі;

акруговыя выбарчыя камісіі;

участковыя выбарчыя камісіі.

Пры прызначэнні паўторных выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў замест выбылых Цэнтральная камісія можа прыняць рашэнне не ўтвараць абласныя, Мінскую гарадскую тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, а ўскласці ажыццяўленне іх паўнамоцтваў на дзеючыя абласныя, Мінскую гарадскую тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі.

**Артыкул 29. Камісіі па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў**

Падрыхтоўку і правядзенне выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў забяспечваюць наступныя выбарчыя камісіі:

тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі – абласныя, Мінская гарадская, раённыя, гарадскія (у гарадах абласнога і раённага падпарадкавання), пасялковыя і сельскія;

акруговыя выбарчыя камісіі па выбарах у абласныя Саветы дэпутатаў і тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, якія ажыццяўляюць у раёнах горада Мінска паўнамоцтвы акруговых выбарчых камісій па выбарах у Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў (у кожным раёне горада Мінска ўтвараецца па адной камісіі);

участковыя выбарчыя камісіі.

**Артыкул 30. Камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата**

Падрыхтоўку і правядзенне галасавання аб адкліканні дэпутата забяспечваюць наступныя камісіі:

акруговыя камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў, дэпутата абласнога Савета дэпутатаў;

тэрытарыяльныя камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата абласнога, Мінскага гарадскога, раённага, гарадскога (у гарадах абласнога і раённага падпарадкавання), пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў;

участковыя камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата.

Пры правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў тэрытарыяльныя камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата не ўтвараюцца, а іх паўнамоцтвы ажыццяўляюцца адпаведна дзеючымі абласнымі, Мінскай гарадской, раённымі, гарадскімі, пасялковымі і сельскімі тэрытарыяльнымі выбарчымі камісіямі.

**Артыкул 31. Камісіі па рэферэндуме**

Падрыхтоўку і правядзенне рэспубліканскага рэферэндуму забяспечваюць наступныя камісіі:

абласныя, Мінская гарадская камісіі па рэферэндуме;

раённыя, гарадскія (у гарадах абласнога падпарадкавання, акрамя гарадоў з раённым дзяленнем), раённыя ў гарадах камісіі па рэферэндуме;

участковыя камісіі па рэферэндуме.

Пры прызначэнні рэспубліканскага рэферэндуму Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь можа прыняць рашэнне не ўтвараць абласныя, Мінскую гарадскую, раённыя, гарадскія (у гарадах абласнога падпарадкавання) камісіі па рэферэндуме, а ўскласці ажыццяўленне іх паўнамоцтваў на дзеючыя абласныя, Мінскую гарадскую, раённыя, гарадскія (у гарадах абласнога падпарадкавання) тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі.

Падрыхтоўку і правядзенне мясцовага рэферэндуму забяспечваюць:

абласнога, Мінскага гарадскога рэферэндуму – абласная, Мінская гарадская, раённыя, гарадскія (у гарадах абласнога падпарадкавання), раённыя ў гарадах і ўчастковыя камісіі па рэферэндуме;

раённага, гарадскога (у гарадах абласнога падпарадкавання), раённага ў горадзе рэферэндуму – раённая, гарадская, раённая ў горадзе і ўчастковыя камісіі па рэферэндуме;

гарадскога (у гарадах раённага падпарадкавання), пасялковага, сельскага рэферэндуму – гарадская, пасялковая, сельская і ўчастковыя камісіі па рэферэндуме.

Пры прызначэнні мясцовага рэферэндуму мясцовы Савет дэпутатаў, які прызначыў рэферэндум, можа прыняць рашэнне не ўтвараць адпаведныя камісіі па рэферэндуме, а ўскласці ажыццяўленне іх паўнамоцтваў на дзеючыя тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі.

У выпадку прызначэння і правядзення адначасова рэспубліканскага і мясцовых рэферэндумаў камісіі, утвораныя ў прадугледжаным гэтым Кодэксам

парадку, з'яўляюцца агульнымі для ўсіх рэферэндумаў, якія праводзяцца адначасова.

## ГЛАВА 8
## УТВАРЭННЕ, АРГАНІЗАЦЫЯ РАБОТЫ І ПАЎНАМОЦТВЫ ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІІ

**Артыкул 32. Парадак утварэння Цэнтральнай камісіі**

Цэнтральная камісія ўтвараецца ў складзе 12 чалавек з грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія маюць, як правіла, вышэйшую юрыдычную адукацыю і вопыт работы па арганізацыі і правядзенні выбараў і рэферэндумаў.

Шэсць членаў Цэнтральнай камісіі прызначае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь і шэсць членаў выбірае Савет Рэспублікі. Кандыдатуры ў склад Цэнтральнай камісіі рэкамендуюцца адпаведна Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і Савету Рэспублікі сумеснымі рашэннямі прэзідыумаў абласных, Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў і абласных, Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў.

Старшыню Цэнтральнай камісіі прызначае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь са згоды Савета Рэспублікі з ліку членаў Цэнтральнай камісіі. Намеснік Старшыні і сакратар Цэнтральнай камісіі выбіраюцца з ліку членаў Цэнтральнай камісіі на яе першым пасяджэнні. Кандыдатуры для выбрання на пасады намесніка Старшыні і сакратара Цэнтральнай камісіі ўносіць Старшыня Цэнтральнай камісіі. Кандыдатура намесніка Старшыні папярэдне ўзгадняецца з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Тэрмін паўнамоцтваў Цэнтральнай камісіі – пяць гадоў. Тэрмін паўнамоцтваў Цэнтральнай камісіі новага складу пачынаецца з дня яе ўтварэння ў правамоцным складзе.

У склад Цэнтральнай камісіі не могуць уваходзіць кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь і іх давераныя асобы, кандыдаты ў дэпутаты і іх давераныя асобы, кандыдаты ў члены Савета Рэспублікі, дэпутаты, члены Савета Рэспублікі, а таксама іншыя асобы ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Паўнамоцтвы асобы, якая ўваходзіць у склад Цэнтральнай камісіі, у гэтых выпадках лічацца спыненымі з моманту яе рэгістрацыі кандыдатам, даверанай асобай або з моманту набыцця гэтай асобай статусу, у адпаведнасці з якім яна не можа ўваходзіць у склад Цэнтральнай камісіі.

Члены Цэнтральнай камісіі, якія з'яўляюцца членамі палітычных партый, павінны прыпыніць сваё членства ў палітычнай партыі і ў перыяд работы ў камісіі не могуць прымаць удзелу ў дзейнасці палітычных партый, а таксама выконваць іх даручэнні.

Старшыня, намеснік Старшыні, сакратар, члены Цэнтральнай камісіі могуць быць вызвалены ад пасады да сканчэння тэрміну іх паўнамоцтваў Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь з апавяшчэннем Савета Рэспублікі ў выпадках:

пісьмовай заявы аб складанні паўнамоцтваў;

спынення грамадзянства Рэспублікі Беларусь;

сістэматычнага невыканання сваіх абавязкаў;

здзяйснення дзеянняў, якія дыскрэдытуюць Цэнтральную камісію;

уступлення ў законную сілу абвінаваўчага прыгавору суда.

Выбранне (прызначэнне) членаў Цэнтральнай камісіі замест асоб, якія выбылі з яе складу, праводзіцца ў парадку, установленым гэтым артыкулам.

### Артыкул 32[1]. Арганізацыя работы Цэнтральнай камісіі і забеспячэнне яе дзейнасці

Асноўнымі прынцыпамі дзейнасці Цэнтральнай камісіі з'яўляюцца законнасць, незалежнасць, калегіяльнасць, адкрытасць і галоснасць.

Цэнтральная камісія збіраецца на сваё першае пасяджэнне не пазней за тры дні з дня яе ўтварэння ў правамоцным складзе.

Пасяджэнні Цэнтральнай камісіі склікаюцца па меры неабходнасці Старшынёй Цэнтральнай камісіі, а таксама па патрабаванні не менш адной трэці яе членаў.

Пасяджэнне Цэнтральнай камісіі правамоцнае, калі ў ім прымае ўдзел не менш за дзве трэці агульнага складу, прадугледжанага часткай першай артыкула 32 гэтага Кодэкса.

Рашэнні Цэнтральнай камісіі прымаюцца ў форме пастаноў адкрытым галасаваннем большасцю галасоў агульнага складу камісіі. Пры роўнай колькасці галасоў, пададзеных «за» і «супраць», прынятым лічыцца рашэнне, за якое прагаласаваў старшынствуючы.

Старшыня і сакратар Цэнтральнай камісіі працуюць на пастаяннай аснове.

У выпадку часовай адсутнасці намесніка Старшыні або сакратара Цэнтральнай камісіі іх абавязкі па рашэнні Цэнтральнай камісіі могуць быць ускладзены на іншых яе членаў. Пры гэтым рашэнне аб ускладанні абавязкаў намесніка Старшыні Цэнтральнай камісіі павінна быць папярэдне ўзгоднена з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Па рашэнні Цэнтральнай камісіі намеснік Старшыні і члены камісіі ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення выбараў і рэспубліканскіх рэферэндумаў, а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, могуць вызваляцца ад выканання працоўных (службовых) абавязкаў з выплатай заработнай платы за кошт сродкаў, выдзеленых на падрыхтоўку і правядзенне выбараў і рэспубліканскіх рэферэндумаў.

Для забеспячэння дзейнасці Цэнтральнай камісіі ствараецца апарат Цэнтральнай камісіі. Колькасць работнікаў апарату Цэнтральнай камісіі вызначае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь па прадстаўленні Старшыні Цэнтральнай камісіі. Структуру і штатны расклад апарату Цэнтральнай камісіі зацвярджае Старшыня Цэнтральнай камісіі.

Старшыня, сакратар і работнікі апарату Цэнтральнай камісіі, за выключэннем асоб, якія ажыццяўляюць тэхнічнае абслугоўванне, з'яўляюцца дзяржаўнымі служачымі.

Фінансаванне дзейнасці Цэнтральнай камісіі і яе апарату ажыццяўляецца ў межах сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце на ўтрыманне Цэнтральнай камісіі.

Старшыня Цэнтральнай камісіі арганізуе работу камісіі, ажыццяўляе агульнае кіраўніцтва яе апаратам, прызначае на пасады і вызваляе ад пасад работнікаў апарату, распараджаецца фінансавымі сродкамі ў межах каштарыса расходаў.

У перыяд падрыхтоўкі і правядзення выбараў і рэспубліканскіх рэферэндумаў Старшыня Цэнтральнай камісіі мае права часова павялічваць колькасць работнікаў апарату і ўстанаўліваць памер аплаты іх працы ў межах выдзеленых на гэтыя мэты сродкаў.

Парадак работы Цэнтральнай камісіі вызначаецца рэгламентам, які зацвярджае Цэнтральная камісія.

**Артыкул 33. Паўнамоцтвы Цэнтральнай камісіі**

Цэнтральная камісія ў межах сваёй кампетэнцыі:

1) арганізуе падрыхтоўку і правядзенне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, рэспубліканскіх рэферэндумаў;

2) кантралюе на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь выкананне заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата і члена Савета Рэспублікі;

3) дае растлумачэнні заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата і члена Савета Рэспублікі ў мэтах яго аднастайнага прымянення;

4) звяртаецца ў выпадку неабходнасці да суб'ектаў права заканадаўчай ініцыятывы з прапановамі аб тлумачэнні гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата і члена Савета Рэспублікі;

5) ажыццяўляе кіраўніцтва дзейнасцю выбарчых камісій, камісій па рэферэндуме, камісій па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутатаў, заслухоўвае іх інфармацыю, аказвае гэтым камісіям метадычную і арганізацыйна-тэхнічную дапамогу;

6) пры неабходнасці вырашае па сутнасці пытанні, якія адносяцца да кампетэнцыі ніжэйстаячай камісіі;

7) утварае выбарчыя акругі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і ўстанаўлівае сярэднюю колькасць выбаршчыкаў на выбарчую акругу па Рэспубліцы Беларусь;

8) вырашае пытанні аб парадку ўдзелу грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь, у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і рэспубліканскім рэферэндуме, а таксама аб парадку ўтварэння ўчасткаў для галасавання; па прадстаўленні Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь прымае рашэнні аб прыпісцы ўчасткаў для галасавання, якія ўтвараюцца за межамі Рэспублікі Беларусь, да адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак або выбарчых акруг на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

9) дае заключэнні аб правамоцнасці вылучэння кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі, рэгіструе вылучаных кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі, падводзіць вынікі выбараў членаў Савета Рэспублікі, рэгіструе выбраных членаў Савета Рэспублікі і публікуе іх спіс у друку, склікае першую пасля выбараў сесію Савета Рэспублікі;

10) рэгіструе:

ініцыятыўныя групы грамадзян па вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь;

кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, іх давераных асоб і выдае ім адпаведныя пасведчанні;

ініцыятыўную групу грамадзян па правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму і пытанні, якія прапануюцца ёю на рэспубліканскі рэферэндум;

ініцыятыўную групу выбаршчыкаў па зборы подпісаў у падтрымку прапановы аб узнiманні пытання аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў;

11) забяспечвае захаванне роўных прававых умоў перадвыбарнай дзейнасці палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты;

12) вызначае парадак выкарыстання сродкаў масавай інфармацыі ў перадвыбарнай кампаніі;

13) складае і зацвярджае каштарысы расходаў па правядзенні выбараў, рэспубліканскага рэферэндуму, адклікання дэпутата Палаты прадстаўнікоў у межах сродкаў, выдзеленых з рэспубліканскага бюджэту; стварае пазабюджэтны фонд па правядзенні выбараў, рэспубліканскага рэферэндуму для добраахвотнага пералічэння ў яго сродкаў арганізацый, у тым ліку грамадскіх аб'яднанняў, грамадзян, і зацвярджае палажэнне аб фондзе; размяркоўвае грашовыя сродкі, выдзеленыя з рэспубліканскага бюджэту і пазабюджэтнага фонду, па выбарчых камісіях, камісіях па рэферэндуме, камісіях па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў;

14) кантралюе мэтавае выкарыстанне грашовых сродкаў, выдзеленых з рэспубліканскага бюджэту, пазабюджэтнага фонду, выбарчых фондаў кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь; інфармуе Палату прадстаўнікоў аб расходаванні сродкаў, выдзеленых з бюджэту на правядзенне выбараў, рэспубліканскага рэферэндуму, адклікання дэпутата Палаты прадстаўнікоў; публікуе справаздачу аб расходаванні сродкаў пазабюджэтнага фонду;

15) устанаўлівае формы бюлетэняў і спіса грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутатаў, пратаколаў камісій і іншых дакументаў па выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутатаў, узоры скрынак для галасавання і пячатак камісій;

16) забяспечвае выраб бюлетэняў па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і для галасавання па рэспубліканскім рэферэндуме і забеспечвае імі абласныя, Мінскую гарадскую камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, па правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму;

17) вызначае меры па забеспячэнні захаванасці скрынак для галасавання і дакументаў па выбарах, рэферэндуме ў перыяд датэрміновага галасавання;

18) заслухоўвае паведамленні дзяржаўных органаў і органаў грамадскіх аб'яднанняў па пытаннях, звязаных з падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў, рэферэндуму;

19) пры адначасовым правядзенні выбараў рознага ўзроўню, выбараў і рэферэндуму можа ўстанаўліваць, што спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах рознага ўзроўню, выбарах і рэферэндуме, а таксама тэрытарыяльныя камісіі з'яўляюцца агульнымі для выбараў рознага ўзроўню, выбараў і рэферэндуму;

20) кантралюе забеспячэнне камісій памяшканнямі, транспартам, сувяззю, разглядае іншыя пытанні іх матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння;

21) падводзіць вынікі выбараў, рэферэндуму;

22) рэгіструе выбраных дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і публікуе іх спіс у друку; склікае першую пасля выбараў сесію Палаты прадстаўнікоў;

23) выдае выбраным Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і членам Савета Рэспублікі пасведчанні аб іх выбранні;

24) вырашае пытанні, звязаныя з правядзеннем другога тура галасавання, паўторных выбараў і выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у выпадку вакансіі пасады Прэзідэнта, а таксама паўторнага галасавання па рэферэндуме;

25) вырашае пытанні, звязаныя з арганізацыяй адклікання дэпутата Палаты прадстаўнікоў і члена Савета Рэспублікі, прызначае паўторныя выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў замест выбылых і забяспечвае іх правядзенне;

26) разглядае скаргі на рашэнні выбарчых камісій, камісій аб рэферэндуме, камісій па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутатаў і выносіць аб іх рашэнні;

27) разглядае звароты грамадзян і арганізацый аб пытаннях правядзення выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутатаў, членаў Савета Рэспублікі;

28) вывучае і абагульняе практыку прымянення заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата і члена Савета Рэспублікі;

29) уносіць суб'ектам права заканадаўчай ініцыятывы прапановы аб удасканальванні заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата і члена Савета Рэспублікі;

30) стварае рабочыя групы і іншыя структуры для арганізацыйнага, прававога і тэхнічнага забеспячэння выбараў і рэферэндуму;

31) пры правядзенні выбараў, рэспубліканскага рэферэндуму вызначае парадак і віды заахвочвання членаў камісій, работнікаў апаратаў камісій, асоб, якія ажыццяўляюць вядзенне бухгалтарскага ўліку і складанне справаздачнасці ў камісіях, а таксама работнікаў структур, указаных у пункце 30 гэтай часткі;

32) устанаўлівае і развівае сувязі з органамі замежных дзяржаў і міжнароднымі арганізацыямі, якія займаюцца пытаннямі арганізацыі правядзення выбараў і рэферэндумаў;

33) ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Пытанні, указаныя ў пунктах 3, 4, 6–10, 12, 13, 15, 17, 19, 21, 22, 24–26, 29 і 31 часткі першай гэтага артыкула, разглядаюцца Цэнтральнай камісіяй калегіяльна.

Звароты грамадзян і арганізацый падлягаюць калегіяльнаму разгляду ў тым выпадку, калі аб іх прыняты рашэнні ніжэйстаячых камісій. Па ініцыятыве Старшыні Цэнтральнай камісіі або па патрабаванні не менш адной трэці яе членаў на пасяджэнні Цэнтральнай камісіі разглядаюцца іншыя звароты грамадзян і арганізацый.

Звароты, якія не патрабуюць калегіяльнага разгляду, па даручэнні Старшыні Цэнтральнай камісіі разглядаюцца членамі Цэнтральнай камісіі, а таксама работнікамі яе апарату.

Рашэнні Цэнтральнай камісіі могуць быць абскарджаны ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 33$^{1}$. Члены Цэнтральнай камісіі з правам дарадчага голасу**

Кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь мае права з дня яго рэгістрацыі накіраваць у Цэнтральную камісію члена камісіі з правам дарадчага голасу.

Тэрмін паўнамоцтваў члена Цэнтральнай камісіі з правам дарадчага голасу пачынаецца з дня атрымання Цэнтральнай камісіяй ад кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь пісьмовага паведамлення аб накіраванні члена Цэнтральнай камісіі з правам дарадчага голасу.

Члену Цэнтральнай камісіі з правам дарадчага голасу выдаецца пасведчанне, форма якога ўстанаўлівае Цэнтральная камісія.

Членамі Цэнтральнай камісіі з правам дарадчага голасу не могуць быць кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, іх давераныя асобы, прадстаўнікі па фінансавых пытаннях.

Члены Цэнтральнай камісіі з правам дарадчага голасу абавязаны прытрымлівацца Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, выконваць патрабаванні гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, не ўчыняць дзеянняў, якія дыскрэдытуюць Цэнтральную камісію або перашкаджаюць яе рабоце.

Член Цэнтральнай камісіі з правам дарадчага голасу мае права:

уносіць у парадак дня пасяджэнняў Цэнтральнай камісіі прапановы аб пытаннях, якія ўваходзяць у яе кампетэнцыю, і патрабаваць правядзення галасавання аб іх;

выступаць на пасяджэннях Цэнтральнай камісіі;

задаваць удзельнікам пасяджэння Цэнтральнай камісіі пытанні ў адпаведнасці з парадкам дня і атрымліваць на іх адказы;

знаёміцца з дакументамі і матэрыяламі, якія разглядаюцца на пасяджэнні Цэнтральнай камісіі.

Член Цэнтральнай камісіі з правам дарадчага голасу не мае права:

удзельнічаць у праверках, якія праводзяцца Цэнтральнай камісіяй, у галасаванні пры прыняцці камісіяй рашэнняў;

даваць растлумачэнні і ўказанні, рабіць паведамленні ад імя Цэнтральнай камісіі.

Паўнамоцтвы члена Цэнтральнай камісіі з правам дарадчага голасу датэрмінова спыняюцца:

па яго пісьмовай заяве;

па рашэнні Цэнтральнай камісіі пры спыненні паўнамоцтваў кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь;

па заяве кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь аб адкліканні накіраванага ім члена Цэнтральнай камісіі;

у выпадку спынення грамадзянства Рэспублікі Беларусь.

Паўнамоцтвы члена Цэнтральнай камісіі з правам дарадчага голасу могуць быць датэрмінова спынены па рашэнні Цэнтральнай камісіі пры ўчыненні ім дзеянняў, якія дыскрэдытуюць Цэнтральную камісію або перашкаджаюць яе рабоце.

У выпадку датэрміновага спынення паўнамоцтваў члена Цэнтральнай камісіі з правам дарадчага голасу Цэнтральная камісія анулюе выдадзенае яму пасведчанне.

Паўнамоцтвы членаў Цэнтральнай камісіі з правам дарадчага голасу спыняюцца пасля ўстанаўлення Цэнтральнай камісіяй вынікаў выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 9
## УТВАРЭННЕ КАМІСІЙ ПА ВЫБАРАХ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ, ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ, ПА РЭФЕРЭНДУМЕ, ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГАЛАСАВАННЯ АБ АДКЛІКАННІ ДЭПУТАТА. ПАРАДАК ЗМЯНЕННЯ СКЛАДУ КАМІСІЙ, АРГАНІЗАЦЫЯ ІХ РАБОТЫ І ПАЎНАМОЦТВЫ

### Артыкул 34. Утварэнне камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, па рэферэндуме, па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата

Камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, па рэферэндуме, па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата, якія фарміруюцца з прадстаўнікоў палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, а таксама прадстаўнікоў грамадзян, вылучаных у склад камісіі шляхам падачы заявы, утвараюцца:

абласныя, Мінская гарадская камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, абласныя, Мінская гарадская тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, абласныя, Мінская гарадская тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, абласныя, Мінская гарадская камісіі па рэферэндуме – прэзідыумамі абласных, Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў і абласнымі, Мінскім гарадскім выканаўчымі камітэтамі ў складзе 9–13 членаў камісіі; указаныя камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь утвараюцца не пазней чым за 80 дзён да выбараў, па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў – за 75 дзён да выбараў, па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў – за 85 дзён да выбараў, па рэферэндуме – за месяц да рэферэндуму;

акруговыя выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў абласных Саветаў дэпутатаў, тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, якія ажыццяўляюць у раёнах горада Мінска паўнамоцтвы акруговых выбарчых камісій па выбарах у Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў, – прэзідыумамі абласных, Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў і абласнымі, Мінскім гарадскім выканаўчымі камітэтамі ў складзе 9–13 членаў камісіі не пазней чым за 75 дзён да выбараў;

раённыя, гарадскія камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, раённыя, гарадскія (у гарадах абласнога падпарадкавання) тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, раённыя, гарадскія камісіі па рэферэндуме – прэзідыумамі раённых, гарадскіх Саветаў дэпутатаў і раённымі, гарадскімі выканаўчымі камітэтамі, а раённыя ў гарадах камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, па рэферэндуме – прэзідыумамі гарадскіх Саветаў дэпутатаў і гарадскімі выканаўчымі камітэтамі ў складзе 9–13 членаў камісіі; указаныя камісіі ўтвараюцца не пазней чым адпаведна за 80 і 85 дзён да выбараў, за месяц да рэферэндуму;

гарадскія (у гарадах раённага падпарадкавання), пасялковыя, сельскія тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў гарадскіх, пасялковых, сельскіх Саветаў дэпутатаў, гарадскіх (у гарадах раённага падпарадкавання), пасялковыя, сельскія камісіі па рэферэндуме – гарадскімі, пасялковымі, сельскімі выканаўчымі камітэтамі ў складзе 7–11 членаў камісіі не пазней чым за 85 дзён да выбараў, за месяц да рэферэндуму;

акруговыя камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў, дэпутата абласнога Савета дэпутатаў – прэзідыумамі абласных, Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў і абласнымі, Мінскім гарадскім выканаўчымі камітэтамі ў складзе 9–13 членаў камісіі не пазней пяці дзён з дня прыняцця рашэння аб прызначэнні галасавання аб адкліканні дэпутата;

участковыя камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, участковыя выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, участковыя камісіі па рэферэндуме, участковыя камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата – раённымі, гарадскімі выканаўчымі камітэтамі, а ў гарадах з раённым дзяленнем – мясцовымі адміністрацыямі ў складзе 5–19 членаў камісіі не пазней чым адпаведна за 45 дзён да выбараў, за 20 дзён да рэферэндуму, за 20 дзён да дня галасавання аб адкліканні дэпутата. У неабходных выпадках склад участковай камісіі можа быць павялічаны або зменшаны. Пры адначасовым правядзенні выбараў рознага ўзроўню, выбараў і рэферэндуму ўчастковыя камісіі з'яўляюцца агульнымі па выбарах рознага ўзроўню, выбарах і рэферэндуме.

Органы, якія ўтвараюць камісію, як правіла, не менш адной трэці яе складу фарміруюць з прадстаўнікоў палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў. Гэта палажэнне не прымяняецца пры фарміраванні ўчастковых камісій, якія ўтвараюцца ў бальніцах і іншых арганізацыях аховы здароўя, якія аказваюць медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах, а таксама за межамі Рэспублікі Беларусь.

У склад камісіі не могуць уваходзіць суддзі, пракуроры, кіраўнікі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

Дзяржаўныя служачыя не могуць складаць болей адной трэці складу камісіі. Гэта палажэнне не прымяняецца пры ўтварэнні ўчастковых камісій за межамі Рэспублікі Беларусь.

Сумесныя рашэнні прэзідыума адпаведнага мясцовага Савета дэпутатаў і выканаўчага камітэта прымаюцца большасцю галасоў складу. У сумесным пасяджэнні гэтых органаў павінны ўдзельнічаць не менш дзвюх трацей складу прэзідыума мясцовага Савета дэпутатаў і выканаўчага камітэта. На пасяджэнні органаў, якія ўтвараюць камісіі, маюць права прысутнічаць прадстаўнікі палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, грамадзян, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад камісіі.

Рашэнне органаў, якія ўтварылі камісію, можа быць абскарджана ў трохдзённы тэрмін з дня яго прыняцця адпаведна ў абласны, Мінскі гарадскі, раённы, гарадскі суд суб'ектамі, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад камісіі. Скарга павінна быць падпісана адпаведна кіраўніком палітычнай партыі (арганізацыйнай структуры), іншага грамадскага аб'яднання (арганізацыйнай структуры), кіраўніком іншай арганізацыі (структурнага падраздзялення), грамадзянамі, якія вылучылі прадстаўніка ў склад камісіі шляхам падачы заявы. Суд разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін, яго рашэнне з'яўляецца канчатковым.

Рашэнне аб утварэнні камісій у сямідзённы тэрмін з дня яго прыняцця публікуецца ў друку. Рашэнне аб утварэнні пасялковых, сельскіх тэрытарыяльных камісій у той жа тэрмін можа быць даведзена да ведама грамадзян іншым спосабам. У рашэнні ўказваюцца прозвішча, імя, імя па бацьку кожнага члена камісіі, спосаб вылучэння ў склад камісіі, месца знаходжання і нумары тэлефонаў камісіі.

За межамі Рэспублікі Беларусь пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і рэспубліканскага рэферэндуму ўчастковыя камісіі ўтвараюцца кіраўнікамі дыпламатычных прадстаўніцтваў (консульскіх устаноў) Рэспублікі Беларусь, якія дзейнічаюць на тэрыторыі адпаведных замежных дзяржаў.

### Артыкул 35. Парадак вылучэння прадстаўнікоў у склад тэрытарыяльных, акруговых і ўчастковых камісій

Палітычныя партыі, іншыя грамадскія аб'яднанні, працоўныя калектывы арганізацый або калектывы іх структурных падраздзяленняў з ліку сваіх членаў, а таксама грамадзяне шляхам падачы заявы могуць вылучаць у адпаведную тэрытарыяльную, акруговую, участковую камісію толькі па адным прадстаўніку.

Вылучаць сваіх прадстаўнікоў у склад камісій маюць права:

кіруючыя органы палітычных партый, іншых рэспубліканскіх грамадскіх аб'яднанняў – у абласныя, Мінскую гарадскую тэрытарыяльныя і акруговыя выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў;

кіруючыя органы абласных, Мінскіх гарадскіх, раённых, гарадскіх (у гарадах абласнога падпарадкавання), раённых ў гарадах арганізацыйных структур палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў – у адпаведныя абласныя, Мінскую гарадскую, раённыя, гарадскія (у гарадах абласнога падпарадкавання) тэрытарыяльныя камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, па рэферэндуме, раённыя ў гарадах тэрытарыяльныя камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, па рэферэндуме, а таксама ва ўчастковыя камісіі;

кіруючыя органы абласных, Мінскіх гарадскіх арганізацыйных структур палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў – у адпаведныя акруговыя выбарчыя камісіі па выбарах у абласныя Саветы дэпутатаў, у тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, якія ажыццяўляюць у раёнах горада Мінска паўнамоцтвы акруговых выбарчых камісій па выбарах у Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў;

кіруючыя органы гарадскіх (у гарадах раённага падпарадкавання) арганізацыйных структур палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, сходу іх першасных арганізацый – у адпаведныя гарадскія (у гарадах раённага падпарадкавання), пасялковыя, сельскія тэрытарыяльныя і ўчастковыя камісіі. Першасная арганізацыя палітычнай партыі, іншага грамадскага аб'яднання мае права вылучаць свайго прадстаўніка ва ўчастковую камісію таго ўчастка для галасавання, на тэрыторыі якога знаходзіцца першасная арганізацыя;

Сходы размешчаных на тэрыторыі раёна, горада, раёна ў горадзе, пасёлка, сельсавета працоўных калектываў арганізацый або калектываў іх структурных падраздзяленняў, якія налічваюць не менш за 10 працуючых, – у адпаведныя тэрытарыяльныя, акруговыя і ўчастковыя камісіі. Пры вылучэнні прадстаўнікоў у склад камісій ад калектываў структурных падраздзяленняў арганізацыі вылучэнне прадстаўнікоў у склад гэтых камісій ад усяго працоўнага калектыву арганізацыі не праводзіцца. Сход правамоцны, калі ў яго рабоце ўдзельнічае больш за палову складу калектыву. Рашэнне сходу працоўнага калектыву арганізацыі прымаецца большасцю галасоў яго ўдзельнікаў. Прадстаўнікі ў склад тэрытарыяльных, акруговых і ўчастковых камісій могуць быць вылучаны ад калектываў некалькіх структурных падраздзяленняў або ад некалькіх працоўных калектываў арганізацый і калектываў структурных падраздзяленняў з агульнай колькасцю працуючых не меншай за 10 чалавек на іх агульным сходзе. Сход правамоцны, калі ад кожнага такога калектыву прысутнічае больш за палову яго складу.

Кіруючыя органы палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў вылучаюць прадстаўнікоў у склад камісій на сваіх пасяджэннях.

Вылучаць сваіх прадстаўнікоў у склад тэрытарыяльных, акруговых і ўчастковых камісій маюць права грамадзяне шляхам падачы заявы. Заява павінна быць падпісана не менш чым 10 грамадзянамі, якія валодаюць выбарчым правам і якія пражываюць на адпаведнай тэрыторыі. Заява аб вылучэнні прадстаўніка ва ўчастковую камісію, якая ўтвараецца за межамі Рэспублікі Беларусь, павінна быць падпісана не менш чым трыма грамадзянамі, якія пражываюць на тэрыторыі ўчастка для галасавання.

Вылучэнне прадстаўнікоў у склад камісій па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата праводзіцца ў парадку, прадугледжаным часткамі другой, трэцяй і чацвёртай гэтага артыкула.

Пры вылучэнні прадстаўніка ў склад адпаведнай камісіі пратакол сходу, пасяджэння або заява, падпісаная грамадзянамі, падаюцца ў органы, якія ўтвараюць камісію, не пазней чым за тры дні да ўстаноўленага гэтым Кодэксам тэрміну ўтварэння адпаведнай камісіі.

У пратаколе ўказваюцца назва кіруючага органа палітычнай партыі, іншага грамадскага аб'яднання, якое вылучыла прадстаўніка ў склад камісіі, яго адрас і нумар тэлефона, колькасць членаў органа (калектыву), колькасць удзельнікаў сходу, пасяджэння гэтага органа (калектыву), вынікі галасавання, дата прыняцця рашэння, прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, займаная пасада (занятак), месца работы і месца жыхарства, партыйнасць асобы, вылучанай у члены камісіі. Адпаведныя даныя ўказваюцца і ў пратаколе сходу працоўнага калектыву, першаснай арганізацыі палітычнай партыі, іншага грамадскага аб'яднання. Пратакол падпісваецца старшынёй і сакратаром сходу, пасяджэння. У заяве грамадзян, якія вылучылі прадстаўніка ў склад камісіі шляхам падачы заявы, указваюцца пералічаныя ў гэтай частцы гэтага артыкула адпаведныя даныя аб асобе, вылучанай у члены камісіі, а таксама прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння і месца жыхарства кожнага грамадзяніна, які падпісаў заяву.

**Артыкул 36. Парадак змянення складу камісій**

Асоба, якая ўваходзіць у склад камісіі, вызваляецца ад выканання сваіх абавязкаў у камісіі па асабістай заяве, а таксама ў выпадку адклікання або спынення паўнамоцтваў.

Права адклікання належыць грамадзянам або органу, які вылучыў асобу ў склад камісіі. Адкліканне асобы, якая ўваходзіць у склад камісіі, ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым для вылучэння.

Паўнамоцтвы асобы, якая ўваходзіць у склад камісіі, спыняюцца органамі, якія ўтварылі камісію, пры парушэнні гэтай асобай патрабаванняў гэтага Кодэкса або сістэматычным невыкананні ёй сваіх абавязкаў. Рашэнне аб спыненні паўнамоцтваў члена камісіі выдаецца не пазней чым на наступны дзень пасля прыняцця рашэння. Рашэнне аб спыненні паўнамоцтваў члена камісіі можа быць ў трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння абскарджана ў раённы, гарадскі суд. Суд разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін, яго рашэнне з'яўляецца канчатковым.

Паўнамоцтвы асобы (асоб), якая ўваходзіць ў склад камісіі, спыняюцца ў выпадку ўстанаўлення судом парушэння патрабаванняў гэтага Кодэкса пры ўтварэнні камісіі.

Пры выбыцці асобы (асоб) са складу камісіі па ўказаных у частцы першай гэтага артыкула і іншых прычынах органы, якія ўтварылі камісію, маюць права звярнуцца да палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных

калектываў, грамадзян з просьбай аб вылучэнні новага прадстаўніка ў склад камісіі. Калі пры выбыцці члена (членаў) камісіі яе склад застаецца правамоцным, вылучэнне новага прадстаўніка і змяненне складу камісіі могуць не праводзіцца.

Рашэнне аб змяненні складу камісіі або фарміраванні камісіі ў новым складзе павінна быць прынята органамі, якія ўтвараюць камісію, не пазней чым у пяцідзённы тэрмін з дня выбыцця члена (членаў) камісіі.

Калі пры выбыцці члена (членаў) камісіі па ўказаных у частцы першай гэтага артыкула і іншых прычынах камісія застаецца ў неправамоцным складзе, паўнамоцтвы камісіі на перыяд яе фарміравання ажыццяўляе вышэйстаячая камісія.

### Артыкул 37. Арганізацыя работы тэрытарыяльных, акруговых і ўчастковых камісій

Першае пасяджэнне тэрытарыяльных, акруговых і ўчастковых камісій склікаецца органамі, якія ўтварылі камісіі, не пазней за тры дні з дня іх фарміравання.

Старшыня, намеснік старшыні і сакратар камісіі выбіраюцца на першым пасяджэнні адпаведнай камісіі з ліку яе членаў.

Старшынёй камісіі не можа быць блізкі сваяк кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, яго муж (жонка), а таксама асоба, якая знаходзіцца ў непасрэдным падначаленні ў кандыдата.

Пасяджэнні камісіі склікаюцца і праводзяцца старшынёй, а ў выпадку яго адсутнасці або па яго даручэнні – намеснікам старшыні камісіі. Пасяджэнні камісіі праводзяцца таксама па патрабаванні не менш чым адной трэці членаў камісіі. Члены камісіі загадзя апавяшчаюцца аб пасяджэнні камісіі.

Пасяджэнні камісіі з'яўляюцца правамоцнымі, калі ў іх прымае ўдзел не менш за дзве трэці складу камісіі. Рашэнні камісіі прымаюцца адкрытым галасаваннем большасцю галасоў ад агульнага складу камісіі. Пры роўнай колькасці галасоў, пададзеных «за» і «супраць», прынятым лічыцца рашэнне, за якое прагаласаваў старшынствуючы. Члены камісіі, не згодныя з яе рашэннем, маюць права выказаць асобную думку, якая ў пісьмовай форме прыкладаецца да пратакола.

Член камісіі мае права:

уносіць прапановы ў парадак дня пасяджэння камісіі, а таксама прапановы па пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю камісіі;

выступаць на пасяджэннях камісіі і патрабаваць правядзення галасавання па ўнесеных прапановах;

задаваць удзельнікам пасяджэння камісіі пытанні ў адпаведнасці з парадкам дня і атрымліваць на іх адказы па сутнасці;

знаёміцца з дакументамі і матэрыяламі камісіі, у склад якой ён уваходзіць, і ніжэйстаячых камісій;

ажыццяўляць іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з кампетэнцыяй камісіі.

Член камісіі абавязаны:

прытрымлівацца Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, выконваць патрабаванні гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата; не ўчыняць дзеянняў, якія дыскрэдытуюць камісію;

удзельнічаць у пасяджэннях камісіі, а ў выпадку немагчымасці ўдзелу ў пасяджэнні – паведамляць аб гэтым кіраўніцтву камісіі;

прымаць удзел у падрыхтоўцы пасяджэнняў камісіі і праверках, якія праводзяцца камісіяй;

выконваць рашэнні камісіі, даручэнні камісіі і яе кіраўніцтва.

Рашэнні і дзеянні камісіі могуць быць абскарджаны ў вышэйстаячую камісію, а ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь, – таксама ў суд.

Па рашэнні камісіі асобныя яе члены могуць вызваляцца ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата ад выканання працоўных (службовых) абавязкаў з захаваннем сярэдняй заработнай платы за кошт сродкаў, выдзеленых на правядзенне выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата.

Аплата працы членаў камісіі і супрацоўнікаў яе апарату можа таксама праводзіцца зыходзячы з фактычна адпрацаванага часу ў камісіі.

Асобы, якія ўваходзяць у склад камісіі, не маюць права прымаць удзел у агітацыі за або супраць кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, за або супраць законапраекта або іншага пытання, вынесенага на рэферэндум, за або супраць адклікання дэпутата.

**Артыкул 38. Садзейнічанне камісіям у ажыццяўленні іх паўнамоцтваў**

Дзяржаўныя органы, грамадскія аб'яднанні, арганізацыі, службовыя асобы абавязаны садзейнічаць камісіям у ажыццяўленні імі сваіх паўнамоцтваў, даваць неабходныя для іх работы звесткі і матэрыялы.

Камісіі маюць права звяртацца па пытаннях, звязаных з падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата, у дзяржаўныя органы, грамадскія аб'яднанні, да кіраўнікоў арганізацый, іншых службовых асоб, якія абавязаны разгледзець пастаўленае пытанне і даць адказ камісіі не пазней чым у трохдзённы тэрмін.

**Артыкул 39. Паўнамоцтвы абласных, Мінскай гарадской камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, па рэферэндуме, па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата**

Абласныя, Мінская гарадская камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, па рэферэндуме, па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата:

1) арганізуюць правядзенне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, рэспубліканскага, абласнога, Мінскага гарадскога рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і кантралююць выкананне патрабаванняў гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата на тэрыторыі вобласці, горада Мінска;

2) кіруюць дзейнасцю раённай, гарадской, раённай у гарадах і ўчастковых камісій;

3) заслухоўваюць паведамленні службовых асоб (работнікаў) мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, арганізацый па пытаннях, звязаных з падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў;

4) кантралююць складанне спісаў грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата, і прадстаўленне іх для азнаямлення;

5) распараджаюцца грашовымі сродкамі, выдзеленымі на падрыхтоўку і правядзенне выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата; размяркоўваюць частку гэтых сродкаў паміж ніжэйстаячымі камісіямі па правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, рэспубліканскага, абласнога, Мінскага гарадскога рэферэндуму, адклікання дэпутата і кантралююць мэтавае выкарыстанне выдзеленых сродкаў; кантралююць забеспячэнне камісій памяшканнямі, транспартам, сувяззю, разглядаюць іншыя пытанні матэрыяльна-тэхнічнага і арганізацыйнага забеспячэння выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата;

6) разглядаюць заявы і скаргі на рашэнні і дзеянні ніжэйстаячых камісій і прымаюць па іх рашэнні.

Абласныя, Мінская гарадская тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, акрамя паўнамоцтваў, прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула, пры правядзенні выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў:

1) утвараюць выбарчыя акругі па выбарах у абласны, Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў па прадстаўленні абласнога, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта;

2) кіруюць дзейнасцю акруговых выбарчых камісій па выбарах у абласны Савет дэпутатаў і тэрытарыяльных выбарчых камісій, якія ажыццяўляюць у раёнах горада Мінска паўнамоцтвы акруговых выбарчых камісій па выбарах у Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў;

$2^1$) кантралююць паступленне і выкарыстанне сродкаў выбарчых фондаў кандыдатаў у дэпутаты;

3) падводзяць вынікі выбараў у абласны, Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў і падаюць інфармацыю аб гэтым у Цэнтральную камісію; рэгіструюць выбраных дэпутатаў; публікуюць паведамленне аб выніках выбараў і спіс выбраных дэпутатаў абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў;

4) арганізуюць правядзенне паўторных выбараў дэпутатаў абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і выбараў дэпутатаў замест выбылых;

5) выключаны;

6) склікаюць першую сесію нававыбранага абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў.

Мінская гарадская тэрытарыяльная выбарчая камісія пры правядзенні адклікання дэпутата Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў непасрэдна ажыццяўляе паўнамоцтвы па арганізацыі адклікання дэпутата, рэгіструе ініцыятыўную групу па зборы подпісаў у падтрымку прапановы аб узніманні пытання аб адкліканні дэпутата, прызначае галасаванне аб адкліканні дэпутата, зацвярджае тэкст бюлетэня па адкліканні дэпутата, забяспечвае выраб бюлетэняў, забяспечвае імі ўчастковыя камісіі, устанаўлівае вынікі галасавання аб адкліканні дэпутата і прымае рашэнне аб прызнанні дэпутата адкліканым выбаршчыкамі.

Абласная тэрытарыяльная выбарчая камісія пры правядзенні адклікання дэпутата абласнога Савета дэпутатаў рэгіструе ініцыятыўную групу па зборы подпісаў у падтрымку прапановы аб узніманні пытання аб адкліканні дэпутата, прызначае галасаванне аб адкліканні дэпутата, на падставе пратакола акруговай камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата абласнога Савета дэпутатаў прымае рашэнне аб прызнанні дэпутата адкліканым выбаршчыкамі.

Абласныя, Мінская гарадская камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, акрамя паўнамоцтваў, прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула, пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь:

1) кантралююць выкананне ініцыятыўнай групай грамадзян па вылучэнні кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь патрабаванняў гэтага Кодэкса пры зборы подпісаў і забяспечваюць дакладнасць даных аб колькасці такіх подпісаў;

2) складаюць на падставе пратаколаў раённых, гарадскіх, раённых у гарадах камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь пратаколы аб устанаўленні колькасці грамадзян, якія паставілі свае подпісы ў падтрымку прапановы аб вылучэнні кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь па вобласці, горадзе Мінску, і накіроўваюць іх у Цэнтральную камісію.

Абласныя, Мінская гарадская камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, па правядзенні рэспубліканскага, абласнога, Мінскага гарадскога рэферэндуму, акрамя паўнамоцтваў, прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула, пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, рэферэндуму:

1) забяспечваюць выраб бюлетэняў для галасавання па абласным і Мінскім гарадскім рэферэндуме і забяспечваюць імі раённыя, гарадскія, раённыя у гарадах камісіі;

2) вызначаюць вынікі галасавання па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, па рэспубліканскім рэферэндуме па вобласці, горадзе Мінску і паведамляюць аб іх у Цэнтральную камісію.

Абласныя, Мінская гарадская камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, акрамя паўнамоцтваў, прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула, пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў кантралююць захаванне роўных прававых умоў перадвыбарнай дзейнасці кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў.

Абласныя, Мінская гарадская камісіі па рэферэндуме, акрамя паўнамоцтваў, прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула, пры правядзенні рэспубліканскага, абласнога, Мінскага гарадскога рэферэндуму:

1) садзейнічаюць сродкам масавай інфармацыі ў правядзенні растлумачэння зместу пытання, вынесенага на рэферэндум;

2) забяспечваюць апублікаванне вынікаў рэферэндуму па вобласці, горадзе Мінску ў мясцовых сродках масавай інфармацыі.

Указаныя ў гэтым артыкуле камісіі ажыццяўляюць і іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Паўнамоцтвы абласных, Мінскай гарадской камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь спыняюцца пасля афіцыйнага апублікавання вынікаў выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Паўнамоцтвы абласных, Мінскай гарадской тэрытарыяльных выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў захоўваюцца да прызначэння выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў новага склікання.

Паўнамоцтвы абласных, Мінскай гарадской камісій па рэферэндуме спыняюцца праз месяц пасля ўступлення ў сілу рашэння рэферэндуму.

**Артыкул 39$^{1}$. Паўнамоцтвы абласных, Мінскай гарадской тэрытарыяльных выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў**

Абласныя, Мінская гарадская тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў:

1) арганізуюць правядзенне выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і кантралююць выкананне патрабаванняў гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах на тэрыторыі вобласці, горада Мінска;

2) кіруюць дзейнасцю акруговых і ўчастковых выбарчых камісій;

3) заслухоўваюць паведамленні службовых асоб (работнікаў) мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, арганізацый аб пытаннях, звязаных з падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў;

4) кантралююць захоўванне аднолькавых прававых умоў передвыбарнай дзейнасці кандыдатаў у дэпутаты;

5) кантралююць складанне спісаў грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, і прадстаўленне іх для азнаямлення;

6) распараджаюцца грашовымі сродкамі, выдзеленымі на падрыхтоўку і правядзенне выбараў, размяркоўваюць частку гэтых сродкаў паміж ніжэйстаячымі выбарчымі камісіямі і кантралююць мэтавае выкарыстанне выдзеленых сродкаў; кантралююць забеспячэнне ніжэйстаячых выбарчых камісій памяшканнямі, транспартам, сувяззю, разглядаюць іншыя пытанні матэрыяльна-тэхнічнага і арганізацыйнага забеспячэння выбараў;

7) кантралююць паступленне і выкарыстанне сродкаў выбарчых фондаў кандыдатаў у дэпутаты;

8) разглядаюць заявы і скаргі на рашэнні і дзеянні акруговых і ўчастковых выбарчых камісій;

9) падаюць у Цэнтральную камісію пратаколы акруговых выбарчых камісій аб рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты па выбарчых акругах, утвораных на тэрыторыі вобласці, горада Мінска;

10) кантралююць выраб бюлетэняў па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і забеспячэнне імі ўчастковых выбарчых камісій;

11) устанаўліваюць вынікі выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў на тэрыторыі вобласці, горада Мінска, падаюць у Цэнтральную камісію пратаколы акруговых выбарчых камісій аб выніках выбараў па выбарчых акругах;

12) арганізуюць правядзенне паўторных выбараў і выбараў дэпутатаў замест выбылых;

13) ажыццяўляюць іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Паўнамоцтвы абласных, Мінскай гарадской тэрытарыяльных выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў спыняюцца праз месяц пасля выбараў.

### Артыкул 40. Паўнамоцтвы раённых, гарадскіх камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, па рэферэндуме, па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата

Раённыя, гарадскія (у гарадах абласнога падпарадкавання) камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, па рэферэндуме, па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата:

1) арганізуюць правядзенне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў раённага, гарадскога Савета дэпутатаў, рэспубліканскага, абласнога,

раённага, гарадскога рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата раённага, гарадскога Савета дэпутатаў і кантралююць выкананне патрабаванняў гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата на тэрыторыі раёна, горада;

2) кіруюць дзейнасцю ўчастковых камісій;

3) устанаўліваюць адзіную нумарацыю ўчасткаў для галасавання па раёне, горадзе;

4) заслухоўваюць паведамленні службовых асоб (работнікаў) мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, арганізацый па пытаннях, звязаных з падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў;

5) кантралююць складанне спісаў грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата, і прадстаўленне іх для азнаямлення;

6) распараджаюцца грашовымі сродкамі, выдзеленымі на падрыхтоўку і правядзенне выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата; размяркоўваюць частку гэтых сродкаў паміж участковымі камісіямі па правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, рэферэндуму і кантралююць мэтавае выкарыстанне выдзеленых сродкаў; кантралююць забеспячэнне камісій памяшканнямі, транспартам, сувяззю, разглядаюць іншыя пытанні матэрыяльна-тэхнічнага і арганізацыйнага забеспячэння выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата;

7) разглядаюць заявы і скаргі на рашэнні і дзеянні ніжэйстаячых камісій і прымаюць па іх рашэнні.

Раённыя, гарадскія (у гарадах абласнога падпарадкавання) тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, акрамя паўнамоцтваў, прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула, пры правядзенні выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў:

1) утвараюць выбарчыя акругі па выбарах у раённы, гарадскі Савет дэпутатаў па прадстаўленні раённага, гарадскога выканаўчага камітэта;

2) кіруюць дзейнасцю гарадскіх (гарадоў раённага падпарадкавання), пасялковых, сельскіх тэрытарыяльных выбарчых камісій;

$2^1$) кантралююць паступленне і выкарыстанне сродкаў выбарчых фондаў кандыдатаў у дэпутаты;

3) рэгіструюць ініцыятыўныя групы грамадзян па зборы подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку асоб, якія прапануюцца для вылучэння кандыдатамі ў дэпутаты, і правядзенні агітацыі за іх выбранне; выдаюць членам ініцыятыўных груп адпаведныя пасведчанні;

4) выключаны;

5) рэгіструюць кандыдатаў у дэпутаты, іх давераных асоб і выдаюць ім адпаведныя пасведчанні;

6) зацвярджаюць тэксты бюлетэняў па выбарах дэпутатаў раённага, гарадскога Савета дэпутатаў па кожнай выбарчай акрузе; забяспечваюць выраб бюлетэняў і забяспечваюць імі ўчастковыя камісіі;

7) садзейнічаюць кандыдатам у дэпутаты ў арганізацыі сустрэч з выбаршчыкамі ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам;

8) падводзяць вынікі выбараў у раённы, гарадскі Савет дэпутатаў і падаюць інфармацыю аб гэтым у абласную тэрытарыяльную выбарчую камісію; рэгіструюць выбраных дэпутатаў; публікуюць паведамленне аб выніках выбараў, спіс выбраных

дэпутатаў раённага, гарадскога Савета дэпутатаў і выдаюць пасведчанні выбраным дэпутатам;

9) арганізуюць правядзенне паўторных выбараў дэпутатаў раённага, гарадскога Савета дэпутатаў і выбараў дэпутатаў замест выбылых;

10) выключаны;

11) склікаюць першую сесію нававыбранага раённага, гарадскога Савета дэпутатаў.

Камісіі, указаныя ў частцы другой гэтага артыкула, пры правядзенні адклікання дэпутата раённага, гарадскога Савета дэпутатаў:

1) рэгіструюць ініцыятыўныя групы па зборы подпісаў у падтрымку прапановы аб узніманні пытання аб адкліканні дэпутата;

2) прызначаюць галасаванне аб адкліканні дэпутата;

3) зацвярджаюць тэкст бюлетэня па адкліканні дэпутата, забяспечваюць выраб бюлетэняў, забяспечваюць імі ўчастковыя камісіі;

4) устанаўліваюць вынікі галасавання аб адкліканні дэпутата і прымаюць рашэнне аб прызнанні дэпутата адкліканым выбаршчыкамі.

Раённыя, гарадскія камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, акрамя паўнамоцтваў, прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула, пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь:

1) кантралююць выкананне ініцыятыўнай групай грамадзян па вылучэнні кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь патрабаванняў гэтага Кодэкса пры зборы подпісаў і забяспечваюць дакладнасць даных аб колькасці такіх подпісаў;

2) падводзяць вынікі па раёне, горадзе аб колькасці грамадзян, якія паставілі свае подпісы ў падтрымку прапановы аб вылучэнні кандыдата ў Прэзідэнты, складаюць аб гэтым пратаколы і неадкладна накіроўваюць іх у абласную, Мінскую гарадскую камісію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Раённыя, гарадскія камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, па правядзенні рэспубліканскага, абласнога, Мінскага гарадскога, раённага, гарадскога рэферэндуму, акрамя паўнамоцтваў, прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула, пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскага, абласнога, Мінскага гарадскога, раённага, гарадскога рэферэндуму:

1) забяспечваюць участковыя камісіі бюлетэнямі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і бюлетэнямі для галасавання па рэспубліканскім, абласным, Мінскім гарадскім, раённым, гарадскім рэферэндуме;

2) устанаўліваюць вынікі галасавання па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, па рэспубліканскім, абласным, Мінскім гарадскім рэферэндуме па раёне, горадзе і паведамляюць аб іх у абласную, Мінскую гарадскую камісію; устанаўліваюць вынікі галасавання па раённым, гарадскім рэферэндуме.

Раённыя, гарадскія камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, акрамя паўнамоцтваў, прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула, пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў кантралююць захаванне роўных прававых умоў перадвыбарнай дзейнасці кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў.

Раённыя, гарадскія камісіі па рэферэндуме, акрамя паўнамоцтваў, прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула, пры правядзенні рэферэндуму садзейнічаюць сродкам масавай інфармацыі ў растлумачэнні зместу пытання,

вынесенага на рэферэндум; забяспечваюць апублікаванне вынікаў рэферэндуму па раёне, горадзе ў мясцовых сродках масавай інфармацыі.

Раённыя ў гарадах камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, па рэспубліканскім, абласным, Мінскім гарадскім рэферэндуме ажыццяўляюць паўнамоцтвы раённых, гарадскіх камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і па рэферэндуме, прадугледжаныя гэтым артыкулам.

Указаныя ў гэтым артыкуле камісіі ажыццяўляюць і іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Паўнамоцтвы раённых, гарадскіх, раённых у гарадах камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь спыняюцца пасля афіцыйнага апублікавання вынікаў выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Паўнамоцтвы раённых, гарадскіх тэрытарыяльных выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў захоўваюцца да прызначэння выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў новага склікання.

Паўнамоцтвы раённых, гарадскіх, раённых у гарадах камісій па рэферэндуме спыняюцца праз месяц пасля ўступлення ў сілу рашэння рэферэндуму.

### Артыкул 41. Паўнамоцтвы гарадскіх (у гарадах раённага падпарадкавання), пасялковых, сельскіх тэрытарыяльных выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў гарадскіх, пасялковых, сельскіх Саветаў дэпутатаў, па рэферэндуме, па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата

Гарадскія (у гарадах раённага падпарадкавання), пасялковыя, сельскія тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў гарадскога, пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў, па гарадскім, пасялковым, сельскім рэферэндуме па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата:

1) арганізуюць правядзенне выбараў дэпутатаў гарадскога, пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў, гарадскога, пасялковага, сельскага рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата гарадскога, пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў і кантралююць выкананне патрабаванняў гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата на тэрыторыі горада, пасёлка, сельсавета;

2) кіруюць дзейнасцю ўчастковых камісій;

3) заслухоўваюць паведамленні службовых асоб (работнікаў) мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, арганізацый па пытаннях, звязаных з падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў;

4) кантралююць складанне спісаў грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата, і прадстаўленне іх для азнаямлення;

5) распараджаюцца грашовымі сродкамі, выдзеленымі на падрыхтоўку і правядзенне выбараў, гарадскога, пасялковага, сельскага рэферэндуму, адклікання дэпутата адпаведнага мясцовага Савета дэпутатаў; размяркоўваюць частку сродкаў, выдзеленых на падрыхтоўку і правядзенне гарадскога, пасялковага, сельскага рэферэндуму, паміж участковымі камісіямі і кантралююць мэтавае выкарыстанне выдзеленых сродкаў; кантралююць забеспячэнне ўчастковых камісій памяшканнямі, транспартам, сувяззю, разглядаюць іншыя пытанні матэрыяльна-тэхнічнага і арганізацыйнага забеспячэння выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата;

6) разглядаюць заявы і скаргі на рашэнні і дзеянні ўчастковых камісій і прымаюць па іх рашэнні.

Гарадскія, пасялковыя, сельскія тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, акрамя паўнамоцтваў, прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула, пры правядзенні выбараў дэпутатаў гарадскога, пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў:

1) утвараюць выбарчыя акругі па выбарах у гарадскі, пасялковы, сельскі Савет дэпутатаў па прадстаўленні гарадскога, пасялковага, сельскага выканаўчага камітэта;

2) рэгіструюць ініцыятыўныя групы грамадзян па зборы подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку асоб, якія прапануюцца для вылучэння кандыдатамі ў дэпутаты, і правядзенні агітацыі за іх выбранне; выдаюць членам ініцыятыўных груп адпаведныя пасведчанні;

$2^1$) кантралююць паступленне і выкарыстанне сродкаў выбарчых фондаў кандыдатаў у дэпутаты;

3) выключаны;

4) рэгіструюць кандыдатаў у дэпутаты, іх давераных асоб і выдаюць ім адпаведныя пасведчанні;

5) зацвярджаюць тэксты бюлетэняў па выбарах дэпутатаў гарадскога, пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў па кожнай выбарчай акрузе; забяспечваюць выраб бюлетэняў і забяспечваюць імі ўчастковыя камісіі;

6) садзейнічаюць кандыдатам у дэпутаты ў арганізацыі сустрэч з выбаршчыкамі ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам;

7) кантралююць захаванне роўных прававых умоў перадвыбарнай дзейнасці кандыдатаў у дэпутаты гарадскога, пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў;

8) падводзяць вынікі выбараў у гарадскі, пасялковы, сельскі Савет дэпутатаў і падаюць інфармацыю аб гэтым у раённую тэрытарыяльную выбарчую камісію; рэгіструюць выбраных дэпутатаў; публікуюць паведамленне аб выніках выбараў, спіс выбраных дэпутатаў гарадскога, пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў і выдаюць пасведчанні выбраным дэпутатам;

9) арганізуюць правядзенне паўторных выбараў дэпутатаў гарадскога, пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў і выбараў дэпутатаў замест выбылых;

10) выключаны;

11) склікаюць першую сесію нававыбранага гарадскога, пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў.

Камісіі, указаныя ў частцы першай гэтага артыкула, пры правядзенні адклікання дэпутата гарадскога, пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў:

1) рэгіструюць ініцыятыўныя групы па зборы подпісаў у падтрымку прапановы аб узнімані пытання аб адкліканні дэпутата;

2) прызначаюць галасаванне аб адкліканні дэпутата;

3) зацвярджаюць тэкст бюлетэня аб адкліканні дэпутата, забяспечваюць выраб бюлетэняў і забяспечваюць імі ўчастковыя камісіі;

4) устанаўліваюць вынікі галасавання аб адкліканні дэпутата і прымаюць рашэнне аб прызнанні дэпутата адкліканым выбаршчыкамі.

Гарадскія, пасялковыя, сельскія камісіі па рэферэндуме, акрамя паўнамоцтваў, прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула, пры правядзенні гарадскога, пасялковага, сельскага рэферэндуму:

1) забяспечваюць участковыя камісіі бюлетэнямі для галасавання па гарадскім, пасялковым, сельскім рэферэндуме;

2) устанаўліваюць вынікі галасавання па гарадскім, пасялковым, сельскім рэферэндуме, паведамляюць аб іх у мясцовых сродках масавай інфармацыі або іншым спосабам даводзяць да ведама грамадзян.

Указаныя ў гэтым артыкуле камісіі ажыццяўляюць і іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Паўнамоцтвы гарадскіх, пасялковых, сельскіх тэрытарыяльных выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў захоўваюцца да прызначэння выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў новага склікання.

Паўнамоцтвы гарадскіх, пасялковых, сельскіх камісій па рэферэндуме спыняюцца праз месяц пасля ўступлення ў сілу рашэння рэферэндуму.

### Артыкул 42. Паўнамоцтвы акруговых выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, па выбарах у абласныя Саветы дэпутатаў і тэрытарыяльных выбарчых камісій, якія ажыццяўляюць у раёнах горада Мінска паўнамоцтвы акруговых выбарчых камісій па выбарах у Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў

Акруговыя выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, па выбарах у абласныя Саветы дэпутатаў і тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, якія ажыццяўляюць у раёнах горада Мінска паўнамоцтвы акруговых выбарчых камісій па выбарах у Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў:

1) арганізуюць правядзенне выбараў і кантралююць выкананне патрабаванняў гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах на тэрыторыі выбарчых акруг, а ў раёне горада Мінска – на тэрыторыі выбарчых акруг, утвораных у раёне;

2) кіруюць дзейнасцю ўчастковых выбарчых камісій;

3) заслухоўваюць паведамленні службовых асоб (работнікаў) мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, арганізацый па пытаннях, звязаных з падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў;

4) рэгіструюць ініцыятыўныя групы грамадзян па зборы подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку асоб, якія прапануюцца для вылучэння кандыдатамі ў дэпутаты, і правядзенні агітацыі за іх выбранне; выдаюць членам ініцыятыўных груп адпаведныя пасведчанні;

5) выключаны;

6) рэгіструюць кандыдатаў у дэпутаты і іх давераных асоб і выдаюць ім адпаведныя пасведчанні;

7) кантралююць захаванне роўных прававых умоў перадвыбарнай дзейнасці кандыдатаў у дэпутаты;

8) садзейнічаюць кандыдатам у дэпутаты ў арганізацыі сустрэч з выбаршчыкамі ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам;

9) кантралююць складанне спісаў грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, і прадстаўленне іх для азнаямлення;

10) распараджаюцца грашовымі сродкамі, выдзеленымі на падрыхтоўку і правядзенне выбараў па выбарчых акругах, размяркоўваюць частку гэтых сродкаў паміж участковымі выбарчымі камісіямі, забяспечваюць кантроль за мэтавым выкарыстаннем выдзеленых сродкаў; кантралююць забеспячэнне ўчастковых выбарчых камісій памяшканнямі, транспартам, сувяззю і разглядаюць іншыя пытанні матэрыяльна-тэхнічнага і арганізацыйнага забеспячэння выбараў;

10[1]) кантралююць паступленне і выкарыстанне сродкаў выбарчых фондаў кандыдатаў у дэпутаты;

11) зацвярджаюць тэксты бюлетэняў па выбарчых акругах, забяспечваюць выраб бюлетэняў і забяспечваюць імі ўчастковыя выбарчыя камісіі;

12) устанаўліваюць і публікуюць у друку вынікі выбараў па выбарчых акругах;

13) выдаюць дэпутатам пасведчанні аб выбранні пасля рэгістрацыі іх адпаведна Цэнтральнай камісіяй, абласной, Мінскай гарадской тэрытарыяльнай выбарчай камісіяй;

14) арганізуюць правядзенне паўторных выбараў і выбараў дэпутатаў замест выбылых;

15) разглядаюць заявы і скаргі на рашэнні і дзеянні ўчастковых выбарчых камісій і прымаюць па іх рашэнні;

16) ажыццяўляюць іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Акруговыя выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў устанаўліваюць на тэрыторыі адпаведнай выбарчай акругі адзіную нумарацыю ўчасткаў для галасавання. Тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, якія ажыццяўляюць у раёнах горада Мінска паўнамоцтвы акруговых выбарчых камісій па выбарах у Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў, устанаўліваюць адзіную нумарацыю ўчасткаў для галасавання на тэрыторыі адпаведнага раёна горада Мінска.

Паўнамоцтвы выбарчых камісій, указаных у гэтым артыкуле, спыняюцца праз месяц пасля выбараў.

### Артыкул 42[1]. Члены акруговых выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў з правам дарадчага голасу

Палітычная партыя, якая вылучыла кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, мае права накіраваць у акруговую выбарчую камісію члена камісіі з правам дарадчага голасу з дня рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, вылучанага гэтай палітычнай партыяй.

Тэрмін паўнамоцтваў члена акруговай выбарчай камісіі з правам дарадчага голасу пачынаецца з дня атрымання акруговай выбарчай камісіяй рашэння кіруючага органа палітычнай партыі аб накіраванні члена акруговай выбарчай камісіі з правам дарадчага голасу.

Члену акруговай выбарчай камісіі з правам дарадчага голасу выдаецца пасведчанне, форма якога ўстанаўліваецца Цэнтральнай камісіяй.

Членамі акруговай выбарчай камісіі з правам дарадчага голасу не могуць быць кандыдаты ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, іх даверaныя асобы, прадстаўнікі па фінансавых пытаннях.

Члены акруговай выбарчай камісіі з правам дарадчага голасу абавязаны прытрымлівацца Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, выконваць патрабаванні гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, не ўчыняць дзеянняў, якія дыскрэдытуюць акруговую выбарчую камісію або перашкаджаюць яе рабоце.

Член акруговай выбарчай камісіі з правам дарадчага голасу мае права:

уносіць у парадак дня пасяджэнняў акруговай выбарчай камісіі прапановы аб пытаннях, якія ўваходзяць у яе кампетэнцыю, і патрабаваць правядзення галасавання па іх;

выступаць на пасяджэннях акруговай выбарчай камісіі;

задаваць удзельнікам пасяджэння акруговай выбарчай камісіі пытанні ў адпаведнасці з парадкам дня і атрымліваць на іх адказы;

знаёміцца з дакументамі і матэрыяламі, якія разглядаюцца на пасяджэнні акруговай выбарчай камісіі.

Член акруговай выбарчай камісіі з правам дарадчага голасу не мае права:

удзельнічаць у праверках, якія праводзяцца акруговай выбарчай камісіяй, у галасаванні пры прыняцці камісіяй рашэнняў;

даваць растлумачэнні і ўказанні, рабіць паведамленні ад імя акруговай выбарчай камісіі.

Паўнамоцтвы члена акруговай выбарчай камісіі з правам дарадчага голасу датэрмінова спыняюцца:

па яго пісьмовай заяве;

па рашэнні акруговай выбарчай камісіі пры выбыцці з выбарчай акругі кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, вылучанага палітычнай партыяй;

па рашэнні кіруючага органа палітычнай партыі аб адкліканні накіраванага ім члена акруговай выбарчай камісіі;

у выпадку спынення грамадзянства Рэспублікі Беларусь.

Паўнамоцтвы члена акруговай выбарчай камісіі з правам дарадчага голасу могуць быць датэрмінова спынены па рашэнні акруговай выбарчай камісіі пры ўчыненні ім дзеянняў, якія дыскрэдытуюць акруговую выбарчую камісію або якія перашкаджаюць яе рабоце.

У выпадку датэрміновага спынення паўнамоцтваў члена акруговай выбарчай камісіі з правам дарадчага голасу акруговая выбарчая камісія анулюе выдадзенае яму пасведчанне.

Паўнамоцтвы членаў акруговай выбарчай камісіі з правам дарадчага голасу спыняюцца пасля ўстанаўлення акруговай выбарчай камісіяй вынікаў выбараў дэпутата Палаты прадстаўнікоў у выбарчай акрузе.

### Артыкул 43. Паўнамоцтвы акруговай камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў, дэпутата абласнога Савета дэпутатаў

Акруговая камісія па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў, дэпутата абласнога Савета дэпутатаў:

1) арганізуе правядзенне галасавання аб адкліканні дэпутата і кантралюе выкананне патрабаванняў гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб адкліканні дэпутата на тэрыторыі выбарчай акругі;

2) кіруе дзейнасцю ўчастковых камісій;

2$^{1}$) устанаўлівае на тэрыторыі выбарчай акругі адзіную нумарацыю ўчасткаў для галасавання;

3) кантралюе складанне спісаў грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у галасаванні аб адкліканні дэпутата, і прадстаўленне іх для азнаямлення;

4) зацвярджае тэкст бюлетэня для галасавання аб адкліканні дэпутата, забяспечвае выраб бюлетэняў і клапоціцца пра забеспячэнне імі ўчастковыя камісіі;

5) распараджаецца грашовымі сродкамі, выдзеленымі на падрыхтоўку і правядзенне галасавання аб адкліканні дэпутата, размяркоўвае частку гэтых сродкаў паміж участковымі камісіямі; кантралюе забеспячэнне ўчастковых камісій памяшканнямі, транспартам, сувяззю і разглядае іншыя пытанні матэрыяльна-тэхнічнага і арганізацыйнага забеспячэння галасавання аб адкліканні дэпутата;

6) разглядае заявы і скаргі на рашэнні і дзеянні ўчастковых камісій і прымае аб іх рашэнні.

Акруговая камісія па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў вызначае вынікі галасавання аб адкліканні дэпутата і прымае рашэнне аб прызнанні дэпутата адкліканым выбаршчыкамі, а акруговая камісія па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата абласнога Савета дэпутатаў вызначае вынікі галасавання аб адкліканні дэпутата абласнога Савета дэпутатаў, складае аб гэты пратакол і накіроўвае яго ў абласную тэрытарыяльную выбарчую камісію.

Паўнамоцтвы камісій, указаных у гэтым артыкуле, спыняюцца пасля афіцыйнага апублікавання вынікаў галасавання аб адкліканні дэпутата.

### Артыкул 44. Паўнамоцтвы ўчастковай камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутата Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, па рэферэндуме, па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата

Участковая камісія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутата Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, па рэферэндуме, па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата:

1) забяспечвае прытрымліванне патрабаванняў гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, аб адкліканні дэпутата на тэрыторыі ўчастка для галасавання;

2) удакладняе спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата, па ўчастку для галасавання;

3) знаёміць выбаршчыкаў, удзельнікаў рэферэндуму са спісам грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата, разглядае заявы аб няправільнасцях у спісе і вырашае пытанне аб унясенні ў яго адпаведных змяненняў;

4) апавяшчае выбаршчыкаў, удзельнікаў рэферэндуму аб месцы знаходжання, часе работы і нумары тэлефона ўчастковай камісіі, а таксама аб дні выбараў, рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата, часе і месцы галасавання;

$4^1$) накіроўвае выбаршчыкам інфармацыю аб кандыдатах у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, прадстаўленую адпаведна Цэнтральнай камісіяй, тэрытарыяльнай, акруговай выбарчай камісіяй;

5) забяспечвае рэалізацыю прадугледжанага гэтым Кодэксам права выбаршчыкаў, удзельнікаў рэферэндуму прагаласаваць на выбарах, рэферэндуме датэрмінова (за выключэннем участковай камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата), а таксама захаванасць бюлетэняў;

6) забяспечвае падрыхтоўку памяшкання для галасавання, скрынак для галасавання і іншага абсталявання;

7) кантралюе на тэрыторыі ўчастка для галасавання прытрымліванне правіл размяшчэння агітацыйных матэрыялаў;

8) забяспечвае мэтавае выкарыстанне грашовых сродкаў, выдзеленых на правядзенне выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата;

9) арганізуе галасаванне ў дзень выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата;

10) праводзіць падлік галасоў і ўстанаўлівае вынікі галасавання па ўчастку;

11) разглядае заявы і скаргі па пытаннях падрыхтоўкі выбараў, рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата, арганізацыі галасавання, падліку галасоў і прымае па іх рашэнні;

12) заслухоўвае паведамленні службовых асоб мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, арганізацый па пытаннях, звязаных з падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата;

13) ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Паўнамоцтвы ўчастковых камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата спыняюцца пасля завяршэння на тэрыторыі ўчастка для галасавання выбараў, галасавання аб адкліканні дэпутата, а паўнамоцтвы ўчастковай камісіі па рэферэндуме – праз месяц пасля ўступлення ў сілу рашэння рэферэндуму.

# РАЗДЗЕЛ IV
# ПЕРАДВЫБАРНАЯ АГІТАЦЫЯ, АГІТАЦЫЯ ПА РЭФЕРЭНДУМЕ, АДКЛІКАННІ ДЭПУТАТА, ЧЛЕНА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ. ФІНАНСАВАННЕ ВЫБАРАЎ, РЭФЕРЭНДУМУ, АДКЛІКАННЯ ДЭПУТАТА, ЧЛЕНА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ. АДКАЗНАСЦЬ ЗА ПАРУШЭННЕ ЗАКАНАДАЎСТВА АБ ВЫБАРАХ, РЭФЕРЭНДУМЕ, АДКЛІКАННІ ДЭПУТАТА, ЧЛЕНА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ

## ГЛАВА 10
## ПЕРАДВЫБАРНАЯ АГІТАЦЫЯ, АГІТАЦЫЯ ПА РЭФЕРЭНДУМЕ, АДКЛІКАННІ ДЭПУТАТА, ЧЛЕНА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ

### Артыкул 45. Перадвыбарная агітацыя, агітацыя па рэферэндуме, адкліканні дэпутата, члена Савета Рэспублікі

Грамадзянам Рэспублікі Беларусь, палітычным партыям, іншым грамадскім аб'яднанням, працоўным калектывам, давераным асобам кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, ініцыятыўным групам, якія праводзяць агітацыю за выбранне кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, даецца права свабоднага і ўсебаковага абмеркавання перадвыбарных праграм кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, іх палітычных, дзелавых і асабістых якасцей, правядзення агітацыі за або супраць кандыдата на сходах, мітынгах, у сродках масавай інфармацыі, а таксама падчас сустрэч з выбаршчыкамі.

Выбаршчыкі, ініцыятыўныя групы, давераныя асобы дэпутата маюць права свабодна і ўсебакова абмяркоўваць пытанні, звязаныя з адкліканнем дэпутата, яго дзелавыя і асабістыя якасці, весці агітацыю за або супраць адклікання дэпутата на сходах, мітынгах, у сродках масавай інфармацыі, а таксама падчас сустрэч з выбаршчыкамі.

На пасяджэнні дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў па выбарах членаў Савета Рэспублікі або па адкліканні члена Савета Рэспублікі кожны дэпутат, які ўдзельнічае ў рабоце пасяджэння, мае права свабодна і ўсебакова абмяркоўваць дзелавыя і асабістыя якасці кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі, члена Савета

Рэспублікі, у дачыненні да якога ўзнята пытанне аб адкліканні, весці агітацыю за або супраць вылучаных кандыдатур у члены Савета Рэспублікі, за або супраць адклікання члена Савета Рэспублікі.

Грамадзянам Рэспублікі Беларусь, палітычным партыям, іншым грамадскім аб'яднанням, працоўным калектывам даецца права беспярашкоднай агітацыі за прапанову па правядзенні рэферэндуму, за прыняцце рашэння, вынесенага на рэферэндум, а таксама супраць прапановы па правядзенні рэферэндуму, супраць прыняцця рашэння, вынесенага на рэферэндум.

Замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства не маюць права удзельнічаць ў агітацыі.

Кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты праводзяць сустрэчы са сваімі выбаршчыкамі на сходах або ў іншай зручнай для выбаршчыкаў форме. Па ўзаемнай дамоўленасці кандыдатаў могуць праводзіцца сумесныя сустрэчы з выбаршчыкамі.

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы па ўзгадненні з адпаведнымі выбарчымі камісіямі вызначаюць памяшканні для правядзення сустрэч кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты з выбаршчыкамі, а таксама для перадвыбарных сходаў, якія арганізуюцца выбаршчыкамі. Заявы аб даванні памяшканняў падаюцца кандыдатамі, даверанымі асобамі кандыдатаў, выбаршчыкамі ў адпаведныя тэрытарыяльныя, акруговыя выбарчыя камісіі не пазней чым за два дні да меркаванай даты правядзення мерапрыемства. У заяве ўказваюцца месца (месцы) правядзення сустрэчы, сходу, дата, час пачатку і заканчэння мерапрыемства; прозвішча, імя, імя па бацьку заяўніка, звесткі аб месцы яго жыхарства і нумар тэлефона, дата падачы заявы. Пры немагчымасці даць памяшканне на ўказаныя ў заяве дату і час адпаведная выбарчая камісія не пазней чым на наступны дзень пасля атрымання заявы паведамляе аб гэтым заяўніку і прапаноўвае іншую дату і час правядзення сустрэчы, сходу. Памяшканні для правядзення сустрэч з выбаршчыкамі, перадвыбарных сходаў даюцца бясплатна ў парадку чарговасці паступлення заяў. Тэрытарыяльныя, акруговыя выбарчыя камісіі ў сродках масавай інфармацыі або іншым спосабам інфармуюць выбаршчыкаў аб правядзенні сустрэч з кандыдатамі ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, а таксама аб правядзенні перадвыбарных сходаў, якія арганізуюцца выбаршчыкамі.

Кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты маюць права за кошт сродкаў уласнага выбарчага фонду арандаваць будынкі і памяшканні для правядзення сустрэч з выбаршчыкамі. Будынкі і памяшканні для ўказаных мэт даюцца кандыдатам на роўных умовах.

Кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, іх давераныя асобы ў парадку, вызначаным артыкулам $45^1$ гэтага Кодэкса, могуць праводзіць масавыя мерапрыемствы (сходы па-за памяшканнямі, мітынгі, пікетаванне) з мэтай ажыццяўлення перадвыбарнай агітацыі.

Масавыя мерапрыемствы, мэтай якіх з'яўляецца ажыццяўленне перадвыбарнай агітацыі, агітацыі па рэферэндуме, адкліканні дэпутата, за выключэннем масавых мерапрыемстваў, указаных у частцы дзевятай гэтага артыкула, праводзяцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб масавых мерапрыемствах.

Кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты маюць права выпрабляць агітацыйныя друкаваныя матэрыялы (плакаты, лістоўкі і іншыя матэрыялы) за кошт сродкаў уласных выбарчых фондаў. Агітацыйныя друкаваныя

матэрыялы вырабляюцца пасля папярэдняй аплаты са сродкаў выбарчага фонду кандыдата.

Агітацыйныя друкаваныя матэрыялы павінны выраблядца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Агітацыйныя друкаваныя матэрыялы павінны ўтрымліваць наступныя выпускныя даныя: назву і адрас арганізацыі (індывідуальнага прадпрымальніка), якая вырабіла агітацыйныя друкаваныя матэрыялы, нумар пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі вырабляльніка друкаваных выданняў і дату яго выдачы, тыраж і нумар заказу, прозвішча і ініцыялы заказчыка. Адзін экзэмпляр агітацыйных друкаваных матэрыялаў або іх копіі да распаўсюджвання падаюцца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты адпаведна ў Цэнтральную камісію, тэрытарыяльную, акруговую выбарчую камісію. Забараняецца распаўсюджванне ананімных агітацыйных друкаваных матэрыялаў.

Пры правядзенні выбараў, рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы па ўзгадненні з адпаведнымі камісіямі выдзяляюць на тэрыторыі ўчасткаў для галасавання месцы, якія найбольш наведваюцца грамадзянамі, для размяшчэння агітацыйных друкаваных матэрыялаў. Агітацыйныя друкаваныя матэрыялы ў іншых месцах могуць размяшчацца з дазволу кіраўніка адпаведнай арганізацыі. У выпадку, калі кіраўнік арганізацыі дазволіў размяшчэнне ў арганізацыі агітацыйнага друкаванага матэрыялу аднаму кандыдату, ён не мае права адмовіць іншаму кандыдату ў размяшчэнні агітацыйнага друкаванага матэрыялу на тых жа ўмовах. Выканаўчыя і распарадчыя органы могуць забараняць размяшчэнне агітацыйных друкаваных матэрыялаў у не адведзеных для іх месцах.

Не дапускаюцца зняцце, заклейванне, замазванне, пашкоджанне агітацыйных друкаваных матэрыялаў, калі яны выраблены і размешчаны з захаваннем патрабаванняў заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

На ўсіх участках для галасавання не пазней за 14 дзён да выбараў афармляюцца стэнды з інфармацыйнымі матэрыяламі аб кандыдатах. Стэнды з такімі інфармацыйнымі матэрыяламі захоўваюцца ў памяшканнях для галасавання і ў дзень выбараў. Пры правядзенні рэферэндуму ў памяшканнях для галасавання на бачным месцы павінны быць вывешаны пытанні (праекты рашэнняў), вынесеныя на рэферэндум.

Агітацыя ў дзень галасавання не дапускаецца. Агітацыйныя друкаваныя матэрыялы, раней вывешаныя па-за памяшканнямі для галасавання, захоўваюцца на ранейшых месцах.

**Артыкул $45^1$. Правядзенне масавых мерапрыемстваў, якія арганізуюцца кандыдатамі ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, іх даверанымі асобамі**

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы пасля ўзгаднення з адпаведнымі выбарчымі камісіямі вызначаюць месцы, у якіх кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, іх davераныя асобы ў мэтах перадвыбарнай агітацыі могуць праводзіць масавыя мерапрыемствы (сходы па-за памяшканнямі, мітынгі, пікетаванне) у парадку, устаноўленым гэтым артыкулам.

Для арганізацыі масавага мерапрыемства, указанага ў частцы першай гэтага артыкула, кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, даверaная асоба кандыдата накіроўвае паведамленне ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган, на тэрыторыі якога плануецца яго правядзенне (у г. Мінску паведамленне накіроўваецца ў Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт), не пазней чым за два дні да

меркаванай даты правядзення мерапрыемства. У паведамленні ўказваюцца форма масавага мерапрыемства, месца (месцы) яго правядзення, дата, час пачатку і заканчэння мерапрыемства; прозвішча, імя, імя па бацьку заяўніка, звесткі аб месцы яго жыхарства і нумар тэлефона, дата падачы паведамлення. Калі ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган раней паступіла паведамленне ад іншага кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, даверанай асобы аб правядзенні ў тым жа месцы і ў той жа час масавага мерапрыемства і адсутнічае дамоўленасць аб правядзенні сумеснага масавага мерапрыемства, мясцовы выканаўчы і распарадчы орган абавязаны не пазней чым на наступны дзень пасля атрымання паведамлення давесці да ведама заяўніка прапанову аб змяненні месца і (або) часу правядзення масавага мерапрыемства.

Масавыя мерапрыемствы, указаныя ў частцы першай гэтага артыкула, могуць праводзіцца з 8 да 22 гадзін.

Забеспячэнне грамадскага парадку і бяспекі грамадзян пры правядзенні масавага мерапрыемства ўскладаецца на мясцовы выканаўчы і распарадчы орган і органы ўнутраных спраў. Кандыдаты, іх давераныя асобы абавязаны садзейнічаць забеспячэнню грамадскага парадку.

Масавае мерапрыемства, а таксама падрыхтоўка да яго павінны быць спынены па патрабаванні кіраўніка або намесніка кіраўніка адпаведнага мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, органа ўнутраных спраў у выпадках:

невыканання кандыдатам, даверанай асобай патрабаванняў, прадугледжаных часткамі другой і трэцяй гэтага артыкула;

узнікнення небяспекі для жыцця і здароўя грамадзян.

**Артыкул 46. Выкарыстанне сродкаў масавай інфармацыі ў передвыбарнай кампаніі, пры правядзенні рэферэндуму**

Кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, у дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў, палітычныя партыі, іншыя грамадскія аб'яднанні, працоўныя калектывы, грамадзяне, якія вылучылі кандыдатаў, з часу рэгістрацыі кандыдатаў на роўных правах карыстаюцца дзяржаўнымі сродкамі масавай інфармацыі.

Дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі, сродкі масавай інфармацыі, якія часткова фінансуюцца з рэспубліканскага або мясцовага бюджэтаў, а таксама сродку масавай інфармацыі, адным з заснавальнікаў якіх выступаюць дзяржаўныя органы або арганізацыі, абавязаны забяспечваць роўныя магчымасці для передвыбарных выступленняў кандыдатаў, апублікавання і абнародавання пытанняў, тэкстаў законапраектаў, вынесеных на рэферэндум, правядзення агітацыі па выбарах, рэферэндуме.

Інфармацыйныя матэрыялы аб кандыдатах у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, якія распаўсюджваюцца ў сродках масавай інфармацыі, павінны быць аб'ектыўнымі і дакладнымі, у іх не павінна аддавацца перавага асобным кандыдатам.

Кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў мае права бясплатна апублікаваць у сродках масавай інфармацыі, указаных у частцы другой гэтага артыкула, сваю передвыбарную праграму, прадставіўшы тэкст праграмы не пазней чым за 20 дзён да выбараў. Аб'ём передвыбарнай праграмы, якая бясплатна публікуецца ў сродках масавай інфармацыі, кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь не можа перавышаць пяці

машынапісных старонак, кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў – двух машынапісных старонак.

Пералік сродкаў масавай інфармацыі, у якіх бясплатна публікуюцца передвыбарныя праграмы кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, вызначае Цэнтральная камісія.

Пры апублікаванні передвыбарных праграм кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў захоўваецца чарговасць іх паступлення.

Кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў маюць права на бясплатныя выступленні па дзяржаўным тэлебачанні, а таксама па радыёвяшчанні. Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь на працягу 10 дзён пасля прызначэння выбараў падае ў Цэнтральную камісію ліміт часу для выступленняў кандыдатаў па дзяржаўным тэлебачанні, а таксама па радыёвяшчанні. Указаны эфірны час павінны прыпадаць на перыяд, калі тэле- і радыёпраграмы збіраюць найбольшую аўдыторыю.

Парадак і колькасць выступленняў кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным тэлебачанні, а таксама па радыёвяшчанні ўстанаўлівае Цэнтральная камісія. Выступленні кандыдатаў забяспечваюцца на роўных падставах.

Цэнтральная камісія рэзервуе частку ліміту часу, указанага ў частцы сёмай гэтага артыкула, для правядзення тэледэбатаў кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Тэледэбаты праводзяцца са згоды кандыдатаў. Кандыдат мае права ўпаўнаважыць для ўдзелу ў тэледэбатах даверанную асобу. Няўдзел кандыдата ў тэледэбатах не цягне за сабой павелічэння аб'ёму эфірнага часу, які даецца кандыдату бясплатна.

Кандыдат у дэпутаты абласнога, Мінскага гарадскога, раённага, гарадскога (горада абласнога падпарадкавання) Савета дэпутатаў мае права на адно бясплатнае выступленне па мясцовым дзяржаўным радыёвяшчанні. Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь, абласныя, раённыя, гарадскія (гарадоў абласнога падпарадкавання) органы радыёвяшчання не пазней за 30 дзён да выбараў падаюць у абласныя, Мінскую гарадскую, раённыя, гарадскія (у гарадах абласнога падпарадкавання) тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі ліміт часу для выступленняў кандыдатаў у дэпутаты па мясцовым радыёвяшчанні, якія вызначаюць час для выступленняў кандыдатаў у дэпутаты. Выступленні кандыдатаў у дэпутаты забяспечваюцца на роўных падставах.

Журналістам, службовым асобам сродкаў масавай інфармацыі забараняецца весці тэле- і радыёпраграмы, удзельнічаць у асвятленні выбараў праз сродкі масавай інфармацыі, калі ўказаныя асобы з'яўляюцца кандыдатамі ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, у дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў або іх даверанымі асобамі.

Сродкі масавай інфармацыі асвятляюць падрыхтоўку і правядзенне выбараў, рэферэндумаў. Інфармацыя аб пасяджэннях Цэнтральнай камісіі і яе рашэнні публікуюцца ў рэспубліканскім друку, а выбарчых камісій, камісій па рэферэндуме – у мясцовым друку.

Дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі абавязаны па патрабаванні Цэнтральнай камісіі даваць ёй магчымасць перадаваць інфармацыю аб ходзе выбарчай кампаніі, падрыхтоўкі да рэспубліканскага рэферэндуму.

На працягу апошніх пяці дзён да выбараў, рэферэндуму не дапускаецца апублікаванне вынікаў апытанняў грамадскага меркавання, звязаных з выбарамі, рэферэндумам, прагнозам іх вынікаў.

**Артыкул 47. Абмежаванні пры правядзенні передвыбарнай агітацыі, агітацыі па рэферэндуме**

Забараняецца агітацыя, пры правядзенні якой прапагандуецца вайна, утрымліваюцца заклікі да гвалтоўнага змянення канстытуцыйнага ладу, парушэння тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь, знявагі і паклёп у адносінах да службовых асоб Рэспублікі Беларусь, кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, а таксама заклікі, якія схіляюць або якія маюць сваёй мэтай схіленне да зрыву, або адмены, або пераносу тэрміну выбараў, рэферэндуму, прызначаных у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Забараняюцца агітацыя або прапаганда сацыяльнай, расавай, нацыянальнай, рэлігійнай або моўнай перавагі, выпуск і распаўсюджванне паведамленняў і матэрыялаў, якія выклікаюць сацыяльную, расавую, нацыянальную або рэлігійную варожасць.

Кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, іх давераным асобам, іншым грамадзянам і арганізацыям пры правядзенні імі передвыбарнай агітацыі, агітацыі па рэферэндуме забараняецца раздаваць грашовыя сродкі, падарункі і іншыя матэрыяльныя каштоўнасці, праводзіць ільготны распродаж тавараў, бясплатна даваць любыя паслугі і тавары, за выключэннем агітацыйных друкаваных матэрыялаў, спецыяльна вырабленых з захаваннем патрабаванняў гэтага Кодэкса для выбарчай кампаніі, правядзення рэферэндуму. Пры правядзенні передвыбарнай агітацыі, агітацыі па рэферэндуме забараняецца ўздзейнічаць на грамадзян абяцаннямі перадачы ім грашовых сродкаў, матэрыяльных каштоўнасцей.

Забараняецца агітацыя за кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, якая аплачваецца са сродкаў выбарчых фондаў іншых кандыдатаў.

Пры парушэнні патрабаванняў гэтага артыкула адпаведныя камісіі прымаюць меры для стрыманні парушэнняў, а Цэнтральная камісія, тэрытарыяльная, акруговая выбарчая камісія мае права таксама адмяніць рашэнне аб рэгістрацыі кандыдата.

## ГЛАВА 11
## ФІНАНСАВАННЕ ВЫБАРАЎ, РЭФЕРЭНДУМУ, АДКЛІКАННЯ ДЭПУТАТА, ЧЛЕНА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ

**Артыкул 48. Расходы на падрыхтоўку і правядзенне выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата, члена Савета Рэспублікі**

Расходы на падрыхтоўку і правядзенне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, членаў Савета Рэспублікі, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, рэспубліканскага рэферэндуму, адкліканне дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі ажыццяўляюцца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Расходы на гэтыя мэты могуць ажыццяўляцца таксама за кошт сродкаў арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў і грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія могуць уносіць свае грашовыя сродкі ў пазабюджэтны фонд, які стварае Цэнтральная камісія для дадатковага фінансавання расходаў на падрыхтоўку і правядзенне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, рэспубліканскага рэферэндуму. Для фінансавання расходаў на передвыбарную агітацыю кандыдаты ў

Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты маюць права ствараць уласныя выбарчыя фонды.

Расходы на падрыхтоўку і правядзенне мясцовага рэферэндуму, паўторных выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў і выбараў дэпутатаў замест выбылых, адкліканне дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў ажыццяўляюцца за кошт сродкаў мясцовага бюджэту ў парадку, устаноўленым адпаведным мясцовым Саветам дэпутатаў.

Расходы на падрыхтоўку і правядзенне мясцовага рэферэндуму могуць ажыццяўляцца таксама за кошт сродкаў арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў, размешчаных на тэрыторыі адпаведнага мясцовага Савета дэпутатаў, і грамадзян, што пражываюць на гэтай тэрыторыі, якія могуць уносіць свае грашовыя сродкі ў пазабюджэтны фонд, што ствараецца мясцовым Саветам дэпутатаў, які прызначыў рэферэндум.

Парадак размеркавання і выкарыстання грашовых сродкаў, выдзеленых на падрыхтоўку і правядзенне выбараў, рэспубліканскага рэферэндуму, адклікання дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі з рэспубліканскага бюджэту і добраахвотна ўнесеных у пазабюджэтны фонд, устанаўлівае Цэнтральная камісія.

Цэнтральная камісія інфармуе Палату прадстаўнікоў аб расходаванні выдзеленых з рэспубліканскага бюджэту сродкаў на падрыхтоўку і правядзенне выбараў, рэспубліканскага рэферэндуму не пазней за шэсць месяцаў з дня выбрання Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, правядзення галасавання па рэферэндуме, адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі, а таксама публікуе справаздачу аб расходаванні сродкаў пазабюджэтнага фонду.

Дзяржаўныя органы, іншыя арганізацыі даюць бясплатна ў распараджэнне камісій неабходныя для падрыхтоўкі і правядзення выбараў, рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата, члена Савета Рэспублікі памяшканні, абсталяванне, сродкі сувязі (акрамя аплаты выдаткаў па абанентнай плаце і за перамовы), а таксама транспартныя сродкі (з аплатай выдаткаў камісіямі за кошт выдзеленых сродкаў).

Дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі, сродкі масавай інфармацыі, якія часткова фінансуюцца з рэспубліканскага або мясцовага бюджэту, а таксама сродкі масавай інфармацыі, адным з заснавальнікаў якіх выступаюць дзяржаўныя органы або арганізацыі, бясплатна абнародуюць матэрыялы, прадстаўленыя камісіямі, і передвыбарныя праграмы кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў.

Палітычныя партыі, іншыя грамадскія аб'яднанні, іншыя арганізацыі, грамадзяне Рэспублікі Беларусь не маюць права аказваць іншую матэрыяльную дапамогу пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў, рэферэндуму, акрамя ўнясення грашовых сродкаў у пазабюджэтны фонд і ў выбарчыя фонды кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, прадугледжаныя часткай першай гэтага артыкула.

Забараняюцца прамы або ўскосны ўдзел у фінансаванні і іншая матэрыяльная дапамога замежных дзяржаў і арганізацый, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, міжнародных арганізацый, арганізацый, заснавальнікамі (удзельнікамі, уласнікамі маёмасці) якіх з'яўляюцца замежныя дзяржавы, замежныя арганізацыі, міжнародныя арганізацыі, замежныя грамадзяне і асобы без

грамадзянства, пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата, члена Савета Рэспублікі.

Выкарыстанне асобай, якая вылучаецца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, або кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты грашовых сродкаў або іншай матэрыяльнай дапамогі ў парушэнне патрабаванняў часткі дзявятай гэтага артыкула цягне за сабой адпаведна адмову ў рэгістрацыі кандыдата або адмену рашэння аб яго рэгістрацыі.

**Артыкул 48[1]. Выбарчыя фонды кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты**

Кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты маюць права ствараць уласныя выбарчыя фонды для фінансавання расходаў на передвыбарную агітацыю.

Выбарчыя фонды кандыдатаў могуць фарміравацца за кошт наступных грашовых сродкаў:

1) уласных грашовых сродкаў кандыдата, памер якіх не можа перавышаць гранічную суму ўсіх расходаў са сродкаў выбарчага фонду кандыдата, указаную ў частцы трэцяй гэтага артыкула;

2) добраахвотных ахвяраванняў грамадзян Рэспублікі Беларусь. Памер ахвяравання грамадзяніна не можа перавышаць 20 базавых велічынь пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, 5 базавых велічынь пры правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, 2 базавыя велічыні пры правядзенні выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў;

3) добраахвотных ахвяраванняў юрыдычных асоб. Памер ахвяравання юрыдычнай асобы не можа перавышаць 50 базавых велічынь пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, 10 базавых велічынь пры правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, 5 базавых велічынь пры правядзенні выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў.

Гранічная сума ўсіх расходаў са сродкаў выбарчага фонду кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь не можа перавышаць 9000 базавых велічынь, кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў – 1000 базавых велічынь, кандыдата ў дэпутаты абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў – 30 базавых велічынь, кандыдата ў дэпутаты раённага, гарадскога (горада абласнога і раённага падпарадкавання), пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў – 10 базавых велічынь.

Забараняецца ўносіць ахвяраванні ў выбарчыя фонды кандыдатаў:

1) замежным дзяржавам і арганізацыям;

2) замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства;

3) міжнародным арганізацыям;

4) арганізацыям, заснавальнікамі (удзельнікамі, уласнікамі маёмасці) якіх з'яўляюцца замежныя дзяржавы, замежныя арганізацыі, міжнародныя арганізацыі, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства;

4[1]) арганізацыям, якія атрымлівалі на працягу года, што папярэднічае дню ўнясення ахвяравання, замежную бязвыплатную дапамогу ад замежных дзяржаў, замежных арганізацый, міжнародных арганізацый, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, а таксама ад ананімных ахвяравальнікаў, калі атрыманая гэтымі арганізацыямі замежная бязвыплатная дапамога не была імі вернута замежным дзяржавам, замежным арганізацыям, міжнародным арганізацыям, замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства, якія далі яе, або ў выпадку немагчымасці

звароту не была пералічана (перададзена) у даход дзяржавы да дня ўнясення ахвяравання ў выбарчыя фонды;

5) грамадзянам Рэспублікі Беларусь, якія не дасягнулі 18 гадоў;

6) дзяржаўным органам і органам мясцовага самакіравання;

7) арганізацыям, якія поўнасцю або часткова фінансуюцца з бюджэту;

$7^1$) арганізацыям, зарэгістраваным ва ўстаноўленым парадку менш чым за адзін год да дня ўнясення ахвяравання;

8) дабрачынным і рэлігійным арганізацыям;

9) ананімным ахвяравальнікам.

Для фарміравання ўласнага выбарчага фонду кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты адкрывае ў падраздзяленні адкрытага акцыянернага таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк» спецыяльны выбарчы рахунак. Падставай для адкрыцця рахунку з'яўляюцца заява кандыдата і копія рашэння Цэнтральнай камісіі, тэрытарыяльнай, акруговай выбарчай камісіі аб рэгістрацыі кандыдата.

Кандыдат мае права прызначыць свайго прадстаўніка па фінансавых пытаннях. Прадстаўніка кандыдата па фінансавых пытаннях рэгіструе Цэнтральная камісія, тэрытарыяльная, акруговая выбарчая камісія на падставе заявы кандыдата. У заяве ўказваюцца прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, месца жыхарства прадстаўніка па фінансавых пытаннях, серыя, нумар і дата выдачы пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Адпаведная камісія ў трохдзённы тэрмін з дня паступлення заявы рэгіструе прадстаўніка па фінансавых пытаннях і выдае яму пасведчанне. Прадстаўнік кандыдата па фінансавых пытаннях мае права адкрыць спецыяльны выбарчы рахунак, распараджацца сродкамі, якія знаходзяцца на гэтым рахунку, і прадстаўляць справаздачы аб паступленні і расходаванні сродкаў. Кандыдат мае права ў любы час адклікаць прадстаўніка па фінансавых пытаннях, паведаміўшы аб гэтым адпаведна ў Цэнтральную камісію, тэрытарыяльную, акруговую выбарчую камісію, а таксама ў падраздзяленне банка, у якім кандыдат адкрыў спецыяльны выбарчы рахунак.

Кандыдат мае права адкрыць толькі адзін спецыяльны выбарчы рахунак. Парадак адкрыцця рахунку, правядзення аперацый па рахунку, закрыцця рахунку вызначае Цэнтральная камісія па ўзгадненні з адкрытым акцыянерным таварыствам «Ашчадны банк «Беларусбанк». Плата за паслугі банка пры адкрыцці рахунка і правядзенні аперацый па рахунку не збіраецца. За карыстанне грашовымі сродкамі, якія знаходзяцца на спецыяльным выбарчым рахунку, працэнты банкам не выплачваюцца. Цэнтральная камісія, тэрытарыяльная, акруговая выбарчая камісія накіроўвае ў друк для апублікавання інфармацыю аб адкрыцці спецыяльных выбарчых рахункаў кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты.

Пры ўнясенні ахвяравання на спецыяльны выбарчы рахунак кандыдата грамадзянін указвае ў плацежным дакуменце наступныя звесткі аб сабе: прозвішча, імя, імя па бацьку, дату нараджэння і месца жыхарства, серыю і нумар пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Добраахвотныя ахвяраванні юрыдычных асоб ажыццяўляюцца ў безнаяўным парадку шляхам пералічэння грашовых сродкаў на спецыяльны выбарчы рахунак, пры гэтым у плацежным даручэнні ўказваюцца наступныя звесткі аб юрыдычнай асобе: уліковы нумар плацельшчыка, назва, банкаўскія рэквізіты, юрыдычны адрас.

Права распараджацца сродкамі выбарчых фондаў належыць кандыдатам, якія іх стварылі.

Кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты могуць выкарыстоўваць сродкі выбарчых фондаў для аплаты выдаткаў, непасрэдна звязаных з правядзеннем перадвыбарнай агітацыі, у парадку, які ўстанаўлівае Цэнтральная камісія.

Кандыдат мае права вярнуць ахвяравальніку любое ахвяраванне ў выбарчы фонд, за выключэннем ахвяравання, унесенага ананімным ахвяравальнікам. Калі добраахвотнае ахвяраванне паступіла ў выбарчы фонд ад ахвяравальніка, які не мае права ажыццяўляць такое ахвяраванне, або ахвяраванне было ўнесена ў памеры, які перавышае памер, прадугледжаны часткай другой гэтага артыкула, кандыдат абавязаны не пазней чым у сямідзённы тэрмін з дня паступлення ахвяравання на спецыяльны выбарчы рахунак вярнуць гэта ахвяраванне адпаведна поўнасцю або тую яго частку, якая перавышае вызначаны максімальны памер ахвяравання, ахвяравальніку з указаннем прычыны вяртання.

Паступленне і выкарыстанне сродкаў выбарчых фондаў кантралююць Цэнтральная камісія, тэрытарыяльныя, акруговыя выбарчыя камісіі і фінансавыя органы.

Падраздзяленне банка, у якім адкрыты спецыяльны выбарчы рахунак, штотыднёва падае ў камісію, якая зарэгістравала кандыдата, звесткі аб паступленні і расходаванні сродкаў, якія знаходзяцца на рахунку адпаведнага кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты. Адпаведная камісія ў двухдзённы тэрмін пасля атрымання звестак накіроўвае ў друк для апублікавання інфармацыю аб агульнай суме сродкаў, якія паступілі ў выбарчы фонд, і аб агульнай суме зрасходаваных сродкаў.

Кандыдаты абавязаны прадстаўляць у камісію, якая зарэгістравала іх, фінансавыя справаздачы з наступнай перыядычнасцю: першая фінансавая справаздача – не раней чым за 15 і не пазней чым за 10 дзён да дня выбараў; падрахункавая фінансавая справаздача – не пазней чым у пяцідзённы тэрмін з дня выбараў.

У выпадку адмены рашэння аб рэгістрацыі кандыдата або зняцця ім сваёй кандыдатуры адпаведная камісія пісьмова інфармуе аб гэтым падраздзяленне банка, якое спыняе ўсе аперацыі па спецыяльным выбарчым рахунку кандыдата.

Усе банкаўскія аперацыі па спецыяльным выбарчым рахунку, за выключэннем звароту ў выбарчы фонд незрасходаваных сродкаў і залічэння на ўказаны рахунак сродкаў, пералічаных да дня выбараў, спыняюцца ў дзень выбараў.

Незрасходаваныя грашовыя сродкі, якія знаходзяцца на спецыяльным выбарчым рахунку, кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты не пазней чым у трохдзённы тэрмін з дня выбараў абавязаны пералічыць грамадзянам і юрыдычным асобам, якія ажыццявілі ахвяраванні ў яго выбарчы фонд, прапарцыянальна ўкладзеным сродкам. Пасля сканчэння ўказанага тэрміну падраздзяленне банка, у якім адкрыты спецыяльны выбарчы рахунак, абавязана пералічыць грашовыя сродкі, якія засталіся на гэтым рахунку, у даход рэспубліканскага бюджэту. На падставе хадайніцтва кандыдата Цэнтральная камісія, тэрытарыяльная, акруговая выбарчая камісія могуць прадоўжыць тэрмін правядзення аперацый па спецыяльным выбарчым рахунку.

Кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты ў тэрмін, указаны ў частцы чатырнаццатай гэтага артыкула, абавязаны падаць у камісію, якая зарэгістравала яго, фінансавую справаздачу аб памеры і ўсіх крыніцах стварэння свайго выбарчага фонду, а таксама аб усіх праведзеных выдатках. Да справаздачы

прыкладаюцца першасныя фінансавыя дакументы, якія пацвярджаюць паступленне, зварот і расходаванне сродкаў выбарчага фонду, даведкі аб сродках, якія засталіся і (або) аб закрыцці спецыяльнага выбарчага рахунку кандыдата. Указаны парадак распаўсюджваецца таксама на асоб, у дачыненні якіх былі адменены рашэнні аб рэгістрацыі іх кандыдатамі, і на асоб, якія знялі свае кандыдатуры да дня выбараў.

У выпадку правядзення другога тура галасавання пры выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аперацыі па аплаце выдаткаў са спецыяльных выбарчых рахункаў кандыдатаў, па якіх праводзіцца другі тур галасавання, аднаўляюцца ў дзень прызначэння Цэнтральнай камісіяй другога туру галасавання і спыняюцца ў дзень другога туру галасавання.

Асоба, якая вылучаецца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, для аплаты выдаткаў і паслуг, звязаных са зборам подпісаў выбаршчыкаў, у тым ліку для аплаты працы членаў ініцыятыўнай групы грамадзян па вылучэнні кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, мае права стварыць уласны выбарчы фонд і выкарыстоўваць сродкі гэтага фонду ў адпаведнасці з патрабаваннямі, прадугледжанымі гэтым артыкулам.

Для адкрыцця спецыяльнага выбарчага рахунку асоба, якая вылучаецца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, падае ў падраздзяленне адкрытага акцыянернага таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк» заяву і копію рашэння Цэнтральнай камісіі аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы грамадзян па вылучэнні яго кандыдатам.

Інфармаванне выбаршчыкаў аб агульнай суме сродкаў, што паступілі ў выбарчы фонд, і аб агульнай суме зрасходаваных сродкаў асобай, якая вылучаецца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляецца ў парадку, прадугледжаным часткай трынаццатай гэтага артыкула.

Асоба, якая вылучаецца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь і якая адкрыла спецыяльны выбарчы рахунак, пасля рэгістрацыі яе кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь працягвае карыстацца гэтым жа рахункам, падаўшы ў падраздзяленне банка копію рашэння Цэнтральнай камісіі аб рэгістрацыі кандыдатам. Агульная сума ўсіх выдаткаў са сродкаў дадзенага выбарчага фонду ў перыяд вылучэння кандыдатам і правядзення перадвыбарнай агітацыі не павінна перавышаць гранічную суму расходаў, указаную ў частцы трэцяй гэтага артыкула.

Асоба, якая вылучаецца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, абавязана не пазней чым на пяты дзень пасля заканчэння тэрміну вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь падаць у Цэнтральную камісію фінансавую справаздачу.

## ГЛАВА 12
## АДКАЗНАСЦЬ ЗА ПАРУШЭННЕ ПАТРАБАВАННЯЎ ГЭТАГА КОДЭКСА. РАЗГЛЯД ЗВАРОТАЎ

### Артыкул 49. Адказнасць за парушэнне патрабаванняў гэтага Кодэкса

Асобы, якія перашкаджаюць свабоднаму ажыццяўленню грамадзянінам Рэспублікі Беларусь права свабодна выбіраць і быць выбраным, удзельнічаць у рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутата, якія распаўсюджваюць заклікі, што схіляюць або маюць сваёй мэтай схіліць да зрыву, або адмены, або пераносу тэрміну выбараў, рэферэндуму, да адмовы ад здзяйснення выбарчых дзеянняў, якія перашкаджаюць рабоце камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь,

выбарчых камісій, камісій па рэферэндуме, камісій па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата, якія займаюцца агітацыяй у дзень выбараў, рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата, а таксама члены камісій, службовыя асобы дзяржаўных органаў і грамадскіх аб'яднанняў і іншыя асобы, якія здзейснілі падлог дакументаў па выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата, яўна няправільны падлік галасоў або іншае скажэнне вынікаў галасавання, якія парушылі тайну галасавання, якія не прадставілі камісіям неабходныя дакументы, або не выканалі іх рашэнні, або якія дапусцілі незаконнае выкарыстанне грашовых сродкаў і матэрыяльных рэсурсаў пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата, члена Савета Рэспублікі, або якія здзейснілі іншыя парушэнні патрабаванняў гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата і члена Савета Рэспублікі, нясуць адказнасць, устаноўленую заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

У выпадку распаўсюджвання лжывых звестак пра кандыдата Цэнтральная камісія або адпаведная тэрытарыяльная, акруговая камісія мае права па пісьмовым звароце кандыдата прыняць рашэнне аб даванні яму магчымасці выступіць публічна з абвяржэннем ілжывых звестак.

Пры парушэнні асобай, якая вылучаецца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, або кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, яго даверанай асобай або ініцыятыўнай групай грамадзян па зборы подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку асобы, якая прапануецца для вылучэння кандыдатам, і правядзенні агітацыі за яго выбранне патрабаванняў гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах асоба, якая вылучаецца кандыдатам, кандыдат, ініцыятыўная група папярэджваюцца адпаведнай тэрытарыяльнай, акруговай камісіяй або Цэнтральнай камісіяй, а ў выпадку паўторнага парушэння патрабаванняў гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах адпаведная тэрытарыяльная, акруговая камісія або Цэнтральная камісія могуць адмовіць у рэгістрацыі або адмяніць рашэнне аб рэгістрацыі кандыдата.

Адмова ў рэгістрацыі кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты і адмена рашэння аб рэгістрацыі кандыдата за парушэнне патрабаванняў гэтага Кодэкса ажыццяўляюцца ў выпадках і парадку, прадугледжаных артыкуламі $68^1$ і $70^1$ гэтага Кодэкса.

Рашэнне Цэнтральнай камісіі аб вынясенні папярэджання асобе, якая вылучаецца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, або ініцыятыўнай групе, або кандыдату ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты можа быць абскарджана асобай, якая вылучаецца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь у трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння. Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін, яго рашэнне з'яўляецца канчатковым.

Рашэнне акруговай выбарчай камісіі аб вынясенні папярэджання асобе, якая вылучаецца кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, або ініцыятыўнай групе або кандыдату ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў можа быць абскарджана асобай, якая вылучаецца кандыдатам у дэпутаты, кандыдатам у дэпутаты ў адпаведную абласную, Мінскую гарадскую тэрытарыяльную выбарчую камісію ў трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння, а рашэнне абласной, Мінскай гарадской тэрытарыяльнай выбарчай камісіі ў той жа тэрмін можа быць абскарджана ў

абласны, Мінскі гарадскі суд. Суд разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін, яго рашэнне з'яўляецца канчатковым.

Рашэнне акруговай, тэрытарыяльнай выбарчай камісіі аб вынясенні папярэджання асобе, якая вылучаецца кандыдатам у дэпутаты мясцовага Савета дэпутатаў, або ініцыятыўнай групе, або кандыдату ў дэпутаты можа быць абскарджана асобай, якая вылучаецца кандыдатам у дэпутаты, кандыдатам у дэпутаты ў вышэйстаячую тэрытарыяльную выбарчую камісію ў трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння, а рашэнне вышэйстаячай тэрытарыяльнай выбарчай камісіі ў той жа тэрмін можа быць абскарджана адпаведна ў абласны, Мінскі гарадскі, раённы суд. Суд разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін, яго рашэнне з'яўляецца канчатковым.

У выпадку вынясення папярэджання асобе, якая вылучаецца кандыдатам у дэпутаты, або ініцыятыўнай групе, або кандыдату ў дэпутаты абласной, Мінскай гарадской тэрытарыяльнай выбарчай камісіяй рашэнне аб гэтым можа быць абскарджана асобай, якая вылучаецца кандыдатам у дэпутаты, кандыдатам у дэпутаты ў Цэнтральную камісію ў трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння. Рашэнне Цэнтральнай камісіі абскарджваецца ў парадку і ў тэрмін, прадугледжаныя часткай пятай гэтага артыкула.

**Артыкул 49$^{1}$. Парадак і тэрміны разгляду зваротаў аб парушэнні заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата, члена Савета Рэспублікі**

Звароты аб парушэнні заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата, члена Савета Рэспублікі падаюцца ў камісіі, дзяржаўныя органы і арганізацыі не пазней чым у дзесяцідзённы тэрмін з дня выбараў, рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата, члена Савета Рэспублікі, калі іншыя тэрміны не ўстаноўлены гэтым Кодэксам. Звароты, пададзеныя пасля сканчэння ўстаноўленых тэрмінаў, пакідаюцца без разгляду па сутнасці, аб чым паведамляецца заяўнікам.

Зварот падаецца грамадзянінам або яго прадстаўніком, які ажыццяўляе свае паўнамоцтвы на падставе натарыяльна засведчанай даверанасці або даверанасці, засведчанай у парадку, устаноўленым пунктам 3 і часткай першай пункта 4 артыкула 186 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Звароты, указаныя ў частцы першай гэтага артыкула, якія паступілі ў камісіі, дзяржаўныя органы і арганізацыі, разглядаюцца ў трохдзённы тэрмін з дня паступлення звароту, а звароты, звязаныя з рэалізацыяй грамадзянамі выбарчага права, права на ўдзел у рэферэндуме, якія паступілі ў дзень выбараў, рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата, члена Савета Рэспублікі, – неадкладна. Звароты, у якіх утрымліваюцца звесткі, што патрабуюць праверкі, разглядаюцца не пазней чым у дзесяцідзённы тэрмін з дня паступлення.

Заяўнік мае права знаёміцца з матэрыяламі, звязанымі з разглядам яго звароту.

Скаргі на рашэнні камісій разглядаюцца на пасяджэннях камісій. Аб даце, часе і месцы правядзення пасяджэння паведамляецца заяўніку, які мае права прысутнічаць пры разглядзе скаргі.

Камісія, разгледзеўшы скаргу, прымае адно з наступных рашэнняў:

адмяніць рашэнне, якое абскарджваецца, поўнасцю або ў частцы і прыняць рашэнне па сутнасці;

адмовіць у задавальненні скаргі;

пакінуць скаргу без разгляду, калі заяўнікам не захаваны тэрміны, або парадак падачы скаргі, устаноўленыя гэтым Кодэксам.

Вышэйстаячая камісія мае права пры неабходнасці разгледзець зварот па пытанні, якое адносіцца да кампетэнцыі ніжэйстаячай камісіі.

## ГЛАВА 13
## ПАРАДАК ГАЛАСАВАННЯ ПРЫ ПРАВЯДЗЕННІ ВЫБАРАЎ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ, ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ, РЭФЕРЭНДУМУ, АДКЛІКАННЯ ДЭПУТАТАЎ

**Артыкул 50. Час і месца галасавання**

Пры выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, правядзенні рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата галасаванне праводзіцца з 8 да 20 гадзін. Участковыя камісіі не пазней чым за 10 дзён да выбараў, рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата апавяшчаюць выбаршчыкаў, удзельнікаў рэферэндуму аб дні выбараў, рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата, часе і месцы галасавання, нумары тэлефона камісіі, а таксама накіроўваюць выбаршчыкам інфармацыю аб кандыдатах у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, прадстаўленую адпаведна Цэнтральнай камісіяй, тэрытарыяльнай, акруговай выбарчай камісіяй.

На ўчастках для галасавання, утвораных у воінскіх часцях, санаторыях, прафілакторыях, дамах адпачынку, бальніцах і іншых арганізацыях аховы здароўя, якія аказваюць медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах, участковыя камісіі могуць аб’явіць галасаванне закончаным і раней за 20 гадзін, калі прагаласавалі ўсе выбаршчыкі, удзельнікі рэферэндуму, уключаныя ў спіс.

**Артыкул 51. Арганізацыя галасавання на ўчастку для галасавання**

Галасаванне праводзіцца ў спецыяльна адведзеных памяшканнях, у якіх павінны быць абсталяваны ў дастатковай колькасці кабіны або пакоі для тайнага галасавання, вызначаны месцы выдачы бюлетэняў і пастаўлены скрынкі для галасавання. Скрынкі для галасавання ставяцца такім чынам, каб асобы, якія галасуюць, пры падыходзе да іх абавязкова праходзілі праз кабіны або пакоі для тайнага галасавання. Скрынкі для галасавання павінны знаходзіцца ў полі зроку членаў участковай камісіі і асоб, указаных у частцы чацвёртай артыкула 13 гэтага Кодэкса.

Адказнасць за арганізацыю галасавання, забеспячэнне тайны волевыяўлення выбаршчыкаў, удзельнікаў рэферэндуму, абсталяванне памяшканняў і падтрыманне ў іх неабходнага парадку нясе ўчастковая камісія.

У дзень выбараў, рэферэндуму, правядзення галасавання аб адкліканні дэпутата перад пачаткам галасавання скрынкі для галасавання правяраюцца, пламбіруюцца або апячатваюцца старшынёй участковай камісіі ў прысутнасці не менш за дзве трэці складу камісіі.

**Артыкул 52. Правядзенне галасавання на ўчастку для галасавання**

Кожны выбаршчык, удзельнік рэферэндуму галасуе асабіста, галасаванне за іншых асоб не дапускаецца.

Бюлетэнь для галасавання выдаецца выбаршчыку, удзельніку рэферэндуму членам участковай камісіі на падставе спіса грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутата, пасля прад'яўлення пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь або іншага дакумента, які вызначаецца Цэнтральнай камісіяй. Пры атрыманні бюлетэня выбаршчык, удзельнік рэферэндуму распісваецца ў адпаведнай графе ўказанага спіса.

Асоба, якая галасуе, запаўняе бюлетэнь у кабіне або пакоі для тайнага галасавання. Пры запаўненні бюлетэня забараняецца прысутнасць каго б там ні было, акрамя асобы, якая галасуе.

Выбаршчык, удзельнік рэферэндуму, які не мае магчымасці самастойна запоўніць бюлетэнь, мае права запрасіць у кабіну або пакой для тайнага галасавання іншую асобу па сваім меркаванні, акрамя членаў участковай і вышэйстаячых камісій, кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, іх давераных асоб, а таксама асоб, указаных у частцы чацвёртай артыкула 13 гэтага Кодэкса.

Пры галасаванні на выбарах выбаршчык ставіць любы знак у пустым квадраце, размешчаным справа ад прозвішча таго кандыдата, за якога ён галасуе. Калі выбаршчык галасуе супраць усіх кандыдатаў, ён ставіць любы знак у пустым квадраце, размешчаным справа ад радка «Супраць усіх кандыдатаў». Пры галасаванні на рэферэндуме, калі ўдзельнік рэферэндуму галасуе за прыняцце вынесенага на рэферэндум пытання (праекта рашэння), ён ставіць любы знак у квадраце пад словам «за», а калі галасуе супраць вынесенага на рэферэндум пытання (праекта рашэння), то ставіць любы знак у квадраце пад словам «супраць». Выбаршчык, які галасуе за адкліканне дэпутата, ставіць любы знак у квадраце пад словамі «за адкліканне», а які галасуе супраць адклікання дэпутата, ставіць любы знак у квадраце пад словамі «супраць адклікання».

Калі ў бюлетэнь унесена прозвішча толькі аднаго кандыдата, то пры галасаванні за кандыдата выбаршчык ставіць любы знак у квадраце пад словам «за», а пры галасаванні супраць кандыдата ставіць любы знак у квадраце пад словам «супраць».

Запоўнены бюлетэнь выбаршчык, удзельнік рэферэндуму апускае ў скрынку для галасавання.

У выпадку правядзення адначасова двух і болей рэферэндумаў асоба, якая галасуе, атрымлівае і запаўняе бюлетэнь па кожным з іх і апускае іх у скрынку для галасавання.

У выпадку, калі выбаршчык, удзельнік рэферэндуму лічыць, што пры запаўненні бюлетэня зрабіў памылку, ён мае права звярнуцца да члена ўчастковай камісіі, які выдаў бюлетэнь, з просьбай выдаць яму новы бюлетэнь замест сапсаванага. Член участковай камісіі, атрымаўшы сапсаваны бюлетэнь, на якім павінны быць уласнаручны подпіс выбаршчыка, удзельніка рэферэндуму, выдае выбаршчыку, удзельніку рэферэндуму новы бюлетэнь, робячы адзнаку аб гэтым у спісе грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутата, насупраць прозвішча выбаршчыка, удзельніка рэферэндуму, які дапусціў памылку. Сапсаваны бюлетэнь пагашаецца, аб чым складаецца акт, які падпісваецца старшынёй або намеснікам старшыні або сакратаром і двума членамі ўчастковай камісіі.

**Артыкул 53. Датэрміновае галасаванне на выбарах, рэферэндуме**

Выбаршчык, удзельнік рэферэндуму, які не можа ў дзень выбараў, рэферэндуму знаходзіцца па месцы свайго жыхарства, мае права не раней чым за пяць дзён да выбараў, рэферэндуму ва ўмовах, што выключаюць кантроль за яго волевыяўленнем, запоўніць у памяшканні ўчастковай камісіі бюлетэнь і апусціць яго ў апячатаную асобную скрынку для галасавання выбаршчыкаў, удзельнікаў рэферэндуму, якія будуць адсутнічаць у дзень правядзення выбараў, рэферэндуму па месцы іх жыхарства. Афіцыйнага пацвярджэння прычын немагчымасці выбаршчыка, удзельніка рэферэндуму прыйсці ў памяшканне для галасавання ў дзень выбараў, рэферэндуму не патрабуецца.

Датэрміновае галасаванне ажыццяўляецца з 10 да 14 гадзін і з 16 да 19 гадзін у прысутнасці не менш чым двух членаў участковай камісіі.

У першы дзень датэрміновага галасавання скрынкі для галасавання пламбіруюцца або апячатваюцца ў парадку, прадугледжаным часткай трэцяй артыкула 51 гэтага Кодэкса.

У перыяд датэрміновага галасавання штодзённа пасля заканчэння часу правядзення галасавання старшыня або намеснік старшыні ўчастковай камісіі заклейвае проразь для апускання бюлетэняў у скрынцы для галасавання аркушам паперы. Старшыня або намеснік старшыні і член участковай камісіі ставяць подпісы на гэтым аркушы. Ускрыццё проразі для апускання бюлетэняў у скрынцы для галасавання праводзіцца штодзённа перад пачаткам датэрміновага галасавання старшынёй або намеснікам старшыні ўчастковай камісіі. Пры заклейванні і ўскрыцці проразі для апускання бюлетэняў у скрынцы для галасавання маюць права прысутнічаць назіральнікі, замежныя (міжнародныя) назіральнікі, прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі. Захоўванне скрынкі для галасавання забяспечвае старшыня участковай камісіі.

У перыяд датэрміновага галасавання штодзённа старшыня або намеснік старшыні ўчастковай камісіі складае пратакол, у якім указваюцца колькасць бюлетэняў, атрыманых участковай камісіяй, колькасць грамадзян, якія атрымалі бюлетэні для галасавання (у апошні дзень датэрміновага галасавання – агульная колькасць грамадзян, якія атрымалі бюлетэні для галасавання), колькасць сапсаваных бюлетэняў і колькасць нявыкарыстаных бюлетэняў. Пратакол падпісваецца старшынёй або намеснікам старшыні і членам камісіі. Копія пратакола вывешваецца для ўсеагульнага азнаямлення ў памяшканні ўчастковай камісіі.

Пры атрыманні бюлетэня выбаршчык, удзельнік рэферэндуму ўласнаручна распісваецца ў спісе грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, і ўказвае дату датэрміновага галасавання.

Датэрміновае галасаванне праводзіцца з прытрымліваннем патрабаванняў гэтага Кодэкса.

Датэрміновае галасаванне не праводзіцца на ўчастках для галасавання, утвораных у санаторыях, прафілакторыях, дамах адпачынку, бальніцах і іншых арганізацыях аховы здароўя, якія аказваюць медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах, а таксама перад другім турам галасавання па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 54. Галасаванне ў месцы знаходжання выбаршчыка, удзельніка рэферэндуму на выбарах, рэферэндуме

Участковая камісія абавязана забяспечыць магчымасць удзельнічаць у галасаванні выбаршчыкам, удзельнікам рэферэндуму, якія з-за стану здароўя або з-

за іншых уважлівых прычын не змогуць прыйсці ў дзень выбараў, рэферэндуму ў памяшканне для галасавання. З гэтымі мэтамі ва ўчастковай камісіі павінна быць не больш за тры пераносныя скрынкі для галасавання.

Участковая камісія па просьбе выбаршчыкаў, удзельнікаў рэферэндуму, выказанай у пісьмовай або вуснай форме, даручае не менш чым двум членам камісіі арганізаваць галасаванне па месцы знаходжання гэтых асоб у дзень выбараў, рэферэндуму ў наступным парадку:

вусныя і пісьмовыя просьбы выбаршчыкаў, удзельнікаў рэферэндуму аб арганізацыі галасавання па месцы іх знаходжання ў дзень выбараў, рэферэндуму заносяцца ў спіс, які спецыяльна складаецца, падпісаны старшынёй або сакратаром участковай камісіі, у якім указваюцца даныя аб гэтых асобах, прадугледжаныя ў спісе грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме. Афіцыйнага пацвярджэння прычын немагчымасці прыйсці ў памяшканне для галасавання не патрабуецца. Выбаршчыкі, удзельнікі рэферэндуму могуць звярнуцца з просьбай аб арганізацыі галасавання па месцы іх знаходжання ў дзень выбараў, рэферэндуму ў любы час пасля ўтварэння ўчастковай камісіі, а ў дзень галасавання – не пазней чым за дзве гадзіны да сканчэння часу галасавання;

члены ўчастковай камісіі атрымліваюць бюлетэні і распісваюцца за іх атрыманне. Колькасць бюлетэняў, якія выдаюцца, павінна адпавядаць колькасці просьбаў выбаршчыкаў, удзельнікаў рэферэндуму, якія паступілі;

для арганізацыі галасавання па месцы знаходжання выбаршчыкаў, удзельнікаў рэферэндуму старшыня або сакратар участковай камісіі з асноўнага спіса грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, выпісвае ў асобны ўкладны ліст усе даныя аб гэтых асобах і падпісвае яго. У гэтым укладным лісце выбаршчыкі, удзельнікі рэферэндуму, якія галасуюць па месцы свайго знаходжання, пры атрыманні бюлетэня ўласнаручна распісваюцца. Затым у асноўным спісе грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, робіцца адзнака, што гэтыя асобы прагаласавалі па месцы свайго знаходжання. Укладныя лісты спіса грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, у якіх запісаны выбаршчыкі, удзельнікі рэферэндуму, што прагаласавалі па месцы свайго знаходжання, павінны захоўвацца разам з асноўным спісам грамадзян, якія што маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме.

Галасаванне па месцы знаходжання выбаршчыкаў, удзельнікаў рэферэндуму праводзіцца з прытрымліваннем патрабаванняў гэтага Кодэкса.

## ГЛАВА 14
## ПАДЛІК ГАЛАСОЎ НА ЎЧАСТКУ ДЛЯ ГАЛАСАВАННЯ ПРЫ ПРАВЯДЗЕННІ ВЫБАРАЎ, РЭФЕРЭНДУМУ

### Артыкул 55. Падлік галасоў на ўчастку для галасавання пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, рэферэндуму

Скрынкі для галасавання распячатваюцца ўчастковай камісіяй пасля абвяшчэння старшынёй камісіі аб заканчэнні галасавання. Распячатванне скрынак для галасавання да заканчэння галасавання забараняецца. Перад распячатваннем скрынак для галасавання падлічваецца і абвяшчаецца колькасць нявыкарыстаных бюлетэняў, якія затым пагашаюцца, складваюцца ў пакеты і апячатваюцца. Спосаб

пагашэння бюлетэняў вызначае ўчастковая камісія. На пакетах надпісваюцца нумар участка, колькасць нявыкарыстаных бюлетэняў па выбарах, рэферэндуме. Пакеты падпісваюцца старшынёй і сакратаром участковай камісіі ў прысутнасці членаў камісіі.

Распячатванне скрынак для галасавання і падлік галасоў пры правядзенні выбараў, рэферэндуму ажыццяўляюцца пачаргова: спачатку падлічваюцца бюлетэні, якія знаходзіліся ў скрынцы для галасавання, што выкарыстоўвалася пры датэрміновым галасаванні, затым – якія знаходзіліся ў пераносных скрынках, што выкарыстоўваліся пры галасаванні па месцы знаходжання выбаршчыкаў, удзельнікаў рэферэндуму, і пасля гэтага – у скрынках для галасавання, якія знаходзіліся ў дзень выбараў, рэферэндуму ў памяшканні ўчастка для галасавання. Вынікі падліку галасоў чытае ўголас старшыня камісіі.

Падлік галасоў выбаршчыкаў, удзельнікаў рэферэндуму павінен праводзіцца непасрэдна членамі ўчастковай камісіі без перапынку да атрымання вынікаў галасавання.

Пры выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутата Палаты прадстаўнікоў падлік галасоў на ўчастку для галасавання праводзіцца асобна па кожным кандыдаце ў Прэзідэнты, у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, а пры выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў – асобна па кожнай выбарчай акрузе і кожным кандыдаце ў дэпутаты па выбарах у адпаведны мясцовы Савет дэпутатаў.

Участковая камісія па спісе грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, устанаўлівае агульную колькасць выбаршчыкаў, удзельнікаў рэферэндуму на ўчастку, а пры правядзенні выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў – і па кожнай выбарчай акрузе, а таксама колькасць выбаршчыкаў, удзельнікаў рэферэндуму, якія атрымалі бюлетэні.

На падставе бюлетэняў, якія знаходзіліся ў скрынках для галасавання, указаных у частцы другой гэтага артыкула, участковая камісія спачатку асобна, а затым, падсумоўваючы даныя, устанаўлівае:

пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў – агульную колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні, у тым ліку колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у датэрміновым галасаванні, колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні па месцы знаходжання, і колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні ў дзень выбараў у памяшканні ўчастка для галасавання; колькасць галасоў, пададзеных за кожнага кандыдата ў Прэзідэнты, у дэпутаты, і колькасць галасоў, пададзеных супраць усіх кандыдатаў у Прэзідэнты, у дэпутаты (калі галасаванне праводзілася па адной кандыдатуры, – колькасць галасоў, пададзеных супраць кандыдата); колькасць бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі;

пры правядзенні выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў – па кожнай выбарчай акрузе агульную колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні, у тым ліку колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у датэрміновым галасаванні, колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні па месцы знаходжання, і колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні ў дзень выбараў у памяшканні ўчастка для галасавання, колькасць галасоў, пададзеных за кожнага кандыдата ў дэпутаты, і колькасць галасоў, пададзеных супраць усіх кандыдатаў у дэпутаты (калі галасаванне праводзілася па адной кандыдатуры, – колькасць галасоў, пададзеных супраць кандыдата), колькасць бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі;

пры правядзенні рэферэндуму – агульную колькасць удзельнікаў рэферэндуму, якія прынялі ўдзел у галасаванні, у тым ліку колькасць удзельнікаў рэферэндуму, якія прынялі ўдзел у датэрміновым галасаванні, колькасць удзельнікаў рэферэндуму, якія прынялі ўдзел у галасаванні па месцы знаходжання, і колькасць удзельнікаў рэферэндуму, якія прынялі ўдзел у галасаванні ў дзень рэферэндуму ў памяшканні ўчастка для галасавання, колькасць удзельнікаў рэферэндуму, якія галасавалі за ўхваленне вынесенага на рэферэндум пытання (праекта рашэння), і колькасць удзельнікаў, якія галасавалі супраць яго ўхвалення, колькасць бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі.

Уносіць змяненні ў спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, пасля пачатку падліку галасоў забараняецца.

Пры правядзенні выбараў, рэферэндуму прызнаюцца несапраўднымі бюлетэні нявызначанага ўзору, бюлетэні, на адваротным баку якіх адсутнічаюць подпісы асоб, якія ўваходзяць у склад участковай камісіі, а пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў – таксама бюлетэні, у якіх знак пастаўлены больш чым у адным квадраце або не пастаўлены ні ў адным з іх, або бюлетэні, у якія ўнесена прозвішча толькі аднаго кандыдата і знак пастаўлены ў двух квадратах або не пастаўлены ні ў адным з іх, і пры правядзенні рэферэндуму – таксама бюлетэні, у якія пастаўлены знак у двух квадратах або не пастаўлены ні ў адным з іх.

У выпадку ўзнікнення сумненняў у сапраўднасці бюлетэня пытанне вырашаецца ўчастковай камісіяй шляхам галасавання. Пры гэтым на адваротным баку кожнага з такіх бюлетэняў робіцца запіс аб прызнанні яго сапраўдным або несапраўдным. Гэты запіс завяраецца подпісамі не менш чым двух асоб, якія ўваходзяць у склад участковай камісіі. Несапраўдныя бюлетэні пакуюцца асобна.

Пасля завяршэння падліку галасоў праводзіцца пасяджэнне ўчастковай камісіі, на якім устанаўліваюцца і заносяцца ў пратакол вынікі падліку галасоў. У пратаколе, акрамя даных, прадугледжаных у частках пятай і шостай гэтага артыкула, указваецца колькасць бюлетэняў, атрыманых участковай камісіяй, колькасць сапсаваных бюлетэняў, колькасць нявыкарыстаных бюлетэняў. Пры правядзенні выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў пратакол складаецца асобна па кожнай выбарчай акрузе. У выпадку правядзення адначасова двух і болей рэферэндумаў па кожным з іх асобна складаецца пратакол. Не дапускаецца запаўненне пратакола алоўкам і ўнясенне ў яго якіх бы там ні было выпраўленняў. Пратакол падпісваецца старшынёй, намеснікам старшыні, сакратаром і членамі камісіі. На пасяджэнні ўчастковай камісіі разглядаюцца, калі маюцца, асобныя думкі членаў камісіі, а таксама скаргі і заявы аб парушэннях пры галасаванні або падліку галасоў.

Копія пратакола ўчастковай камісіі пасля яго падпісання вывешваецца для ўсеагульнага азнаямлення ў месцы, устаноўленым камісіяй.

Пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскага, абласнога, Мінскага гарадскога рэферэндуму пратакол пасля ўстанаўлення вынікаў падліку галасоў асабіста старшынёй, або намеснікам старшыні, або сакратаром участковай камісіі падаецца ў адпаведную раённую, гарадскую, раённую ў горадзе камісію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, па рэферэндуме, пры правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў – у адпаведную акруговую, тэрытарыяльную выбарчую камісію, а таксама ў орган, які ўтварыў камісію, для інфармацыі. Да пратакола, які

накіроўваецца ў вышэйстаячую камісію, дадаюцца, калі яны маюцца, асобныя думкі членаў камісіі, заявы давераных асоб кандыдатаў і іншых асоб аб парушэннях, дапушчаных у ходзе галасавання або пры падліку галасоў, і прынятыя па іх рашэнні камісіі.

У выпадку выяўлення органам, які ўтварыў камісію, парушэнняў патрабаванняў гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь, дапушчаных у ходзе галасавання або пры падліку галасоў, аб гэтым неадкладна паведамляецца адпаведнай вышэйстаячай выбарчай камісіі, камісіі па рэферэндуме або Цэнтральнай камісіі.

# АСАБЛІВАЯ ЧАСТКА

## РАЗДЗЕЛ V
## ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ, ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ

### ГЛАВА 15
### АРГАНІЗАЦЫЯ І ПРАВЯДЗЕННЕ ВЫБАРАЎ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, ДЭПУТАТАЎ

**Артыкул 56. Прызначэнне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў**

Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прызначаюцца Палатай прадстаўнікоў не пазней чым за пяць месяцаў і праводзяцца ў нядзелю не пазней чым за два месяцы да сканчэння тэрміну паўнамоцтваў папярэдняга Прэзідэнта.

Калі пасада Прэзідэнта аказалася вакантнай, выбары праводзяцца не раней чым праз 30 дзён і не пазней чым праз 70 дзён з дня адкрыцця вакансіі. Пры гэтым скарочаныя тэрміны правядзення перадвыбарных мерапрыемстваў вызначае Цэнтральная камісія.

Выбары ў Палату прадстаўнікоў новага склікання прызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь не пазней за чатыры месяцы і праводзяцца не пазней за 30 дзён да заканчэння паўнамоцтваў Палаты прадстаўнікоў дзеючага склікання.

Пры роспуску Палаты прадстаўнікоў у выпадках і парадку, прадугледжаных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Прэзідэнт адначасова прызначае выбары ў Палату прадстаўнікоў новага склікання. Пазачарговыя выбары ў Палату прадстаўнікоў праводзяцца на працягу трох месяцаў з дня датэрміновага спынення паўнамоцтваў Палаты прадстаўнікоў дзеючага склікання.

Выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў новага склікання прызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь не пазней за чатыры месяцы і праводзяцца не пазней за 30 дзён да заканчэння паўнамоцтваў мясцовых Саветаў дэпутатаў дзеючага склікання. Выбары ва ўсе мясцовыя Саветы дэпутатаў праводзяцца адначасова.

У выпадку роспуску мясцовага Савета дэпутатаў выбары ў гэты мясцовы Савет дэпутатаў прызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь не пазней чым у месячны тэрмін з дня яго роспуску і праводзяцца з захаваннем патрабаванняў гэтага Кодэкса.

Паведамленне аб дні выбараў абнародуецца ў сродках масавай інфармацыі на наступны дзень пасля прызначэння выбараў.

**Артыкул 57. Патрабаванні, якія прад'яўляюцца да кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты**

Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь можа быць выбраны грамадзянін Рэспублікі Беларусь па нараджэнні, не маладзейшы за 35 гадоў, які валодае выбарчым правам і які пастаянна пражывае ў Рэспубліцы Беларусь не менш за дзесяць гадоў непасрэдна перад выбарамі.

Дэпутатам Палаты прадстаўнікоў можа быць выбраны грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які дасягнуў 21 года, які пастаянна пражывае ў Рэспубліцы Беларусь.

Дэпутатам мясцовага Савета дэпутатаў можа быць выбраны грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які дасягнуў 18 гадоў.

**Артыкул 58. Права грамадзян Расійскай Федэрацыі, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, удзельнічаць у выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў**

Грамадзяне Расійскай Федэрацыі, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, маюць права ў парадку, прадугледжаным гэтым Кодэксам, удзельнічаць у выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў у адпаведнасці з міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі.

**Артыкул 59. Несумяшчальнасць статусу дэпутата са службовым становішчам, а таксама з адпаведнымі паўнамоцтвамі**

Не дапускаецца сумяшчэнне абавязкаў дэпутата Палаты прадстаўнікоў з адначасовым займаннем пасады Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь або суддзі.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў не можа быць адначасова членам Савета Рэспублікі, дэпутатам мясцовага Савета дэпутатаў.

Дэпутатамі мясцовых Саветаў дэпутатаў не могуць быць старшыні абласных, Мінскага гарадскога, раённых, гарадскіх (акрамя гарадоў раённага падпарадкавання) выканаўчых камітэтаў, а таксама суддзі.

Дэпутат мясцовага Савета дэпутатаў не можа быць адначасова дэпутатам Палаты прадстаўнікоў.

Асобы, указаныя ў частках першай – чацвёртай гэтага артыкула, могуць быць зарэгістраваны кандыдатамі ў дэпутаты, калі яны ў адпаведнай заяве ў выбарчую камісію зазначаць:

аб вызваленні імі займанай пасады або аб спыненні паўнамоцтваў члена Савета Рэспублікі, дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў пры выбранні дэпутатам Палаты прадстаўнікоў;

аб вызваленні імі займанай пасады або аб спыненні паўнамоцтваў дэпутата Палаты прадстаўнікоў пры выбранні дэпутатам мясцовага Савета дэпутатаў.

**Артыкул 60. Права і тэрміны вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты**

Кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь вылучаюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь пры наяўнасці не менш за 100 тысяч подпісаў выбаршчыкаў.

Вылучэнне кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь пачынаецца за 80 дзён і заканчваецца за 50 дзён да выбараў.

Права вылучэння кандыдатаў у дэпутаты належыць палітычным партыям, зарэгістраваным Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь не пазней чым за

шэсць месяцаў да прызначэння выбараў, працоўным калектывам, а таксама грамадзянам шляхам збору подпісаў.

Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты пачынаецца за 70 дзён і заканчваецца за 40 дзён да выбараў.

Грамадзянін можа вылучацца кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў толькі па адной выбарчай акрузе, а кандыдатам у дэпутаты мясцовага Савета дэпутатаў – па адной выбарчай акрузе па выбарах у мясцовы Савет дэпутатаў адпаведнага тэрытарыяльнага ўзроўню.

Кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў могуць быць вылучаны грамадзяне, якія пражываюць або працуюць на тэрыторыі адпаведнага мясцовага Савета дэпутатаў, а таксама працуюць ў арганізацыях, размешчаных на тэрыторыі іншага мясцовага Савета дэпутатаў, але звязаных з задавальненнем патрэбнасцей насельніцтва і сацыяльным развіццём тэрыторыі дадзенага мясцовага Савета дэпутатаў.

Кандыдатамі ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты не могуць быць вылучаны грамадзяне, якія не маюць права ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь займаць пасады ў дзяржаўных органах і іншых дзяржаўных арганізацыях у сувязі з наяўнасцю судзімасці.

**Артыкул 61. Парадак вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь**

Вылучэнне кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь грамадзянамі ажыццяўляецца ініцыятыўнай групай выбаршчыкаў (далей – ініцыятыўная група) у колькасці не меншай за 100 чалавек.

Для рэгістрацыі ініцыятыўнай групы ў Цэнтральную камісію не пазней чым за 85 дзён да выбараў асобай, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, падаюцца:

пісьмовая заява аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, у якой указваюцца прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, пасада (занятак), месца работы і месца жыхарства, тэрмін пражывання на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, партыйнасць асобы, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь;

копіі старонак пашпарта, якія пацвярджаюць грамадзянства Рэспублікі Беларусь і рэгістрацыю на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь асобы, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь;

спіс членаў ініцыятыўнай групы з указаннем кіраўніка ініцыятыўнай групы і каардынатараў па раёнах, гарадах абласнога падпарадкавання, раёнах у гарадах, калі збор подпісаў будзе праводзіцца на іх тэрыторыі. У спісе членаў ініцыятыўнай групы ў дачыненні да кожнага члена ініцыятыўнай групы ўказваюцца прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, месца жыхарства, серыя і нумар пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. У спісе таксама ўказваюцца прозвішча, імя і імя па бацьку асобы, якая прапануецца для вылучэння кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Спіс членаў ініцыятыўнай групы падаецца ў друкаваным і электронным выглядзе.

Асоба, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, падае ў Цэнтральную камісію дакументы, указаныя ў частцы другой гэтага артыкула, і прад'яўляе пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Дакументы могуць быць пададзены ў Цэнтральную камісію прадстаўніком асобы, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, які

ажыццяўляе свае паўнамоцтвы на падставе натарыяльна засведчанай даверанасці або даверанасці, засведчанай у парадку, устаноўленым пунктам 3 і часткай першай пункта 4 артыкула 186 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Асоба, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, або кіраўнік ініцыятыўнай групы мае права ўносіць змяненні ў дакументы, пададзеныя для рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, не пазней чым за адзін дзень да разгляду Цэнтральнай камісіяй пытання аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, а таксама знаёміцца з матэрыяламі праверкі гэтых дакументаў.

Цэнтральная камісія разглядае заяву ў пяцідзённы тэрмін з дня яе паступлення, рэгіструе ініцыятыўную групу і выдае членам ініцыятыўнай групы адпаведныя пасведчанні і падпісныя лісты для збору подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку асобы, якая прапануецца для вылучэння кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь (далей – падпісны ліст). У рэгістрацыі ініцыятыўнай групы адмаўляецца ў выпадку парушэння патрабаванняў гэтага Кодэкса. Адмова ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы можа быць абскарджана ў трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння аб адмове ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь асобай, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін.

У падпісным лісце ўказваюцца прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, пасада (занятак), месца работы і месца жыхарства, партыйнасць асобы, якая прапануецца для вылучэння кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, а таксама прозвішча, імя і імя па бацьку члена ініцыятыўнай групы, які збірае подпісы, і нумар рэгістрацыі ініцыятыўнай групы.

У падпісным лісце павінны быць подпісы выбаршчыкаў, якія пражываюць на тэрыторыі толькі аднаго горада абласнога падпарадкавання, раёна, а ў гарадах з раённым дзяленнем – аднаго раёна.

Выбаршчык мае права падпісацца ў падтрымку асобы, якая прапануецца для вылучэння кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, толькі адзін раз.

У падпісным лісце ў дачыненні да выбаршчыка, які падтрымлівае асобу, што прапануецца для вылучэння кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, указваюцца прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, месца жыхарства, серыя і нумар пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь або рэквізіты іншага дакумента, які вызначаецца Цэнтральнай камісіяй. Даныя аб выбаршчыку ўносяцца ў падпісны ліст рукапісным спосабам. Выбаршчык уласнаручна ставіць у падпісным лісце дату подпісу і распісваецца. Подпісы нумаруюцца.

Удзел адміністрацыі арганізацыі ў зборы подпісаў, таксама як і прымус у працэсе збору подпісаў і ўзнагароджанне выбаршчыкаў за ўнясенне подпісу, не дапускаюцца. Парушэнне гэтых патрабаванняў можа быць падставай для адмовы ў рэгістрацыі або адмены рашэння аб рэгістрацыі кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

Збор подпісаў выбаршчыкаў можа ажыццяўляцца ў форме пікетавання. Атрыманне дазволу на правядзенне пікетавання для ўказаных мэт не патрабуецца, калі яно праводзіцца ў месцах, не забароненых мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі.

Падпісны ліст засведчвае член ініцыятыўнай групы, які збіраў подпісы. Член ініцыятыўнай групы пры засведчанні падпіснога ліста ставіць подпіс і дату яго ўнясення, а таксама ўказвае прозвішча і ініцыялы.

Выбаршчыкі, якія вылучылі кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, маюць права да здачы падпісных лістоў у раённую, гарадскую, раённую ў горадзе камісію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь зняць свае подпісы ў падпісных лістах, падаўшы аб гэтым заяву ва ўказаныя камісіі.

Каардынатары па раёнах, гарадах, раёнах у гарадах здаюць падпісныя лісты не пазней чым за 50 дзён да выбараў у раённую, гарадскую, раённую ў горадзе камісію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якая ў дзесяцідзённы тэрмін правярае дакладнасць подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах і забяспечвае дакладнасць даных аб колькасці такіх подпісаў. Праверцы падлягае не менш за 20 працэнтаў подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах, здадзеных у адпаведную камісію.

Парадак адбору падпісных лістоў для праверкі вызначаецца на пасяджэнні адпаведнай камісіі. Па выніках праверкі дакладнасці даных у падпісных лістах подпіс выбаршчыка можа быць прызнаны дакладным або недакладным.

Праверцы і ўліку не падлягаюць подпісы выбаршчыкаў і адпаведныя ім даныя, якія знаходзяцца ў падпісных лістах, але выключаныя (выкрасленыя) членам ініцыятыўнай групы, які збіраў подпісы, да падавання падпісных лістоў у адпаведную камісію, калі гэта выключэнне ім спецыяльна пісьмова агаворана. Праверцы і ўліку таксама не падлягаюць подпісы выбаршчыкаў і адпаведныя ім даныя, калі ў падпісным лісце адсутнічаюць звесткі аб асобе, якая вылучаецца кандыдатам.

Калі ў падпісным лісце, які паступіў у раённую, гарадскую, раённую ў горадзе камісію, утрымліваюцца подпісы выбаршчыкаў, якія пражываюць на тэрыторыі розных раёнаў, гарадоў абласнога падпарадкавання, раёнаў у горадзе, праверцы і ўліку падлягаюць толькі подпісы, пададзеныя на тэрыторыі таго раёна, горада, раёна ў горадзе, дзе ўтворана камісія, у якую здадзены гэты падпісны ліст. Астатнія подпісы не правяраюцца і не ўлічваюцца.

Недакладнымі подпісамі лічацца:

фіктыўныя подпісы (выкананыя ад імя неіснуючых асоб і якія выдаюцца за сапраўдныя);

подпісы выбаршчыкаў, выкананыя ад імя розных асоб адной асобай або ад імя адной асобы іншай асобай;

подпісы асоб, якія не валодаюць выбарчым правам;

подпісы выбаршчыкаў, якія пазначылі ў падпісным лісце даныя, не адпаведныя рэчаіснасці;

подпісы выбаршчыкаў, сабраныя да вызначанага тэрміну вылучэння кандыдатаў;

подпісы выбаршчыкаў, калі ў звестках аб іх адсутнічаюць адно або некалькі даных, якія патрэбуюцца гэтым Кодэксам;

подпісы выбаршчыкаў, калі даныя аб іх унесены ў падпісны ліст нерукапісным спосабам або алоўкам, а таксама подпісы, даты ўнясення якіх выкананы выбаршчыкамі неўласнаручна;

усе подпісы выбаршчыкаў у падпісным лісце, калі подпісы сабраны асобай, якая не з'яўляецца членам ініцыятыўнай групы, або калі падпісны ліст не засведчаны членам ініцыятыўнай групы або засведчаны іншым членам ініцыятыўнай групы, які не збіраў гэтыя подпісы;

подпісы выбаршчыкаў, сабраныя з парушэннем патрабаванняў часткі дзясятай гэтага артыкула.

У выпадку выяўлення некалькіх подпісаў аднаго і таго ж выбаршчыка ў падтрымку вылучэння аднаго і таго ж кандыдата дакладным лічыцца толькі адзін подпіс, а астатнія подпісы лічацца недакладнымі.

Калі колькасць выяўленых пры праверцы недакладных подпісаў выбаршчыкаў складзе больш за 15 працэнтаў ад колькасці правераных подпісаў, праводзіцца дадатковая праверка яшчэ 15 працэнтаў подпісаў выбаршчыкаў ад колькасці подпісаў у падпісных лістах, здадзеных у адпаведную камісію.

У выпадку, калі сумарная колькасць недакладных подпісаў выбаршчыкаў, выяўленых пры праверках, складзе больш за 15 працэнтаў ад агульнай колькасці правераных подпісаў у падпісных лістах, далейшая праверка подпісаў у падпісных лістах раённай, гарадской, раённай у горадзе камісіяй спыняецца і ўсе подпісы выбаршчыкаў у здадзеных падпісных лістах не ўлічваюцца пры вызначэнні выніку збору подпісаў выбаршчыкаў у раёне, горадзе, раёне ў горадзе.

Праверыць дакладнасць подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах пры неабходнасці ў пяцідзённы тэрмін могуць таксама абласныя і Мінская гарадская камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

На падставе пратаколаў раённых, гарадскіх, раённых у гарадах камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб устанаўленні колькасці выбаршчыкаў, якія паставілі ў падпісных лістах свае подпісы аб вылучэнні кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, і вынікаў праведзеных абласной, Мінскай гарадской камісіяй праверак дакладнасці подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах абласная, Мінская гарадская камісія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь падводзіць вынікі па вобласці, горадзе Мінску, складае аб гэтым пратакол і неадкладна накіроўвае яго ў Цэнтральную камісію.

**Артыкул 62. Парадак вылучэння кандыдатаў у дэпутаты палітычнымі партыямі**

Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў ад палітычных партый ажыццяўляецца вышэйшымі органамі палітычных партый.

Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты абласных, Мінскага гарадскога, раённых, гарадскіх (гарадоў абласнога падпарадкавання) Саветаў дэпутатаў ад палітычных партый ажыццяўляецца адпаведна кіруючымі органамі абласных, Мінскай гарадской, раённых, гарадскіх арганізацыйных структур, створаных у вызначаным парадку да прызначэння выбараў.

Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты гарадскіх (гарадоў раённага падпарадкавання), пасялковых і сельскіх Саветаў дэпутатаў ад палітычных партый ажыццяўляецца адпаведна кіруючымі органамі раённых, гарадскіх арганізацыйных структур, створаных у вызначаным парадку да прызначэння выбараў. Кандыдатаў у дэпутаты гарадскіх (гарадоў раённага падпарадкавання), пасялковых і сельскіх Саветаў дэпутатаў могуць вылучаць створаныя на тэрыторыі гэтых мясцовых Саветаў дэпутатаў у вызначаным парадку да прызначэння выбараў першасныя арганізацыі палітычных партый.

Палітычная партыя мае права вылучыць па кожнай выбарчай акрузе па выбарах у Палату прадстаўнікоў, адпаведны мясцовы Савет дэпутатаў толькі аднаго кандыдата ў дэпутаты з ліку членаў гэтай палітычнай партыі.

Спіс зарэгістраваных палітычных партый Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь падае ў Цэнтральную камісію не пазней чым праз пяць дзён пасля прызначэння выбараў.

## Артыкул 63. Парадак вылучэння кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў працоўнымі калектывамі

Кандыдаты ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў ад працоўных калектываў арганізацый вылучаюцца на сходах (канферэнцыях) выбаршчыкаў у працоўных калектывах.

Сходы (канферэнцыі) выбаршчыкаў у працоўных калектывах арганізацый, якія знаходзяцца на тэрыторыі выбарчай акругі, што налічвае не менш за 300 чалавек працоўных, і маюць правы юрыдычнай асобы, склікае адміністрацыя арганізацыі як па ўласнай ініцыятыве, так і па ініцыятыве групы выбаршчыкаў у колькасці не меншай за 150 чалавек, якія працуюць у арганізацыі.

У выпадку адхілення адміністрацыяй прапановы аб правядзенні сходу (канферэнцыі) па ініцыятыве групы выбаршчыкаў яго ініцыятарам выдаецца копія матываванага рашэння. Гэта рашэнне можа быць у трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння абскарджана ініцыятарамі склікання сходу ў раённы, гарадскі суд (скарга павінна быць падпісана большасцю ініцыятараў склікання сходу). Рашэнне суда з'яўляецца канчатковым.

На сходзе павінна прысутнічаць больш за палову складу працоўнага калектыву. Канферэнцыі ў працоўных калектывах праводзяцца, калі скліканне сходаў ускладнена па прычынах вялікай колькасці работнікаў, мнагазменнасці або тэрытарыяльнай разлучанасці структурных падраздзяленняў, і правамоцныя пры ўдзеле ў іх рабоце не менш за дзве трэці дэлегатаў, выбраных у парадку, устаноўленым працоўным калектывам. Рашэнне сходу (канферэнцыі) працоўнага калектыву прымаецца большасцю галасоў яго ўдзельнікаў.

Кандыдат у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў можа быць вылучаны ад некалькіх меншых калектываў з агульнай колькасцю працоўных не менш за 300 чалавек на іх агульным сходзе. Пры гэтым ад кожнага працоўнага калектыву арганізацыі, якая мае правы юрыдычнай асобы, павінна прысутнічаць больш за палову яго складу.

Працоўны калектыў можа вылучыць толькі аднаго кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў.

## Артыкул 64. Парадак вылучэння кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўнымі калектывамі

Кандыдаты ў дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў ад працоўных калектываў арганізацый вылучаюцца на сходах (канферэнцыях) выбаршчыкаў у працоўных калектывах.

Кандыдатаў у дэпутаты абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў вылучаюць працоўныя калектывы, размешчаныя на тэрыторыі адпаведнай выбарчай акругі, а кандыдатаў у дэпутаты раённага, гарадскога, пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў – працоўныя калектывы, размешчаныя на тэрыторыі адпаведнага мясцовага Савета дэпутатаў.

Сходы (канферэнцыі) выбаршчыкаў у працоўных калектывах арганізацый склікае адміністрацыя арганізацыі як па ўласнай ініцыятыве, так і па ініцыятыве групы выбаршчыкаў у колькасці не меншай за 10 чалавек, якія працуюць у арганізацыі. Сходы выбаршчыкаў у працоўных калектывах па вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты могуць праводзіцца:

пры вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў – у калектывах, якія налічваюць не менш за 150 працоўных;

пры вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты раённага, гарадскога (горада абласнога падпарадкавання) Савета дэпутатаў – у калектывах, якія налічваюць не менш за 75 працоўных;

пры вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты гарадскога (горада раённага падпарадкавання), пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў – у калектывах, якія налічваюць не менш за 20 працоўных.

Абскарджанне адмовы адміністрацыі ў правядзенні сходу (канферэнцыі), вызначэнне правамоцнасці сходу (канферэнцыі) працоўнага калектыву і прынятага рашэння праводзяцца ў парадку, прадугледжаным часткамі трэцяй і чацвёртай артыкула 63 гэтага Кодэкса.

Кандыдат у дэпутаты мясцовага Савета дэпутатаў можа быць вылучаны ад некалькіх меншых працоўных калектываў з агульнай колькасцю працоўных, устаноўленай часткай трэцяй гэтага артыкула, на іх агульным сходзе. Сход правамоцны, калі ад кожнага такога калектыву арганізацыі прысутнічае больш за палову яго складу.

Сходы выбаршчыкаў па вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў могуць праводзіцца па структурных падраздзяленнях арганізацый пры ўмове, што іх колькасны склад пры вылучэнні кандыдата ў дэпутаты адпаведнага мясцовага Савета дэпутатаў адпавядае патрабаванням часткі трэцяй гэтага артыкула. У парадку, прадугледжаным часткай пятай гэтага артыкула, кандыдат у дэпутаты мясцовага Савета дэпутатаў можа быць вылучаны ад некалькіх структурных падраздзяленняў або ад некалькіх працоўных калектываў і структурных падраздзяленняў на іх агульным сходзе. Пры вылучэнні кандыдата ў дэпутаты ў структурным падраздзяленні (структурных падраздзяленнях) вылучэнне кандыдата ў дэпутаты ад усяго працоўнага калектыву не праводзіцца.

Працоўны калектыў арганізацыі або калектывы яе структурных падраздзяленняў з захаваннем патрабаванняў часткі трэцяй гэтага артыкула маюць права вылучыць толькі па адным кандыдаце ў дэпутаты кожнага тэрытарыяльнага ўзроўню мясцовых Саветаў дэпутатаў.

### Артыкул 65. Парадак вылучэння кандыдатаў у дэпутаты шляхам збору подпісаў выбаршчыкаў

Вылучэнне кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў шляхам збору подпісаў выбаршчыкаў ажыццяўляецца групай выбаршчыкаў (ініцыятыўнай групай) у колькасці не меншай за 10 чалавек, а кандыдата ў дэпутаты мясцовага Савета дэпутатаў – ініцыятыўнай групай у колькасці ад 3 да 10 чалавек. Для рэгістрацыі ініцыятыўнай групы не пазней чым за 65 дзён да выбараў асоба, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у дэпутаты, у адпаведную акруговую выбарчую камісію па выбарах дэпутата Палаты прадстаўнікоў, у акруговую, тэрытарыяльную выбарчую камісію па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў падае:

пісьмовую заяву аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, у якой указваюцца прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, пасада (занятак), месца работы і месца жыхарства, партыйнасць асобы, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у дэпутаты;

копіі старонак пашпарта, што пацвярджаюць грамадзянства Рэспублікі Беларусь і рэгістрацыю на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь асобы, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у дэпутаты;

спіс членаў ініцыятыўнай групы, у якім у дачыненні да кожнага члена ініцыятыўнай групы і яе кіраўніка ўказваюцца прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, месца жыхарства, серыя і нумар пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. У спісе таксама ўказваюцца прозвішча, імя і імя па бацьку асобы, якая прапануецца для вылучэння кандыдатам у дэпутаты. Спіс членаў ініцыятыўнай групы падаецца ў друкаваным выглядзе.

Асоба, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у дэпутаты, падае ў адпаведную акруговую, тэрытарыяльную выбарчую камісію дакументы, указаныя ў частцы першай гэтага артыкула, і прад'яўляе пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Дакументы ў акруговую, тэрытарыяльную выбарчую камісію можа падаць прадстаўнік асобы, што мае намер вылучыцца кандыдатам у дэпутаты, які ажыццяўляе свае паўнамоцтвы на падставе натарыяльна засведчанай даверанасці або даверанасці, засведчанай у парадку, устаноўленым пунктам 3 і часткай першай пункта 4 артыкула 186 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Асоба, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у дэпутаты, або кіраўнік ініцыятыўнай групы мае права ўносіць змяненні ў дакументы, пададзеныя для рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, не пазней чым за адзін дзень да разгляду акруговай, тэрытарыяльнай выбарчай камісіяй пытання аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, а таксама знаёміцца з матэрыяламі праверкі гэтых дакументаў.

Акруговая, тэрытарыяльная выбарчая камісія разглядае заяву ў пяцідзённы тэрмін з дня яе паступлення, рэгіструе ініцыятыўную групу і выдае членам ініцыятыўнай групы адпаведныя пасведчанні і падпісныя лісты для збору подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку асобы, якая прапануецца для вылучэння кандыдатам у дэпутаты (далей – падпісны ліст). У рэгістрацыі ініцыятыўнай групы адмаўляецца ў выпадку парушэння патрабаванняў гэтага Кодэкса.

Рашэнне акруговай выбарчай камісіі аб адмове ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы па вылучэнні кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў можа быць абскарджана асобай, якая мае намер вылучыцца кандыдатам ў дэпутаты, у адпаведную абласную, Мінскую гарадскую тэрытарыяльную выбарчую камісію ў трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння, а рашэнне абласной, Мінскай гарадской тэрытарыяльнай выбарчай камісіі ў той жа тэрмін можа быць абскарджана ў абласны, Мінскі гарадскі суд. Суд разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін, яго рашэнне з'яўляецца канчатковым.

Рашэнне акруговай, тэрытарыяльнай выбарчай камісіі аб адмове ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы па вылучэнні кандыдатам у дэпутаты мясцовага Савета дэпутатаў можа быць абскарджана асобай, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у дэпутаты, у вышэйстаячую тэрытарыяльную выбарчую камісію ў трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння, а рашэнне вышэйстаячай тэрытарыяльнай выбарчай камісіі ў той жа тэрмін можа быць абскарджана адпаведна ў абласны, Мінскі гарадскі, раённы суд. Суд разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін, яго рашэнне з'яўляецца канчатковым.

Асобу, якая прапануецца для вылучэння кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў у выбарчай акрузе групай выбаршчыкаў, павінны падтрымаць не менш за 1000 выбаршчыкаў, якія пражываюць на тэрыторыі дадзенай выбарчай акругі, а асобу, якая прапануецца для вылучэння кандыдатам у дэпутаты мясцовага Савета дэпутатаў, – выбаршчыкі, якія пражываюць на тэрыторыі выбарчай акругі, у колькасці:

у абласны і Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў – не менш за 150;

у раённы, гарадскі (гарады абласнога падпарадкавання) Савет дэпутатаў – не менш за 75;

у гарадскі (горада раённага падпарадкавання), пасялковы і сельскі Савет дэпутатаў – не менш за 20.

У падпісных лістах павінны быць подпісы выбаршчыкаў, якія пражываюць на тэрыторыі выбарчай акругі.

Збор подпісаў выбаршчыкаў для вылучэння кандыдата ў дэпутаты, засведчанне падпіснога ліста праводзяцца ў парадку, прадугледжаным часткамі шостай, восьмай – дванаццатай артыкула 61 гэтага Кодэкса. Парушэнне патрабаванняў часткі дзясятай артыкула 61 гэтага Кодэкса можа быць падставай для адмовы ў рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты або адмены рашэння аб яго рэгістрацыі.

**Артыкул 66. Дакументы аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты, якія падаюцца ў акруговую, тэрытарыяльную выбарчую камісію**

Аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты вышэйшыя органы палітычных партый, кіруючыя органы арганізацыйных структур палітычных партый, сходы першасных арганізацый палітычных партый, сходы (канферэнцыі) выбаршчыкаў у працоўных калектывах прымаюць рашэнні, якія заносяцца ў пратакол. У пратаколе ўказваюцца найменне вышэйшага органа палітычнай партыі, кіруючага органа арганізацыйнай структуры палітычнай партыі, першаснай арганізацыі палітычнай партыі, даныя аб працоўным калектыве, іх адрасы і нумары тэлефонаў, колькасць членаў органа палітычнай партыі, працоўнага калектыву, колькасць удзельнікаў пасяджэння органа, сходу першаснай арганізацыі палітычнай партыі, сходу (канферэнцыі) калектыву, дата правядзення пасяджэння, сходу (канферэнцыі), вынікі галасавання, прынятае рашэнне з указаннем прозвішча, імя і імя па бацьку, даты нараджэння, пасады (занятку), месца работы і месца жыхарства, партыйнасці асобы, вылучанай кандыдатам у дэпутаты, і выбарчай акругі, па якой ён вылучаны.

Асоба, вылучаная кандыдатам у дэпутаты, не пазней чым за 40 дзён да выбараў падае ў адпаведную акруговую, тэрытарыяльную выбарчую камісію адначасова ўсе дакументы для рэгістрацыі кандыдатам і прад'яўляе пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Дакументы могуць быць пададзены ў акруговую, тэрытарыяльную выбарчую камісію прадстаўніком асобы, вылучанай кандыдатам у дэпутаты, якая ажыццяўляе свае паўнамоцтвы на падставе натарыяльна засведчанай даверанасці або даверанасці, засведчанай у парадку, устаноўленым пунктам 3 і часткай першай пункта 4 артыкула 186 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Для рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, кандыдата ў дэпутаты мясцовага Савета дэпутатаў у акруговую, тэрытарыяльную выбарчую камісію падаюцца:

пісьмовая заява аб згодзе балаціравацца па дадзенай выбарчай акрузе;

копіі старонак пашпарта, якія пацвярджаюць грамадзянства Рэспублікі Беларусь і рэгістрацыю на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, – для асоб, вылучаных кандыдатамі ў дэпутаты палітычнымі партыямі і працоўнымі калектывамі;

біяграфічныя даныя асобы, вылучанай кандыдатам у дэпутаты, па форме, устаноўленай Цэнтральнай камісіяй. Калі асоба, вылучаная кандыдатам у дэпутаты, раней мела судзімасць і (або) мае судзімасць, звесткі аб гэтым указваюцца ў біяграфічных даных;

копіі дакументаў, якія пацвярджаюць звесткі аб адукацыі, аб месцы работы, займанай пасадзе (занятку) асобы, вылучанай кандыдатам у дэпутаты, указаныя ў дакументах аб вылучэнні кандыдатам;

пісьмовая заява аб згодзе пры выбранні дэпутатам на вызваленне ад займанай пасады або на спыненне адпаведных паўнамоцтваў – для асоб, указаных у частках першай – чацвёртай артыкула 59 гэтага Кодэкса;

дэкларацыя аб даходах і маёмасці асобы, вылучанай кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, абласнога, Мінскага гарадскога, раённага, гарадскога (горада абласнога падпарадкавання) Савета дэпутатаў, па форме, зацверджанай Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь. Пры адсутнасці ў асобы, вылучанай кандыдатам у дэпутаты, даходаў за перыяд, які дэкларуецца, у дэкларацыі ўказваецца крыніца сродкаў існавання. Асоба, вылучаная кандыдатам у дэпутаты, мае права ўносіць выпраўленні ў дэкларацыю аб даходах і маёмасці да яе накіравання на праверку ў дзяржаўныя органы і арганізацыі. Выпраўленні ўносяцца шляхам закрэслівання недакладных звестак і ўказання дакладных звестак ці звестак, якімі дапаўняецца дэкларацыя, ці шляхам падавання ўдакладненай дэкларацыі.

Пры вылучэнні кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў палітычнай партыяй для рэгістрацыі дадаткова да дакументаў, указаных у частцы трэцяй гэтага артыкула, падаюцца:

пратакол вышэйшага органа палітычнай партыі аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты;

копія пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі палітычнай партыі;

копія статута палітычнай партыі;

копія дакумента, які пацвярджае членства ў палітычнай партыі асобы, вылучанай кандыдатам у дэпутаты.

Пры вылучэнні кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў працоўным калектывам арганізацыі для рэгістрацыі дадаткова да дакументаў, указаных у частцы трэцяй гэтага артыкула, падаюцца:

пратакол сходу (канферэнцыі) працоўнага калектыву арганізацыі аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты;

копія пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі арганізацыі.

Пры вылучэнні кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, кандыдата ў дэпутаты мясцовага Савета дэпутатаў шляхам збору подпісаў выбаршчыкаў для рэгістрацыі дадаткова да дакументаў, указаных у частцы трэцяй гэтага артыкула, падаюцца падпісныя лісты.

Пры вылучэнні кандыдата ў дэпутаты мясцовага Савета дэпутатаў палітычнай партыяй для рэгістрацыі дадаткова да дакументаў, указаных у частцы трэцяй гэтага артыкула, падаюцца:

пратакол кіруючага органа арганізацыйнай структуры (сходу першаснай арганізацыі) палітычнай партыі аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты;

копія пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі палітычнай партыі;

копія статута палітычнай партыі;

копія пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі (пастаноўцы на ўлік) арганізацыйнай структуры палітычнай партыі, якая вылучыла кандыдата ў дэпутаты;

копія дакумента, які пацвярджае членства ў палітычнай партыі асобы, вылучанай кандыдатам у дэпутаты.

Калі ў раённы, гарадскі, пасялковы, сельскі Савет дэпутатаў па некалькіх або ўсіх выбарчых акругах вылучаны кандыдаты ў дэпутаты ад адной палітычнай партыі, то дакументы, указаныя ў абзацах трэцім – пятым часткі сёмай гэтага артыкула, падаюцца ў адпаведную тэрытарыяльную выбарчую камісію ў адным экзэмпляры.

Пры вылучэнні кандыдата ў дэпутаты мясцовага Савета дэпутатаў працоўным калектывам арганізацыі або калектывам яе структурнага падраздзялення для рэгістрацыі дадаткова да дакументаў, указаных у частцы трэцяй гэтага артыкула, падаецца пратакол сходу (канферэнцыі) працоўнага калектыву арганізацыі або сходу яе структурнага падраздзялення аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты.

Выбаршчыкі, якія вылучылі кандыдата ў дэпутаты шляхам збору подпісаў, маюць права да здачы падпісных лістоў у акруговую, тэрытарыяльную выбарчую камісію зняць свае подпісы ў падпісных лістах, падаўшы аб гэтым заяву ў адпаведную выбарчую камісію.

**Артыкул 67. Праверка дакладнасці подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах па выбарах дэпутатаў**

Акруговыя, тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі правяраюць дакладнасць подпісаў выбаршчыкаў. Пры гэтым павінна быць праверана не менш за 20 працэнтаў подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах ад колькасці подпісаў, неабходных для рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты.

Прызнанне дакладнымі подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах праводзіцца ў парадку, прадугледжаным часткамі пятнаццатай, шаснаццатай, васямнаццатай і дзевятнаццатай артыкула 61 гэтага Кодэкса. Калі ў падпісным лісце ўтрымліваюцца подпісы выбаршчыкаў, якія не пражываюць на тэрыторыі выбарчай акругі, гэтыя подпісы не правяраюцца і не ўлічваюцца.

Калі колькасць выяўленых пры праверцы недакладных подпісаў выбаршчыкаў складзе больш за 15 працэнтаў ад колькасці правераных подпісаў, праводзіцца дадатковая праверка яшчэ 15 працэнтаў подпісаў выбаршчыкаў ад колькасці подпісаў, неабходных для рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты.

У выпадку, калі сумарная колькасць недакладных подпісаў выбаршчыкаў, выяўленых пры праверках, складзе больш за 15 працэнтаў ад агульнай колькасці правераных подпісаў у падпісных лістах, далейшая праверка подпісаў у падпісных лістах спыняецца.

Аб выніках праверкі дакладнасці подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах акруговыя, тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі складаюць пратаколы.

**Артыкул 68. Рэгістрацыя кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты**

Кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь рэгіструе Цэнтральная камісія, а кандыдатаў у дэпутаты – адпаведная акруговая, тэрытарыяльная выбарчая камісія.

Рэгістрацыя кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь пачынаецца за 35 дзён і заканчваецца за 25 дзён да выбараў, а кандыдатаў у дэпутаты пачынаецца за 40 дзён і заканчваецца за 30 дзён да выбараў.

У асобных выпадках тэрмін рэгістрацыі кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў па матываваным рашэнні Цэнтральнай камісіі можа быць прадоўжаны, але не болей чым на пяць дзён, а тэрмін рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў – адпаведнай акруговай, тэрытарыяльнай або вышэйстаячай выбарчай камісіяй на такі ж тэрмін.

Асоба, вылучаная кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у парадку, прадугледжаным часткай трэцяй артыкула 61 гэтага Кодэкса, падае ў Цэнтральную камісію да пачатку рэгістрацыі наступныя дакументы:

пісьмовую заяву аб згодзе балаціравацца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь;

біяграфічныя даныя асобы, вылучанай кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, па форме, устаноўленай Цэнтральнай камісіяй. Калі асоба, вылучаная кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, раней мела судзімасць і (або) мае судзімасць, звесткі аб гэтым указваюцца ў біяграфічных даных;

копіі дакументаў, якія пацвярджаюць звесткі аб адукацыі, аб месцы работы, займанай пасадзе (занятку) асобы, вылучанай кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, указаныя ў дакументах аб вылучэнні кандыдатам;

дэкларацыю аб даходах і маёмасці асобы, вылучанай кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, яе жонкі (мужа) і паўналетніх блізкіх сваякоў, якія сумесна з ім пражываць і вядуць агульную гаспадарку, па форме, зацверджанай Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь. Пры адсутнасці ў асобы, вылучанай кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, даходаў за перыяд, які дэкларуецца, у дэкларацыі ўказваецца крыніца сродкаў існавання. Асобы, якія падалі дэкларацыі аб даходах і маёмасці, маюць права ўносіць у іх выпраўленні да накіравання ўказаных дэкларацый на праверку ў дзяржаўныя органы і арганізацыі. Выпраўленні ўносяцца шляхам закрэслівання недакладных звестак і ўказання дакладных звестак ці звестак, якімі дапаўняецца дэкларацыя, або шляхам падавання ўдакладненай дэкларацыі.

Асоба, вылучаная кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь і якая стварыла выбарчы фонд, падае ў Цэнтральную камісію фінансавую справаздачу аб расходаванні сродкаў гэтага фонду ў тэрмін, устаноўлены часткай дваццаць чацвёртай артыкула $48^1$ гэтага Кодэкса.

Цэнтральная камісія, адпаведная акруговая, тэрытарыяльная выбарчая камісія правярае адпаведнасць парадку вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты патрабаванням гэтага Кодэкса і дакладнасць звестак у пададзеных для рэгістрацыі дакументах.

Асоба, вылучаная кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, мае права знаёміцца з матэрыяламі праверкі дакументаў, пададзеных для рэгістрацыі.

Рашэнне аб рэгістрацыі кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь прымаецца пры наяўнасці дакументаў, указаных у частках чацвёртай і пятай гэтага артыкула, і пратаколаў абласных, Мінскай гарадской камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія пацвярджаюць наяўнасць не менш за 100 тысяч подпісаў выбаршчыкаў па вылучэнні кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

Рашэнне аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты прымаецца пры наяўнасці адпаведных дакументаў, указаных у артыкуле 66 гэтага Кодэкса, якія паступілі ў акруговую, тэрытарыяльную выбарчую камісію да пачатку рэгістрацыі.

Цэнтральная камісія, адпаведная акруговая, тэрытарыяльная выбарчая камісія, устанавіўшы адпаведнасць парадку вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты патрабаванням гэтага Кодэкса, прымае рашэнне аб рэгістрацыі кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты і ў двухдзённы тэрмін пасля рэгістрацыі выдае кандыдатам адпаведныя пасведчанні.

Пратакол аб рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў падаецца адпаведна ў

Цэнтральную камісію, абласную, Мінскую гарадскую тэрытарыяльную выбарчую камісію.

Паўнамоцтвы асобы, вылучанай кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, якая ўваходзіць ў склад Цэнтральнай камісіі, тэрытарыяльнай, участковай камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, лічацца спыненымі з моманту рэгістрацыі яе кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

Паўнамоцтвы асобы, вылучанай кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, кандыдатам у дэпутаты мясцовага Савета дэпутатаў, якая ўваходзіць у склад Цэнтральнай камісіі, акруговай, тэрытарыяльнай, участковай выбарчай камісіі, лічацца спыненымі з моманту рэгістрацыі яе кандыдатам у дэпутаты.

Цэнтральная камісія, акруговая, тэрытарыяльная выбарчая камісія не пазней чым на чацвёрты дзень пасля рэгістрацыі кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты накіроўвае ў друк для апублікавання паведамленне аб рэгістрацыі з указаннем у дачыненні да кожнага кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты прозвішча, імя і імя па бацьку, даты нараджэння, пасады (занятку), месцы работы і месца жыхарства, партыйнасці, а таксама звестак аб даходах і маёмасці ў аб'ёме, які вызначаецца Цэнтральнай камісіяй, або іншым спосабам інфармуе аб гэтым выбаршчыкаў. Калі кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты раней меў судзімасць, звесткі аб гэтым указваюцца ў паведамленні. Пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Цэнтральная камісія таксама накіроўвае ў друк для апублікавання звесткі аб даходах і маёмасці асоб, указаных у абзацы пятым часткі чацвёртай гэтага артыкула.

**Артыкул 68[1]. Адмова ў рэгістрацыі кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты**

Цэнтральная камісія, акруговая, тэрытарыяльная выбарчая камісія адмаўляе ў рэгістрацыі кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты ў выпадку:

неадпаведнасці асобы, вылучанай кандыдатам, патрабаванням, якія прад'яўляюцца гэтым Кодэксам, да кандыдата;

наяўнасці судзімасці ў асобы, вылучанай кандыдатам;

незахавання патрабаванняў, прадугледжаных гэтым Кодэксам, да вылучэння кандыдата;

непадавання аднаго або некалькіх дакументаў, неабходных для рэгістрацыі кандыдата;

недастатковай для рэгістрацыі кандыдата колькасці дакладных подпісаў выбаршчыкаў, пададзеных у падтрымку вылучэння кандыдатам;

выкарыстання ў інтарэсах выбрання грашовых сродкаў або іншай матэрыяльнай дапамогі замежных дзяржаў і арганізацый, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, міжнародных арганізацый, арганізацый, заснавальнікамі (удзельнікамі, уласнікамі маёмасці) якіх з'яўляюцца замежныя дзяржавы, замежныя арганізацыі, міжнародныя арганізацыі, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства;

наяўнасці ў падпісных лістах па вылучэнні кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь у цэлым па Рэспубліцы Беларусь больш за 15 працэнтаў недакладных подпісаў ад агульнай колькасці правераных подпісаў выбаршчыкаў;

наяўнасці ў падпісных лістах па вылучэнні кандыдата ў дэпутаты больш за 15 працэнтаў недакладных подпісаў ад агульнай колькасці правераных подпісаў выбаршчыкаў;

у іншых выпадках неадпаведнасці парадку вылучэння патрабаванням гэтага Кодэкса.

Цэнтральная камісія, акруговая, тэрытарыяльная выбарчая камісія маюць права адмовіць у рэгістрацыі кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты ў выпадку:

прадстаўлення ў дэкларацыі аб даходах і маёмасці асобы, вылучанай кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, або іншых асоб, указаных у абзацы пятым часткі чацвёртай артыкула 68 гэтага Кодэкса, асоб, вылучаных кандыдатамі ў дэпутаты, не адпаведных рэчаіснасці звестак, якія маюць істотны характар. Растлумачэнне аб тым, якія не адпаведныя рэчаіснасці звесткі аб даходах і маёмасці маюць істотны характар, дае Цэнтральная камісія;

выкарыстання пераваг службовага становішча ў інтарэсах выбрання, указаных у частцы другой артыкула 73 гэтага Кодэкса;

удзелу адміністрацыі арганізацыі ў зборы подпісаў выбаршчыкаў, прымусу ў працэсе збору подпісаў і ўзнагароджання выбаршчыкаў за ўнясенне подпісу;

паўторнага парушэння асобай, якая вылучаецца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, або ініцыятыўнай групай патрабаванняў гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, калі раней ім было вынесена папярэджанне.

Цэнтральная камісія мае права адмовіць у рэгістрацыі кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь пры перавышэнні асобай, вылучанай кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, больш чым на 20 працэнтаў гранічнага памеру расходавання сродкаў выбарчага фонду, указанага ў частцы трэцяй артыкула $48^1$ гэтага Кодэкса, або выкарыстанні ў гэтых жа памерах грашовых сродкаў апрача сродкаў выбарчага фонду.

Рашэнне Цэнтральнай камісіі, акруговай, тэрытарыяльнай выбарчай камісіі аб адмове ў рэгістрацыі кандыдатам з указаннем падстаў адмовы ў рэгістрацыі выдаецца не пазней чым на наступны дзень пасля прыняцця рашэння.

Рашэнне Цэнтральнай камісіі аб адмове ў рэгістрацыі кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь можа быць абскарджана асобай, вылучанай кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь у трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння. Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін, яго рашэнне з'яўляецца канчатковым.

Рашэнне акруговай выбарчай камісіі аб адмове ў рэгістрацыі кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў можа быць абскарджана асобай, вылучанай кандыдатам у дэпутаты, у адпаведную абласную, Мінскую гарадскую тэрытарыяльную выбарчую камісію ў трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння, а рашэнне абласной, Мінскай гарадской тэрытарыяльнай выбарчай камісіі ў той жа тэрмін можа быць абскарджана ў абласны, Мінскі гарадскі суд. Суд разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін, яго рашэнне з'яўляецца канчатковым.

Рашэнне акруговай, тэрытарыяльнай выбарчай камісіі аб адмове ў рэгістрацыі кандыдатам у дэпутаты мясцовага Савета дэпутатаў можа быць абскарджана асобай, вылучанай кандыдатам у дэпутаты, у вышэйстаячую тэрытарыяльную выбарчую камісію ў трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння, а рашэнне вышэйстаячай тэрытарыяльнай выбарчай камісіі ў той жа тэрмін можа быць абскарджана адпаведна ў абласны, Мінскі гарадскі, раённы суд. Суд разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін, яго рашэнне з'яўляецца канчатковым.

### Артыкул 69. Зняцце кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты сваёй кандыдатуры

Кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты ў любы час да дня выбараў можа зняць сваю кандыдатуру, звярнуўшыся з заявай аб гэтым адпаведна ў Цэнтральную камісію, акруговую, тэрытарыяльную выбарчую камісію. У выпадку зняцця кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты сваёй кандыдатуры без уважлівых прычын, што павінна быць указана ў рашэнні камісіі, кандыдат у Прэзідэнты, у дэпутаты кампенсуе Цэнтральнай камісіі, акруговай, тэрытарыяльнай выбарчай камісіі панесеныя ёю расходы на кандыдата ў Прэзідэнты, у дэпутаты.

Рашэнне Цэнтральнай камісіі, акруговай, тэрытарыяльнай выбарчай камісіі аб прызнанні зняцця кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты сваёй кандыдатуры без уважлівых прычын можа быць абскарджана кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты адпаведна ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь, абласны, Мінскі гарадскі, раённы, гарадскі суд у трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння. Суд разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін, яго рашэнне з'яўляецца канчатковым.

Пры адмове кандыдата добраахвотна кампенсаваць расходы, вызначаныя Цэнтральнай камісіяй, акруговай, тэрытарыяльнай выбарчай камісіяй у выпадку, прадугледжаным часткай першай гэтага артыкула, спагнанне іх праводзіцца ў судовым парадку.

У выпадку выбыцця ўсіх кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, у дэпутаты мясцовага Савета дэпутатаў праводзяцца паўторныя выбары ў парадку, прадугледжаным адпаведна артыкуламі 81, 87, 94 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 70. Адмена рашэння палітычнай партыі, працоўнага калектыву аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты

Палітычная партыя, працоўны калектыў, якія вылучылі кандыдата ў дэпутаты, маюць права не пазней чым за пяць дзён да дня выбараў адмяніць сваё рашэнне аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты. Аб часе правядзення пасяджэння вышэйшага органа палітычнай партыі, кіруючага органа арганізацыйнай структуры палітычнай партыі, сходу першаснай арганізацыі палітычнай партыі, сходу (канферэнцыі) працоўнага калектыву аб адмене рашэння па вылучэнні кандыдата ў дэпутаты паведамляецца кандыдату у дэпутаты. Рашэнне па гэтым пытанні прымаецца ў парадку, прадугледжаным для вылучэння кандыдатаў у дэпутаты, і неадкладна падаецца ў адпаведную акруговую, тэрытарыяльную выбарчую камісію.

У выпадку адмены рашэння аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты без уважлівых прычын палітычная партыя або арганізацыйная структура палітычнай партыі, працоўны калектыў, якія вылучылі кандыдата ў дэпутаты, кампенсуюць акруговай, тэрытарыяльнай выбарчай камісіі панесеныя ёю расходы на кандыдата ў дэпутаты. Пры адмове добраахвотна кампенсаваць расходы, вызначаныя акруговай, тэрытарыяльнай выбарчай камісіяй, спагнанне іх праводзіцца ў судовым парадку.

### Артыкул 70$^{1}$. Адмена рашэння аб рэгістрацыі кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты за парушэнне патрабаванняў гэтага Кодэкса

Цэнтральная камісія, акруговая, тэрытарыяльная выбарчая камісія мае права без папярэдняга папярэджання адмяніць рашэнне аб рэгістрацыі кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты ў выпадку:

незахавання абмежаванняў пры правядзенні перадвыбарнай агітацыі, устаноўленых гэтым Кодэксам;

паўторнага парушэння патрабаванняў гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, калі раней было вынесена папярэджанне;

перавышэння больш чым на 20 працэнтаў гранічнага памеру расходавання сродкаў выбарчага фонду, указанага ў частцы трэцяй артыкула 48[1]гэтага Кодэкса, або выкарыстання ў гэтых жа памерах грашовых сродкаў апрача сродкаў выбарчага фонду;

удзелу адміністрацыі арганізацыі ў зборы подпісаў выбаршчыкаў, прымусу ў працэсе збору подпісаў і ўзнагароджання выбаршчыкаў за ўнясенне подпісу;

прадстаўлення ў дэкларацыі аб даходах і маёмасці асоб, указаных у абзацы другім часткі другой артыкула 68[1] гэтага Кодэкса, не адпаведных рэчаіснасці звестак, якія маюць істотны характар;

выкарыстання пераваг службовага становішча ў інтарэсах выбрання, указаных у частцы другой артыкула 73 гэтага Кодэкса;

парушэння патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да перадвыбарнай праграмы кандыдата.

Цэнтральная камісія, акруговая, тэрытарыяльная выбарчая камісія без папярэдняга паведамлення адмяняе рашэнне аб рэгістрацыі кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты:

пры выкарыстанні ў інтарэсах выбрання грашовых сродкаў або іншай матэрыяльнай дапамогі замежных дзяржаў і арганізацый, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, міжнародных арганізацый, арганізацый, заснавальнікамі (удзельнікамі, уласнікамі маёмасці) якіх з'яўляюцца замежныя дзяржавы, замежныя арганізацыі, міжнародныя арганізацыі, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства;

у выпадку страты асобай, зарэгістраванай кандыдатам, права выбірацца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, дэпутатам;

у выпадку ўстанаўлення пасля рэгістрацыі кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты абставін, прадугледжаных часткай першай артыкула 68[1] гэтага Кодэкса.

Рашэнне Цэнтральнай камісіі, акруговай, тэрытарыяльнай выбарчай камісіі аб адмене рашэння аб рэгістрацыі кандыдата з указаннем падстаў адмены рашэння выдаецца не пазней чым на наступны дзень пасля прыняцця рашэння.

Рашэнне Цэнтральнай камісіі аб адмене рашэння аб рэгістрацыі кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты можа быць абскарджана кандыдатам у Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь у трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння. Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін, яго рашэнне з'яўляецца канчатковым.

Рашэнне акруговай выбарчай камісіі аб адмене рашэння аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў можа быць абскарджана кандыдатам у абласную, Мінскую гарадскую тэрытарыяльную выбарчую камісію ў трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння, а рашэнне абласной, Мінскай гарадской тэрытарыяльнай выбарчай камісіі ў той жа тэрмін можа быць абскарджана ў

абласны, Мінскі гарадскі суд. Суд разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін, яго рашэнне з'яўляецца канчатковым.

Рашэнне акруговай, тэрытарыяльнай выбарчай камісіі аб адмене рашэння аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты мясцовага Савета дэпутатаў можа быць абскарджана кандыдатам у вышэйстаячую тэрытарыяльную выбарчую камісію ў трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння, а рашэнне вышэйстаячай тэрытарыяльнай выбарчай камісіі ў той жа тэрмін можа быць абскарджана адпаведна ў абласны, Мінскі гарадскі, раённы суд. Суд разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін, яго рашэнне з'яўляецца канчатковым.

У выпадку прыняцця рашэння аб адмене рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты абласной, Мінскай гарадской тэрытарыяльнай выбарчай камісіяй гэта рашэнне можа быць абскарджана кандыдатам у Цэнтральную камісію ў трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння. Рашэнне Цэнтральнай камісіі абскарджваецца ў парадку, прадугледжаным часткай чацвёртай гэтага артыкула.

**Артыкул 71. Парадак вылучэння кандыдатаў у дэпутаты замест выбылых**

У выпадку выбыцця кандыдатаў у дэпутаты пасля заканчэння тэрміну рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты, калі ў выбарчай акрузе не застаецца іншых кандыдатаў, а таксама калі асобы, вылучаныя кандыдатамі ў дэпутаты, да рэгістрацыі адклікалі свае заявы аб згодзе балаціравацца ў выбарчай акрузе або гэтым асобам у сувязі з парушэннямі патрабаванняў гэтага Кодэкса было адмоўлена ў рэгістрацыі, з прычыны чаго ў выбарчай акрузе не засталося іншых кандыдатаў у дэпутаты, акруговая, тэрытарыяльная выбарчая камісія звяртаецца адпаведна да палітычных партый, арганізацыйных структур палітычных партый, працоўных калектываў з прапановай вылучыць новых кандыдатаў у дэпутаты. Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты замест выбылых праводзіцца ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам. Пры выбыцці кандыдатаў у дэпутаты менш чым за 20 дзён да дня выбараў праводзяцца паўторныя выбары дэпутата Палаты прадстаўнікоў, дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў у парадку, прадугледжаным адпаведна артыкуламі 87, 94 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 72. Бюлетэнь па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, бюлетэнь па выбарах дэпутатаў**

Тэкст бюлетэня па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь зацвярджае Цэнтральная камісія, тэкст бюлетэня па выбарах дэпутата – адпаведная акруговая, тэрытарыяльная выбарчая камісія.

У бюлетэнь уключаюцца ў алфавітным парадку ўсе зарэгістраваныя кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку, даты нараджэння, пасады (занятку), месца работы і месца жыхарства, партыйнасці кожнага кандыдата ў Прэзідэнты, у дэпутаты. Справа ад даных аб кожным кандыдаце змяшчаецца пусты квадрат. У канцы пераліку кандыдатаў змяшчаецца радок «Супраць усіх кандыдатаў» з размешчаным справа ад яго пустым квадратам. Калі ў бюлетэнь унесена прозвішча толькі аднаго кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, то ў тэксце бюлетэня павінны ўтрымлівацца словы «за» і «супраць», пад якімі змяшчаюцца пустыя квадраты.

Выраб бюлетэняў па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь забяспечвае Цэнтральная камісія, па выбарах дэпутатаў – акруговыя, тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі. У выпадку неабходнасці акруговыя, тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі могуць звярнуцца з просьбай аб вырабе бюлетэняў у вышэйстаячую тэрытарыяльную выбарчую камісію.

Пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў дапускаецца выраб бюлетэняў участковымі выбарчымі камісіямі, размешчанымі за межамі Рэспублікі Беларусь.

Колькасць выраблены́х бюлетэняў не можа быць меншай за колькасць выбаршчыкаў, уключаных у спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў. Колькасць запасных бюлетэняў не павінна перавышаць 5 працэнтаў ад колькасці выбаршчыкаў. Канкрэтную колькасць выраблены́х бюлетэняў вызначае адпаведная камісія.

Перадача бюлетэняў з вышэйстаячай выбарчай камісіі ў ніжэйстаячую выбарчую камісію, у тым ліку ва ўчастковую камісію, праводзіцца па акце. Участковыя выбарчыя камісіі забяспечваюцца бюлетэнямі не пазней дня, які папярэднічае дню датэрміновага галасавання, а ўчастковыя выбарчыя камісіі, у якіх не праводзіцца датэрміновае галасаванне, – не пазней дня, які папярэднічае дню выбараў. Адказнасць за захаванасць бюлетэняў нясуць старшыні камісій, якія ажыццяўляюць атрыманне, перадачу і захоўванне бюлетэняў.

Кожны бюлетэнь павінен утрымліваць растлумачэнне аб парадку яго запаўнення.

Бюлетэні друкуюцца на беларускай або рускай мове. На адваротным баку бюлетэня ставяцца подпісы не менш чым двух асоб, якія ўваходзяць у склад участковай камісіі.

Бюлетэні па выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў розных тэрытарыяльных узроўняў павінны адрозніваца па колеры або мець распазнавальны знак.

У выпадку выбыцця кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты напярэдадні выбараў і немагчымасці вырабу новых бюлетэняў адпаведна Цэнтральная камісія, акруговая, тэрытарыяльная выбарчая камісія даручаюць участковым камісіям зрабіць у кожным бюлетэні чарнілам або шарыкавай ручкай адзнаку «выбыў» супраць прозвішча кандыдата, які выбыў. Аб гэтым таксама вывешваецца аб'ява ў памяшканні для галасавання і паведамляецца выбаршчыкам пры выдачы бюлетэняў.

Бюлетэні па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, па выбарах дэпутатаў пасля ўстанаўлення вынікаў галасавання разам з пратаколамі ўчастковых выбарчых камісій здаюцца ў адпаведныя тэрытарыяльныя, акруговыя выбарчыя камісіі.

## ГЛАВА 16
## ГАРАНТЫІ ДЗЕЙНАСЦІ І ПРАВЫ КАНДЫДАТА Ў ПРЭЗІДЭНТЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, У ДЭПУТАТЫ

### Артыкул 73. Роўнасць праў і абавязкаў кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты

Усе кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты маюць роўныя правы і выконваюць роўныя абавязкі.

Кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты не мае права выкарыстоўваць перавагі свайго службовага становішча ў інтарэсах выбрання. Пад выкарыстаннем пераваг службовага становішча ў гэтым Кодэксе разумеюцца:

прыцягненне асоб, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні або іншай службовай залежнасці, для ажыццяўлення ў рабочы час дзейнасці, якая спрыяе вылучэнню і (або) выбранню;

выкарыстанне памяшканняў, якія займаюцца дзяржаўнымі органамі, арганізацыямі, для ажыццяўлення дзейнасці, якая спрыяе вылучэнню і (або) выбранню, у выпадку, калі іншыя кандыдаты ў Прэзідэнты, у дэпутаты, якія звярнуліся па такім жа пытанні, не могуць выкарыстоўваць гэтыя памяшканні на аналагічных умовах;

выкарыстанне тэлефоннага і іншых відаў сувязі, аргтэхнікі, прызначаных для забеспячэння функцыянавання дзяржаўных органаў, арганізацый, для ажыццяўлення дзейнасці, якая спрыяе вылучэнню і (або) выбранню;

бясплатнае або на льготных умовах выкарыстанне транспартных сродкаў, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, для ажыццяўлення дзейнасці, якая спрыяе вылучэнню і (або) выбранню;

правядзенне збору подпісаў выбаршчыкаў, перадвыбарнай агітацыі ў ходзе службовых камандзіровак.

Палажэнні, прадугледжаныя абзацамі чацвёртым і пятым часткі другой гэтага артыкула, не распаўсюджваюцца на асоб, якія карыстаюцца сродкамі сувязі і транспартам у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб дзяржаўнай ахове.

Пры парушэнні патрабаванняў гэтага артыкула Цэнтральная камісія, акруговая, тэрытарыяльная выбарчая камісія мае права адмовіць у рэгістрацыі кандыдата або адмяніць рашэнне аб яго рэгістрацыі.

**Артыкул 74. Права кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты выступаць на сходах, карыстацца сродкамі масавай інфармацыі, атрымліваць інфармацыю**

Кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты з часу іх рэгістрацыі маюць роўнае права выступаць на перадвыбарных і іншых сходах, нарадах, пасяджэннях, у друку, па дзяржаўным радыё, а кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў – і па дзяржаўным тэлебачанні. Парушэнне гэтага права можа быць абскарджана ў акруговую, тэрытарыяльную выбарчую камісію, у Цэнтральную камісію.

Дзяржаўныя органы, грамадскія аб'яднанні, кіраўнікі арганізацый, органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання абавязаны садзейнічаць арганізацыі сустрэч кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты з выбаршчыкамі, а таксама забяспечваць даванне неабходных ім для правядзення выбарчай кампаніі даведачных і інфармацыйных матэрыялаў, акрамя матэрыялаў, карыстанне якімі абмежавана заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 75. Перадвыбарная праграма кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты**

Кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты мае права выступаць з праграмай сваёй будучай дзейнасці, тэкст якой вызначаецца кандыдатам. Праграма кандыдата не павінна ўтрымліваць прапаганды вайны, заклікаў да гвалтоўнага змянення канстытуцыйнага ладу, парушэння тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь, да сацыяльнай, нацыянальнай, рэлігійнай і расавай варожасці, заклікаў, якія схіляюць або якія маюць сваёй мэтай схіленне да зрыву, або адмены, або пераносу тэрміну выбараў, прызначаных у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, а таксама зняваг і паклёпу ў дачыненні да службовых асоб

Рэспублікі Беларусь, іншых кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты.

Пры парушэнні патрабаванняў гэтага артыкула Цэнтральная камісія, акруговая, тэрытарыяльная выбарчая камісія мае права адмяніць рашэнне аб рэгістрацыі кандыдата.

**Артыкул 76. Давераныя асобы кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты**

Кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь можа мець да 30 давераных асоб, кандыдат у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў – да 15, кандыдат у дэпутаты мясцовага Савета дэпутатаў – да 5 давераных асоб.

Давераныя асобы дапамагаюць кандыдату ў правядзенні выбарчай кампаніі, вядуць агітацыю за яго выбранне, прадстаўляюць інтарэсы кандыдата ва ўзаемаадносінах з дзяржаўнымі органамі, грамадскімі аб'яднаннямі, выбаршчыкамі, а таксама ў камісіях.

Кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты вызначае давераных асоб па сваім меркаванні і ў пісьмовай заяве паведамляе аб іх адпаведна ў Цэнтральную камісію, акруговую, тэрытарыяльную выбарчую камісію для рэгістрацыі. У заяве ў дачыненні да кожнай даверанай асобы ўказваюцца прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, месца жыхарства, серыя і нумар пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Адпаведная камісія ў трохдзённы тэрмін з дня паступлення заявы рэгіструе давераных асоб і выдае ім пасведчанні.

Даверанымі асобамі кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты не могуць быць кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты.

Кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты мае права ў любы час да дня выбараў адклікаць давераных асоб, паведаміўшы аб гэтым у адпаведную камісію, якая анулюе выдадзеныя ім пасведчанні. Даверанная асоба ў любы час можа скласці свае паўнамоцтвы.

Даверанная асоба кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь не можа быць ў складзе Цэнтральнай камісіі, тэрытарыяльнай і ўчастковай камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а даверанная асоба кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, у дэпутаты мясцовага Савета дэпутатаў – у складзе Цэнтральнай камісіі, акруговай, тэрытарыяльнай і ўчастковай выбарчых камісій, у якіх прадстаўляе кандыдата ў дэпутаты, і з моманту рэгістрацыі яе адпаведнай камісіяй лічыцца вызваленай ад абавязкаў у камісіі.

Давераныя асобы кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты па просьбе кандыдата могуць вызваляцца ад працоўных (службовых) абавязкаў без захавання заработнай платы пасля іх рэгістрацыі да дня выбараў. Падставай для такога вызвалення з'яўляецца рашэнне адпаведнай камісіі аб рэгістрацыі даверанай асобы і заява даверанай асобы наймальніку аб даванні яму водпуску без захавання заработнай платы для ўдзелу ў перадвыбарных мерапрыемствах.

**Артыкул 77. Вызваленне кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты ад працоўных (службовых) абавязкаў для ўдзелу ў перадвыбарных мерапрыемствах і гарантыі іх дзейнасці**

Пасля рэгістрацыі кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь (акрамя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, які балаціруецца на новы тэрмін), кандыдаты ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў (акрамя Старшыні Палаты прадстаўнікоў) вызваляюцца ад выканання працоўных (службовых) абавязкаў з дня рэгістрацыі да

дня выбараў без захавання заработнай платы. Падставай для такога вызвалення з'яўляецца рашэнне адпаведнай камісіі аб рэгістрацыі кандыдатам і заява кандыдата наймальніку аб даванні яму водпуску без захавання заработнай платы для ўдзелу ў перадвыбарных мерапрыемствах.

Кандыдаты ў дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў пасля іх рэгістрацыі пры неабходнасці па асабістай заяве могуць вызваляцца ад выканання працоўных (службовых) абавязкаў без захавання заработнай платы.

Кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты па іх асабістай заяве на гэты ж час можа быць дадзены працоўны водпуск.

Кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты не можа быць прызваны на ваенную службу або на ваенныя зборы з дня рэгістрацыі да дня выбараў, а кандыдат у дэпутаты мясцовага Савета дэпутатаў таксама не можа быць накіраваны без яго згоды ў службовую камандзіроўку.

## ГЛАВА 17
## ПАРАДАК УСТАНАЎЛЕННЯ ВЫНІКАЎ ГАЛАСАВАННЯ І ПАДВЯДЗЕННЯ ВЫНІКАЎ ВЫБАРАЎ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

### Артыкул 78. Вызначэнне вынікаў галасавання ў тэрытарыяльных камісіях па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Раённая, гарадская, раённая ў горадзе камісія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на падставе пратаколаў, атрыманых ад участковых камісій і складзеных у адпаведнасці з патрабаваннямі артыкула 55 гэтага Кодэкса, вызначае:

агульную колькасць выбаршчыкаў у раёне, горадзе, раёне ў горадзе; колькасць выбаршчыкаў, якія атрымалі бюлетэні; колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні, у тым ліку колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у датэрміновым галасаванні, колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні па месцы знаходжання, і колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні ў дзень выбараў у памяшканні ўчастка для галасавання;

колькасць галасоў, пададзеных за кожнага кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, і колькасць галасоў, пададзеных супраць усіх кандыдатаў (калі галасаванне праводзілася па адной кандыдатуры, – колькасць галасоў, пададзеных супраць кандыдата);

колькасць бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі;

колькасць бюлетэняў, выдадзеных участковым камісіям;

колькасць сапсаваных бюлетэняў;

колькасць нявыкарыстаных бюлетэняў.

Раённая, гарадская, раённая ў горадзе камісія вызначае на сваім пасяджэнні вынікі галасавання ў раёне, горадзе, раёне ў горадзе і складае пратакол. Пратакол падпісваецца старшынёй, намеснікам старшыні, сакратаром і членамі камісіі і не пазней чым на трэці дзень пасля заканчэння галасавання перадаецца асабіста старшынёй, або намеснікам старшыні, або сакратаром камісіі ў адпаведную абласную, Мінскую гарадскую камісію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і ў органы, якія ўтварылі камісію, для інфармацыі.

Абласная, Мінская гарадская камісія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на падставе пратаколаў, атрыманых ад адпаведных раённых, гарадскіх, раённых у гарадах камісій, вызначае:

агульную колькасць выбаршчыкаў у вобласці, горадзе Мінску;
колькасць выбаршчыкаў, якія атрымалі бюлетэні;
колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні, у тым ліку колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у датэрміновым галасаванні, колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні па месцы знаходжання, і колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні ў дзень выбараў у памяшканні ўчастка для галасавання;
колькасць галасоў, пададзеных за кожнага кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, і колькасць галасоў, пададзеных супраць усіх кандыдатаў (калі галасаванне праводзілася па адной кандыдатуры, – колькасць галасоў, пададзеных супраць кандыдата);
колькасць бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі;
колькасць бюлетэняў, выдадзеных адпаведным раённым, гарадскім, раённым у гарадах камісіям;
колькасць сапсаваных бюлетэняў;
колькасць нявыкарыстаных бюлетэняў.
Абласная, Мінская гарадская камісія ўстанаўлівае на сваім пасяджэнні вынікі галасавання ў вобласці, горадзе Мінску і складае аб гэтым пратакол. Пратакол падпісваецца старшынёй, намеснікам старшыні, сакратаром і членамі камісіі і не пазней чым на чацвёрты дзень пасля заканчэння галасавання асабіста старшынёй, або намеснікам старшыні, або сакратаром камісіі перадаецца ў Цэнтральную камісію і ў органы, якія ўтварылі абласную, Мінскую гарадскую камісію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, для інфармацыі.
Да пратаколаў камісій, якія накіроўваюцца ў вышэйстаячыя камісіі, дадаюцца, калі яны маюцца, асобныя думкі членаў камісіі, заявы давераных асоб кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь і іншых асоб аб парушэннях патрабаванняў гэтага Кодэкса і прынятыя па іх рашэнні камісій.
У выпадку выяўлення органамі, якія ўтварылі раённую, гарадскую, раённую ў горадзе, абласную, Мінскую гарадскую камісію, парушэнняў патрабаванняў гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь, дапушчаных у ходзе галасавання або пры падліку галасоў, аб гэтым неадкладна паведамляецца адпаведнай вышэйстаячай камісіі або Цэнтральнай камісіі.

### Артыкул 79. Вызначэнне і апублікаванне вынікаў выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Цэнтральная камісія на падставе пратаколаў абласных, Мінскай гарадской камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь не пазней чым праз 10 сутак пасля заканчэння галасавання вызначае на сваім пасяджэнні і ўносіць у пратакол наступныя даныя:
агульную колькасць выбаршчыкаў у Рэспубліцы Беларусь;
колькасць выбаршчыкаў, якія атрымалі бюлетэні;
колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні, у тым ліку колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у датэрміновым галасаванні, колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні па месцы знаходжання, і колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні ў дзень выбараў у памяшканні ўчастка для галасавання;
колькасць галасоў, пададзеных за кожнага кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, і колькасць галасоў, пададзеных супраць усіх кандыдатаў (калі

галасаванне праводзілася па адной кандыдатуры, – колькасць галасоў, пададзеных супраць кандыдата);

колькасць бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі;

колькасць сапсаваных бюлетэняў;

колькасць нявыкарыстаных бюлетэняў.

Пратакол падпісваюць старшыня, намеснік старшыні, сакратар і члены Цэнтральнай камісіі.

Лічыцца, што выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь адбыліся, калі ў галасаванні прыняло ўдзел больш за палову грамадзян Рэспублікі Беларусь, уключаных у спіс выбаршчыкаў.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь лічыцца выбраным, калі за яго прагаласавала больш за палову грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

Пры выяўленні памылак, неадпаведнасцей у пратаколах участковых і тэрытарыяльных камісій, а таксама іншых парушэнняў, дапушчаных у ходзе галасавання або пры падліку галасоў, Цэнтральная камісія па сваёй ініцыятыве або па заяве кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь мае права прыняць рашэнне аб паўторным падліку галасоў адпаведнай тэрытарыяльнай камісіяй. Заява кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь аб паўторным падліку галасоў падаецца ў Цэнтральную камісію не пазней чым на трэці дзень пасля выбараў. Паўторны падлік галасоў выбаршчыкаў праводзіцца тэрытарыяльнай камісіяй у прысутнасці члена (членаў) вышэйстаячай або Цэнтральнай камісіі, а пры неабходнасці – і ўчастковых камісій.

Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у цэлым у рэспубліцы або на асобных участках для галасавання, раёнах, гарадах, раёнах у гарадах, абласцях, горадзе Мінску могуць быць прызнаны несапраўднымі з-за дапушчаных у ходзе выбараў або пры падліку галасоў парушэнняў патрабаванняў гэтага Кодэкса, калі яны паўплывалі на вынікі выбараў у цэлым па рэспубліцы. Рашэнне аб прызнанні выбараў несапраўднымі прымае Цэнтральная камісія. Скаргу аб такім парушэнні падае кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь у Цэнтральную камісію не пазней чым на трэці дзень пасля выбараў. Рашэнне Цэнтральнай камісіі можа быць абскарджана ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь на працягу 10 дзён. Права абскарджання рашэння аб прызнанні выбараў несапраўднымі належыць кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

Цэнтральная камісія перадае паведамленне аб выніках выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь сродкам масавай інфармацыі для абнародавання (апублікавання) не пазней чым праз тры дні з моманту падпісання пратакола аб выніках выбараў.

**Артыкул 80. Другі тур галасавання**

Калі ні адзін з кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь не набраў неабходнай колькасці галасоў, то не пазней чым у двухтыднёвы тэрмін па рашэнні Цэнтральнай камісіі праводзіцца другі тур галасавання па двух кандыдатах, якія атрымалі найбольшую колькасць галасоў выбаршчыкаў. Паведамленне аб правядзенні другога туру галасавання публікуецца ў друку і абнародуецца ў іншых сродках масавай інфармацыі на наступны дзень пасля прызначэння другога туру галасавання. Другі тур галасавання праводзіцца з захаваннем патрабаванняў гэтага Кодэкса. Спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах Прэзідэнта

Рэспублікі Беларусь, удакладняюцца ўчастковай камісіяй перад другім турам галасавання.

Лічыцца, што выбары ў другім туры галасавання адбыліся, калі ў галасаванні прыняло удзел больш за палову выбаршчыкаў, уключаных у спіс грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах. Выбраным лічыцца кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, які атрымаў ў другім туры галасавання больш за палову галасоў выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

У выпадку, калі адзін з кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, уключаны ў бюлетэнь для балаціравання ў другім туры галасавання, зняў сваю кандыдатуру, другі тур галасавання праводзіцца па адной кандыдатуры. Пры гэтым кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь таксама лічыцца выбраным, калі ён атрымаў больш за палову галасоў выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

### Артыкул 81. Паўторныя выбары

Калі на выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь балаціравалася не больш за два кандыдаты і ні адзін з іх не быў выбраны, а таксама ў выпадку выбыцця ўсіх кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь або прызнання выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь выбарамі, якія не адбыліся, ці несапраўднымі, або калі другі тур галасавання не дазволіў вызначыць выбранага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Цэнтральная камісія вырашае пытанне аб прызначэнні паўторных выбараў з паўторным вылучэннем кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Пры гэтым яна можа прыняць рашэнне аб правядзенні выбараў тэрытарыяльнымі і ўчастковымі камісіямі ў новым складзе.

Паўторныя выбары праводзяцца на працягу трох месяцаў пасля асноўных выбараў. Галасаванне праводзіцца на тых жа ўчастках для галасавання па спісах, складзеных для правядзення асноўных выбараў і ўдакладненых напярэдадні паўторных выбараў.

Утварэнне камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, калі ў адпаведнасці з часткай першай гэтага артыкула было прынята рашэнне аб правядзенні паўторных выбараў камісіямі ў новым складзе, вылучэнне і рэгістрацыя кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, іншыя мерапрыемствы, звязаныя з правядзеннем паўторных выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, праводзяцца ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

У выпадку правядзення паўторных выбараў кандыдатамі ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь не могуць зноў балаціравацца грамадзяне Рэспублікі Беларусь, у дачыненні да якіх у адпаведнасці з абзацамі другім – чацвёртым, шостым і восьмым часткі першай артыкула $70^1$ гэтага Кодэкса прыняты рашэнні аб адмене рэгістрацыі іх кандыдатамі ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, а таксама грамадзяне, якія знялі без уважлівых прычын свае кандыдатуры ў першым туры выбараў.

Паведамленне аб правядзенні паўторных выбараў у трохдзённы тэрмін публікуецца ў друку і абнародуецца ў іншых сродках масавай інфармацыі.

## ГЛАВА 18
## ПАРАДАК ВЫЗНАЧЭННЯ ВЫНІКАЎ І ПАДВЯДЗЕННЯ ВЫНІКАЎ ВЫБАРАЎ ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ

### Артыкул 82. Вызначэнне вынікаў выбараў у выбарчай акрузе па выбарах дэпутата Палаты прадстаўнікоў

На падставе пратаколаў, атрыманых ад участковых выбарчых камісій і складзеных у адпаведнасці з патрабаваннямі артыкула 55 гэтага Кодэкса, акруговая выбарчая камісія вызначае:

агульную колькасць выбаршчыкаў у акрузе;

колькасць выбаршчыкаў, якія атрымалі бюлетэні;

колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні, у тым ліку колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у датэрміновым галасаванні, колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні па месцы знаходжання, і колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні ў дзень выбараў у памяшканні ўчастка для галасавання;

колькасць галасоў, пададзеных за кожнага кандыдата ў дэпутаты, і колькасць галасоў, пададзеных супраць усіх кандыдатаў у дэпутаты (калі галасаванне праводзілася па адной кандыдатуры, – колькасць галасоў, пададзеных супраць кандыдата);

колькасць бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі;

колькасць бюлетэняў, выдадзеных участковым выбарчым камісіям;

колькасць сапсаваных бюлетэняў;

колькасць нявыкарыстаных бюлетэняў.

Выбары прызнаюцца выбарамі, якія адбыліся, калі ў галасаванні прыняло ўдзел больш за палову выбаршчыкаў акругі, уключаных у спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах.

Выбраным лічыцца кандыдат у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, які атрымаў найбольшую колькасць галасоў выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні. Пры правядзенні галасавання па адной кандыдатуры кандыдат лічыцца выбраным, калі ён атрымаў больш за палову галасоў выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

Акруговая выбарчая камісія можа прызнаць выбары несапраўднымі, калі ў ходзе выбараў, або пры падліку галасоў, або пры вызначэнні вынікаў выбараў былі дапушчаны парушэнні патрабаванняў гэтага Кодэкса, якія паўплывалі на вынікі выбараў. Скаргу аб такім парушэнні падае кандыдат у дэпутаты ў акруговую выбарчую камісію не пазней чым на трэці дзень пасля выбараў. Рашэнне акруговай выбарчай камісіі можа быць абскарджана ў абласную, Мінскую гарадскую тэрытарыяльную выбарчую камісію ў трохдзённы тэрмін з дня яго прыняцця, а рашэнне абласной, Мінскай гарадской тэрытарыяльнай выбарчай камісіі – у Цэнтральную камісію ў той жа тэрмін.

Вынікі выбараў у выбарчай акрузе вызначаюцца на пасяджэнні акруговай выбарчай камісіі і заносяцца ў пратакол. Пратакол падпісваецца старшынёй, намеснікам старшыні, сакратаром і членамі камісіі і не пазней чым на чацвёрты дзень пасля заканчэння галасавання асабіста старшынёй, або намеснікам старшыні, або сакратаром камісіі перадаецца ў абласную, Мінскую гарадскую тэрытарыяльную выбарчую камісію і ў органы, якія ўтварылі акруговую выбарчую камісію, для інфармацыі. Да пратакола, які накіроўваецца ў абласную, Мінскую гарадскую тэрытарыяльную выбарчую камісію, дадаюцца, калі яны ёсць, асобныя думкі членаў камісіі, заявы даверанных асоб кандыдатаў у дэпутаты і іншых асоб аб парушэннях патрабаванняў гэтага Кодэкса і прынятыя па іх рашэнні акруговай выбарчай камісіі.

У выпадку выяўлення органамі, якія ўтварылі камісію, парушэнняў патрабаванняў гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь,

дапушчаных у ходзе галасавання або пры падліку галасоў, аб гэтым неадкладна паведамляецца абласной, Мінскай гарадской тэрытарыяльнай выбарчай камісіі або Цэнтральнай камісіі.

Паведамленне аб выніках выбараў у выбарчай акрузе акруговая выбарчая камісія накіроўвае ў друк для апублікавання не пазней чым на пяты дзень пасля выбараў. У паведамленні ўказваецца агульная колькасць выбаршчыкаў, уключаных у спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах; колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні; колькасць галасоў, пададзеных за кожнага кандыдата, і колькасць галасоў, пададзеных супраць усіх кандыдатаў у дэпутаты (калі галасаванне праводзілася па адной кандыдатуры, – колькасць галасоў, пададзеных супраць кандыдата); колькасць несапраўдных бюлетэняў; прозвішча, імя, імя па бацьку, дата нараджэння, пасада (занятак), месца работы і месца жыхарства, партыйнасць выбранага дэпутата. У выпадках прызнання выбараў выбарамі, якія не адбыліся, або несапраўднымі аб гэтым указваецца ў паведамленні акруговай выбарчай камісіі.

**Артыкул 83. Вызначэнне вынікаў выбараў абласнымі, Мінскай гарадской тэрытарыяльнымі выбарчымі камісіямі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў**

Абласная, Мінская гарадская тэрытарыяльная выбарчая камісія на падставе пратаколаў акруговых выбарчых камісій вызначае вынікі выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў на тэрыторыі вобласці, горада Мінска і прымае адпаведнае рашэнне. Рашэнне абласной, Мінскай гарадской тэрытарыяльнай выбарчай камісіі разам з пратаколамі акруговых выбарчых камісій і дакументамі, указанымі ў частцы пятай артыкула 82 гэтага Кодэкса, не пазней чым на шосты дзень пасля выбараў асабіста старшынёй, або намеснікам старшыні, або сакратаром камісіі перадаецца ў Цэнтральную камісію.

Пры выяўленні памылак, неадпаведнасцей у пратаколах участковых і акруговым выбарчых камісій, а таксама іншых парушэнняў, дапушчаных у ходзе галасавання або пры падліку галасоў, абласная, Мінская гарадская тэрытарыяльная выбарчая камісія па сваёй ініцыятыве або па заяве кандыдата ў дэпутаты мае права прыняць рашэнне аб паўторным падліку галасоў адпаведнай акруговай выбарчай камісіяй. Заява кандыдата ў дэпутаты аб паўторным падліку галасоў падаецца ў абласную, Мінскую гарадскую тэрытарыяльную выбарчую камісію не пазней чым на трэці дзень пасля выбараў. Паўторны падлік галасоў выбаршчыкаў праводзіцца акруговай выбарчай камісіяй у прысутнасці члена (членаў) абласной, Мінскай гарадской тэрытарыяльнай выбарчай камісіі, а пры неабходнасці – і ўчастковых выбарчых камісій.

Абласная, Мінская гарадская тэрытарыяльная выбарчая камісія можа прызнаць выбары несапраўднымі, калі ў ходзе выбараў, або пры падліку галасоў, або пры вызначэнні вынікаў выбараў былі дапушчаны парушэнні патрабаванняў гэтага Кодэкса, якія паўплывалі на вынікі выбараў. Рашэнне абласной, Мінскай гарадской тэрытарыяльнай выбарчай камісіі можа быць абскарджана кандыдатам у дэпутаты ў Цэнтральную камісію ў трохдзённы тэрмін з дня яго прыняцця.

**Артыкул 84. Вызначэнне вынікаў выбараў Цэнтральнай камісіяй**

Цэнтральная камісія на падставе пададзеных рашэнняў абласных, Мінскай гарадской тэрытарыяльных выбарчых камісій і пратаколаў акруговых выбарчых

камісій вызначае вынікі выбараў дэпутатаў па выбарчых акругах, рэгіструе выбраных дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў.

Цэнтральная камісія можа прызнаць выбары несапраўднымі, калі ў ходзе выбараў, або пры падліку галасоў, або пры вызначэнні вынікаў выбараў мелі месца парушэнні патрабаванняў гэтага Кодэкса, якія паўплывалі на вынікі выбараў або якія не дазваляюць дакладна вызначыць вынікі волевыяўлення выбаршчыкаў, і адмовіць у рэгістрацыі дэпутата Палаты прадстаўнікоў. Рашэнне Цэнтральнай камісіі аб прызнанні выбараў несапраўднымі можа быць абскарджана кандыдатам у дэпутаты ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь у трохдзённы тэрмін з дня яго прыняцця.

**Артыкул 85. Апублікаванне вынікаў выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў**

Цэнтральная камісія не пазней чым у трохдзённы тэрмін з дня вызначэння вынікаў выбараў накіроўвае ў друк для апублікавання паведамленне аб выніках выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў у Рэспубліцы Беларусь і спіс дэпутатаў, выбраных у кожнай выбарчай акрузе, з указаннем прозвішча, імя і імя па бацьку, даты нараджэння, пасады (занятку), месца работы і месца жыхарства, партыйнасці дэпутата.

**Артыкул 86. Выключаны**

**Артыкул 87. Паўторныя выбары**

Калі ў выбарчай акрузе выбары былі прызнаны выбарамі, якія не адбыліся, або несапраўднымі, або балаціраваўся адзін кандыдат у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, які не набраў неабходнай колькасці галасоў выбаршчыкаў, а таксама ў выпадку выбыцця ўсіх кандыдатаў у дэпутаты Цэнтральная камісія даручае адпаведна абласной, Мінскай гарадской і акруговай выбарчай камісіі правесці ў выбарчай акрузе паўторныя выбары. Пры гэтым яна можа прыняць рашэнне аб неабходнасці правядзення выбараў тэрытарыяльнай, акруговай і ўчастковымі выбарчымі камісіямі ў новым складзе. У гэтым выпадку ўтварэнне выбарчых камісій праводзіцца ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам. Галасаванне праводзіцца на тых жа ўчастках для галасавання па спісах, складзеных для правядзення асноўных выбараў і ўдакладненых напярэдадні паўторных выбараў.

Паўторныя выбары прызначаюцца Цэнтральнай камісіяй не пазней чым за тры месяцы да іх правядзення і арганізуюцца з захаваннем патрабаванняў гэтага Кодэкса.

Паўторныя выбары прызнаюцца выбарамі, якія адбыліся, калі ў галасаванні прыняло удзел больш за палову выбаршчыкаў акругі, уключаных у спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах.

Выбраным лічыцца кандыдат у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, які атрымаў найбольшую колькасць галасоў выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні. Пры правядзенні галасавання па адной кандыдатуры кандыдат лічыцца выбраным, калі ён атрымаў больш за палову галасоў выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

У выпадку правядзення паўторных выбараў кандыдатамі ў дэпутаты не могуць ізноў балаціравацца грамадзяне Рэспублікі Беларусь, у дачыненні да якіх у адпаведнасці з абзацамі другім – чацвёртым, шостым і восьмым часткі першай артыкула 70[1] гэтага Кодэкса прыняты рашэнні аб адмене рэгістрацыі іх

кандыдатамі ў дэпутаты, а таксама якія знялі без уважлівых прычын свае кандыдатуры пры правядзенні выбараў.

### Артыкул 88. Правядзенне выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў замест выбылых

У выпадку адклікання дэпутата Палаты прадстаўнікоў, датэрміновага спынення дэпутацкіх паўнамоцтваў па іншых прычынах у адпаведнай выбарчай акрузе праводзяцца новыя выбары. Выбары прызначаюцца Цэнтральнай камісіяй не пазней чым за тры месяцы да іх правядзення і арганізуюцца з захаваннем патрабаванняў гэтага Кодэкса.

Пры выбыцці дэпутата Палаты прадстаўнікоў менш чым за год да сканчэння тэрміну паўнамоцтваў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў выбары новага дэпутата Палаты прадстаўнікоў замест выбылага не праводзяцца.

## ГЛАВА 19
## ПАРАДАК ВЫЗНАЧЭННЯ ВЫНІКАЎ І ПАДВЯДЗЕННЯ ВЫНІКАЎ ВЫБАРАЎ ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ

### Артыкул 89. Вызначэнне вынікаў выбараў у выбарчай акрузе па выбарах дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў

На падставе пратаколаў, атрыманых ад участковых (участковай) выбарчых камісій і складзеных у адпаведнасці з патрабаваннямі артыкула 55 гэтага Кодэкса, тэрытарыяльная, акруговая выбарчая камісія вызначае:

агульную колькасць выбаршчыкаў у акрузе;

колькасць выбаршчыкаў, якія атрымалі бюлетэні;

колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні, у тым ліку колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у датэрміновым галасаванні, колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні па месцы знаходжання, і колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні ў дзень выбараў у памяшканні ўчастка для галасавання;

колькасць галасоў, пададзеных за кожнага кандыдата ў дэпутаты, і колькасць галасоў, пададзеных супраць усіх кандыдатаў у дэпутаты (калі галасаванне праводзілася па адной кандыдатуры, – колькасць галасоў, пададзеных супраць кандыдата);

колькасць бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі;

колькасць бюлетэняў, выдадзеных участковым выбарчым камісіям;

колькасць сапсаваных бюлетэняў;

колькасць нявыкарыстаных бюлетэняў.

Выбраным лічыцца кандыдат у дэпутаты мясцовага Савета дэпутатаў, які атрымаў найбольшую колькасць галасоў выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні. Пры правядзенні галасавання па адной кандыдатуры кандыдат лічыцца выбраным, калі ён атрымаў больш за палову галасоў выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

Тэрытарыяльная, акруговая выбарчая камісія можа прызнаць выбары несапраўднымі, калі ў ходзе выбараў, або пры падліку галасоў, або пры вызначэнні вынікаў выбараў былі дапушчаны парушэнні патрабаванняў гэтага Кодэкса, якія паўплывалі на вынікі выбараў. Скаргу аб такім парушэнні падае кандыдат у

дэпутаты ў тэрытарыяльную, акруговую выбарчую камісію не пазней чым на трэці дзень пасля выбараў. Рашэнне тэрытарыяльнай, акруговай выбарчай камісіі можа быць абскарджана ў вышэйстаячую тэрытарыяльную выбарчую камісію ў трохдзённы тэрмін з дня яго прыняцця.

Вынікі выбараў у кожнай выбарчай акрузе вызначаюцца на пасяджэнні тэрытарыяльнай, акруговай выбарчай камісіі і заносяцца ў пратакол. Пратакол падпісваюць старшыня, намеснік старшыні, сакратар і члены камісіі.

Акруговая выбарчая камісія па выбарах у абласны Савет дэпутатаў і тэрытарыяльная выбарчая камісія, якая ажыццяўляе ў раёне горада Мінска паўнамоцтвы акруговых выбарчых камісій па выбарах у Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў, не пазней чым на пяты дзень пасля заканчэння галасавання перадае пратакол адпаведна ў абласную, Мінскую гарадскую тэрытарыяльную выбарчую камісію і ў органы, якія ўтварылі камісію, для інфармацыі. Пратакол перадае асабіста старшыня, або намеснік старшыні, або сакратар камісіі. Да пратакола, які накіроўваецца ў абласную, Мінскую гарадскую тэрытарыяльную выбарчую камісію, дадаюцца, калі яны маюцца, асобныя думкі членаў камісіі, заявы давераных асоб кандыдатаў у дэпутаты і іншых асоб аб парушэннях патрабаванняў гэтага Кодэкса і прынятыя па іх рашэнні адпаведнай акруговай, тэрытарыяльнай выбарчай камісіі.

Тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі па выбарах у раённыя, гарадскія, пасялковыя, сельскія Саветы дэпутатаў перадаюць пратаколы аб выніках выбараў у органы, якія ўтварылі камісіі, для інфармацыі.

У выпадку выяўлення органамі, якія ўтварылі камісію, парушэнняў патрабаванняў гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь, дапушчаных у ходзе галасавання або пры падліку галасоў, аб гэтым неадкладна паведамляецца адпаведнай вышэйстаячай выбарчай камісіі або Цэнтральнай камісіі.

Пры выяўленні памылак, неадпаведнасцей у пратаколах участковых, тэрытарыяльнай, акруговай выбарчых камісій, а таксама іншых парушэнняў, дапушчаных у ходзе галасавання або пры падліку галасоў, вышэйстаячая выбарчая камісія па сваёй ініцыятыве або па заяве кандыдата ў дэпутаты мае права прыняць рашэнне аб паўторным падліку галасоў адпаведнай тэрытарыяльнай, акруговай выбарчай камісіяй. Заява кандыдата ў дэпутаты аб паўторным падліку галасоў падаецца ў вышэйстаячую выбарчую камісію не пазней чым на трэці дзень пасля выбараў. Паўторны падлік галасоў выбаршчыкаў праводзіцца тэрытарыяльнай, акруговай выбарчай камісіяй у прысутнасці члена (членаў) вышэйстаячай выбарчай камісіі, а пры неабходнасці – і ўчастковых выбарчых камісій.

**Артыкул 90. Выключаны**

**Артыкул 91. Вызначэнне вынікаў выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў тэрытарыяльнымі выбарчымі камісіямі**

Тэрытарыяльная выбарчая камісія па выбарах у абласны, Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў на падставе адпаведна пратаколаў акруговых выбарчых камісій па выбарах у абласны Савет дэпутатаў, тэрытарыяльных выбарчых камісій, якія ажыццяўляюць у раёнах горада Мінска паўнамоцтвы акруговых выбарчых камісій па выбарах у Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў, а тэрытарыяльная выбарчая камісія па выбарах у раённы, гарадскі, пасялковы, сельскі Савет дэпутатаў на падставе пратаколаў участковых выбарчых камісій і пратаколаў аб выніках выбараў па выбарчых акругах падводзяць вынікі выбараў у адпаведны мясцовы Савет

дэпутатаў і праводзяць рэгістрацыю дэпутатаў, выбраных па кожнай выбарчай акрузе.

Тэрытарыяльная выбарчая камісія можа прызнаць выбары несапраўднымі, калі ў ходзе выбараў, або пры падліку галасоў, або вызначэнні вынікаў выбараў мелі месца парушэнні патрабаванняў гэтага Кодэкса, якія паўплывалі на вынікі выбараў або якія не дазваляюць дакладна вызначыць вынікі волевыяўлення выбаршчыкаў, і адмовіць у рэгістрацыі дэпутата. Рашэнне тэрытарыяльнай выбарчай камісіі аб прызнанні выбараў несапраўднымі можа быць абскарджана кандыдатам у дэпутаты адпаведна ў абласны, Мінскі гарадскі, раённы, гарадскі суд у трохдзённы тэрмін з дня яго прыняцця.

**Артыкул 92. Апублікаванне вынікаў выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў**

Абласныя, Мінская гарадская, раённыя, гарадскія, пасялковыя, сельскія тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі не пазней чым на пяты дзень пасля выбараў накіроўваюць у друк для апублікавання паведамленне аб выніках выбараў і спіс дэпутатаў адпаведных абласных, Мінскага гарадскога, раённых, гарадскіх, пасялковых, сельскіх Саветаў дэпутатаў, выбраных па кожнай выбарчай акрузе, з указаннем прозвішча, імя і імя па бацьку, даты нараджэння, пасады (занятку), месца работы і месца жыхарства, партыйнасці дэпутата або іншым спосабам інфармуюць аб гэтым выбаршчыкаў. У паведамленні ўказваецца агульная колькасць выбаршчыкаў, уключаных у спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні, колькасць галасоў, пададзеных за кожнага кандыдата, і колькасць галасоў, пададзеных супраць усіх кандыдатаў (калі галасаванне праводзілася па адной кандыдатуры, – колькасць галасоў, пададзеных супраць кандыдата), колькасць несапраўдных бюлетэняў.

У выпадках прызнання выбараў несапраўднымі аб гэтым указваецца ў паведамленні тэрытарыяльнай выбарчай камісіі.

**Артыкул 93. Выключаны**

**Артыкул 94. Паўторныя выбары**

Калі ў выбарчай акрузе выбары былі прызнаны несапраўднымі або калі балаціраваўся адзін кандыдат у дэпутаты мясцовага Савета дэпутатаў, які не набраў неабходнай колькасці галасоў выбаршчыкаў, а таксама ў выпадку выбыцця ўсіх кандыдатаў у дэпутаты абласная, Мінская гарадская тэрытарыяльная выбарчая камісія даручае адпаведна акруговай выбарчай камісіі, тэрытарыяльнай выбарчай камісіі, якая ажыццяўляе ў раёне горада Мінска паўнамоцтвы акруговых выбарчых камісій па выбарах у Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў, правесці ў выбарчай акрузе паўторныя выбары, а раённая, гарадская, пасялковая, сельская тэрытарыяльная выбарчая камісія прымае рашэнне аб правядзенні ў выбарчай акрузе паўторных выбараў. Пры гэтым камісіі могуць прыняць рашэнне аб неабходнасці правядзення выбараў адпаведнай акруговай, тэрытарыяльнай і ўчастковымі выбарчымі камісіямі ў новым складзе. У гэтым выпадку ўтварэнне выбарчых камісій праводзіцца ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам. Галасаванне праводзіцца на тых жа ўчастках для галасавання па спісах, складзеных для правядзення асноўных выбараў і ўдакладненых напярэдадні паўторных выбараў.

Паўторныя выбары прызначаюцца тэрытарыяльнай выбарчай камісіяй не пазней чым за тры месяцы да іх правядзення і арганізуюцца з захаваннем патрабаванняў гэтага Кодэкса.

У выпадку правядзення паўторных выбараў кандыдатамі ў дэпутаты не могуць зноў балаціравацца грамадзяне, у дачыненні да якіх у адпаведнасці з абзацамі другім – чацвёртым, шостым і восьмым часткі першай артыкула 70[1] гэтага Кодэкса прыняты рашэнні аб адмене рэгістрацыі іх кандыдатамі ў дэпутаты, а таксама якія знялі без уважлівых прычын свае кандыдатуры пры правядзенні выбараў.

### Артыкул 95. Правядзенне выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў замест выбылых

У выпадку адклікання дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў, датэрміновага спынення дэпутацкіх паўнамоцтваў па іншых прычынах у адпаведнай выбарчай акрузе праводзяцца новыя выбары. Выбары прызначаюцца адпаведным мясцовым Саветам дэпутатаў не пазней чым за тры месяцы да іх правядзення і арганізуюцца з захаваннем патрабаванняў гэтага Кодэкса.

Пры выбыцці дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў менш чым за шэсць месяцаў да сканчэння тэрміну паўнамоцтваў дэпутатаў мясцовага Савета дэпутатаў выбары новага дэпутата замест выбылага не праводзяцца.

Калі пры правядзенні выбараў дэпутата гарадскога (горада раённага падпарадкавання), пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў замест выбылага тэрыторыя выбарчай акругі меншая за тэрыторыю ўчастка для галасавання або роўная ёй, участковая выбарчая камісія не ўтвараецца. У гэтым выпадку паўнамоцтвы ўчастковай выбарчай камісіі ажыццяўляе тэрытарыяльная выбарчая камісія па выбарах у дадзены мясцовы Савет дэпутатаў. Галасаванне можа быць аб'яўлена скончаным і раней за 20 гадзін, калі прагаласавалі ўсе выбаршчыкі, уключаныя ў спіс.

### Артыкул 96. Правядзенне выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў у новаўтвораных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках і пры змяненні меж адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі

Калі ў новаўтвораных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках утварэнне мясцовага Савета дэпутатаў немагчымае з прычыны адсутнасці або недастатковай колькасці дэпутатаў, выбраных у мясцовы Савет дэпутатаў на тэрыторыі, якая ўвайшла ў склад новаўтворанай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, то ў адпаведны мясцовы Савет дэпутатаў праводзяцца новыя выбары.

Калі ў выніку змянення меж адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі мясцовы Савет дэпутатаў не можа ажыццяўляць сваю дзейнасць з прычыны недастатковай колькасці дэпутатаў, то ў адпаведны мясцовы Савет дэпутатаў праводзяцца новыя выбары.

Выбары ў выпадках, указаных у частках першай і другой гэтага артыкула, прызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і праводзяцца ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам. Колькасць выбарчых акруг, якія падлягаюць утварэнню па выбарах у мясцовы Савет дэпутатаў, і сярэднюю колькасць выбаршчыкаў на выбарчую акругу вызначае адпаведны вышэйстаячы мясцовы Савет дэпутатаў, а тэрытарыяльную выбарчую камісію па выбарах у мясцовы Савет

дэпутатаў утвараюць вышэйстаячыя дзяржаўныя органы ў парадку, устаноўленым артыкулам 34 гэтага Кодэкса.

Пры выбарах дэпутатаў абласнога Савета дэпутатаў у новаўтворанай вобласці колькасць выбарчых акруг, якія падлягаюць утварэнню, і сярэднюю колькасць выбаршчыкаў на выбарчую акругу ўстанаўлівае Цэнтральная камісія. Абласную тэрытарыяльную і акруговыя выбарчыя камісіі таксама ўтварае Цэнтральная камісія.

# РАЗДЗЕЛ VI
# ВЫБАРЫ ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ

## ГЛАВА 20
## ПАРАДАК ПРЫЗНАЧЭННЯ ВЫБАРАЎ ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ. ВЫЛУЧЭННЕ КАНДЫДАТАЎ У ЧЛЕНЫ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ

### Артыкул 97. Прызначэнне выбараў членаў Савета Рэспублікі

Выбары членаў Савета Рэспублікі новага склікання прызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь не пазней за чатыры месяцы і праводзяцца не пазней за 30 дзён да заканчэння паўнамоцтваў Савета Рэспублікі дзеючага склікання.

Ад кожнай вобласці і горада Мінска тайным галасаваннем выбіраюцца на пасяджэннях дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню кожнай вобласці і горада Мінска па восем членаў Савета Рэспублікі.

Пры датэрміновым спыненні паўнамоцтваў Савета Рэспублікі праводзяцца пазачарговыя выбары на працягу трох месяцаў з дня датэрміновага спынення паўнамоцтваў палаты, якія прызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Паведамленне аб даце правядзення выбараў абнародуецца ў сродках масавай інфармацыі не пазней за тры дні пасля прызначэння выбараў.

### Артыкул 98. Патрабаванні, якія прад'яўляюцца да кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі

Кандыдатам у члены Савета Рэспублікі можа быць грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які дасягнуў 30 год і які пражыў на тэрыторыі адпаведнай вобласці, горада Мінска не менш за пяць гадоў.

Кандыдатамі ў члены Савета Рэспублікі не могуць быць вылучаны грамадзяне, якія не маюць права ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь займаць пасады ў дзяржаўных органах і іншых дзяржаўных арганізацыях у сувязі з наяўнасцю судзімасці.

### Артыкул 99. Несумяшчальнасць статусу члена Савета Рэспублікі са службовым становішчам, паўнамоцтвамі дэпутата Палаты прадстаўнікоў

Член Савета Рэспублікі не можа быць адначасова Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, дэпутатам Палаты прадстаўнікоў, членам Урада Рэспублікі Беларусь, суддзёй.

### Артыкул 100. Вылучэнне кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі

Вылучэнне кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі пачынаецца за 90 дзён і заканчваецца за 60 дзён да заканчэння паўнамоцтваў Савета Рэспублікі дзеючага склікання.

Права вылучэння кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі належыць прэзідыумам мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню і адпаведным выканаўчым камітэтам – раённым, гарадскім (гарадоў абласнога падпарадкавання), а ў горадзе Мінску – прэзідыуму Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і Мінскаму гарадскому выканаўчаму камітэту. У сумесным пасяджэнні гэтых органаў павінны ўдзельнічаць не менш за дзве трэці ад складу адпаведнага прэзідыума Савета дэпутатаў і выканаўчага камітэта.

Рашэнне сумеснага пасяджэння прэзідыума мясцовага Савета дэпутатаў базавага ўзроўню і адпаведнага выканаўчага камітэта аб вылучэнні кандыдата ў члены Савета Рэспублікі прымаецца большасцю галасоў ад іх складу.

Прэзідыум раённага, гарадскога (горада абласнога падпарадкавання) Савета дэпутатаў і адпаведны выканаўчы камітэт могуць вылучыць толькі аднаго кандыдата ў члены Савета Рэспублікі. Адзін і той жа кандыдат у члены Савета Рэспублікі можа быць вылучаны некалькімі прэзідыумамі раённых, гарадскіх (гарадоў абласнога падпарадкавання) Саветаў дэпутатаў і адпаведнымі выканаўчымі камітэтамі.

У рашэнні аб вылучэнні асобы кандыдатам у члены Савета Рэспублікі ўказваюцца прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, пасада (занятак), месца работы і месца жыхарства, партыйнасць і час пражывання на тэрыторыі вобласці, горада Мінска.

Рашэнне аб вылучэнні асобы кандыдатам у члены Савета Рэспублікі падпісваецца старшынёй мясцовага Савета дэпутатаў і старшынёй адпаведнага выканаўчага камітэта і перадаецца ў Цэнтральную камісію не пазней чым у трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння разам з наступнымі дакументамі:

пісьмовай заявай асобы, вылучанай кандыдатам у члены Савета Рэспублікі, аб згодзе балаціравацца ў Савет Рэспублікі ад вобласці, горада Мінска;

біяграфічнымі данымі асобы, вылучанай кандыдатам у члены Савета Рэспублікі, па форме, устаноўленай Цэнтральнай камісіяй;

дэкларацыяй аб даходах і маёмасці асобы, вылучанай кандыдатам у члены Савета Рэспублікі, па форме, зацверджанай Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

пісьмовай заявай аб згодзе пры выбранні членам Савета Рэспублікі на вызваленне ад займанай пасады або на спыненне паўнамоцтваў дэпутата Палаты прадстаўнікоў – для асоб, указаных у артыкуле 99 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 101. Рэгістрацыя кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі

Кандыдаты ў члены Савета Рэспублікі рэгіструюцца Цэнтральнай камісіяй. Рашэнне аб рэгістрацыі кандыдата ў члены Савета Рэспублікі прымаецца на падставе дакументаў, якія паступілі да пачатку рэгістрацыі, указаных ў частцы шостай артыкула 100 гэтага Кодэкса.

Рэгістрацыя кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі пачынаецца за 60 дзён і заканчваецца за 55 дзён да заканчэння паўнамоцтваў Савета Рэспублікі дзеючага склікання.

Цэнтральная камісія правярае адпаведнасць парадку вылучэння кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі, складае аб гэтым заключэнне і прымае рашэнне аб рэгістрацыі кандыдатамі ў члены Савета Рэспублікі або матываванае рашэнне аб

адмове ў рэгістрацыі. Рашэнне Цэнтральнай камісіі аб адмове ў рэгістрацыі ў трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння можа быць абскарджана асобай, вылучаным кандыдатам у члены Савета Рэспублікі, у Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь. Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін; яго рашэнне з'яўляецца канчатковым. Зарэгістраваным кандыдатам у члены Савета Рэспублікі выдаюцца адпаведныя пасведчанні.

Кандыдат у члены Савета Рэспублікі з дня яго рэгістрацыі да дня апублікавання вынікаў выбараў не можа быць накіраваны без яго згоды ў службовую камандзіроўку, а таксама прызваны на ваенную службу або на ваенныя зборы.

Цэнтральная камісія не пазней чым на чацвёрты дзень пасля рэгістрацыі кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі накіроўвае ў друк для апублікавання паведамленне аб рэгістрацыі кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі з указаннем прозвішча, імя і імя па бацьку, даты нараджэння, пасады (занятку), месца работы і месца жыхарства, партыйнасці, часу пражывання на тэрыторыі вобласці, горада Мінска кожнага кандыдата.

## ГЛАВА 21
## ПРАВЯДЗЕННЕ ПАСЯДЖЭННЯ ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ БАЗАВАГА ЎЗРОЎНЮ ВОБЛАСЦІ, ДЭПУТАТАЎ МІНСКАГА ГАРАДСКОГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПА ВЫБАРАХ ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ

### Артыкул 102. Парадак склікання і правядзення пасяджэння дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў па выбарах членаў Савета Рэспублікі

Пасяджэнне дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў па выбарах членаў Савета Рэспублікі склікаецца не пазней чым за 35 дзён да заканчэння паўнамоцтваў Савета Рэспублікі па сумесным рашэнні прэзідыума абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і абласнога, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, прынятым большасцю галасоў ад іх складу. У сумесным пасяджэнні гэтых органаў павінны ўдзельнічаць не менш за дзве трэці ад складу адпаведнага прэзідыума Савета дэпутатаў і выканаўчага камітэта. Дата правядзення пасяджэння вызначаецца ў рашэнні.

Пасяджэнне дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў лічыцца правамоцным, калі ў ім прымае ўдзел больш за палову ад агульнай колькасці дэпутатаў, выбраных у мясцовыя Саветы дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў. Пры гэтым у пасяджэнні дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці павінны прыняць удзел не менш за адну чвэрць дэпутатаў ад кожнага мясцовага Савета дэпутатаў базавага ўзроўню.

Пасяджэнне дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў па выбарах членаў Савета Рэспублікі адкрывае найстарэйшы па ўзросце дэпутат і вядзе яго да выбрання старшыні пасяджэння.

Для забеспячэння работы пасяджэння выбіраюцца сакратарыят, мандатная і падліковая камісіі.

Па прадстаўленні мандатнай камісіі прымаецца рашэнне аб прызнанні правамоцным пасяджэння дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў.

На пасяджэнні заслухоўваецца заключэнне Цэнтральнай камісіі аб правамоцнасці вылучэння кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі ад вобласці, горада Мінска і яе паведамленне аб іх рэгістрацыі.

Рашэнне пасяджэння дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў прымаецца большасцю галасоў ад колькасці ўдзельнікаў дэпутатаў гэтых Саветаў.

**Артыкул 103. Абмеркаванне кандыдатур, якія прапануюцца для выбрання членамі Савета Рэспублікі**

На пасяджэнні дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў па выбарах членаў Савета Рэспублікі праводзіцца абмеркаванне кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі, вылучаных на сумесных пасяджэннях прэзідыумаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і адпаведных выканаўчых камітэтаў. Вылучэнне іншых кандыдатур у члены Савета Рэспублікі на пасяджэнні дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў не праводзіцца.

Кандыдаты ў члены Савета Рэспублікі выступаюць на пасяджэнні з праграмай будучай дзейнасці.

Кожны дэпутат, які бярэ ўдзел у рабоце пасяджэння, мае права задаваць пытанні кандыдату ў члены Савета Рэспублікі, выказваць сваё меркаванне, агітаваць за або супраць вылучанай кандыдатуры.

Абмеркаванне кандыдатур спыняецца па рашэнні пасяджэння.

Кандыдат у члены Савета Рэспублікі на пасяджэнні можа зняць сваю кандыдатуру.

На пасяджэнні прымаецца рашэнне аб уключэнні кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі ў бюлетэнь для галасавання.

**Артыкул 104. Арганізацыя галасавання па выбарах членаў Савета Рэспублікі**

Для арганізацыі тайнага галасавання па выбарах членаў Савета Рэспублікі і вызначэння яго вынікаў дэпутаты, якія бяруць удзел у пасяджэнні, выбіраюць са свайго складу падліковую камісію ў колькасці 9–15 членаў. У склад падліковай камісіі не могуць уваходзіць кандыдаты ў члены Савета Рэспублікі.

Падліковая камісія выбірае са свайго складу старшыню, намесніка старшыні і сакратара камісіі. Рашэнні падліковай камісіі прымаюцца большасцю галасоў яе складу.

Бюлетэні для галасавання выпрацоўвае падліковая камісія па вызначанай Цэнтральнай камісіяй форме ў колькасці, якая адпавядае колькасці ўдзельнікаў пасяджэння. Тэкст бюлетэня зацвярджаецца падліковай камісіяй.

У бюлетэнь для галасавання ў алфавітным парадку ўключаюцца кандыдаты ў члены Савета Рэспублікі з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку, даты

нараджэння, пасады (занятку), месца работы і месца жыхарства, партыйнасці і часу пражывання на тэрыторыі вобласці, горада Мінска кожнага кандыдата. Справа ад даных аб кожным кандыдаце змяшчаецца пусты квадрат. У канцы пераліку кандыдатаў змяшчаецца радок «Супраць усіх кандыдатаў» з размешчаным справа ад яго пустым квадратам. Калі пры правядзенні паўторных выбараў або выбараў члена Савета Рэспублікі замест выбылага ў бюлетэнь для галасавання ўнесена прозвішча толькі аднаго кандыдата ў члены Савета Рэспублікі, то ў тэксце бюлетэня павінны ўтрымлівацца словы «за» і «супраць», пад якімі змяшчаюцца пустыя квадраты.

На адваротным баку бюлетэня для галасавання ставяцца подпісы не менш чым двух асоб, якія ўваходзяць у склад падліковай камісіі.

Галасаванне па выбарах членаў Савета Рэспублікі праводзіцца ў спецыяльна адведзеным для гэтага памяшканні, у якім у дастатковай колькасці абсталёўваюцца кабіны або пакоі для тайнага галасавання, вызначаюцца месцы выдачы бюлетэняў. Скрынкі для галасавання ставяцца такім чынам, каб асобы, якія галасуюць, пры падыходзе да іх абавязкова праходзілі праз кабіны або пакоі для тайнага галасавання.

Час, месца і парадак правядзення галасавання вызначае падліковая камісія і аб'яўляе яе старшынёй.

Перад пачаткам галасавання скрынкі для галасавання правяраюцца, пламбіруюцца або апячатваюцца старшынёй падліковай камісіі ў прысутнасці членаў падліковай камісіі.

Кожнаму дэпутату, які прымае ўдзел у рабоце пасяджэння, выдаецца бюлетэнь для галасавання. Бюлетэні выдаюцца членамі падліковай камісіі ў адпаведнасці са спісам дэпутатаў, якія прымаюць удзел у рабоце пасяджэння, пры прад'яўленні дэпутатам яго дэпутацкага пасведчання. Дэпутат распісваецца ў атрыманні бюлетэня ў спісе дэпутатаў.

### Артыкул 105. Правядзенне галасавання па выбарах членаў Савета Рэспублікі

Пры правядзенні выбараў членаў Савета Рэспублікі кожны ўдзельнік пасяджэння галасуе асабіста. Галасаванне за іншых дэпутатаў не дапускаецца.

Запаўненне бюлетэняў праводзіцца ў кабіне або пакоі для тайнага галасавання. Пры галасаванні ўдзельнік пасяджэння ставіць любы знак у пустых квадратах, размешчаных справа ад прозвішчаў тых кандыдатаў, за якіх ён галасуе, але не болей чым у васьмі або ў квадраце, размешчаным справа ад радка «Супраць усіх кандыдатаў». Калі ў бюлетэнь унесена прозвішча толькі аднаго кандыдата, то пры галасаванні за кандыдата ўдзельнік пасяджэння ставіць любы знак у квадраце пад словам «за», а пры галасаванні супраць кандыдата ставіць любы знак у квадраце пад словам «супраць».

Запоўнены бюлетэнь дэпутат апускае ў скрынку для галасавання. Скрынкі для галасавання павінны знаходзіцца ў полі зроку членаў падліковай камісіі і асоб, указаных у частцы чацвёртай артыкула 13 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 106. Вызначэнне вынікаў галасавання па выбарах членаў Савета Рэспублікі

Падлік галасоў дэпутатаў павінен праводзіцца непасрэдна членамі падліковай камісіі без перапынку да атрымання вынікаў галасавання.

Падліковая камісія па спісе дэпутатаў, зарэгістраваных для ўдзелу ў пасяджэнні, устанаўлівае агульную колькасць дэпутатаў, якія бяруць удзел у пасяджэнні, а таксама колькасць дэпутатаў, якія атрымалі бюлетэні. На падставе бюлетэняў, якія знаходзіліся ў скрынцы для галасавання, падліковая камісія устанаўлівае агульную колькасць дэпутатаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні, колькасць галасоў, пададзеных за кожнага кандыдата ў члены Савета Рэспублікі, і колькасць галасоў, пададзеных супраць усіх кандыдатаў (калі галасаванне праводзілася па адной кандыдатуры, – колькасць галасоў, пададзеных супраць кандыдата), колькасць бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі.

Прызнаюцца несапраўднымі бюлетэні нявызначанага ўзору, а таксама бюлетэні, у якіх пастаўлены знакі ў большай колькасці квадратаў, чым павінна быць выбрана членаў Савета Рэспублікі ад вобласці, горада Мінска, або не пастаўлены знак ні ў адным з іх, або бюлетэні, у якія ўнесена прозвішча толькі аднаго кандыдата і знак пастаўлены ў двух квадратах або не пастаўлены ні ў адным з іх, а таксама бюлетэні, на адваротным баку якіх адсутнічаюць подпісы асоб, якія ўваходзяць у склад падліковай камісіі.

Вынікі падліку галасоў разглядаюцца на пасяджэнні падліковай камісіі і заносяцца ў пратакол. Запаўненне пратакола алоўкам і ўнясенне ў яго якіх бы там ні было выпраўленняў не дапускаюцца.

Пратакол складаецца ў двух экзэмплярах, якія падпісваюцца ўсім складам падліковай камісіі.

Па дакладзе падліковай камісіі на пасяджэнні дэпутатаў адкрытым галасаваннем прымаецца рашэнне аб зацвярджэнні вынікаў галасавання.

Выбраным лічыцца кандыдат у члены Савета Рэспублікі, які атрымаў больш за палову галасоў дэпутатаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

Калі пры правядзенні выбараў вызначаная колькасць членаў Савета Рэспублікі, якія падлягаюць выбранню ад вобласці, горада Мінска, не было выбрана, у тэрмін, вызначаны Цэнтральнай камісіяй, праводзяцца паўторныя выбары ў парадку, прадугледжаным раздзелам VI гэтага Кодэкса.

Да пратакола падліковай камісіі дадаюцца спіс дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, якія прынялі ўдзел у пасяджэнні, а таксама асобныя думкі, калі яны маюцца, членаў падліковай камісіі і заявы іншых асоб аб парушэннях патрабаванняў гэтага Кодэкса, дапушчаных у ходзе галасавання або пры падліку галасоў, і прынятыя па іх рашэнні.

Першыя экзэмпляры рашэння пасяджэння дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў аб зацвярджэнні вынікаў галасавання па выбарах членаў Савета Рэспублікі, пратакола пасяджэння падліковай камісіі разам са спісам дэпутатаў, якія прынялі ўдзел у пасяджэнні, у двухдзённы тэрмін перадаюцца ў Цэнтральную камісію.

### Артыкул 107. Вызначэнне вынікаў выбараў членаў Савета Рэспублікі Цэнтральнай камісіяй

Цэнтральная камісія на падставе ўказаных у частцы дзясятай артыкула 106 гэтага Кодэкса дакументаў, якія паступілі, вызначае вынікі выбараў

членаў Савета Рэспублікі ад абласцей і горада Мінска і рэгіструе выбраных членаў Савета Рэспублікі.

Цэнтральная камісія можа прызнаць выбары члена Савета Рэспублікі несапраўднымі, калі ў ходзе выбараў, пры падліку галасоў або пры ўстанаўленні вынікаў выбараў мелі месца парушэнні патрабаванняў гэтага Кодэкса, якія паўплывалі на вынікі выбараў, і адмовіць у рэгістрацыі члена Савета Рэспублікі. Рашэнне Цэнтральнай камісіі аб прызнанні выбараў несапраўднымі можа быць абскарджана кандыдатам у члены Савета Рэспублікі ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь у трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння.

Калі пры правядзенні выбараў члена (членаў) Савета Рэспублікі ад вобласці, горада Мінска выбары былі прызнаны несапраўднымі, праводзяцца паўторныя выбары ў тэрмін, устаноўлены Цэнтральнай камісіяй. Паўторныя выбары прызначаюцца Цэнтральнай камісіяй і праводзяцца ў парадку, устаноўленым раздзелам VI гэтага Кодэкса.

### Артыкул 108. Апублікаванне вынікаў выбараў членаў Савета Рэспублікі

Паведамленне аб выніках выбараў членаў Савета Рэспублікі і спіс выбраных членаў Савета Рэспублікі ад абласцей, горада Мінска ў алфавітным парадку з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку, даты нараджэння, пасады (занятку), месца работы і месца жыхарства, партыйнасці кожнага члена Савета Рэспублікі Цэнтральная камісія накіроўвае ў друк для апублікавання не пазней чым у трохдзённы тэрмін з дня ўстанаўлення вынікаў выбараў членаў Савета Рэспублікі.

### Артыкул 109. Пасведчанне аб выбранні членам Савета Рэспублікі

Цэнтральная камісія пасля рэгістрацыі выдае кожнаму члену Савета Рэспублікі пасведчанне аб яго выбранні.

### Артыкул 110. Правядзенне выбараў члена Савета Рэспублікі замест выбылага

У выпадку адклікання або датэрміновага спынення па іншых прычынах паўнамоцтваў выбранага члена Савета Рэспублікі праводзяцца новыя выбары члена Савета Рэспублікі ў тэрмін, устаноўлены Цэнтральнай камісіяй. Выбары замест выбылага члена Савета Рэспублікі прызначаюцца Цэнтральнай камісіяй і праводзяцца ў парадку, устаноўленым раздзелам VI гэтага Кодэкса.

Пры выбыцці выбранага члена Савета Рэспублікі менш чым за год да сканчэння тэрміну паўнамоцтваў Савета Рэспублікі выбары новага члена Савета Рэспублікі замест выбылага не праводзяцца.

# РАЗДЗЕЛ VII
# РЭФЕРЭНДУМ

## ГЛАВА 22
## ПАНЯЦЦЕ, ВІДЫ І МЭТА РЭФЕРЭНДУМУ.
## ПЫТАННІ, ЯКІЯ ВЫНОСЯЦЦА НА РЭФЕРЭНДУМ

### Артыкул 111. Паняцце, віды і мэта рэферэндуму

Рэферэндум з'яўляецца спосабам прыняцця грамадзянамі Рэспублікі Беларусь рашэнняў па найважнейшых пытаннях дзяржаўнага і грамадскага жыцця.

У Рэспубліцы Беларусь могуць праводзіцца рэспубліканскія і мясцовыя рэферэндумы.

**Артыкул 112. Пытанні, якія выносяцца на рэферэндум**

На рэспубліканскі рэферэндум могуць выносіцца найважнейшыя пытанні дзяржаўнага і грамадскага жыцця Рэспублікі Беларусь.

На мясцовы рэферэндум могуць выносіцца пытанні, якія маюць найважнейшае значэнне для насельніцтва адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак і аднесеныя да кампетэнцыі адпаведных мясцовых Саветаў дэпутатаў, выканаўчых і распарадчых органаў.

На рэспубліканскі рэферэндум не могуць выносіцца пытанні:

якія могуць выклікаць парушэнне тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь;

звязаныя з выбраннем і вызваленнем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, прызначэннем (выбраннем, вызваленнем) службовых асоб, прызначэнне (выбранне, вызваленне) якія адносіцца да кампетэнцыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь;

аб прыняцці і змяненні бюджэту, устанаўленні, змяненні і адмене падаткаў, збораў (пошлін);

аб амністыі, аб памілаванні.

На мясцовы рэферэндум не выносяцца пытанні, пералічаныя ў частцы трэцяй гэтага артыкула, пытанні, якія маюць значэнне для Рэспублікі Беларусь у цэлым, пытанні, урэгуляваныя заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, а таксама пытанні, звязаныя з прызначэннем на пасаду, зацвярджэннем у пасадзе або вызваленнем ад пасады, якія адносяцца да кампетэнцыі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа або яго кіраўніка.

## ГЛАВА 23
## ІНІЦЫІРАВАННЕ І ПРЫЗНАЧЭННЕ
## РЭСПУБЛІКАНСКАГА РЭФЕРЭНДУМУ

**Артыкул 113. Права ініцыятывы на правядзенне рэспубліканскага рэферэндуму**

Права ініцыятывы на правядзенне рэспубліканскага рэферэндуму належыць Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, Палаце прадстаўнікоў і Савету Рэспублікі, грамадзянам Рэспублікі Беларусь.

Ініцыятыва Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі на правядзенне рэспубліканскага рэферэндуму выказваецца ў выглядзе прапановы, якая прымаецца на іх раздзельных пасяджэннях большасцю галасоў ад поўнага складу кожнай з палат, і ўносіцца Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь.

Ініцыятыва грамадзян на правядзенне рэспубліканскага рэферэндуму выказваецца ў выглядзе прапановы, унесенай не менш чым 450 тысячамі грамадзян, якія валодаюць выбарчым правам, у тым ліку не менш чым 30 тысячамі грамадзян ад кожнай з абласцей і горада Мінска.

## Артыкул 114. Ініцыятыўная група па правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму

У выпадку, калі з ініцыятывай аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму выступаюць грамадзяне, яны ствараюць групу для правядзення рэферэндуму (далей – ініцыятыўная група) з колькасцю асоб, якія маюць права ўдзельнічаць у рэферэндуме, у колькасці не меншай за 100 чалавек, якія прыкладна ў роўнай ступені прадстаўляюць грамадзян ад кожнай вобласці і горада Мінска.

Ініцыятыўная група звяртаецца ў Цэнтральную камісію з заявай аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы і пытання (праекта рашэння), якое прапануецца ёю на рэферэндум. Да заявы дадаюцца пратакол сходу ініцыятыўнай групы, на якім было прынята рашэнне аб утварэнні групы, вылучэнні ініцыятывы аб правядзенні рэферэндуму, пытанні (праекце рашэння), што прапануецца на рэферэндум, выбранні кіраўніка групы і каардынатараў па абласцях і горадзе Мінску, спіс удзельнікаў сходу, падпісаны старшынёй і сакратаром сходу, а таксама спіс членаў ініцыятыўнай групы, якія далі згоду на ўдзел у рабоце ініцыятыўнай групы, што павінна быць пацверджана іх уласнаручнымі подпісамі, сапраўднасць якіх падлягае натарыяльнаму засведчанню.

Сход ініцыятыўнай групы правамоцны, калі ў ім прыняло ўдзел больш за палову складу ініцыятыўнай групы. Рашэнні сходу прымаюцца большасцю галасоў яго ўдзельнікаў.

У спісе ініцыятыўнай групы ў дачыненні да кожнага члена групы ўказваюцца прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, месца жыхарства, серыя і нумар пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. У спісе ініцыятыўнай групы таксама ўказваюцца кіраўнік групы і каардынатары па раёнах, гарадах абласнога падпарадкавання, раёнах у гарадах, калі збор подпісаў будзе праводзіцца на іх тэрыторыі.

Пытанне (праект рашэння), якое выносіцца на рэспубліканскі рэферэндум, павінен быць сфармуляваны ініцыятыўнай групай дакладна і ясна з тым, каб на яго быў магчымы адназначны адказ. Фармулёўка пытання (праекта рашэння), якое прапануецца на рэферэндум, можа быць удакладнена са згоды ініцыятыўнай групы, аб чым павінен быць прадстаўлены пратакол сходу групы.

Дакументы, пададзеныя ініцыятыўнай групай аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму, і пытанне (праект рашэння), якое прапануецца на рэферэндум, накіроўваюцца Цэнтральнай камісіяй на заключэнне ў Міністэрства юстыцыі і Генеральную пракуратуру Рэспублікі Беларусь, якія правяраюць адпаведнасць пытання (праекта рашэння) патрабаванням заканадаўства Рэспублікі Беларусь і захаванне парадку ўтварэння ініцыятыўнай групы.

Пытанне (праект рашэння), якое прапануецца на рэспубліканскі рэферэндум, з улікам заключэння Міністэрства юстыцыі і Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, і склад ініцыятыўнай групы рэгіструюцца Цэнтральнай камісіяй. У рэгістрацыі адмаўляецца ў выпадку парушэння патрабаванняў заканадаўства Рэспублікі Беларусь. Адмову ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы можа абскардзіць у месячны тэрмін у Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь кіраўнік ініцыятыўнай групы.

Пасля рэгістрацыі ініцыятыўнай групы Цэнтральная камісія выдае ёй пасведчанне аб рэгістрацыі і ўзор ліста для збору подпісаў грамадзян у падтрымку прапановы аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму (далей – падпісны ліст), а членам ініцыятыўнай групы – адпаведныя пасведчанні.

## Артыкул 114[1]. Фонд ініцыятыўнай групы па правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму

Фінансаванне расходаў, звязаных са зборам подпісаў грамадзян у падтрымку прапановы аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму і правядзеннем агітацыі па ініцыіраванні рэспубліканскага рэферэндуму грамадзянамі, ажыццяўляецца за кошт сродкаў фонду ініцыятыўнай групы па правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму (далей – фонд ініцыятыўнай групы).

Фонд ініцыятыўнай групы можа фарміравацца за кошт наступных грашовых сродкаў:

1) добраахвотных ахвяраванняў членаў ініцыятыўнай групы, іншых грамадзян Рэспублікі Беларусь. Памер ахвяравання грамадзяніна не можа перавышаць 15 базавых велічынь;

2) добраахвотных ахвяраванняў юрыдычных асоб. Памер ахвяравання юрыдычнай асобы не можа перавышаць 30 базавых велічынь.

Гранічная сума ўсіх расходаў са сродкаў фонду ініцыятыўнай групы не можа перавышаць 3000 базавых велічынь.

У фонд ініцыятыўнай групы не маюць права ўносіць ахвяраванні суб'екты, указаныя ў частцы чацвёртай артыкула 48[1] гэтага Кодэкса.

Для фарміравання фонду ініцыятыўнай групы кіраўнік ініцыятыўнай групы не пазней чым у дзесяцідзённы тэрмін з дня рэгістрацыі ініцыятыўнай групы павінен адкрыць у падраздзяленні адкрытага акцыянернага таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк» спецыяльны рахунак па правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму (далей – спецыяльны рахунак). Падставай для адкрыцця спецыяльнага рахунку з'яўляюцца заява кіраўніка ініцыятыўнай групы і копія рашэння Цэнтральнай камісіі аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы.

Кіраўнік ініцыятыўнай групы мае права адкрыць толькі адзін спецыяльны рахунак. Плата за паслугі банка па адкрыцці спецыяльнага рахунка і правядзенні аперацый па рахунку не збіраецца. За карыстанне грашовымі сродкамі, якія знаходзяцца на спецыяльным рахунку, працэнты банкам не выплачваюцца. Цэнтральная камісія накіроўвае ў друк для апублікавання інфармацыю аб адкрыцці спецыяльнага рахунку.

Парадак адкрыцця спецыяльнага рахунку, правядзення аперацый па рахунку, закрыцця рахунку вызначаецца Цэнтральнай камісіяй па ўзгадненні з адкрытым акцыянерным таварыствам «Ашчадны банк «Беларусбанк».

Права выкарыстоўваць сродкі фонду ініцыятыўнай групы належыць кіраўніку ініцыятыўнай групы.

Кіраўнік ініцыятыўнай групы мае права прызначыць прадстаўніка ініцыятыўнай групы па фінансавых пытаннях (далей – прадстаўнік па фінансавых пытаннях). Прадстаўніка па фінансавых пытаннях рэгіструе Цэнтральная камісія на падставе заявы кіраўніка ініцыятыўнай групы. У заяве ўказваюцца прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, месца жыхарства прадстаўніка па фінансавых пытаннях, серыя, нумар і дата выдачы пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Цэнтральная камісія ў трохдзённы тэрмін з дня паступлення заявы рэгіструе прадстаўніка па фінансавых пытаннях і выдае яму пасведчанне.

Прадстаўнік па фінансавых пытаннях мае права адкрыць спецыяльны рахунак, распараджацца сродкамі, якія знаходзяцца на гэтым рахунку, і падаваць справаздачы аб паступленні і расходаванні сродкаў. Кіраўнік ініцыятыўнай групы мае права ў любы час адклікаць прадстаўніка па фінансавых пытаннях,

паведаміўшы аб гэтым у Цэнтральную камісію, а таксама ў падраздзяленне банка, у якім адкрыты спецыяльны рахунак.

Сродкі фонду ініцыятыўнай групы могуць выкарыстоўвацца для аплаты выдаткаў і паслуг, звязаных са зборам подпісаў грамадзян, у тым ліку для аплаты працы членаў ініцыятыўнай групы па зборы подпісаў грамадзян у падтрымку прапановы аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму, а таксама для аплаты іншых расходаў, непасрэдна звязаных з правядзеннем агітацыі па рэферэндуме, у парадку, які ўстанаўліваецца Цэнтральнай камісіяй.

Падраздзяленне банка, у якім адкрыты спецыяльны рахунак, штотыднёва падае ў Цэнтральную камісію звесткі аб паступленні і расходаванні сродкаў, якія знаходзяцца на спецыяльным рахунку. Цэнтральная камісія ў двухдзённы тэрмін пасля атрымання звестак накіроўвае ў друк для апублікавання інфармацыю аб агульнай суме сродкаў, якія паступілі ў фонд ініцыятыўнай групы, і аб агульнай суме зрасходаваных сродкаў.

Паступленне і расходаванне сродкаў фонду ініцыятыўнай групы кантралююць Цэнтральная камісія і фінансавыя органы.

Унясенне ахвяраванняў у фонд ініцыятыўнай групы, зварот ахвяраванняў і спыненне банкаўскіх аперацый па спецыяльным рахунку ажыццяўляюцца ў адносінах да патрабаванняў, прадугледжаных часткамі восьмай, адзінаццатай, шаснаццатай і сямнаццатай артыкула $48^1$ гэтага Кодэкса.

Кіраўнік ініцыятыўнай групы абавязаны падаваць у Цэнтральную камісію фінансавыя справаздачы аб расходаванні сродкаў фонду ініцыятыўнай групы з наступнай перыядычнасцю:

першая справаздача – праз 20 дзён пасля рэгістрацыі ініцыятыўнай групы;

другая справаздача – не пазней чым у пяцідзённы тэрмін з дня заканчэння тэрміну для збору подпісаў грамадзян;

трэцяя справаздача – праз 20 дзён пасля прызначэння рэферэндуму;

падрахункавая справаздача – не пазней чым у пяцідзённы тэрмін з дня галасавання па рэферэндуме.

Да справаздачы дадаюцца першасныя фінансавыя дакументы, якія пацвярджаюць паступленне, зварот і расходаванне сродкаў фонду ініцыятыўнай групы, даведкі аб сродках, якія засталіся, і (або) аб закрыцці спецыяльнага рахунку. У выпадку адхілення Цэнтральнай камісіяй прапановы аб правядзенні рэферэндуму кіраўнік ініцыятыўнай групы падае ў Цэнтральную камісію фінансавую справаздачу не пазней чым у пяцідзённы тэрмін з дня прыняцця Цэнтральнай камісіяй рашэння аб адхіленні прапановы аб правядзенні рэферэндуму.

У выпадку адхілення Цэнтральнай камісіяй прапановы аб правядзенні рэферэндуму Цэнтральная камісія пісьмова інфармуе аб гэтым падраздзяленне банка, якое спыняе ўсе аперацыі па спецыяльным рахунку.

### Артыкул 115. Збор подпісаў грамадзян

Збор подпісаў грамадзян у падтрымку прапановы аб правядзенні рэферэндуму ажыццяўляецца толькі членамі ініцыятыўнай групы ў двухмесячны тэрмін з дня рэгістрацыі ініцыятыўнай групы.

Падпісныя лісты павінны ўтрымліваць фармулёўку зарэгістраванага пытання, якое прапануецца на рэферэндум, і (або) перадачу сутнасці прапанаванага рашэння (законапраекта), а таксама прозвішча, імя і імя па бацьку члена ініцыятыўнай групы, які збірае подпісы, з указаннем нумара пасведчання аб рэгістрацыі ініцыятыўнай

групы і органа, які выдаў яго. Член ініцыятыўнай групы, які праводзіць збор подпісаў, абавязаны па патрабаванні грамадзяніна прадставіць для азнаямлення поўны тэкст рашэння (законапраекта), якое прапануецца на рэферэндум.

У падпісным лісце павінны быць подпісы грамадзян, якія пражываюць на тэрыторыі толькі аднаго горада абласнога падпарадкавання, раёна, а ў гарадах з раённым дзяленнем – аднаго раёна.

У падпісным лісце ў дачыненні да грамадзяніна, які падтрымлівае прапанову аб правядзенні рэферэндуму, указваюцца прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, месца жыхарства, серыя і нумар пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь або рэквізіты іншага дакумента, які вызначаецца Цэнтральнай камісіяй. Даныя аб грамадзяніне ўносяцца ў падпісны ліст рукапісным спосабам. Грамадзянін уласнаручна ставіць у падпісным лісце дату подпісу і распісваецца. Подпісы нумаруюцца.

Грамадзянін мае права падпісацца ў падтрымку прапановы аб правядзенні рэферэндуму толькі адзін раз.

Падпісны ліст засведчвае член ініцыятыўнай групы, які збіраў подпісы. Член ініцыятыўнай групы пры засведчанні падпіснога ліста ставіць подпіс і дату яго ўнясення, а таксама ўказвае прозвішча і ініцыялы.

Прымус грамадзян Рэспублікі Беларусь з мэтай атрымання подпісу ў падпісным лісце, а таксама выкарыстанне проціпраўных форм збору подпісаў забараняецца.

### Артыкул 116. Разгляд ініцыятывы грамадзян аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму

Падпісныя лісты здаюцца каардынатарамі па раёнах, гарадах, раёнах у гарадах не пазней сканчэння тэрміну, устаноўленага для збору подпісаў, у раённы, гарадскі выканаўчы камітэт, у мясцовую адміністрацыю, якія ў дзесяцідзённы тэрмін правяраюць дакладнасць подпісаў грамадзян у падпісных лістах. Пры гэтым павінна быць праверана не менш за 20 працэнтаў подпісаў грамадзян у падпісных лістах, здадзеных каардынатарамі па раёнах, гарадах, раёнах у гарадах.

Вызначэнне парадку праверкі і ўліку подпісаў грамадзян у падпісных лістах, пададзеных у органы, указаныя ў частцы першай гэтага артыкула, а таксама прызнанне недакладнымі подпісаў грамадзян праводзяцца ў парадку, прадугледжаным часткамі шаснаццатай і васямнаццатай артыкула 61гэтага Кодэкса. Недакладнымі лічацца таксама подпісы грамадзян, сабраныя да рэгістрацыі ініцыятыўнай групы. Праверцы і ўліку не падлягаюць подпісы грамадзян, калі ў падпісным лісце адсутнічае фармулёўка пытання, якое прапануецца на рэферэндум, і (або) перадача сутнасці прапанаванага рашэння (законапраекта) . Калі ў падпісным лісце, які паступіў у раённы, гарадскі выканаўчы камітэт, мясцовую адміністрацыю, утрымліваюцца подпісы грамадзян, якія пражываюць на тэрыторыі розных раёнаў, гарадоў абласнога падпарадкавання, раёнаў у горадзе, праверцы і ўліку падлягаюць толькі подпісы, пададзеныя на тэрыторыі таго раёна, горада, раёна ў горадзе, у выканаўчы камітэт якога, мясцовую адміністрацыю здадзены гэты падпісны ліст. Астатнія подпісы не правяраюцца і не ўлічваюцца.

У выпадку выяўлення некалькіх подпісаў аднаго і таго ж грамадзяніна дакладным лічыцца толькі адзін подпіс, а астатнія подпісы лічацца недакладнымі.

Калі колькасць выяўленых пры праверцы недакладных подпісаў грамадзян складзе больш за 15 працэнтаў ад колькасці правераных подпісаў, праводзіцца

дадатковая праверка яшчэ 15 працэнтаў подпісаў ад колькасці подпісаў у падпісных лістах, здадзеных у адпаведны раённы, гарадскі выканаўчы камітэт, мясцовую адміністрацыю.

У выпадку, калі сумарная колькасць недакладных подпісаў грамадзян, выяўленых пры праверках, складзе больш за 15 працэнтаў ад агульнай колькасці правераных подпісаў у падпісных лістах, далейшая праверка подпісаў у падпісных лістах раённым, гарадскім выканаўчым камітэтам, мясцовай адміністрацыяй спыняецца, і ўсе подпісы грамадзян у здадзеных падпісных лістах не ўлічваюцца пры вызначэнні выніку збору подпісаў у раёне, горадзе, раёне ў горадзе.

Аб выніках збору подпісаў грамадзян у падпісных лістах у падтрымку ініцыятывы аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму прымаецца рашэнне адпаведнага раённага, гарадскога выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі, якое накіроўваецца адпаведна ў абласны, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт. У рашэнні ўказваюцца агульная колькасць подпісаў у падпісных лістах, прынятых ад ініцыятыўнай групы; колькасць подпісаў, дакладнасць якіх правяралася; колькасць подпісаў, прызнаных дакладнымі, і колькасць подпісаў, прызнаных недакладнымі.

Абласны, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт пры неабходнасці ў пяцідзённы тэрмін можа таксама праверыць дакладнасць подпісаў грамадзян у падпісных лістах. На падставе рашэнняў раённых, гарадскіх выканаўчых камітэтаў, мясцовых адміністрацый аб устанаўленні колькасці грамадзян, якія паставілі свае подпісы ў падпісных лістах у падтрымку ініцыятывы аб правядзенні рэферэндуму, і вынікаў праведзеных абласным, Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам праверак дакладнасці подпісаў грамадзян у падпісных лістах абласны, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт падводзіць вынікі збору подпісаў па вобласці, горадзе Мінску, прымае аб гэтым рашэнне і накіроўвае яго ў Цэнтральную камісію. У рашэнні ўказваюцца даныя, прадугледжаныя часткай шостай гэтага артыкула. Копія рашэння перадаецца каардынатару ініцыятыўнай групы па вобласці, горадзе Мінску.

Пасля прыняцця рашэнняў абласнымі і Мінскім гарадскім выканаўчымі камітэтамі ініцыятыўная група складае заключны акт аб зборы подпісаў і падае яго ў Цэнтральную камісію.

Цэнтральная камісія:

правярае адпаведнасць заключнага акта ініцыятыўнай групы і рашэнняў абласных, Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, якія паступілі, патрабаванням гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь;

складае заключэнне аб захаванні ініцыятыўнай групай патрабаванняў гэтага Кодэкса і пратакол аб выніках збору подпісаў, які пацвярджае наяўнасць не менш за 450 тысяч подпісаў грамадзян, у тым ліку не менш за 30 тысяч подпісаў грамадзян ад кожнай з абласцей і горада Мінска.

Заключны акт ініцыятыўнай групы разам са сваім заключэннем і пратаколам, калі адсутнічаюць падставы для адхілення прапановы аб правядзенні рэферэндуму, Цэнтральная камісія перадае Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь.

Цэнтральная камісія адхіляе прапанову аб правядзенні рэферэндуму і паведамляе аб гэтым ініцыятыўнай групе і Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь у выпадках:

парушэння тэрміну для збору подпісаў грамадзян;

адсутнасці патрэбнай колькасці подпісаў;

выяўлення парушэнняў прынцыпу добраахвотнасці ў ходзе збору подпісаў, зафіксаваных ва ўстаноўленым Цэнтральнай камісіяй парадку;

падавання ініцыятыўнай групай больш за 15 працэнтаў недакладных подпісаў ад агульнай колькасці правераных подпісаў грамадзян у падпісных лістах;

адсутнасці спецыяльнага рахунку;

перавышэння больш чым на 20 працэнтаў гранічнага памеру расходавання сродкаў фонду ініцыятыўнай групы, указанага ў частцы трэцяй артыкула 114[1] гэтага Кодэкса, або выкарыстання ў гэта жа памерах грашовых сродкаў, апрача сродкаў выбарчага фонду;

вызначэння ў пададзеных дакументах іншых парушэнняў патрабаванняў гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Рашэнне Цэнтральнай камісіі аб адхіленні прапановы па правядзенні рэферэндуму можа быць абскарджана ў месячны тэрмін у Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь кіраўніком ініцыятыўнай групы.

Паўторнае ініцыіраванне грамадзянамі правядзення рэферэндуму па адным і тым жа пытанні дапускаецца не раней чым праз год пасля адхілення прапановы аб правядзенні рэферэндуму і не раней чым праз тры гады пасля правядзення рэферэндуму па гэтым пытанні.

**Артыкул 117. Рашэнне аб прызначэнні рэспубліканскага рэферэндуму**

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь прызначае рэспубліканскі рэферэндум па ўласнай ініцыятыве або ў двухмесячны тэрмін пасля ўнясення на яго разгляд у адпаведнасці з гэтым Кодэксам прапаноў палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь або грамадзян.

Ва ўказе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб прызначэнні рэферэндуму, як правіла, прадугледжваюцца:

дата правядзення рэферэндуму;

юрыдычная сіла рашэння, прынятага рэферэндумам;

фармулёўка вынесенага на рэферэндум пытання (пытанняў);

іншыя арганізацыйныя мерапрыемствы па забеспячэнні правядзення рэферэндуму.

Калі на рэферэндум выносіцца законапраект, то ён дадаецца да ўказа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб прызначэнні рэферэндуму.

Дата правядзення рэферэндуму вызначаецца не пазней за тры месяцы з дня выдання ўказа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб прызначэнні рэферэндуму.

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб прызначэнні рэферэндуму, тэкст законапраекта або праекта іншага рашэння, вынесеных на рэферэндум, публікуюцца ў друку і абнародуюцца ў іншых сродках масавай інфармацыі ў парадку, які ўстанаўліваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь мае права адхіліць прапанову аб правядзенні рэферэндуму, калі яна не адпавядае патрабаванням гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь. Рашэнне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб адхіленні рэферэндуму афармляецца ўказам.

**Артыкул 118. Бюлетэнь для галасавання**

У бюлетэні для галасавання дакладна ўзнаўляецца фармулёўка вынесенага на рэферэндум пытання (праекта рашэння) і ўказваюцца варыянты волевыяўлення асобы, якая галасуе, словамі «за» або «супраць», пад якімі змяшчаюцца пустыя квадраты.

Пры вынясенні на рэферэндум некалькіх пытанняў яны ўключаюцца ў адзін бюлетэнь для галасавання і паслядоўна нумаруюцца. Калі прапануюцца альтэрнатыўныя праекты рашэння (закона) па адным і тым жа пытанні або альтэрнатыўныя варыянты якой-небудзь нормы праекта рашэння (закона), яны таксама паслядоўна нумаруюцца.

Пры вынясенні на рэферэндум праекта закона Цэнтральная камісія можа прыняць рашэнне аб публікацыі ў друку тэкстаў праекта закона, які выносіцца на рэферэндум, і дзеючага закона, які прапануецца адмяніць, змяніць або дапоўніць. Указаныя тэксты павінны знаходзіцца ў памяшканні кожнага ўчастка для галасавання для ўсеагульнага азнаямлення.

У выпадку правядзення адначасова рэспубліканскага і мясцовага рэферэндумаў бюлетэні для галасавання, якія выкарыстоўваюцца ў кожным з іх, павінны адрозніваўцца па колеры або мець распазнавальны знак.

Выраб бюлетэняў для галасавання па рэспубліканскім рэферэндуме забяспечвае Цэнтральная камісія.

Пры правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму дапускаецца выраб бюлетэняў участковымі камісіямі, размешчанымі за межамі Рэспублікі Беларусь.

Колькасць выраблених бюлетэняў не можа быць меншай за колькасць удзельнікаў рэферэндуму, уключаных у спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у рэферэндуме. Колькасць запасных бюлетэняў не павінна перавышаць 5 працэнтаў ад колькасці ўдзельнікаў рэферэндуму. Канкрэтную колькасць выраблених бюлетэняў вызначае Цэнтральная камісія.

Перадача бюлетэняў у ніжэйстаячыя камісіі па правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму, у тым ліку ва ўчастковыя камісіі, праводзіцца па акце. Участковыя камісіі забяспечваюцца бюлетэнямі не пазней дня, які папярэднічае дню датэрміновага галасавання, а ўчастковыя камісіі, у якія не праводзіцца датэрміновае галасаванне, – не пазней дня, які папярэднічае дню рэферэндуму. Адказнасць за захаванасць бюлетэняў нясуць старшыні камісій, якія ажыццяўляюць атрыманне, перадачу і захоўванне бюлетэняў.

Бюлетэні для галасавання друкуюцца на беларускай або рускай мове.

Бюлетэнь для галасавання павінен утрымліваць растлумачэнне аб парадку яго запаўнення.

На адваротным баку бюлетэня для галасавання ставяцца подпісы не менш чым двух асоб, якія ўваходзяць у склад участковай камісіі па рэферэндуме.

Бюлетэні для галасавання па рэспубліканскім рэферэндуме пасля ўстанаўлення вынікаў галасавання разам з пратаколамі ўчастковых камісій здаюцца ў раённыя, гарадскія, раённыя ў гарадах камісіі.

## ГЛАВА 24
## ВЫЗНАЧЭННЕ ВЫНІКАЎ
## І ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ РЭСПУБЛІКАНСКАГА РЭФЕРЭНДУМУ

### Артыкул 119. Вызначэнне вынікаў рэферэндуму па раёне, горадзе, раёне ў горадзе

На падставе пратаколаў, атрыманых ад участковых камісій па рэферэндуме і складзеных у адпаведнасці з патрабаваннямі артыкула 55 гэтага Кодэкса, раённыя, гарадскія, раённыя ў гарадах камісіі па рэферэндуме вызначаюць:

агульную колькасць грамадзян у раёне, горадзе, раёне ў горадзе, якія маюць права ўдзельнічаць у рэферэндуме;

колькасць грамадзян, якія атрымалі бюлетэні для галасавання;

колькасць грамадзян, якія прынялі ўдзел у галасаванні, у тым ліку колькасць грамадзян, якія прынялі ўдзел у датэрміновым галасаванні, колькасць грамадзян, якія прынялі ўдзел у галасаванні па месцы знаходжання, і колькасць грамадзян, якія прынялі ўдзел у галасаванні ў дзень рэферэндуму ў памяшканні ўчастка для галасавання;

колькасць асоб, якія галасавалі за ўхваленне вынесенага на рэферэндум пытання (праекта рашэння), і колькасць асоб, якія галасавалі супраць яго ўхвалення;

колькасць бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі;

колькасць бюлетэняў, выдадзеных участковым камісіям па рэферэндуме;

колькасць сапсаваных бюлетэняў;

колькасць нявыкарыстаных бюлетэняў.

Вынікі рэферэндуму ў раёнах, гарадах, раёнах у гарадах устанаўліваюцца на пасяджэннях раённых, гарадскіх, раённых у гарадах камісій па рэферэндуме і заносяцца ў пратакол. Пратакол падпісваецца старшынёй, намеснікам старшыні, сакратаром і членамі адпаведнай камісіі па рэферэндуме і перадаецца не пазней чым на трэці дзень пасля заканчэння галасавання асабіста старшынёй або намеснікам старшыні або сакратаром камісіі ў абласную, Мінскую гарадскую камісію па рэферэндуме і ў органы, якія ўтварылі камісію, для інфармацыі. Да пратакола, які накіроўваецца ў абласную, Мінскую гарадскую камісію па рэферэндуме, дадаюцца, калі яны маюцца, асобныя думкі членаў камісіі, заявы іншых асоб аб парушэннях, дапушчаных у ходзе галасавання або пры падліку галасоў, і прынятыя па іх рашэнні камісіі.

У выпадку выяўлення органамі, якія ўтварылі камісію, парушэнняў патрабаванняў гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь, дапушчаных у ходзе галасавання або пры падліку галасоў, аб гэтым неадкладна паведамляецца ў вышэйстаячую камісію па рэферэндуме або Цэнтральную камісію.

**Артыкул 120. Вызначэнне вынікаў рэферэндуму па абласцях і горадзе Мінску**

На падставе пратаколаў раённых, гарадскіх, раённых у гарадах камісій па рэферэндуме абласныя, Мінская гарадская камісіі па рэферэндуме вызначаюць:

агульную колькасць грамадзян у вобласці, горадзе Мінску, якія маюць права ўдзельнічаць у рэферэндуме;

колькасць грамадзян, якія атрымалі бюлетэні для галасавання;

колькасць грамадзян, якія прынялі ўдзел у галасаванні, у тым ліку колькасць грамадзян, якія прынялі ўдзел у датэрміновым галасаванні, колькасць грамадзян, якія прынялі ўдзел у галасаванні па месцы знаходжання, і колькасць грамадзян, якія прынялі ўдзел у галасаванні ў дзень рэферэндуму ў памяшканні ўчастка для галасавання;

колькасць асоб, якія галасавалі за ўхваленне вынесенага на рэферэндум пытання (праекта рашэння), і колькасць асоб, якія галасавалі супраць яго ўхвалення;

колькасць бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі;

колькасць бюлетэняў, выдадзеных раённым, гарадскім, раённым у гарадах камісіям па рэферэндуме;

колькасць сапсаваных бюлетэняў;

колькасць нявыкарыстаных бюлетэняў.

Вынікі рэферэндуму ў абласцях, горадзе Мінску ўстанаўліваюцца на пасяджэннях абласных, Мінскай гарадской камісій па рэферэндуме і заносяцца ў пратакол. Пратакол падпісваецца старшынёй, намеснікам старшыні, сакратаром і членамі абласных, Мінскай гарадской камісій па рэферэндуме і перадаецца не пазней чым на чацвёрты дзень пасля заканчэння галасавання асабіста старшынёй або намеснікам старшыні або сакратаром камісіі ў Цэнтральную камісію і ў органы, якія ўтварылі абласныя, Мінскую гарадскую камісіі па рэферэндуме, для інфармацыі. Да пратакола, які накіроўваецца ў Цэнтральную камісію, дадаюцца, калі яны маюцца, асобныя думкі членаў камісіі, заявы іншых асоб аб парушэннях, допушчаных у ходзе галасавання або пры падліку галасоў, і прынятыя па іх рашэнні камісіі.

У выпадку выяўлення органамі, якія ўтварылі абласную, Мінскую гарадскую камісію па рэферэндуме, парушэнняў патрабаванняў гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь, допушчаных у ходзе галасавання або пры падліку галасоў, аб гэтым неадкладна паведамляецца ў Цэнтральную камісію.

**Артыкул 121. Падвядзенне вынікаў рэферэндуму**

На падставе пратаколаў абласных, Мінскай гарадской камісій па рэферэндуме Цэнтральная камісія ўстанаўлівае:

агульную колькасць грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у рэферэндуме;

колькасць грамадзян, якія атрымалі бюлетэні для галасавання;

колькасць грамадзян, якія прынялі ўдзел у галасаванні, у тым ліку колькасць грамадзян, якія прынялі ўдзел у датэрміновым галасаванні, колькасць грамадзян, якія прынялі ўдзел у галасаванні па месцы знаходжання, і колькасць грамадзян, якія прынялі ўдзел у галасаванні ў дзень рэферэндуму ў памяшканні ўчастка для галасавання;

колькасць асоб, якія галасавалі за ўхваленне вынесенага на рэферэндум пытання (праекта рашэння), і колькасць асоб, якія галасавалі супраць яго ўхвалення;

колькасць бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі.

Рэферэндум лічыцца рэферэндумам, які адбыўся, калі ў галасаванні прыняло ўдзел больш за палову грамадзян, унесеных у спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у рэферэндуме. Рашэнне лічыцца прынятым рэферэндумам, калі за яго ў цэлым па Рэспубліцы Беларусь прагаласавала больш за палову грамадзян, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

Рашэнне аб прыняцці, змяненні і дапаўненні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала большасць грамадзян, унесеных у спісы для галасавання.

Вынікі рэферэндуму вызначаюцца на пасяджэнні Цэнтральнай камісіі і заносяцца ў пратакол. Пратакол падпісваюць старшыня, намеснік старшыні, сакратар і члены камісіі.

Цэнтральная камісія па прадстаўленні адпаведных камісій па рэферэндуме і органаў, якія ўтварылі камісіі, а таксама на вызначаных ёю падставах можа прызнаць вынікі рэферэндуму ў вобласці, раёне, горадзе, раёне ў горадзе, на ўчастку для галасавання несапраўднымі з-за допушчаных парушэнняў патрабаванняў гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Паведамленне аб выніках рэферэндуму публікуецца ў друку Цэнтральнай камісіяй у сямідзённы тэрмін. У паведамленні ўказваюцца агульная колькасць

грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у рэферэндуме; колькасць грамадзян, якія атрымалі бюлетэні для галасавання; колькасць грамадзян, якія прынялі ўдзел у галасаванні; колькасць асоб, якія галасавалі за ўхваленне вынесенага на рэферэндум пытання (праекта рашэння), і колькасць асоб, якія галасавалі супраць яго ўхвалення; колькасць бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі.

**Артыкул 122. Правядзенне паўторнага галасавання**

Па прадстаўленні Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь аб парушэннях, дапушчаных пры правядзенні рэферэндуму, Цэнтральная камісія мае права прыняць рашэнне або аб правядзенні на працягу месяца паўторнага галасавання на тых участках для галасавання і іншых тэрыторыях, дзе былі дапушчаны парушэнні, або аб правядзенні на працягу года паўторнага галасавання на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 123. Апублікаванне і ўступленне ў сілу рашэння, прынятага рэферэндумам**

Рашэнне, прынятае рэферэндумам, падпісваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і падлягае неадкладнаму і абавязковаму афіцыйнаму апублікаванню пасля яго падпісання.

Рашэнне, прынятае рэферэндумам, уступае ў сілу праз 10 дзён пасля яго афіцыйнага апублікавання, калі ў ім не вызначаны іншы тэрмін.

Датай прыняцця рашэння рэферэндумам лічыцца дзень рэферэндуму.

**Артыкул 124. Юрыдычная сіла рашэння, прынятага рэферэндумам**

Юрыдычная сіла рашэння, прынятага рэферэндумам, вызначаецца ўказам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб прызначэнні рэферэндуму.

Рашэнні, прынятыя рэферэндумам, могуць быць адменены або зменены толькі шляхам рэферэндуму, калі іншае не будзе вызначана рэферэндумам.

Калі для выканання рашэння, прынятага рэферэндумам, патрабуецца выданне якога-небудзь прававога акта, ён павінен быць прыняты на працягу пяці месяцаў з дня ўступлення ў сілу рашэння, прынятага рэферэндумам.

## ГЛАВА 25
## ПАРАДАК ПРЫЗНАЧЭННЯ І ПРАВЯДЗЕННЯ МЯСЦОВАГА РЭФЕРЭНДУМУ

**Артыкул 125. Парадак падрыхтоўкі і правядзення мясцовага рэферэндуму**

Рэалізацыя права ініцыятывы грамадзян на правядзенне мясцовага рэферэндуму, разгляд ініцыятывы грамадзян аб правядзенні мясцовага рэферэндуму, яго падрыхтоўка і правядзенне, парадак і тэрміны ўтварэння ўчасткаў для галасавання, адпаведных камісій па рэферэндуме, паўнамоцтвы і арганізацыя іх дзейнасці, складанне спісаў грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у рэферэндуме, парадак галасавання, падвядзення і апублікавання вынікаў рэферэндуму ажыццяўляюцца ў прымяненні да норм заканадаўства аб рэспубліканскім рэферэндуме, калі іншае не вызначана главой 25 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 126. Права ініцыятывы на правядзенне мясцовага рэферэндуму**

Права ініцыятывы на правядзенне мясцовага рэферэндуму належыць мясцовым прадстаўнічым органам і грамадзянам Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі адпаведнай вобласці, раёна, горада, раёна ў горадзе, пасёлка, сельсавета. Ініцыятыва грамадзян выказваецца ў выглядзе прапановы, унесенай не менш чым 10 працэнтамі грамадзян, якія валодаюць выбарчым правам і якія пражываюць на адпаведнай тэрыторыі.

Калі грамадзяне выступаюць з ініцыятывай аб правядзенні мясцовага рэферэндуму, імі ўтвараецца ініцыятыўная група з колькасцю асоб, якія маюць права ўдзельнічаць у рэферэндуме, у колькасці:

у вобласці і горадзе Мінску – не менш за 50 чалавек;

у раёне, горадзе, раёне ў горадзе – не менш за 20 чалавек;

у пасёлку, сельсавеце – не менш за 10 чалавек.

Дакументы аб правядзенні мясцовага рэферэндуму, пададзеныя ініцыятыўнай групай, і пытанне, якое прапануецца на рэферэндум, накіроўваюцца мясцовым выканаўчым і распарадчым органам на заключэнне ў адпаведны абласны, Мінскі гарадскі орган юстыцыі, якія правяраюць адпаведнасць пытання, якое выносіцца на рэферэндум, патрабаванням заканадаўства і захванне парадку ўтварэння ініцыятыўнай групы.

Пытанне, якое прапануецца на мясцовы рэферэндум, з улікам заключэння адпаведнага абласнога, Мінскага гарадскога органа юстыцыі і склад ініцыятыўнай групы рэгіструюцца адпаведным мясцовым выканаўчым і распарадчым органам.

На працягу 30 дзён з дня звароту за рэгістрацыяй ініцыятыўнай групе выдаецца пасведчанне аб рэгістрацыі, узор падпіснога ліста, а членам ініцыятыўнай групы – адпаведныя пасведчанні.

У рэгістрацыі ініцыятыўнай групы па правядзенні мясцовага рэферэндуму адмаўляецца ў выпадку парушэння патрабаванняў гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь. Адмова можа быць абскарджана ў месячны тэрмін у раённы, гарадскі суд.

Калі выканаўчым і распарадчым органам вызначана, што пададзена неабходная колькасць дакладных подпісаў, ініцыятыўная група па правядзенні мясцовага рэферэндуму складае заключны акт і падае яго ў адпаведны выканаўчы і распарадчы орган, які перадае яго ў мясцовы Савет дэпутатаў.

### Артыкул 127. Рашэнне аб прызначэнні мясцовага рэферэндуму

Рашэнне аб прызначэнні абласнога, Мінскага гарадскога, раённага, гарадскога, пасялковага, сельскага рэферэндуму прымае адпаведны мясцовы Савет дэпутатаў, а рашэнне аб прызначэнні раённага рэферэндуму ў горадзе з раённым дзяленнем – гарадскі Савет дэпутатаў не пазней за 30 дзён з дня ўнясення ў адпаведнасці з патрабаваннямі гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь такой прапановы.

Юрыдычная сіла рашэння, прынятага мясцовым рэферэндумам, вызначаецца ў рашэнні мясцовага Савета дэпутатаў аб прызначэнні рэферэндуму.

Мясцовы Савет дэпутатаў, прымаючы рашэнне аб прызначэнні рэферэндуму, забяспечвае азнаямленне грамадзян са зместам пытання (праекта рашэння), вынесенага на рэферэндум.

Дата правядзення рэферэндуму ўстанаўліваецца не пазней за тры месяцы з дня прыняцця рашэння аб прызначэнні рэферэндуму.

Рашэнне мясцовага Савета дэпутатаў аб прызначэнні рэферэндуму публікуецца ў друку і можа абнародавацца ў іншых сродках масавай інфармацыі.

Рашэнні, прынятыя мясцовым рэферэндумам, падпісваюцца кіраўніком адпаведнага мясцовага выканаўчага і распарадчага органа.

**Артыкул 128. Правядзенне мясцовага рэферэндуму**

Падрыхтоўка і правядзенне рэферэндуму на тэрыторыі вобласці, горада, раёна, раёна ў горадзе, пасёлка, сельсавета ажыццяўляюцца адпаведнымі камісіямі па рэферэндуме, утворанымі ў адпаведнасці з артыкуламі 34–37 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 128[1]. Фонд ініцыятыўнай групы па правядзенні мясцовага рэферэндуму**

Расходы, звязаныя са зборам подпісаў грамадзян у падтрымку прапановы аб правядзенні абласнога, Мінскага гарадскога, раённага, гарадскога (у горадзе абласнога падпарадкавання) рэферэндуму і правядзеннем агітацыі па ініцыіраванні рэферэндуму грамадзянамі, фінансуюцца за кошт сродкаў фонду ініцыятыўнай групы.

Фонд ініцыятыўнай групы па правядзенні абласнога, Мінскага гарадскога, раённага, гарадскога (у горадзе абласнога падпарадкавання) рэферэндуму можа фарміравацца за кошт наступных грашовых сродкаў:

1) добраахвотных ахвяраванняў членаў ініцыятыўнай групы, іншых грамадзян Рэспублікі Беларусь. Памер ахвяравання грамадзяніна ў фонд па правядзенні абласнога, Мінскага гарадскога рэферэндуму не можа перавышаць 10 базавых велічынь, а па правядзенні раённага, гарадскога (у горадзе абласнога падпарадкавання) рэферэндуму – 5 базавых велічынь;

2) добраахвотных ахвяраванняў юрыдычных асоб. Памер ахвяравання юрыдычнай асобы ў фонд па правядзенні абласнога, Мінскага гарадскога рэферэндуму не можа перавышаць 20 базавых велічынь, а па правядзенні раённага, гарадскога (у горадзе абласнога падпарадкавання) рэферэндуму – 10 базавых велічынь.

Гранічная сума ўсіх расходаў са сродкаў фонду ініцыятыўнай групы па правядзенні абласнога, Мінскага гарадскога рэферэндуму не можа перавышаць 500 базавых велічынь, а па правядзенні раённага, гарадскога (у горадзе абласнога падпарадкавання) рэферэндуму – 100 базавых велічынь.

Ініцыятыўная група па правядзенні гарадскога (у горадзе раённага падпарадкавання), пасялковага, сельскага рэферэндуму мае права ствараць фонд ініцыятыўнай групы, які можа фарміравацца за кошт наступных грашовых сродкаў:

1) добраахвотных ахвяраванняў членаў ініцыятыўнай групы, іншых грамадзян Рэспублікі Беларусь. Памер ахвяравання грамадзяніна не можа перавышаць 2 базавыя велічыні;

2) добраахвотных ахвяраванняў юрыдычных асоб. Памер ахвяравання юрыдычнай асобы не можа перавышаць 5 базавых велічынь.

Гранічная сума ўсіх расходаў са сродкаў фонду ініцыятыўнай групы па правядзенні гарадскога (у горадзе раённага падпарадкавання), пасялковага, сельскага рэферэндуму не можа перавышаць 50 базавых велічынь.

У фонд ініцыятыўнай групы не маюць права ўносіць ахвяраванні суб'екты, указаныя ў частцы чацвёртай артыкула 48[1] гэтага Кодэкса.

Паступленне і расходаванне сродкаў фонду ініцыятыўнай групы кантралюе фінансавы орган мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, які прыняў рашэнне аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы.

Адкрыццё спецыяльнага рахунку, унясенне ахвяраванняў у фонд ініцыятыўнай групы, зварот ахвяраванняў, спыненне банкаўскіх аперацый па спецыяльным рахунку і падаванне фінансавых справаздач ажыццяўляюцца ў прымяненні да патрабаванняў артыкула 114[1] гэтага Кодэкса.

# РАЗДЗЕЛ VIII
# ПАРАДАК АДКЛІКАННЯ ДЭПУТАТА ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ, ДЭПУТАТА МЯСЦОВАГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ

## ГЛАВА 26
## ПАДСТАВЫ І ПАРАДАК УЗНІМАННЯ ПЫТАННЯ АБ АДКЛІКАННІ ДЭПУТАТА

### Артыкул 129. Падставы адклікання дэпутата

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў, дэпутат мясцовага Савета дэпутатаў, які не апраўдаў даверу выбаршчыкаў, што выявілася ў невыкананні прадугледжаных законам дэпутацкіх абавязкаў, парушэнні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, законаў Рэспублікі Беларусь, актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, учыненні дзеянняў, якія дыскрэдытуюць дэпутата, можа быць адазваны выбаршчыкамі ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

### Артыкул 130. Права ўзнімання пытання аб адкліканні дэпутата

Права ўзнімання пытання аб адкліканні дэпутата належыць выбаршчыкам выбарчай акругі (далей – акруга), ад якой выбраны дэпутат.

Пытанне аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў, дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў не можа быць ўзбуджана менш чым за год да сканчэння тэрміну іх паўнамоцтваў.

### Артыкул 131. Ініцыіраванне пытання аб адкліканні дэпутата

Пытанне аб адкліканні дэпутата можа быць узнята на сходзе выбаршчыкаў акругі, ад якой выбраны дэпутат.

Сходы выбаршчыкаў могуць праводзіцца як па месцы іх жыхарства, так і ў арганізацыях, размешчаных у межах акругі.

Ініцыіраваць скліканне сходу мае права група выбаршчыкаў, якія пражываюць на тэрыторыі акругі, ад якой выбраны дэпутат, у колькасці, не меншай за:

150 выбаршчыкаў – па пытанні аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў;

50 выбаршчыкаў – па пытанні аб адкліканні дэпутата абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў;

40 выбаршчыкаў – па пытанні аб адкліканні дэпутата раённага, гарадскога (горада абласнога падпарадкавання) Савета дэпутатаў;

15 выбаршчыкаў – па пытанні аб адкліканні дэпутата гарадскога (горада раённага падпарадкавання), пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў.

Ініцыятары склікання сходу выбаршчыкаў звяртаюцца да старшыні мясцовага Савета дэпутатаў, на тэрыторыі якога плануецца правесці сход выбаршчыкаў, з пісьмовай заявай аб скліканні такога сходу па месцы іх жыхарства, а аб скліканні сходу выбаршчыкаў у арганізацыі – да яе адміністрацыі.

Заява аб правядзенні сходу выбаршчыкаў павінна быць падпісана ўсімі ініцыятарамі правядзення сходу з указаннем матываў, якія паслужылі падставай для ўзнімання пытання аб адкліканні дэпутата, а таксама прозвішча, імя, імя па бацьку, даты нараджэння і месца жыхарства кожнага ініцыятара правядзення сходу выбаршчыкаў.

Пытанне аб скліканні сходу выбаршчыкаў разглядае адпаведна старшыня або прэзідыум мясцовага Савета дэпутатаў, адміністрацыя арганізацыі, і ў дзесяцідзённы тэрмін прымаецца рашэнне, аб чым паведамляецца ініцыятарам склікання сходу. Пры прыняцці прапановы ініцыятараў склікання сходу выбаршчыкаў вызначаюцца дата, час і месца яго правядзення, аб чым на працягу трох дзён паведамляецца выбаршчыкам.

У выпадку адхілення прапановы аб правядзенні сходу выбаршчыкаў яго ініцыятарам выдаецца копія матываванага рашэння. Гэта рашэнне можа быць ў трохдзённы тэрмін абскарджана ініцыятарамі склікання сходу ў раённы, гарадскі суд (скарга павінна быць падпісана большасцю ініцыятараў склікання сходу). Рашэнне суда з'яўляецца канчатковым.

Паўнамоцтвы, якія ўскладаюцца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам па адкліканні дэпутата на старшыню мясцовага Савета дэпутатаў, у выпадку ўзнімання пытання аб яго адкліканні ажыццяўляе яго намеснік.

### Артыкул 132. Правамоцнасць сходу выбаршчыкаў пры ўзніманні пытання аб адкліканні дэпутата і парадак яго правядзення

Сход выбаршчыкаў па месцы жыхарства пры ўзніманні пытання аб адкліканні дэпутата правамоцны, калі ў ім прымаюць удзел выбаршчыкі, якія пражываюць на тэрыторыі акругі ў колькасці, не меншай за:

300 выбаршчыкаў – пры ўзніманні пытання аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў;

150 выбаршчыкаў – пры ўзніманні пытання аб адкліканні дэпутата абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў;

75 выбаршчыкаў – пры ўзніманні пытання аб адкліканні дэпутата раённага, гарадскога (горада абласнога падпарадкавання) Савета дэпутатаў;

20 выбаршчыкаў – пры ўзніманні пытання аб адкліканні дэпутата гарадскога (горада раённага падпарадкавання), пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў.

Сход выбаршчыкаў у працоўным калектыве арганізацыі, якая з'яўляецца юрыдычнай асобай і налічвае не менш за 300 чалавек, пры ўзніманні пытання аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў правамоцны, калі ў ім прымае ўдзел больш за палову складу калектыву.

Узніманне пытання аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў можа быць ажыццёўлена на агульным сходзе некалькіх меншых працоўных калектываў арганізацый, якія з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, з агульнай колькасцю працуючых не меншай за 300 чалавек. Пры гэтым ад кожнага такога калектыву павінна прысутнічаць больш за палову яго складу.

Сходы выбаршчыкаў у працоўных калектывах па ўзнімáнні пытання аб адкліканні дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў могуць праводзіцца ў калектывах, якія налічваюць не менш за:

150 працуючых – пры ўзніманні пытання аб адкліканні дэпутата абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў;

75 працуючых – пры ўзніманні пытання аб адкліканні дэпутата раённага, гарадскога (горада абласнога падпарадкавання) Савета дэпутатаў;

20 працуючых – пры ўзніманні пытання аб адкліканні дэпутата гарадскога (горада раённага падпарадкавання), пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў.

Сход правамоцны, калі ў ім прымае ўдзел больш за палову складу калектыву.

У парадку, прадугледжаным часткай чацвёртай артыкула 63 гэтага Кодэкса, узніманне пытання аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў, дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў можа быць ажыццёўлена і на канферэнцыі працоўнага калектыву.

Ініцыятары склікання сходу не пазней за 10 дзён да правядзення сходу выбаршчыкаў абавязаны пісьмова паведаміць дэпутату, у дачыненні да якога яны намераны ўзняць пытанне аб адкліканні, а таксама паведаміць адпаведна ў Палату прадстаўнікоў або мясцовы Савет дэпутатаў, са складу якога прапануецца адклікаць дэпутата, аб даце, месцы правядзення сходу выбаршчыкаў і матывах, якія паслужылі падставай для ўзнімання пытання аб адкліканні дэпутата.

Перад пачаткам сходу выбаршчыкаў праводзіцца рэгістрацыя яго ўдзельнікаў з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку, даты нараджэння і месца жыхарства. Кожны ўдзельнік сходу ўласнаручна распісваецца ў спісе выбаршчыкаў, якія прымаюць удзел у сходзе.

На сходзе выбаршчыкаў выбіраецца прэзідыум у складзе старшыні, сакратара і членаў і пры неабходнасці – падліковая камісія, разглядаюцца прапановы аб узніманні пытання аб адкліканні дэпутата, аб правядзенні збору подпісаў выбаршчыкаў акругі ў падтрымку гэтай прапановы і аб утварэнні ініцыятыўнай групы па зборы подпісаў у падтрымку прапановы аб узніманні пытання аб адкліканні дэпутата і правядзенні агітацыі (далей – ініцыятыўная група). Ініцыятыўная група ўтвараецца ў колькасці, не меншай за пяць чалавек. На сходзе выбіраецца кіраўнік ініцыятыўнай групы. Рашэнне сходу прымаецца большасцю галасоў.

Колькасць праведзеных у акрузе сходаў выбаршчыкаў, на якіх можа быць узнята пытанне аб адкліканні дэпутата і ўтвораны ініцыятыўныя групы, не абмяжоўваецца, але яны павінны праводзіцца на працягу трыццацідзённага тэрміну з дня рэгістрацыі першай ініцыятыўнай групы.

На сходзе выбаршчыкаў маюць права прысутнічаць дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, мясцовых Саветаў дэпутатаў, службовыя асобы, упаўнаважаныя старшынёй мясцовага Савета дэпутатаў, на тэрыторыі якога праводзіцца сход выбаршчыкаў, або старшынёй мясцовага Савета дэпутатаў, са складу якога прапануецца адклікаць дэпутата, а таксама прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі.

Аб правядзенні сходу выбаршчыкаў складаецца пратакол. У пратаколе ўказваюцца дата і месца яго правядзення, колькасць удзельнікаў сходу, сутнасць пытанняў, якія разглядаюцца, вынікі галасавання і прынятыя рашэнні, склад утворанай ініцыятыўнай групы з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку і месца жыхарства кожнага з яе членаў і кіраўніка ініцыятыўнай групы.

Пратакол падпісваецца старшынёй і сакратаром сходу і з прыкладзенымі да яго спісамі ўдзельнікаў сходу і складу ініцыятыўнай групы не пазней чым у пяцідзённы тэрмін падаецца ў:

Цэнтральную камісію – пры ўзніманні пытання аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў;

абласную, Мінскую гарадскую, раённую, гарадскую, пасялковую, сельскую тэрытарыяльную выбарчую камісію – пры ўзніманні пытання аб адкліканні дэпутата адпаведнага мясцовага Савета дэпутатаў.

**Артыкул 133. Гарантыі праў дэпутата пры ўзніманні пытання аб яго адкліканні**

Дэпутат, у дачыненні якога ўзбуджаецца пытанне аб адкліканні, мае права прысутнічаць на сходзе выбаршчыкаў або накіроўваць для ўдзелу ў ім упаўнаважаных ім асоб. Паўнамоцтвы гэтых асоб павінны быць пацверджаны пісьмова.

Старшыня сходу выбаршчыкаў абавязаны даць дэпутату для выступлення час, дастатковы для выказвання тлумачэнняў па пытанні, якое абмяркоўваецца. Тлумачэнні дэпутата павінны быць адлюстраваны ў пратаколе сходу. Па даручэнні дэпутата на сходзе мае права замест яго выступіць ўпаўнаважаная ім асоба. Пасля заканчэння абмеркавання прапановы аб узніманні пытання аб адкліканні дэпутат або ўпаўнаважаная ім асоба маюць права на выступленне да пачатку галасавання.

Дэпутат, у дачыненні да якога прапануецца ўзняць пытанне аб адкліканні, не пазней за сем дзён да прызначанай даты сходу выбаршчыкаў можа накіраваць ініцыятарам правядзення гэтага сходу, старшыні мясцовага Савета дэпутатаў, на тэрыторыі якога плануецца правесці сход выбаршчыкаў, у адміністрацыю арганізацыі, якая прыняла рашэнне аб скліканні сходу, пісьмовую заяву з абгрунтаваннем уважлівай прычыны, якая робіць немагчымым яго ўдзел у сходзе выбаршчыкаў у прызначаны дзень, і прапанаваць іншы дзень правядзення сходу ў межах наступных 15 дзён пасля прызначанай даты. Ініцыятары склікання сходу, старшыня мясцовага Савета дэпутатаў, адміністрацыя арганізацыі павінны забяспечыць просьбу дэпутата і ўзгадніць з ім іншы дзень правядзення сходу. Паўторнае перанясенне даты сходу па просьбе дэпутата не дапускаецца.

У выпадку хваробы дэпутата, што павінна быць пацверджана адпаведным дакументам, сход выбаршчыкаў па пісьмовай заяве дэпутата пераносіцца на іншую дату, але не пазней 15 дзён з дня яго папраўкі. Аб сваёй папраўцы дэпутат павінен накіраваць у трохдзённы тэрмін пісьмовае паведамленне ініцыятарам склікання сходу выбаршчыкаў, старшыні мясцовага Савета дэпутатаў, у адміністрацыю арганізацыі. Сход выбаршчыкаў можа быць праведзены незалежна ад стану здароўя дэпутата пасля сканчэння чатырох месяцаў з дня планаванай першай даты сходу.

Адмова дэпутата ўдзельнічаць у сходзе выбаршчыкаў, а таксама няяўка яго на сход без уважлівай прычыны пры своечасовым паведамленні не з'яўляюцца перашкодай для разгляду прапановы аб узніманні пытання аб яго адкліканні.

Сход выбаршчыкаў можа быць перанесены па просьбе яго ініцыятараў на любую іншую дату, калі на гэту маецца пісьмовая згода дэпутата. Перанясенне даты сходу выбаршчыкаў па просьбе яго ініцыятараў дапускаецца толькі адзін раз. Дата сходу выбаршчыкаў пераносіцца з прытрымліваннем патрабаванняў артыкулаў 131 і 132 гэтага Кодэкса.

У выпадку, калі абставіны, якія паслужылі падставай для ўзнімання пытання аб адкліканні дэпутата, з'яўляюцца прадметам разгляду ў судзе, старшыня

мясцовага Савета дэпутатаў, адміністрацыя арганізацыі прыпыняюць разгляд пытання аб правядзенні сходу выбаршчыкаў да вынясення судом рашэння (прыгавору).

Асобы, якія прадставілі яўна лжывую інфармацыю, якая паслужыла падставай для ўзнімання пытання аб адкліканні дэпутата, нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 134. Рэгістрацыя ініцыятыўнай групы**

Ініцыятыўную групу, утвораную на сходзе выбаршчыкаў пры ўзніманні пытання аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў, рэгіструе Цэнтральная камісія, а пры ўзніманні пытання аб адкліканні дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў – адпаведная тэрытарыяльная выбарчая камісія.

Для рэгістрацыі ініцыятыўнай групы ў Цэнтральную камісію, адпаведную тэрытарыяльную выбарчую камісію падаюцца пратакол сходу выбаршчыкаў, спіс удзельнікаў сходу, спіс складу ініцыятыўнай групы з указаннем яе кіраўніка, копія пісьмовага паведамлення дэпутату аб правядзенні сходу выбаршчыкаў і дакумент, які пацвярджае накіраванне паведамлення дэпутату.

Цэнтральная камісія, адпаведная тэрытарыяльная выбарчая камісія ў пятнаццацідзённы тэрмін пасля паступлення неабходных дакументаў рэгіструе ініцыятыўную групу або можа прыняць рашэнне аб адмове ў яе рэгістрацыі, калі пры ўзніманні пытання аб адкліканні дэпутата не быў захаваны парадак, устаноўлены раздзелам VIII гэтага Кодэкса. Пры рашэнні пытання аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы маюць права прысутнічаць яе прадстаўнікі, а таксама дэпутат, у дачыненні да якога прапануецца ўзняць пытанне аб адкліканні, або ўпаўнаважаная ім асоба.

Адмова ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы па адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў можа быць абскарджана ў трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння аб адмове кіраўніком ініцыятыўнай групы ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь, а па адкліканні дэпутата абласнога, Мінскага гарадскога, раённага, гарадскога, пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў – у той жа тэрмін адпаведна ў абласны, Мінскі гарадскі, раённы, гарадскі суд.

Пасля рэгістрацыі ініцыятыўнай групы яе прадстаўніку ў трохдзённы тэрмін выдаюцца пасведчанне аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, пасведчанні членаў групы і падпісныя лісты для збору подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку прапановы аб узніманні пытання аб адкліканні дэпутата (далей – падпісныя лісты), а таксама паведамляецца аб мінімальнай колькасці подпісаў выбаршчыкаў, неабходных у адпаведнасці з патрабаваннямі часткі першай артыкула 135 гэтага Кодэкса для падтрымкі прапановы аб узніманні пытання аб адкліканні дэпутата. Формы пасведчання аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, пасведчання члена ініцыятыўнай групы і падпісных лістоў вызначае Цэнтральная камісія.

Аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы Цэнтральная камісія ў двухдзённы тэрмін паведамляе ў Палату прадстаўнікоў, а адпаведная тэрытарыяльная выбарчая камісія – у мясцовы Савет дэпутатаў, са складу якога прапануецца адклікаць дэпутата.

**Артыкул 135. Збор подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку прапановы аб узніманні пытання аб адкліканні дэпутата**

Прапанову аб узніманні пытання аб адкліканні дэпутата, прынятую на сходзе выбаршчыкаў, павінны падтрымаць не менш за 20 працэнтаў грамадзян, якія валодаюць выбарчым правам і пражываюць на тэрыторыі адпаведнай акругі. Колькасць выбаршчыкаў, неабходная для падтрымкі прапановы аб узніманні пытання аб адкліканні дэпутата, вызначаецца зыходзячы з колькасці выбаршчыкаў у акрузе на дзень выбараў.

Ініцыятыўная група з дня атрымання пасведчання аб яе рэгістрацыі мае права ажыццяўляць на ўсёй тэрыторыі акругі збор подпісаў выбаршчыкаў на падпісных лістах. Подпісы выбаршчыкаў, сабраныя да рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, не ўлічваюцца. Расходы на збор подпісаў выбаршчыкаў нясе ініцыятыўная група.

Падпісныя лісты павінны ўтрымліваць фармулёўку прапановы аб адкліканні дэпутата з указаннем матываў адклікання, прозвішча, імя, імя па бацьку дэпутата, даты нараджэння, пасады (занятку), месца работы і месца жыхарства, год выбрання дэпутатам (Палаты прадстаўнікоў, адпаведнага мясцовага Савета дэпутатаў), партыйнасць, а таксама прозвішча, імя, імя па бацьку члена ініцыятыўнай групы, які збірае подпісы, і нумар пасведчання аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы. У падпісным лісце павінен быць указаны апошні дзень збору подпісаў.

Тэрмін збору подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку прапановы аб узніманні пытання аб адкліканні дэпутата – 45 дзён з дня атрымання пасведчання аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы. Калі ў акрузе ўтворана і зарэгістравана некалькі ініцыятыўных груп, тэрмін збору подпісаў для кожнай з іх незалежна ад даты іх рэгістрацыі абмяжоўваецца 45 днямі з дня рэгістрацыі першай ініцыятыўнай групы.

У выпадку, калі на працягу 45 дзён не была сабрана неабходная колькасць подпісаў, далейшы збор подпісаў выбаршчыкаў спыняецца.

### Артыкул 136. Парадак збору подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку прапановы аб узніманні пытання аб адкліканні дэпутата

Подпісы выбаршчыкаў збіраюць толькі члены ініцыятыўнай групы. У падпісным лісце павінны быць подпісы выбаршчыкаў, якія пражываюць на тэрыторыі выбарчай акругі, па якой узбуджана пытанне аб адкліканні дэпутата.

У падпісным лісце ў дачыненні да выбаршчыка, які падтрымлівае прапанову аб узніманні пытання аб адкліканні дэпутата, указваюцца прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, месца жыхарства, серыя і нумар пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь або рэквізіты іншага дакумента, які вызначаецца Цэнтральнай камісіяй. Даныя аб выбаршчыку ўносяцца ў падпісны ліст рукапісным спосабам. Выбаршчык уласнаручна ставіць у падпісным лісце дату подпісу і распісваецца. Подпісы нумаруюцца.

Падпісны ліст засведчвае член ініцыятыўнай групы, які збіраў подпісы. Член ініцыятыўнай групы пры засведчанні падпіснога ліста ставіць подпіс і дату яго ўнясення, а таксама ўказвае прозвішча і ініцыялы.

Выбаршчык мае права паставіць свой подпіс толькі на адным падпісным лісце і толькі за сябе асабіста.

### Артыкул 137. Парадак і тэрміны падачы падпісных лістоў у мясцовыя Саветы дэпутатаў. Вызначэнне вынікаў збору подпісаў выбаршчыкаў

Запоўненыя падпісныя лісты на працягу прадугледжанага часткай чацвёртай артыкула 135 гэтага Кодэкса тэрміну для збору подпісаў, але не пазней чым на наступны дзень з дня сканчэння гэтага тэрміну падаюцца:

старшыні Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў – пры ўзніманні пытання аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў, дэпутата Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў;

старшыні адпаведнага абласнога Савета дэпутатаў – пры ўзніманні пытання аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў, дэпутата абласнога Савета дэпутатаў;

старшыні раённага, гарадскога (горада абласнога і раённага падпарадкавання), пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў – пры ўзніманні пытання аб адкліканні дэпутата раённага, гарадскога, пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў.

Старшыня адпаведнага мясцовага Савета дэпутатаў арганізуе праверку дакладнасці подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах, у якой могуць удзельнічаць дэпутаты і іншыя прыцягнутыя старшынёй мясцовага Савета дэпутатаў асобы. Праверка праводзіцца не пазней чым у месячны тэрмін пасля падавання падпісных лістоў.

Прызнанне дакладнымі подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку прапановы аб узніманні пытання аб адкліканні дэпутата праводзіцца ў парадку, прадугледжаным часткамі шаснаццатай і васямнаццатай артыкула 61 гэтага Кодэкса. Недакладнымі лічацца таксама подпісы выбаршчыкаў, сабраныя да рэгістрацыі ініцыятыўнай групы. Калі ў падпісным лісце ўтрымліваюцца подпісы выбаршчыкаў, якія не пражываюць на тэрыторыі выбарчай акругі, гэтыя подпісы не правяраюцца і не ўлічваюцца. Праверцы і ўліку таксама не падлягаюць подпісы выбаршчыкаў, калі ў падпісным лісце адсутнічае фармулёўка прапановы аб адкліканні дэпутата і (або) звесткі аб дэпутаце, у дачыненні якога ўзбуджана пытанне аб адкліканні.

У выпадку выяўлення некалькіх подпісаў аднаго і таго ж выбаршчыка ў падтрымку прапановы аб узніманні пытання аб адкліканні дэпутата дакладным лічыцца толькі адзін подпіс, а астатнія подпісы лічацца недакладнымі.

Пасля заканчэння праверкі падпісных лістоў старшыня адпаведнага мясцовага Савета дэпутатаў, указаны у частцы першай гэтага артыкула, які прыняў ад ініцыятыўнай групы падпісныя лісты, складае пратакол аб выніках збору подпісаў, у якім указваюцца агульная колькасць подпісаў у падпісных лістах, прынятых ад ініцыятыўнай групы, колькасць подпісаў, дакладнасць якіх правяралася, колькасць подпісаў, прызнаных дакладнымі, і колькасць подпісаў, прызнаных недакладнымі. Пратакол падпісвае старшыня мясцовага Савета дэпутатаў.

Калі збор подпісаў праводзіўся некалькімі ініцыятыўнымі групамі, пратакол аб выніках збору подпісаў складаецца асобна па кожнай ініцыятыўнай групе, а затым складаецца падагульняльны пратакол, які падпісвае старшыня мясцовага Савета дэпутатаў.

Пратакол аб выніках збору подпісаў не пазней чым у трохдзённы тэрмін перадаецца ў:

Цэнтральную камісію – пры ўзніманні пытання аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў;

адпаведную тэрытарыяльную выбарчую камісію – пры ўзніманні пытання аб адкліканні дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў.

## ГЛАВА 27
## ПАРАДАК ПРЫЗНАЧЭННЯ ГАЛАСАВАННЯ АБ АДКЛІКАННІ ДЭПУТАТА. ГАЛАСАВАННЕ І ПАДВЯДЗЕННЕ ЯГО ВЫНІКАЎ

### Артыкул 138. Прыняцце рашэння аб прызначэнні галасавання аб адкліканні дэпутата

Цэнтральная камісія, адпаведная тэрытарыяльная выбарчая камісія на працягу 15 дзён з дня паступлення неабходных дакументаў (пратаколаў, падпісных лістоў) маюць права правесці выбарачную або поўную праверку захавання патрабаванняў раздзела VIII гэтага Кодэкса пры ўзніманні пытання аб адкліканні дэпутата.

Пры вызначэнні, што збор неабходнай колькасці подпісаў выбаршчыкаў і іншыя мерапрыемствы праведзены ў адпаведнасці з патрабаваннямі раздзела VIII гэтага Кодэкса, Цэнтральная камісія прымае рашэнне аб прызначэнні галасавання аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў, а адпаведная тэрытарыяльная выбарчая камісія – аб прызначэнні галасавання аб адкліканні дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў.

Галасаванне прызначаецца не раней за адзін месяц і не пазней за два месяцы з дня прыняцця рашэння аб прызначэнні галасавання.

Калі пры ўзніманні пытання аб адкліканні дэпутата і зборы подпісаў выбаршчыкаў мелі месца істотныя парушэнні патрабаванняў раздзела VIII гэтага Кодэкса або не было сабрана неабходнай колькасці подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку прапановы аб узніманні пытання аб адкліканні дэпутата, прымаецца рашэнне аб адмове ў прызначэнні галасавання аб адкліканні дэпутата.

Рашэнне Цэнтральнай камісіі аб адмове ў прызначэнні галасавання аб адкліканні дэпутата ў трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння можа быць абскарджана кіраўніком ініцыятыўнай групы ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь, а рашэнне абласной, Мінскай гарадской, раённай, гарадской, пасялковай, сельскай тэрытарыяльнай выбарчай камісіі ў той жа тэрмін – адпаведна ў абласны, Мінскі гарадскі, раённы, гарадскі суд.

Рашэнне Цэнтральнай камісіі аб прызначэнні галасавання аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў накіроўваецца ў Палату прадстаўнікоў і перадаецца для абнародавання (апублікавання) у сродкі масавай інфармацыі, а рашэнне адпаведнай тэрытарыяльнай выбарчай камісіі аб прызначэнні галасавання аб адкліканні дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў публікуецца ў мясцовых друкаваных выданнях або іншым спосабам даводзіцца да ведама выбаршчыкаў.

Рашэнне Цэнтральнай камісіі, адпаведнай тэрытарыяльнай выбарчай камісіі аб прызначэнні галасавання аб адкліканні дэпутата адмяняецца, калі паўнамоцтвы дэпутата датэрмінова спынены на падставах, устаноўленых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 139. Бюлетэнь для галасавання аб адкліканні дэпутата

Бюлетэнь для галасавання аб адкліканні дэпутата павінен утрымліваць найменне і нумар акругі, ад якой выбраны дэпутат, фармулёўку прапановы аб адкліканні дэпутата з указаннем матываў адклікання, прозвішча, імя, імя па бацьку дэпутата, дату нараджэння, пасаду (занятак), месца работы і месца жыхарства, год выбрання дэпутатам (Палаты прадстаўнікоў, адпаведнага мясцовага Савета дэпутатаў), партыйнасць і варыянты адказу – «за адкліканне» і «супраць адклікання», пад якімі змяшчаюцца пустыя квадраты.

Тэкст бюлетэня зацвярджаецца адпаведнай акруговай, тэрытарыяльнай камісіяй.

Бюлетэні для галасавання аб адкліканні дэпутата друкуюцца на беларускай або рускай мове.

Бюлетэнь для галасавання павінен утрымліваць растлумачэнне аб парадку яго запаўнення.

На адваротным баку бюлетэня для галасавання ставяцца подпісы не менш чым дзвюх асоб, якія ўваходзяць у склад участковай камісіі.

### Артыкул 140. Давераныя асобы дэпутата

Дэпутат пры вырашэнні пытанняў, звязаных з яго адкліканнем, пасля прыняцця рашэння аб прызначэнні галасавання аб адкліканні можа мець давераных асоб, якія прадстаўляюць яго інтарэсы ва ўзаемаадносінах з выбаршчыкамі, ініцыятыўнымі групамі, дзяржаўнымі органамі, камісіямі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата. Рэгістрацыя давераных асоб і іх дзейнасць ажыццяўляюцца ў прымяненні да парадку, прадугледжанага гэтым Кодэксам пры правядзенні выбараў дэпутатаў.

### Артыкул 141. Парадак правядзення галасавання аб адкліканні дэпутата і падвядзення яго вынікаў

Галасаванне аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў, дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў з'яўляецца тайным і праводзіцца ў парадку, прадугледжаным артыкуламі 50, 51, 52 і 54 гэтага Кодэкса.

Галасаванне лічыцца галасаваннем, якое адбылося, калі ў ім прыняло ўдзел больш за палову выбаршчыкаў, уключаных у спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у галасаванні аб адкліканні дэпутата. Адкліканым лічыцца дэпутат, калі за яго адкліканне прагаласавала больш за палову выбаршчыкаў акругі, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

Адкліканне дэпутата лічыцца адхіленым, калі за адкліканне прагаласавала менш за палову выбаршчыкаў акругі, якія прынялі ўдзел у галасаванні, а таксама калі ў галасаванні ўдзельнічала менш за палову выбаршчыкаў, уключаных у спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у галасаванні аб адкліканні дэпутата. У выпадку роўнасці галасоў, пададзеных за і супраць адклікання дэпутата, дэпутат захоўвае свае паўнамоцтвы.

На падставе пратаколаў, атрыманых ад участковых камісій і складзеных у прымяненні да патрабаванняў артыкула 55 гэтага Кодэкса, вынікі галасавання вызначаюцца на пасяджэнні акруговай, тэрытарыяльнай камісіі і заносяцца ў пратакол.

Пратакол акруговай камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў пасля вызначэння вынікаў галасавання накіроўваецца ў Цэнтральную камісію, а пратакол акруговай камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата абласнога Савета дэпутатаў – у абласную тэрытарыяльную камісію.

Цэнтральная камісія, адпаведная тэрытарыяльная камісія пасля сканчэння пяці дзён з дня галасавання, калі больш за палову выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні, прагаласавала за адкліканне дэпутата і няма падстаў для разгляду

пытання аб прызнанні вынікаў галасавання несапраўднымі, прымае рашэнне аб прызнанні дэпутата адкліканым выбаршчыкамі.

Калі выбаршчыкі акругі не прагаласавалі за адкліканне дэпутата, у рашэнні Цэнтральнай камісіі, адпаведнай тэрытарыяльнай камісіі ўказваецца, што прапанова аб адкліканні дэпутата адхілена выбаршчыкамі. Матэрыялы аб гэтым перадаюцца адпаведна ў Палату прадстаўнікоў, мясцовы Савет дэпутатаў.

Цэнтральная камісія, а таксама акруговая, тэрытарыяльная камісія ў выпадку парушэнняў патрабаванняў гэтага Кодэкса, якія паўплывалі на вынікі галасавання, могуць прызнаць вынікі галасавання несапраўднымі. Скарга аб прызнанні вынікаў галасавання аб адкліканні дэпутата несапраўднымі падаецца адпаведна ў Цэнтральную камісію, акруговую, тэрытарыяльную камісію не пазней чым на трэці дзень пасля галасавання. Рашэнне Цэнтральнай камісіі, тэрытарыяльнай, акруговай камісіі аб прызнанні вынікаў галасавання несапраўднымі ў трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння можа быць абскарджана адпаведна ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь, абласны, Мінскі гарадскі, раённы, гарадскі суд.

Пры выяўленні памылак, неадпаведнасцей у пратаколах участковых, акруговай, тэрытарыяльнай камісій, а таксама іншых парушэнняў, дапушчаных у ходзе галасавання або пры падліку галасоў, Цэнтральная камісія, вышэйстаячая тэрытарыяльная камісія па сваёй ініцыятыве або па заяве дэпутата маюць права прыняць рашэнне аб паўторным падліку галасоў адпаведнай акруговай, тэрытарыяльнай камісіяй. Заява дэпутата аб паўторным падліку галасоў падаецца адпаведна ў Цэнтральную камісію, вышэйстаячую тэрытарыяльную камісію не пазней чым на трэці дзень пасля галасавання аб адкліканні дэпутата. Паўторны падлік галасоў выбаршчыкаў праводзіцца акруговай, тэрытарыяльнай камісіяй у прысутнасці члена (членаў) Цэнтральнай камісіі, вышэйстаячай тэрытарыяльнай камісіі, а пры неабходнасці – і ўчастковых камісій.

Рашэнне Цэнтральнай камісіі па выніках галасавання аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў у трохдзённы тэрмін з дня прыняцця можа быць абскарджана дэпутатам, кіраўніком ініцыятыўнай групы ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь.

Рашэнне тэрытарыяльнай камісіі па выніках галасавання аб адкліканні дэпутата абласнога, Мінскага гарадскога, раённага, гарадскога, пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў у такім жа парадку і ў той жа тэрмін можа быць абскарджана адпаведна ў абласны, Мінскі гарадскі, раённы, гарадскі суд.

### Артыкул 142. Недапушчальнасць паўторнага ўзнімання пытання аб адкліканні дэпутата на працягу года

Паўторнае ўзніманне пытання аб адкліканні дэпутата на тых жа падставах на працягу года з дня правядзення галасавання аб адкліканні дэпутата не дапускаецца.

## РАЗДЗЕЛ IX
## ПАРАДАК АДКЛІКАННЯ ЧЛЕНА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ

## ГЛАВА 28
## ПАДСТАВЫ І ПАРАДАК ІНІЦЫІРАВАННЯ АДКЛІКАННЯ ЧЛЕНА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ

### Артыкул 143. Падставы і парадак адклікання члена Савета Рэспублікі

Член Савета Рэспублікі, які не апраўдаў аказанага яму даверу, што выявілася ў невыкананні прадугледжаных законам абавязкаў члена Савета Рэспублікі, парушэнні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, законаў Рэспублікі Беларусь, актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, учыненні дзеянняў, якія дыскрэдытуюць члена Савета Рэспублікі, можа быць адкліканы.

Адкліканне члена Савета Рэспублікі, выбранага ад вобласці, горада Мінска, ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым раздзелам IX гэтага Кодэкса.

Парадак адклікання члена Савета Рэспублікі, прызначанага Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, устанаўлівае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

Пытанне аб адкліканні члена Савета Рэспублікі не можа быць узнята менш чым за год да сканчэння тэрміну яго паўнамоцтваў.

**Артыкул 144. Ініцыіраванне ўзнімання пытання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі**

Ініцыіраваць узніманне пытання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі, выбранага ад вобласці, горада Мінска, могуць:

прэзідыум раённага, гарадскога (горада абласнога падпарадкавання) Савета дэпутатаў і раённы, гарадскі выканаўчы камітэт, якія вылучалі кандыдата ў члены Савета Рэспублікі, – перад прэзідыумам абласнога Савета дэпутатаў і абласным выканаўчым камітэтам;

не менш за 10 дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў – перад прэзідыумам Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам.

Ініцыятары ўзнімання пытання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі выказваюць матывы, якія паслужылі падставай для разгляду гэтага пытання.

Узнімання пытання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі, выбранага ад вобласці, ініцыіруецца на сумесным пасяджэнні прэзідыума раённага, гарадскога (горада абласнога падпарадкавання) Савета дэпутатаў і раённага, гарадскога выканаўчага камітэта. Сумеснае пасяджэнне прэзідыума раённага, гарадскога Савета дэпутатаў і адпаведнага выканаўчага камітэта лічыцца правамоцным, калі ў ім прымае ўдзел не менш за дзве трэці адпаведна ад складу прэзідыума і выканаўчага камітэта.

Рашэнне сумеснага пасяджэння прэзідыума раённага, гарадскога Савета дэпутатаў і адпаведнага выканаўчага камітэта прымаецца простай большасцю галасоў ад іх складу.

Заяву дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў аб ініцыіраванні ўзнімання пытання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі павінны падпісаць усе яго ініцыятары.

Матэрыялы па ініцыіраванні ўзнімання пытання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі накіроўваюцца: па адкліканні члена Савета Рэспублікі, выбранага ад вобласці, – у прэзідыум абласнога Савета дэпутатаў і абласны выканаўчы камітэт; па адкліканні члена Савета Рэспублікі, выбранага ад горада Мінска, – у прэзідыум Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт.

**Артыкул 145. Парадак разгляду ініцыятывы аб узніманні пытання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі прэзідыумам абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і абласным, Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам**

Прэзідыум абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і абласны, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт абавязаны ў пяцідзённы тэрмін паведаміць члену Савета Рэспублікі аб ініцыіраванні ў дачыненні да яго пытання аб адкліканні з указаннем матываў і даты разгляду дадзенага пытання на іх пасяджэнні. Аб даце, часе і месцы разгляду пісьмова паведамляецца члену Савета Рэспублікі не пазней чым за 15 дзён да правядзення пасяджэння.

Калі член Савета Рэспублікі, у дачыненні да якога ініцыіруецца пытанне аб адкліканні, па ўважлівай прычыне не можа прыняць удзелу ў пасяджэнні ў прызначаны дзень, ён не пазней за сем дзён да прызначанай даты пасяджэння павінен накіраваць ініцыятарам правядзення пасяджэння пісьмовую заяву з абгрунтаваннем прычыны і прапанаваць іншы дзень правядзення пасяджэння ў межах 15 дзён, наступных пасля прызначанай даты. Ініцыятары правядзення пасяджэння павінны забяспечыць просьбу члена Савета Рэспублікі і ўзгадніць з ім іншы дзень правядзення пасяджэння. Паўторнае перанясенне даты пасяджэння па просьбе члена Савета Рэспублікі не дапускаецца.

Адмова члена Савета Рэспублікі ўдзельнічаць у пасяджэнні, а таксама няяўка яго на пасяджэнне без уважлівай прычыны пры своечасовым паведамленні не з'яўляюцца перашкодай для разгляду прапановы аб узніманні пытання аб яго адкліканні.

Член Савета Рэспублікі мае права накіраваць для ўдзелу ў пасяджэнні ўпаўнаважаную ім асобу (асоб). Паўнамоцтвы гэтай асобы (асоб) павінны быць пацверджаны пісьмова.

На пасяджэнні адпаведна прэзідыума абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і абласнога, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта члену Савета Рэспублікі даецца час, дастатковы для выказвання тлумачэнняў па сутнасці ініцыятывы аб узніманні пытання аб яго адкліканні, якая разглядаецца. Тлумачэнні члена Савета Рэспублікі павінны быць адлюстраваны ў пратаколе пасяджэння. Па даручэнні члена Савета Рэспублікі на пасяджэнні мае права замест яго выступіць ўпаўнаважаная ім асоба.

Сумеснае пасяджэнне прэзідыума абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і абласнога, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта лічыцца правамоцным, калі ў ім прыняло ўдзел не за дзве трэці адпаведна ад складу прэзідыума і выканаўчага камітэта. Рашэнне сумеснага пасяджэння, якое ўтрымлівае меркаванне гэтых органаў аб ініцыятыве аб узніманні пытання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі, прымаецца большасцю галасоў ад іх складу.

Пратакол пасяджэння з усімі наяўнымі матэрыяламі накіроўваецца ў Цэнтральную камісію для заключэння аб захаванні патрабаванняў раздзела IX гэтага Кодэкса пры ініцыіраванні ўзнімання пытання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі.

### Артыкул 146. Праверка Цэнтральнай камісіяй захавання патрабаванняў гэтага Кодэкса пры ініцыіраванні ўзнімання пытання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі

Цэнтральная камісія ў дзесяцідзённы тэрмін пасля паступлення пратакола пасяджэння прэзідыума абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і абласнога, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта правярае захаванне патрабаванняў раздзела IX гэтага Кодэкса пры ініцыіраванні ўзнімання пытання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі, разглядае гэта пытанне на сваім пасяджэнні,

зацвярджае заключэнне і неадкладна накіроўвае яго ў прэзідыум абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і абласны, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт.

### Артыкул 147. Узніманне пытання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі

Прэзідыум абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і абласны, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт у пяцідзённы тэрмін пасля атрымання заключэння Цэнтральнай камісіі вызначаюць дату правядзення свайго пасяджэння для разгляду прапановы аб узніманні пытання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі. Аб даце, часе і месцы правядзення пасяджэння не пазней чым за 15 дзён да пасяджэння пісьмова паведамляецца члену Савета Рэспублікі, які мае права прысутнічаць на гэтым пасяджэнні або накіраваць для ўдзелу ў ім упаўнаважаную ім асобу (асоб).

Калі мерапрыемствы па ініцыіраванні ўзнімання пытання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі праведзены ў адпаведнасці з патрабаваннямі раздзела IX гэтага Кодэкса і маюцца падставы для ўзнімання пытання аб яго адкліканні, прэзідыум абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і абласны, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт прымаюць рашэнне аб узніманні пытання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі, выбранага ад вобласці, горада Мінска, і аб прызначэнні дня галасавання аб яго адкліканні.

У выпадку, калі абставіны, якія паслужылі падставай для ініцыіравання ўзнімання пытання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі, з'яўляюцца прадметам разгляду ў судзе, органы, указаныя ў частцы другой гэтага артыкула, прыпыняюць далейшы разгляд пытання да вынясення судом рашэння (прыгавору).

### Артыкул 148. Парадак прызначэння галасавання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі

Галасаванне аб адкліканні члена Савета Рэспублікі, выбранага ад вобласці, горада Мінска, прызначаецца не раней за адзін месяц і не пазней за два месяцы з дня прыняцця рашэння аб прызначэнні галасавання.

У выпадку хваробы члена Савета Рэспублікі, што павінна быць пацверджана адпаведным дакументам, галасаванне па яго пісьмовай заяве пераносіцца на іншую дату, але не пазней за 15 дзён з дня яго папраўкі. Аб сваёй папраўцы член Савета Рэспублікі павінен накіраваць у трохдзённы тэрмін пісьмовае паведамленне ў прэзідыум абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і абласны, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт. Галасаванне можа быць праведзена незалежна ад стану здароўя члена Савета Рэспублікі пасля сканчэння чатырох месяцаў з пачатку яго хваробы.

Рашэнне прэзідыума абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і абласнога, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта аб прызначэнні галасавання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі накіроўваецца ў Савет Рэспублікі і перадаецца для абнародавання (апублікавання) у сродкі масавай інфармацыі.

Калі пры ініцыіраванні ўзнімання пытання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі мелі месца істотныя парушэнні патрабаванняў раздзела IX гэтага Кодэкса, прымаецца рашэнне аб адмове ў прызначэнні галасавання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі. Гэта рашэнне ў трохдзённы тэрмін можа быць абскарджана ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь ініцыятарамі ўзнімання пытання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі.

**Артыкул 149. Агітацыя за адклікання або супраць адклікання члена Савета Рэспублікі**

Пасля прызначэння галасавання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі, выбранага ад вобласці, горада Мінска, дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутаты Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў маюць права свабодна і ўсебакова абмяркоўваць пытанні, звязаныя з адкліканнем члена Савета Рэспублікі, яго дзелавыя і асабістыя якасці, весці агітацыю за **адкліканне** або супраць адклікання члена Савета Рэспублікі.

Дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі, сродкі масавай інфармацыі, што часткова фінансуюцца з рэспубліканскага або мясцовага бюджэтаў, а таксама сродкі масавай інфармацыі, адным з заснавальнікаў якіх выступаюць дзяржаўныя органы, арганізацыі, абавязаны забяспечваць роўныя магчымасці для выступленняў за **адкліканне** або супраць адклікання члена Савета Рэспублікі дэпутатам мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатам Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, а таксама члену Савета Рэспублікі, у дачыненні да якога ўзнята пытанне аб адкліканні.

## ГЛАВА 29
## ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ ПАСЯДЖЭННЯ ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ БАЗАВАГА ЎЗРОЎНЮ ВОБЛАСЦІ, ДЭПУТАТАЎ МІНСКАГА ГАРАДСКОГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПА ПЫТАННІ АБ АДКЛІКАННІ ЧЛЕНА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ

**Артыкул 150. Правядзенне пасяджэння дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў па пытанні аб адкліканні члена Савета Рэспублікі**

Аб дні пасяджэння дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў (далей – пасяджэнне дэпутатаў) аб'яўляецца не пазней чым у пяцідзённы тэрмін з дня прыняцця прэзідыумам абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і абласным, Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам рашэння аб прызначэнні галасавання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі, выбранага ад вобласці, горада Мінска.

Пасяджэнне дэпутатаў лічыцца правамоцным, калі ў ім прымае ўдзел больш за палову ад агульнай колькасці дэпутатаў, выбраных у мясцовыя Саветы дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў. Пры гэтым у пасяджэнні дэпутатаў павінны прыняць удзел не менш за адну чвэрць дэпутатаў ад кожнага мясцовага Савета дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці.

Пасяджэнне дэпутатаў адкрывае найстарэйшы па ўзросце дэпутат і вядзе яго да выбрання старшыні пасяджэння.

Для забеспячэння работы пасяджэння дэпутатаў выбіраюцца сакратарыят і падліковая камісія.

Пасяджэнне дэпутатаў праводзіцца з удзелам члена Савета Рэспублікі, у дачыненні да якога разглядаецца пытанне аб адкліканні, або ўпаўнаважанай ім асобы (асоб).

Адмова члена Савета Рэспублікі ўдзельнічаць у пасяджэнні дэпутатаў або яго няяўка без уважлівай прычыны на пасяджэнне не з'яўляюцца перашкодай для разгляду пытання аб яго адкліканні.

Падстава і матывы правядзення галасавання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі дэпутатам на пасяджэнні дакладвае асоба, упаўнаважаная органамі, якія прынялі рашэнне аб прызначэнні галасавання.

Старшыня пасяджэння абавязаны даць члену Савета Рэспублікі для выступлення час, дастатковы для выказвання тлумачэнняў.

Па даручэнні члена Савета Рэспублікі на пасяджэнні дэпутатаў мае права выступіць ўпаўнаважаная ім асоба. Пасля заканчэння абмеркавання пытання аб адкліканні член Савета Рэспублікі або ўпаўнаважаная ім асоба маюць права выступіць да пачатку галасавання.

На пасяджэнні дэпутатаў маюць права прысутнічаць члены Савета Рэспублікі, члены Цэнтральнай камісіі, дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў усіх тэрытарыяльных узроўняў, прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі.

**Артыкул 151. Арганізацыя галасавання па адкліканні члена Савета Рэспублікі**

Адкліканне члена Савета Рэспублікі праводзіцца тайным галасаваннем. Для арганізацыі галасавання і вызначэння яго вынікаў на пасяджэнні дэпутатаў выбіраецца са складу дэпутатаў падліковая камісія.

Падліковая камісія выбірае са свайго складу старшыню, намесніка старшыні і сакратара камісіі. Рашэнні падліковай камісіі прымаюцца большасцю галасоў ад яе складу.

Бюлетэні для галасавання вырабляе падліковая камісія па вызначанай Цэнтральнай камісіяй форме ў колькасці, якая адпавядае колькасці ўдзельнікаў пасяджэння.

Час і месца галасавання, парадак яго правядзення вызначае падліковая камісія і аб'яўляе яе старшыня.

Кожнаму дэпутату, які прымае ўдзел у рабоце пасяджэння дэпутатаў, выдаецца адзін бюлетэнь для галасавання.

Бюлетэні выдаюцца падліковай камісіяй па спісе дэпутатаў, якія прымаюць удзел у рабоце пасяджэння дэпутатаў, пры прад'яўленні пасведчання дэпутата.

Па выніках галасавання падліковая камісія складае пратакол, які падпісваецца ўсім складам падліковай камісіі.

Па дакладзе падліковай камісіі пасяджэнне дэпутатаў адкрытым галасаваннем прымае рашэнне аб зацвярджэнні вынікаў галасавання.

Адкліканне члена Савета Рэспублікі лічыцца адкліканнем, якое адбылося, калі ў галасаванні прыняло ўдзел больш за палову ад агульнай колькасці дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і за адкліканне прагаласавала больш за палову дэпутатаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні. У выпадку роўнасці галасоў, пададзеных за і супраць адклікання члена Савета Рэспублікі, ён захоўвае свае паўнамоцтвы.

Пратакол падліковай камісіі і іншыя матэрыялы па адкліканні члена Савета Рэспублікі ў двухдзённы тэрмін перадаюцца ў Цэнтральную камісію.

**Артыкул 152. Разгляд Цэнтральнай камісіяй вынікаў галасавання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі**

Цэнтральная камісія пасля сканчэння 10 дзён з дня галасавання аб адкліканні члена Савета Рэспублікі, калі за адкліканне прагаласавала больш за палову ад колькасці дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні, і не маецца падстаў для разгляду пытання аб прызнанні вынікаў галасавання несапраўднымі, прымае рашэнне аб прызнанні члена Савета Рэспублікі адкліканым і паведамляе аб гэтым у Савет Рэспублікі.

Рашэнне Цэнтральнай камісіі ў трохдзённы тэрмін можа быць абскарджана членам Савета Рэспублікі ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь.

## РАЗДЗЕЛ X
## ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 153. Уступленне ў сілу гэтага Кодэкса**

Гэты Кодэкс уступае ў сілу праз месяц пасля яго апублікавання.

**Артыкул 154. Прывядзенне актаў заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым Кодэксам**

Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь на працягу трох месяцаў з дня ўступлення ў сілу гэтага Кодэкса:

падрыхтаваць і ўнесці ў вызначаным парадку ў Палату прадстаўнікоў прапановы па прывядзенні заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Кодэксам;

прывесці рашэнні Урада Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Кодэксам;

забяспечыць перагляд і адмену рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, падпарадкаванымі Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, іх нарматыўных актаў, якія супярэчаць гэтаму Кодэксу.

**Артыкул 155. Асноўныя тэрміны, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым Кодэксе**

У гэтым Кодэксе выкарыстоўваюцца наступныя асноўныя тэрміны:

агітацыйныя матэрыялы – друкаваныя і іншыя матэрыялы, якія ўтрымліваюць прыкметы передвыбарнай агітацыі, агітацыі па рэферэндуме, адкліканні дэпутата і прызначаныя для масавага распаўсюджвання пры правядзенні выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата;

передвыбарная агітацыя – дзейнасць грамадзян Рэспублікі Беларусь, палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, кандыдатаў, іх давераных асоб, ініцыятыўных груп, якія ажыццяўлялі збор подпісаў па вылучэнні кандыдатаў і якія праводзяць агітацыю за іх выбранне, якая мае мэтай схіліць або якая схіляе выбаршчыкаў да ўдзелу ў выбарах, галасавання за тых ці іншых кандыдатаў або супраць іх;

агітацыя па рэферэндуме – дзейнасць грамадзян Рэспублікі Беларусь, ініцыятыўнай групы па правядзенні рэферэндуму, палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, якая мае мэтай схіліць або якая

схіляе ўдзельнікаў рэферэндуму правесці рэферэндум або адмовіцца ад яго правядзення, прагаласаваць за або супраць пытання (праекта рашэння), вынесенага на рэферэндум;

выбары – выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, членаў Савета Рэспублікі, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, якія праводзяцца на аснове Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і гэтага Кодэкса;

дэпутат – асоба, выбраная выбаршчыкамі адпаведнай выбарчай акругі ў Палату прадстаўнікоў або мясцовы Савет дэпутатаў на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні;

выбаршчык – грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які валодае ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і гэтым Кодэксам правам выбіраць у дзяржаўныя органы;

выбарчая кампанія – перыяд з дня афіцыйнага апублікавання рашэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважанага Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Кодэксам дзяржаўнага органа аб прызначэнні выбараў да дня афіцыйнага апублікавання вынікаў выбараў;

камісіі – выбарчыя камісіі, камісіі па рэферэндуме, камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата;

выбарчыя камісіі – камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, камісіі па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў;

выбарчая акруга – тэрыторыя, ад якой непасрэдна грамадзянамі Рэспублікі Беларусь выбіраецца Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў;

кандыдат – асоба, зарэгістраваная адпаведнай камісіяй кандыдатам на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, кандыдатам у члены Савета Рэспублікі, кандыдатам у дэпутаты мясцовага Савета дэпутатаў;

назіральнік – дэпутат Палаты прадстаўнікоў, член Савета Рэспублікі, дэпутат мясцовага Савета дэпутатаў, давераная асоба кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, а таксама прадстаўнік палітычнай партыі, іншага грамадскага аб'яднання, працоўнага калектыву, грамадзян, якія ажыццяўляюць назіранне за падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата, члена Савета Рэспублікі ў адпаведнасці з устаноўленым гэтым Кодэксам парадкам;

замежны (міжнародны) назіральнік – асоба, якая прадстаўляе замежную дзяржаву або міжнародную арганізацыю, набывае права на ажыццяўленне назірання за падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата, члена Савета Рэспублікі ў адпаведнасці з устаноўленым гэтым Кодэксам парадкам;

удзельнік рэферэндуму – грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які валодае выбарчым правам і прымае ўдзел у правядзенні рэферэндуму;

тэледэбаты – выказванні двух і болей кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў па шырокім коле калектыўна значных праблем, у тым ліку паведамленні, якія датычацца перадвыбарных праграм іншых кандыдатаў, зробленыя па тэлебачанні ў ходзе публічнага абмену меркаваннямі, пытаннямі;

добраахвотнае ахвяраванне грамадзяніна – бязвыплатнае ўнясенне грамадзянінам Рэспублікі Беларусь уласных грашовых сродкаў на спецыяльны выбарчы рахунак кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, на

спецыяльны рахунак ініцыятыўнай групы па правядзенні рэферэндуму або ў пазабюджэтны фонд, які ствараецца Цэнтральнай камісіяй;

добраахвотнае ахвяраванне юрыдычнай асобы – бязвыплатнае пералічэнне юрыдычнай асобай грашовых сродкаў са свайго разліковага рахунку на спецыяльны выбарчы рахунак кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, на спецыяльны рахунак ініцыятыўнай групы па правядзенні рэферэндуму або ў пазабюджэтны фонд, які ствараецца Цэнтральнай камісіяй.

**Артыкул 155[1]. Парадак захоўвання дакументаў па выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата, члена Савета Рэспублікі**

Парадак захоўвання, перадачы ў архіў дакументаў Цэнтральнай камісіі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сферы архіўнай справы і справаводства.

Дакументы камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў, камісій па рэферэндуме, па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата пасля завяршэння выбараў, рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата захоўваюцца ў парадку, прадугледжаным часткамі трэцяй – восьмай гэтага артыкула.

Пратаколы пасяджэнняў і дакументы да іх:

абласных і Мінскай гарадской камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, абласных і Мінскай гарадской тэрытарыяльных выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, акруговых выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, абласных і Мінскай гарадской тэрытарыяльных выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, а таксама акруговых выбарчых камісій па выбарах у абласныя Саветы дэпутатаў і тэрытарыяльных выбарчых камісій, якія ажыццяўляюць у раёнах горада Мінска паўнамоцтвы акруговых выбарчых камісій па выбарах у Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў, абласных і Мінскай гарадской камісій па рэферэндуме, акруговых камісій па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата захоўваюцца ў абласных, Мінскім гарадскім выканаўчых камітэтах на працягу 10 гадоў, а затым у складзе фондаў гэтых органаў перадаюцца на захоўванне ў дзяржаўныя архівы;

раённых, гарадскіх (у гарадах абласнога падпарадкавання), раённых у гарадах камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь захоўваюцца ў адпаведных раённых, гарадскіх выканаўчых камітэтах, мясцовых адміністрацыях на працягу 5 гадоў, а затым у складзе фондаў гэтых органаў перадаюцца на захоўванне ў дзяржаўныя архівы;

раённых, гарадскіх, пасялковых, сельскіх тэрытарыяльных выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, а таксама раённых, гарадскіх, пасялковых, сельскіх, раённых у гарадах камісій па рэферэндуме захоўваюцца ў адпаведных раённых, гарадскіх, пасялковых, сельскіх выканаўчых камітэтах, мясцовых адміністрацыях на працягу 4 гадоў, а затым у складзе фондаў гэтых органаў перадаюцца на захоўванне ў дзяржаўныя архівы;

участковых камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь захоўваюцца ў органах, якія ўтварылі камісіі, на працягу 5 гадоў, а ўчастковых камісій па выбарах дэпутатаў, па рэферэндуме, па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата захоўваюцца ў органах, якія ўтварылі камісіі, на працягу 4 гадоў, а затым у складзе фондаў гэтых органаў перадаюцца на захоўванне ў дзяржаўныя архівы.

Падпісныя лісты для збору подпісаў грамадзян у падтрымку:

вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь захоўваюцца ў адпаведных раённых, гарадскіх выканаўчых камітэтах, мясцовых адміністрацыях;

асоб, якія прапануюцца для вылучэння кандыдатамі ў дэпутаты, захоўваюцца ў органах, якія ўтварылі адпаведныя акруговыя, тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі;

прапановы аб правядзенні рэспубліканскага, мясцовага рэферэндуму захоўваюцца ў адпаведных раённых, гарадскіх выканаўчых камітэтах, мясцовых адміністрацыях;

прапановы аб узніманні пытання аб адкліканні дэпутата захоўваюцца ў абласных, Мінскім гарадскім, раённых, гарадскіх, пасялковых, сельскіх выканаўчых камітэтах.

Бюлетэні:

па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў захоўваюцца ў адпаведных раённых, гарадскіх, пасялковых, сельскіх выканаўчых камітэтах, мясцовых адміністрацыях;

па выбарах членаў Савета Рэспублікі, галасаванні аб адкліканні члена Савета Рэспублікі захоўваюцца ў адпаведных абласных, Мінскім гарадскім выканаўчых камітэтах;

для галасавання па рэферэндуме і для галасавання аб адкліканні дэпутата захоўваюцца ў адпаведных раённых, гарадскіх, пасялковых, сельскіх выканаўчых камітэтах, мясцовых адміністрацыях.

Тэрмін захоўвання падпісных лістоў для збору подпісаў, а таксама бюлетэняў па выбарах, для галасавання па рэферэндуме, галасавання аб адкліканні дэпутата – шэсць месяцаў пасля дня выбараў, дня галасавання па рэферэндуме, галасавання аб адкліканні дэпутата.

Фінансавыя справаздачы аб паступленні і расходаванні сродкаў:

выбарчых фондаў кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, фонду ініцыятыўнай групы па правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму захоўваюцца ў Цэнтральнай камісіі на працягу 5 гадоў;

выбарчых фондаў кандыдатаў у дэпутаты захоўваюцца ў адпаведных абласных, Мінскім гарадскім, раённых, гарадскіх, пасялковых, сельскіх выканаўчых камітэтах на працягу 4 гадоў;

фонду ініцыятыўнай групы па правядзенні мясцовага рэферэндуму захоўваюцца ў адпаведных мясцовых выканаўчых і распарадчых органах на працягу аднаго года.

Спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутата, участковыя камісіі перадаюць у выканаўчыя і распарадчыя органы, якія ўтварылі адпаведныя ўчастковыя камісіі, дзе яны захоўваюцца да правядзення новых выбараў, рэферэндуму.

Пратаколы пасяджэнняў і сумесныя рашэнні прэзідыумаў мясцовых Саветаў дэпутатаў і адпаведных выканаўчых камітэтаў, рашэнні пасяджэнняў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў па правядзенні выбараў членаў Савета Рэспублікі, адклікання члена Савета Рэспублікі, а таксама дакументы да іх захоўваюцца ў адпаведных абласных, Мінскім гарадскім выканаўчых камітэтах на працягу 10 гадоў, у раённых, гарадскіх выканаўчых камітэтах – на працягу 4 гадоў, а затым у складзе фондаў гэтых органаў перадаюцца на захоўванне ў дзяржаўныя архівы.

Дакументы, указаныя ў частках чацвёртай, пятай, сёмай і восьмай гэтага артыкула, пасля сканчэння тэрмінаў захоўвання падлягаюць знішчэнню ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сферы архіўнай справы і справаводства.

**Артыкул 156. Прызнанне, што некаторыя заканадаўчыя акты страцілі сілу**

У сувязі з уступленнем у сілу гэтага Кодэкса прызнаць, што страцілі сілу:

Закон Рэспублікі Беларусь ад 20 лістапада 1959 года «Аб парадку адклікання дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь» (СЗ БССР, 1959 г., № 16, арт. 251);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 ліпеня 1960 года «Аб парадку адклікання дэпутата абласнога, раённага, гарадскога, пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў працаўнікоў Рэспублікі Беларусь» (СЗ БССР, 1960 г., № 20, арт. 150);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 12 снежня 1978 года «Аб выбарах у Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь» (СЗ БССР, 1978 г., № 35, арт. 676);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 21 чэрвеня 1979 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб парадку адклікання дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь» (СЗ БССР, 1979 г., № 18, арт. 304);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 14 снежня 1979 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб парадку адклікання дэпутата абласнога, раённага, гарадскога, пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў працаўнікоўРэспублікі Беларусь» (СЗ БССР, 1979 г., № 35, арт. 615);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 27 кастрычніка 1989 года «Аб выбарах дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь» (СЗ БССР, 1989 г., № 31, арт. 316; Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1995 г., № 1-2, арт. 3);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 20 чэрвеня 1990 года «Аб змяненні артыкула 47 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб выбарах народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь» і артыкула 45 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб выбарах народных дэпутатаў мясцовых Саветаў народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь» (СЗ БССР, 1990 г., № 18, арт. 266);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 21 снежня 1990 года «Аб унясенні змяненняў у артыкул 57 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб выбарах народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь» і артыкул 54 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб выбарах народных дэпутатаў мясцовых Саветаў народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 1991 г., № 1, арт. 9);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 чэрвеня 1991 года «Аб народным галасаванні (рэферэндуме) у Рэспубліцы Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 1991 г., № 25, арт. 364);

Пастанову Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 13 чэрвеня 1991 года «Аб увядзенні ў дзеянне Закону Рэспублікі Беларусь «Аб народным галасаванні (рэферэндуме) у Рэспубліцы Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 1991 г., № 25, арт. 365);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 8 снежня 1992 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб выбарах народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь» і Закон Рэспублікі Беларусь «Аб выбарах народных дэпутатаў мясцовых Саветаў народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., № 34, арт. 540);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 29 сакавіка 1994 года «Аб выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1994 г., № 10, арт. 146);

Пастанову Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 29 сакавіка 1994 года «Аб увядзенні ў дзеянне Закону Рэспублікі Беларусь «Аб выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1994 г., № 10, арт. 147);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 1994 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб выбарах народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1995 г., № 1-2, арт. 1);

Пастанову Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 1994 года «Аб увядзенні ў дзеянне Закону Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб выбарах народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1995 г., № 1-2, арт. 2);

Пастанову Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 31 студзеня 1995 года «Аб прымяненні апошняй часткі артыкула 34 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб выбарах дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1995 г., № 13, арт. 133);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 22 сакавіка 1995 года «Аб унясенні змянення ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб выбарах дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1995 г., № 18, арт. 198);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 7 верасня 1995 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб выбарах дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1995 г., № 29, арт. 367);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 24 верасня 1996 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб выбарах дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1996 г., № 32, арт. 583);

Пастанову Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 14 лістапада 1996 года «Аб тлумачэнні асобных артыкулаў Закона Рэспублікі Беларусь «Аб народным галасаванні (рэферэндуме) у Рэспубліцы Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1996 г., № 34, арт. 622);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 23 снежня 1998 года «Аб выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, 1999 г., № 2, арт. 33);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 1999 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб народным галасаванні (рэферэндуме) у Рэспубліцы Беларусь» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 1999 г., № 56, 2/63).

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь** **А.Лукашэнка**